

# Пімен Панчанка



*Пімен Панчанка*

*Збор твораў*

# Пімен Панчанка

*збор твораў*
*у чатырох*
*тамах*

# Пімен Панчанка

*том першы*

*вершы і паэмы (1934—1945 гг.)*

*выбраныя пераклады*

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1981

Бел 2
П16

П $\frac{70403-030}{М\ 303(05)-81}$ падпіснае 4702120200

© Афармленне. Прадмова. Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1981.

## ПАЭЗІЯ ДАБРЫНІ І МУЖНАСЦІ

Мабыць, самы прыгожы з усіх беларускіх шляхоў — лясны шлях з Мінска на Полацк. Вельмі люба ездзіць па ім. улетку, калі лясы набіраюць сваю лісцвяную моц і стаяць па абодва бакі, нібы трапічныя джунглі; люба ўвосень, у пару залатога лістапада азіраць яго стракатамаляўнічую прыгажосць, ці нават зімой, маразамі, калі бары абапал гасцінца апранаюць свой срабрысты ўбор, і ўсё навакол замірае ва ўрачыстым маўчанні.

Пасля Плешчаніц стужка шашы нырае ў самыя лясныя нетры, і стромкія сосны жоўтай мядзянай сцяной сціскаюць асфальтку, якая то віляе з пагорка на пагорак, то пераскоквае рэчкі, то доўга ўецца між баравых цяснін. Але перад Беразінай бары расступаюцца, даючы месца паселішчу, якое нечакана вынікае за чарговым пагоркам россыпам сваіх несамавітых дамкоў, аўтобуснай станцыяй, некалькімі шэрымі сілікатнымі збудаваннямі. Гэта Бягомль. Тут прамінулі далёкія ўжо дзіцячыя гады выдатнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі.

Нездарма я пачаў з дарогі і лесу — трэба да іх прыглядацца пільней і бачыць больш, чым мы прывыклі бачыць звычайна. Гэта асабліва дарэчы, калі гаворка ідзе пра паэта і яго маленства — выток яго душэўнай і паэтычнай сутнасці. Уражлівая дзіцячая душа, сама не ведаючы таго, найперш бярэ ад прыроды, ад звыклага для сябе асяроддзя ўсё тое, што пасля пераплавіцца ў дыямент паэтычнасці і на шмат год, калі не на ўсё жыццё вызначыць характар светаўспрымання паэта. Пімену Панчанку ў гэтым сэнсе пашэнціла: мусіць, не шмат знойдзецца на Беларусі такіх першародных лесавых мясцін, дзе чалавек і прырода на працягу стагоддзяў суіснавалі ў добрай згодзе, у гарманічным адзінстве, без фальшы і хцівасці, дабром і ласкай уплываючы адзін на аднаго.

Канечне, за гады жыцця Пімен Панчанка нагледзеўся рознага, у свой час адбылося і знаёмства з хцівасцю свету, яго сподам і злом; нямала лепшых гадоў адабрала вайна — прамая сутычка ўзаемавыключных сіл, калі вырашалася элементарнае: жыць ці не жыць. Але першаснае, аснова характару Панчанкі-паэта і Панчанкі-чалавека, мабыць, бярэ свой пачатак менавіта ад зямлі, па якой пралеглі яго першыя дзіцячыя крокі — ад ягонай Бягомельшчыны.

Панчанка як паэтычны характар надзвычай гарманічны і цэльны, ён не дужа імкнецца да навізны тэм, здаецца, не надта займаюць яго фармальныя паэтычныя пошукі,— здаўна і надоўга яго цікавяць «ісціны простыя, як хлеб, і праўдзівыя, як плач дзіцяці».

Мусіць, гэта і правільна, бо час, на які прыпадае паэтычная дзейнасць паэта, не дужа спрыяў пошукам паэтычнай вытанчанасці, затое густа агалашаўся дзіцячым плачам; і хлеб для мільёнаў быў даражэйшы за золата. Ён даваў жыццё, адстаяць якое было не дужа проста ў свеце, дзе грымелі баі і ліліся рэкі крыві. У той агнявы час Панчанка выдаў тры паэтычныя зборнікі, у якіх мноства выдатных вобразаў, нібы на камені выбітых думак. Але мяне асабіста да ўтрапёнай нематы ўражвае ягоны невялічкі вершык «Герой» з яго шырокавядомымі, такімі бязлітаснымі ў сваёй крывавай праўдзівасці радкамі:

Злосна сказаў: «Уставай, пяхота!
Мы не на пляжы, а на вайне».
І лёг на змяіныя скруткі дроту,
І дзвесце салдацкіх запыленых ботаў
Прайшлі па яго спіне.

Думаецца, калі б ён пра фронт не напісаў болей нічога, дык адных гэтых радкоў хапіла, каб з такой яркай канкрэтнасцю выразіць усю пакутніцка-гераічную сутнасць мінулай вайны.

Калі прырода Бягомельшчыны заклала ў будучым паэце асновы дабра і гармоніі, дык цану справядлівасці ён зазнаў трохі пазней, у гады сваёй агнявой маладосці, на франтах вялікай вайны. Менавіта на вайне ва ўсім бляску раскрылася перад ім непарушная сутнасць сяброўства, салдацкае вернасці, значэнне таварыства і ўзаемавыручкі.

Вайна была доўгая і жорсткая, яна патрабавала мільёнаў ахвяр і безлічы чалавечых намаганняў. «Мы перакапалі паў-Еўропы, перш чым перамогу адкапаць»,— скажа паэт трохі пазней. Але наша перамога накладвае і на пераможцаў свой немалы абавязак,— у мірны час і пасля вайны чалавек найперш павінен заставацца чалавекам.

А хто не паспрыяў людскому шчасцю,
Каго і сёння гне халуйскі страх,
Дык той не франтавік, не нашай часці,
А недзе акалачваўся ў тылах,—

з усёй бескампраміснай катэгарычнасцю сцвярджае Пімен Панчанка.

Так, мірны пасляваенны час не дае супакоіцца, тым болей расслабіцца, барацьба за ўсё лепшае ў чалавеку, супраць пошасці прыстасавальніцтва вымушае паэта на радкі, прасякнутыя пафасам непрымірымасці:

А як ачысціць муць?
Скажы, якімі фільтрамі?
Жывуць і ў вус не дзьмуць
Прыстасаванцы хітрыя!
З іх кожны быццам б'е
Старое грозна розгамі,
А сам дабро грабе,
Схаваўшыся за лозунгі.

Балявы парог паэтычнай натуры Пімена Панчанкі надзвычай нізкі, а яго здольнасць да суперажывання ўсяму сапраўды чалавечнаму зайздросна абвостраная нават як для паэта. У той не такі ўжо даўні час, калі ён болей пісаў і часцей друкаваўся, кожны ягоны верш або падборка вершаў адразу ж пасля выхаду ў свет рабіліся паэтычнай з'явай, студэнты іх вывучалі на памяць, іх чыталі з эстрады, перадрукоўвалі ў розных выданнях. Мусіць, гэта таму, што вершы Пімена Панчанкі, як правіла, былі выразнікамі дум і спадзяванняў эпохі, неслі ўвесь напал яе творчага пафасу, і не адно пакаленне чытачоў захаплялася імі. У гэтых вершах не толькі не было месца фальшы, прыблізнасці або ашуканства, але кожнае слова гучала, як звон, бо выказвала ўсеагульны боль ці ўсеагульны клопат.

Бо без чалавечнасці
Не будзе і вечнасці.

Пімен Панчанка як ніхто іншы з паэтаў ведае і адчувае, што трэба людзям у дадзены момант іх гістарычнага існавання і чаго ўжо не трэба, што падлягае пафаснаму праклёну навек. («Хлусяць не багі, а людзі, крывадушнічаюць не багі».) Публіцыстычная завостранасць цэлых цыклаў панчанкаўскіх вершаў рабіла іх баявой зброяй народа ў барацьбе з бюракратызмам, пустазвонствам і раўнадушшам, якія з такой цяжкасцю выкарчоўваюцца з нашага жыцця.

Самаадданая ў пачуццях сяброўства натура Пімена Панчанкі ўмее надзвычай прыгожа радавацца чужымі ўдачамі таксама як і глыбока засмучацца чалавечымі бедамі, няўдачамі мастакоў на іх творчым шляху. Агульнавядома,

з якой шчырай зацікаўленасцю ён сочыць за поспехамі маладзейшых і як радуецца, калі іхнія новыя творы спраўджваюць ягоныя надзеі. Так, ён вельмі высока цэніць творчасць Рыгора Барадуліна, у асобе якога беларуская паэзія знайшла свайго самага галасістага салоўку; яго радуе «шчыры, прынцыповы, па-грамадзянску мужны» талент Генадзя Бураўкіна, ён захапляецца таленавітай паэзіяй Міколы Аўрамчыка, Янкі Сіпакова, Веры Вярбы. «Я глыбока перакананы, што паэзія без страснасці, без грамадзянскага гучання — непаўнацэнная паэзія»,— сцвярджае прызнаны майстра паэтычнага слова.

Будучы шэраг гадоў галоўным рэдактарам часопіса «Маладосць» Пімен Панчанка выхаваў цэлую плеяду маладых тады беларускіх паэтаў; іншыя ж выхоўваліся ў літаратуры не без уплыву ягонай надзвычай чалавечнай паэзіі. Але ён уплываў не толькі на паэзію. У якасці галоўнага рэдактара ён меў даволі рэдкую па тым часе (а па цяперашнім і тым болей) завядзёнку першым чытаць аўтарскія рукапісы і тым вызначаць іхні лёс у часопісе. З яго рэдактарскага «благаславення» ў «Маладосці» з найменшымі стратамі былі надрукаваны шмат якія з аповесцей аўтара гэтых радкоў. У шматлікіх выпадках ён цалкам давяраў аўтару, калі бачыў у ім несумненны талент, і на розныя прэтэнзіі сваіх супрацоўнікаў звычайна казаў: «Нічога не чапайце, хай так ідзе!» Панчанка, калі было трэба, не скупіўся на пахвалу, хоць, валодаючы дасканалым літаратурным густам, мог быць прыдзірлівым і патрабавальным, калі таго вымагаў твор. Але гэтая патрабавальнасць ішла ад неспатольнага клопату за росквіт роднай літаратуры, развіццё роднай мовы.

Песню сваю, мову сваю
Я да грудзей прытульваю.

Пімен Панчанка нямала стварыў у беларускай літаратуры за амаль паўстагоддзе сваёй творчай дзейнасці. Значэнне яго паэзіі цяжка пераацаніць. Яго паэтычныя вобразы даўно жывуць у свядомасці яго чытачоў, вывучаюцца дзецьмі ў школах. На лепшых здабытках ягонай лірыкі выхоўваліся дзесяткі маладзейшых, цяпер шырока вядомых паэтаў Беларусі, яна склала яркую і непаўторную старонку ў гісторыі нацыянальнай паэзіі.

*Васіль Быкаў*
*Народны пісьменнік Беларусі*

## УРАДЖАЙНАЕ

За гарой высокай вецер ходзіць, свішча,
Узвілася песня за гарой высокай...
У зялёным садзе чырванеюць вішні,
Каласы набраклі бурштыновым сокам.

І шуміць ласкава ў жоўтых хвалях поле —
Вынік веснавое працы бальшавіцкай.
Буйнае насенне сеялі супольна
Ўдарнікі калгаса, хлопцы й маладзіцы.

Не казалі — цяжка, з радаснай надзеяй
Засявалі поле дбайнаю рукою.
І зямля, як маці, шчодра нас надзеліць —
Глянь — калоссе долу хіліцца цяжкое!

І дзявочы голас звоніць над лясамі:
«Будзем з белым хлебам зімку зімаваці...
Хутка наша поле ўсцелецца снапамі.
Паплыве у гумны хлебнае багацце.

Будуць у калгасе слаўныя дажынкі,
Будуць чутны песні за гарой высокай».
...Зніклі ў хвалях жыта вузкія сцяжынкі,
Каласы набраклі бурштыновым сокам.

*1934*

## МОЛАДЗІ

Нашы бурныя дні начаку,
Развінайся ж у маршы, моладзь,
Як сяброўку, вітай за руку
Маладую вясну камсамола.

Станавіся пад ленінскі сцяг,
Набірай бальшавіцкага гарту,
Каб на кожным участку жыцця
Ты змагла несці зорную варту.

Перашкодамі рук не аслаб,
Прыкладзі і старанне, і розум,
Каб для ворагаў нашых была
Найвялікшаю ў свеце пагрозай.

У краіне нямала франтоў.
Будзь жа, моладзь, у шэрагах першых
На будоўлі дарог і мастоў,
На заводзе, ў калгасе, у вершах.

Помні Ленінскі завет —
Пра навуку ягонае слова,
Бо нам суджана цэлы свет
Збудаваць на разумнай аснове.

Дык заўсёды ж ты будзь начаку,
Развінайся у маршы, моладзь,
Як сяброўку, вітай за руку
Маладую вясну камсамола.

*1934*

## З ПЕСНЯЮ ВЯСНЫ

Вось гэты краявід і нашы сэрцы —
Граніца думак і вясны, напэўна.
Ну, як усмешку сёння з твару сцерці,
Калі замест вады тут сонечная пена?

Нячутна нават веснавая сырасць,
І снег — грудкі раскрышанага сыру,
А ў ручаях кіпучых б'ецца радасць...
Вам весела таксама, сябры, праўда?

За працаю шпакі і дзетвара;
Стаіць, падпёршы дзюбай сонца, бусел;
Флатылья крыг выходзіць на парад
На цёмна-сінім вадзяным абрусе.

А з горада магутны паравоз,
На чорны твар злавіўшы сонца промень,
Над ледаходам трактары правёз,
І бубен-мост забарабаніў громам.

І гэты гром, і нашы галасы
Напевам гучным над зямлёй дрыжаць,
Як кліч за паліўныя каласы,
Як бой за бальшавіцкі ураджай.

І гэтай песні нельга сутрымаць,
Мы з ёю стрэнем наш вясёлы май:
Адвагу сіл у росквіце гадоў,
Усмешку нашых новых пабудоў,
Цвіценне ніў і маладых садоў.

*1935*

## СУСТРЭЧА

Можа, гэтаму спрыяла
Веснавое шалясценне,
Што насіла у прасторы
Песні сонца, песні медзі.
Сэрца білася трывожна,
Нібы выбегчы хацела
Насустрэчу той дзяўчыне,
Што сягоння я прыкмеціў...

Я паветрам свежым дыхаў,
Ідучы па шляху талым.
Навакол крычалі птушкі,
А мажліва што спявалі.
Ярка-вогненнае сонца
Варушыла снег, хістала
Памутнелыя аблокі,
Што на поўнач адплывалі.

Мне хацелася смяяцца,
І спяваць, і бегчы ўдалеч...
Раптам, бачу я, дзяўчына
Мне якраз ідзе насустрач.
Я міжвольна схамянуўся,
Неслухмяны чуб паправіў,
А затым мне стаў цікавым
Верабей на плоце шустры.

Ты прайшла з касою чорнай
Пад малінавым берэтам,
Пад крылатымі брывамі
Хітравата ззялі вочы.

Ты прыйшла з усмешкай цёплай,
Прашумела, нібы ветласць
Той вясны, што ты адбіла
Тонкай постаццю дзявочай.

Хай ты Насця, хай ты Жэня,
Хай ты Соня ці Таіса,—
У мяне сэрца задрыжэла,
І няма чаго таіцца...

А тым часам на заходзе,
Норму вырабіўшы, клаўся
У ружовую калыску
Дзень — шырокі, нібы мора.
І націху вецер сіні
На празрысты, лёгкі насціл
Залаты гарох рассыпаў
Трапяткіх, нямых сузор'яў.

А пазней у клубнай зале
Камсамольскі сход адбыўся.
Там мяне крытыкавалі,
Што ад працы я адбіўся.
Хоць балюча, ды без злосці
Мне сябры давалі ў косці.
Пра грахі мае пыталі,
Жартавалі, рагаталі.

А званчэй за ўсіх дзяўчына,
Што ўзнімала ў сэрцы хвалі
І прыкоўвала мой позірк...
Вечар скончан. Падыходжу
Да яе: «Дазвольце з вамі...»
А яна з насмешкай кажа:
«Нам, відаць, не па дарозе...»

Я адзін пайшоў дарогай
І, нягледзячы на месяц,
Што халодна усміхаўся,
Пра яе з тугой нязвыклай
Думаў так і думаў гэтак...
А затым, павесялеўшы,
Закурыўшы папяросу,
Засмяяўся, ледзь не крыкнуў:

«Я нараджан не для смеху,
Сам расправлюся з грахамі».
Мо тады з дзяўчынай гэтай
Пашчасліціць мне спаткацца,
Бо вясна ідзе ўжо з поўдня
З нечым радасным каханнем,
З салаўямі, зорным звонам,
З пахам бэзу і акацый.

*1935*

## ВЯСНОВЫЯ МАРЫ

Прыйшла і сонцам прамяністым
Расправіла снягі і лёд,
Вясёлым спевам, звонкім свістам
Напоўніла лясы, сады,
І ад зімы адны сляды —
Бязлістае яшчэ галлё.
Ну як не быць усхваляваным?
Глянь, сонца ўсюды: на вадзе,
Дыміцца парай над хлявамі,
Размову з кроплямі вядзе...
Цяпер бы паблукаць за лосем,
Што прагна сок крынічны п'е,
Рыкае зычна і ля сосен
Галіны гордых рог праносіць
Ды глуха капытамі б'е.
Паслухаць бы драздоў свістанне
У час ружовага світання,
Калі цяжкі мядзведзь з бярлогі
Высоўвае на сонца нос;
Калі туман плыве над логам,
Рассейваючы кроплі рос...
Стаю пад сонцам я і мару.
Насустрач крочыць мой таварыш,
У зморшчыны свой лоб сабраў.
Гукаю хмурнага сябра:
«Чакай, таварыш брыгадзір,
Вакол сябе ты паглядзі —
Прыроды нельга распазнаць!»
«Ну, што ж, вясна як і вясна...» —
Стаіць разгублены і дужы.
«Ты што, дружышча, хіба тужыш?»
«Тужыць, браток, не маем часу,
Калі з клапотамі ідзе
З палёў вільготных да калгаса
Сяўбы вясновай рупны дзень.
Гарачы будзе гэты годзік,
Багаты ураджай — не жарт.

Змагацца будзем — і уродзяць
Дзівосныя жыты, аўсы,
Цяжкія будуць каласы
На працаднях нашых ляжаць.
Такая мара ў нас... Між іншым,
Я сам люблю прыход вясны —
Малочнае цвіценне вішань,
І спеў драздоў, і шум лясны».

*1936*

## ЯБЛЫНЯ

Стаяла яблыня ля вёскі,
Як падарожнік між дарог.
Вясною падалі палёсткі,
Нібы сняжынкі, на мурог.

Ніхто не дбаў аб ёй, і вецер
Хацеў галіны пакрышыць.
А побач — помнік нечай смерці —
Гнілі два сумныя крыжы.

Як сірата расла... І кожны
Пахучым кветкам крыўду нёс.
І ціха скардзілася пожням
Яна пра свой паганы лёс.

Ды кожны год аздобай новай
Здзіўляла птушак і людзей.
А гэтай сонечнай вясною
Такі выдатны выпаў дзень:

Мы перавезлі беражліва
Яе у сад, калгасны сад,
Дзе на ігрушах і на слівах
Зіхціць блакітная раса.

«Расці,— сказалі ёй з пашанай,—
Гадуй нам сочныя плады».
«Расці!» — загрукаў гром, і хмара
Паслала дождажык малады.

І ападаў на сад са звонам
Бліскучых буйных кропель рой...
А з поўдня ехаў май зялёны
Да нас з вясёлкавай дугой.

*1936*

## НА ПАШЫ

На пашы рыжыя чмялі
Загаспадарылі між кветак.
З маленькіх гладышоў пілі
Пахучы мёд — ласунак лета.

Раздвоен сонца жоўты круг —
У небе вадкім ён і ў рэчцы
Ператварае ў рыб ікру
І запрашае ў хвалях грэцца.

Лянуюю плынь блакітных вод
Нагрэла сонца да астатку.
Дзе вольхі сталі ў карагод,
Лёг адпачыць калгасны статак.

Прыкрыў цянёк сваім крылом
Кароў паважных, цёлак тлустых.
«Вось прыпякло, дык прыпякло!» —
Сказаў пастух і лёг пад кустам.

Ён дудку выразаў з лазы,
І заспявала ціха шчасце:
«Як вечар зернеты расы
Пасее, вернемся мы з пасты.

Даярка будзе сустракаць
Нас ля варот з вядром бляшаным.
За цёплы водар малака —
Павага мне і вам пашана».

*1936*

## ВЕРАСЕНЬ

Смугой павіты росныя пагоркі.
Між рэдкіх хмар ужо іскрацца зоркі.
І ціха-ціха падаюць лісты,
І вецер па палях пустых
Разносіць спеў, для нас незразумелы.
Я чую ў ім і сум, і шкадаванне
Тых дзён, калі пшаніца ў хваляванні,
Як ветразь залаты, шумела.
Калі пярун штось хмары гуў, а тая
Ішла-плыла нястрымная, густая
І косы дажджавыя расплятала,
І з матчынай пяшчотаю шаптала:
«Шумі ліствой, зялёны мой клянок!
Расці, расці, пшаніца маладая!»
...Пшаніца ўзгадавалася даўно,
Ад ураджаю ломіцца гумно.
Цяпер жа ноч... і верасень багаты
Расплёскаў водар яблычны ля хатаў.
А ў хатах светлых чуцен смех і песні.
Рагоча напаўголасу баян.
Ў такую ноч — у грудзях сэрцу цесна.
Ў такую ноч — спяваю звонка я:
«Шчаслівы край! Шчаслівы, хто жыве
Пад зорамі Радзімы дарагое!..»
А з глыбіні зямлі плыве, плыве
Вятроў асенніх невыразны гоман.

*1936*

## ІСПАНСКАМУ ТАВАРЫШУ

Я хацеў бы, далёкі мой друг,
Тваё мужнае сэрца уславіць,
І пацісцуць далоні рук,
Што нясуць неўміручую славу.

Інквізітараў подлых арда
Падпаўзла да Іспаніі спрутам.
І па вёсках, па гарадах
Смерць гуляе у хмарах атруты.

Квецень саду і птушак палёт
Праглынае смурод пажараў...
Ды жыве гераічны народ,
З ім і ты, мой мадрыдскі таварыш.

Я хацеў бы цяпер быць з табой,
У паходах хадзіць суровых.
Хай з табою ідзе у бой
Маё сэрца і шчырае слова.

*1936*

## ШЫЗЫ ГАЛУБОК

Я рад вясне. Я рад гучанню
Дзявочых песень ля бяроз.
Як плаўлены метал у чане,
Гарыць ружовы край нябёс,—

То дзень нам шле на адыходзе
Усмешкі сонечнай зары.
Каля крыніцы песні ходзяць,
У лад гудзе ім гай стары.

І словы песні немудронай
Звівалі казачны клубок:
— Кранаючы бярозаў кроны,
Ляцеў імкліва галубок.

Ён быў вясёлы і прыгожы,
Як дзень вясновы, малады;
Стаміўся ён у падарожжы
І сеў на камень ля вады.

А там, за цёмнымі барамі,
За люстрамі азёр і рэк,
Яго галубку хтось параніў,
Скалечыў шызую навек.

Закончыў шлях і шызы голуб
У каршуновых кіпцюрах...
Хрыпела смерць... А ў небе кволым,
Як і цяпер, была зара...

І толькі кроплі апямелай
Крыві глынуў блакітны вір...
Высока песня дазвінела
І апусцілася на жвір.

Дзяўчаты крыху пасмутнелі.
Я шчырасць думак ім нясу:
— Вы ад душы, дзяўчаты, пелі,
Але навошта — гэты сум?

Мы каршунам падбілі крылле.
У сэрцы ж вырасла любоў
Да легкакрылых эскадрылій
Магутных, шызых галубоў.

Куды ні глянь — над Запаляр'ем,
Над Ферганою грозны гул,—
Героі ў песенным падхмар'і
Радзіму нашу берагуць!

Дзяўчаты мне ў адказ запелі,
І чулі травы ля крыніц
Аб тым, што кожны наш прапелер
Нясе спакой і мір граніц.

*1936*

## СУВЕЙ

### I

Пад Маладзечнам шмат лясоў,
Нямала і балот.
Вялося многа там ласёў
І дзікіх коз было.
Цяпер іх, кажуць, не відно,
Не чуцен грозны рык;
І п'юць хваёвае віно
Інакшыя звяры...
Загублена у нетрах тых,
Дзе хвоі вышай гор,
Магіла непрыкметная —
Зямлі пакутнай горб.
А людзі часам гутараць,
А ў людзях сказ жыве,
Што жыў на бедным хутары
Хлапец Лявон Сувей.
А воддаль млын пад горкаю —
Чатырохкрылы птах.
Лявон там працы горкае
Удосталь паспытаў.
Цягаў мяшкі пукатыя
Ён дзень у дзень, каб мець
Скарынку, каб за хатаю
Шчэ пачакала смерць.
Пад старасць каб з сявенькаю
Пайсці на свой загон,
Каб мацеры сівенькай
Дажыць да лепшых дзён...
А дні ішлі прагорклыя,
Як лубіна струкі.
І часта за гаворкаю
Ўзнімаў ён дзве рукі:
«Эх, шчасце, шчасце... Дзе ж яно?
Дайсці не хопіць ног
Мне да яго... Развеена
На паясах дарог.
Нядоля ходзіць лютая
За намі цэлы век.

Чаму, чаму ж пакутуе
Працоўны чалавек?
А ў млынара скупога скарб,
Як цеста з дзежкі, прэ...»
Маўкліва людзі слухалі,
Ішлі з аглядкаї прэч.

II

Быў давячорак. Воблакаў
Стаялі астравы
На небе. Дожджык цёплы
Асеў у глыб травы.
Трубіў пастух... З палосак
Дахаты жнеі йшлі,
Іх песень адгалоскі
Журботаю плылі...
Лявон ішоў у стоме,
Быў адпачынку рад...
Яго ў багатым доме
Чакаў млынар Ігнат.
Сядзеў і гладзіў вус. Каб
Кроў бурліла лепш,
Гарэлка і закуска
Стаялі на стале.
Сядзеў, як бог. Пад носам
Два касмакі рудых...
І парабку паднёс ён:
«На, выпі за труды!»
Лявон быў здзіўлен. Выпіў...
Праз зуб — гнілы тынок —
Ляцелі словы хрыпла:
«Пі, сам даю, сынок».
Затым устаў ён. Тлусты,
Як буйны белы грыб.
«Каб мець вам хлеба лусту,
Трэ быць маўклівей рыб.
А ты, а ты ўжо хочаш
Таптаць святы закон?
А ты распяліў вочы
На скарб чужы? Лявон!
Ідзі, ідзі да д'ябла,
У млын каб ні нагой! —
Гнілы, папсуты яблык

Сарву сваёй рукой!..»
Крычаў, варонай каркаў
І непакорных кляў.
Лявон збялеў. І чарка
У горле запякла...
А на двары прыветна
Сваволіў вецярок.
І бачыў месяц светлы
Цяжкі Лявонаў крок.
Хадзіў з калючым болем,
Ў вачах іскрыўся гнеў.
Хадзіў, як цень, па полі,
Ў нянавісці пямеў...
Дождж зорак з неба падаў
На росны шоўк травы.
І чуўся шэпат: «Гады!
Заплачаце ж і вы!»
А потым звон старанна
Гудзеў, і выў млынар:
Млын паміраў, прыбраны
Ў кажух пякучых хмар.
І знік Лявон... І маці
Сівела ад журбы.
І пелі штосьь ля хаты
Дзве сумныя вярбы.

III

Не вецер лісцем шастае,
Не рыпае кара —
Лявон глухою сцежкаю
Ідзе у родны край.
І па суровай постаці
Нялёгка зразумець,
Якія словы вострыя
І думкі ён займеў.
...Ноч зоркам пераблытала
Таемныя шляхі —
Адна упала спрытная
У цёмны бор глухі
І нарадзіла вогнішча,
Сабрала сем сялян...
Мо папараць чароўная
Тут сёння зацвіла?

Паселі ўсе суровыя:
«Ну, што ж, Лявон, кажы,
Што чуў на свеце новага,
Чым дыхаў ты і жыў?»
«Браты, як звер зацкованы,
Я уцякаў ад хат
У лесавыя схованi,
А быў чамусьці рад,
Што полымем залочаным,
Узняўся мой праклён,
Што помстаю заплочана
За здзек, за пекла дзён...
Я край наш вялікі
Ўвесь абышоў.
Усюды шчасце клікаў,
Але не знайшоў.
У Пінску, на Гародні
Пакутуе наш брат.
О, колькі іх, галодных,
Без працы, без хат!
У чорным дыме Лодзі
Хрыпяць ткачы,
Каб сыта, ў пазалоце
Жылі багачы.
Дакуль жа будзем, братцы,
Прыгнечанымі жыць?
Пара за стрэльбы брацца,
Пара паноў паліць!
Цярпець і енчыць годзе!
Вы гляньце на усход —
У шчасці і у згодзе
Жыве там народ.
Там радасная праца,
Там сонца ярчэй,
І весела іскрацца
Сузор'і начэй...»
І чулі дрэвы дужыя
Прысягу мужыкоў —
Быць змагарамі мужнымі,
Разбіць прыгнёт вякоў.

## IV

Не вербы шум рассыпалі,
Не плёскае ручэй —
То маці плача з радасці,
Ласкава словы тчэ:
«Цябе я, родны сыне мой,
Чакала кожны дзень...
Хоць ночаньку адзіную
Паспі ў сваім гняздзе...»
І задрамаў ён стомлены,
Бы явар ля ракі,
Як абцугі над скронямі
Сышліся дзве рукі.
А маці ноч бяссонную
Малілася, каб бог
Ад бед, ад гора чорнага
Ёй сына пабярог.
Маўчала цемра-здрадніца,
І месяц з неба знік,
У косы ночы раніца
Зары ўпляла каснік.
І тапалі крылатыя —
Пасталі ў поўны рост...
Загрукалі прыкладамі
Жандары ля варот.
Наперадзе, як ступа,
Ішоў млынар Ігнат;
Каваным ботам стукаў,
Масніцы угінаў...
Куды ж, куды падзецца
Ад чорнае бяды?
Загінуць давядзецца...
Лявон адчуў тады,
Што маладое сонейка
Не для яго вачэй,
Што ўжо не піць ў сасоннiку
Мядовы пах начэй.
Вясна мая гаротная!
Мяцежны мой закат!
Бывай, матуля родная...
Ну, варушыся, кат.
«Сынок... Мой сын... куды ж яго?..»
Зара, як кроў, плыла...

І бегла ўслед нядужая,
Прасіла і кляла.
Ды кат рукой умелаю
Скрывавіў скронь старой;
Збялелая, знямелая
Упала пад гарой...
Глядзела і не бачыла,
Як збеглася сяло.
Святое гора матчына
Усім душу пякло.
Эх, сонечная раніца,
Цямней ты нам за ноч!
Маўчалі людзі хмурыя,
А помста біла з воч.
«Каму ты ўсходзіш, сонейка?
Каму цвітуць сады?
Каму пяюць ў сасонніку
Сініцы і дразды?» —
З адчаем маці думала,
Ў вачах стаяў туман...
О божа, ашукаў мяне,
Няма цябе, няма!..

. . . . . . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . . .

Пад Маладзечнам шмат лясоў:
Там, у гушчары дрэў,
Уночы чуцен рогат соў,
Удзень — птушыны спеў.
А гэтай майскай раніцай
Звярыны смех гучыць:
«Пан бунтаўшчык застрэлены
Пры спробе уцячы...»

V

І будзе дзень, і грымне бой,
Узброіцца народ.
Гарніст мядзянаю трубой
Збярэ нас у паход.
Мы пераможнаю хадой
Уславім грозны час.
Вілейка свежаю вадой
Шчэ пачастуе нас...

Я адшукаю у бары
Магілу змагара
І ціха вымаўлю: «Сябры.
Пахован тут наш брат.
Дарогай жаху ён прайшоў,
І ў час пакутных дзён
Ён сеяў гнеў, каб узышло
Шчаслівае жыццё».
Яшчэ скажу: «Лявон Сувей,
Пад гул хваін старых
Спакойна спі, сябры твае —
Жыцця гаспадары.
І ворагаў перамагчы
Твая нас кліча кроў,
У сэрцах мужных несучы
Нянавісць і любоў».

*1936*

## РАДЗІМЕ

Я малым хлапчуком палюбіў твае пушчы і нівы,
І блакітныя рэкі, і мора зялёных лугоў.
Ты мяне гадавала, як маці, і рос я шчаслівы,
Не зазнаўшы галечы, з атрадам вясёлых сяброў.

О Радзіма, табою напоўнена сэрца да краю,
І заўжды — ці працую, ці пільна на варце стаю,—
Я твой велічны вобраз у думках сваіх уяўляю
І люблю, як жыццё, я зямлю маладую тваю!

Бо на гэтай зямлі малаком мяне маці карміла,
Тут хадзіць я вучыўся і кнігі чытаў да зары.
Што ж мне можа быць больш
за Радзіму любімую міла?
Хто ж мне будзе радней за таго,
хто Радзіму стварыў?

Я спакойны юнак, можа, нават крыху сарамлівы,
Не пакрыўджу і птушкі, бо знаю:
ёй хочацца жыць;
Але тых, хто жадае напасці на край мой шчаслівы,
Я сваімі рукамі без жалю гатоў задушыць.

*1937*

## КРАСАВІЦКАЯ НАВАЛЬНІЦА

Небу цёмна-сіняму і ветру
Скардзіліся чорныя палі:
«Сонцам мы вясновым абагрэты,
А дажджу даўно ўжо не пілі!»

І тады прыйшлі паважна хмары —
Айсбергі падсонечных вышынь.
Гром у бубны гулкія ударыў,
Цішыню густую пакрышыў.

Я люблю часіну навальніцы,
Калі б'е пярун па ўсіх ладах
І злуюцца ў хмарах бліскавіцы,
Кроплі асыпаючы на дах.

А струмені звоняць, нібы струны,
Прагна п'е іх смяглая зямля;
Травы прарастуць, густыя руні
Забушуюць хутка на палях.

Адгулі грымоты і замоўклі.
Ўсюды шмат срабрыстых ягад-рос.
Елкі цёмнагрывыя намоклі,
Сушаць вербы пасмы жоўтых кос.

На зямлю блакіт праліўся — лужын
Шмат блішчыць усюды, а ў вадзе
Сонца промні зыркія варушыць,
Ніткі залацістыя прадзе.

Ў сетцы дрэў ідзе птушыны мітынг —
У азоне спеў ярчэй грыміць.
А зямля абмытая дыміцца,
Дыхаючы поўнымі грудзьмі.

На сустрэчу ёй выходзяць людзі:
«Сейбітаў, радзімая, прымай!»
Я па ўсіх прыкметах бачу — будзе
Сёлета багаты ураджай.

*1937*

## У ДАРОЗЕ

Знікла цішыня, і па дарогу
Сыплюцца удары конскіх ног.
Едзем паўз бярэзнік беланогі,
Што ў расе па досвітку прадрог.

Не паспелі мы нагаварыцца,
А ўжо птушкі першыя звіняць.
Заспявай і ты, мая сястрыца,
Песню надыходзячага дня!

Спаць зусім не хочацца. А росы
Наліваюцца святлом, зірні!
Я такі святочны, нецвярозы
Ад тваіх усмешак, як зарніц.

А табе няхай сабе здаецца,
Што ад свежых подыхаў лугоў,
Ад гамонкі гаю... Маё сэрца
Поўна аж да самых берагоў.

Што ж ты не спяваеш? Задрамала?
Ціха, гаю, ціха! Можа, зноў
Ёй прысніўся горад, бо нямала
Светлых думак у яе і сноў.

Вось і промень першы залаціцца,
Каб твой сон юнацкі абагрэць.
Хутка горад. Спі. А я, сястрыца,
Песеньку паціху буду пець.

*1937*

## ЗАЖЫНКІ

Зямля маладая спрасоння
Дыміцца ружовай зарой.
Пад ветрам гарачым, пад сонцам
Даспелі жыты пад гарой.

Мы крочым у хустачках белых
Туды, дзе шуміць збажына
І просіць нас голасам спелым:
«Прыходзьце хутчэй зажынаць!»

Жыты нас паклонам вітаюць,
Страсаючы кроплі расы,
Цяжкія галовы схіляюць
Да самай зямлі каласы.

Ўстрывожаны песняй узнёслай
Дрымотны спакой на палях.
Жняярка, ўздымаючы вёслы,
У хвалі жытоў паплыла.

І жыта на дол ападае,
Шуміць залатою ракой,—
Сноп першы жанчына старая
Звязала умелай рукой.

Узняла над полем шырокім
Духмяны зажынкавы сноп:
«Калгаснае шчасце, сяброўкі,
Народзіцца ў тысячах коп.

Мы слову свайму гаспадыні —
Без страты збяром ураджай!»
І песнямі маладымі
Напоўніўся сонечны край.

*1937*

## НАРАДЖЭННЕ ДНЯ

Расой, як жэмчугам, акроплены мурог,
Гарыць зары малінавая стужка.
Густы туман прыкрыў зялёны лог,
І першай песняй празвінела птушка.

Пад полагам начы прадроглі каласы
І ціха плешчуцца у рэчышчы бясконцым.
Устань, хутчэй устань і жменямі рассып
На росы буйныя праменні шчодра, сонца!

Чароўны час! Зямлі зялёны твар
Ў чаканні томіцца, як свежы хлеб, дыміцца.
Але расце і шырыцца пажар,
І промні першыя у росах сталі мыцца.

І сонца узышло! Трубі, трубі, пастух!
Склікай кароў сваім вясёлым клічам.
Травою сочнаю іх пачастуе луг,
Напоіць рэчка іх вадой крынічнай.

З кароўніка даярка рунна йдзе,
Нясе вядро з пахучым сырадоем.
Ёй, пэўна, радасна, што ў гэты ясны дзень
Каровы шмат далі удою.

Гляджу я з хваляваннем навакол —
Дзень нарадзіўся ясны, працавіты,
І славіць хочацца густое малако
І гэты лог, туманам апавіты.

*1937*

## УПЭЎНЕНАСЦЬ

Адгрукаў гром. Адгаманіла лета
На мове зор малінавых і кветак.
Там, дзе гулі пшаніцы і жыты,
Стаяць снапы, як рыжыя браты.

Б'е жарабок падковай. Поўны воз
Гатоў адплыць да вёскі. Рып калёс,
І хлебны пах зямлі, і гэты вечар —
Гавораць мне аб шчасці чалавечым.

А неба сінь глыбокая, як вочы
Маёй любімай. Я павольна крочу
Туды, дзе гай спавіў зялёны дым
І птахі звоняць на усе лады.

Хусцінка белая мільгнулася і знікла
Паміж арэшын.
Любая, чакай!
Давай з табой паслухаем, як гай
Спявае песню нам на мове звыклай.

Прысядзем да бяроз. Мы маем права:
Багаты ураджай глядзіць з паважных коп —
Усё гэта брыгады нашай справа,
Мы вырасцілі хлеб сваёй рукой.

Тваю руку да сэрца прыкладу я:
Упэўненасць і радасць б'ецца ў ім —
За нашую Радзіму маладую,
За скарб, які завём мы дарагім.

Чуваць, як дыша вераснем зара
Па ўсёй зямлі, што ў вечаровым дыме,
І добра нам маўчаць і пазіраць
На родны краі вачыма маладымі!

*1937*

* *

Я іду... Рассцілаюць дзяўчаты ільны —
Нібы гаці пракладваюць простыя.
Яны спорна працуюць — адбітак вясны
У юнацкіх прыкмеціў я постацях.

Спавіваюць дзяўчаты блакітны прастор
Звонкай песняй — дзявочымі марамі.
Гэта песня, як птушка, ляціць вышэй гор
І сябруе і з сонцам, і з хмарамі.

Я па лесе іду... Рыжых сосен сям'я
Над маёй галавой крылле звесіла.
Шоўк травы
сытым статкам калгасным прымят,—
Пастуху тут раздольна і весела.

Дык палайце блакітным агнём, верасы!
Гай зялёны надой павялічыў нам.
Сонца, ззяй весялей,
медзь праменняў рассып! —
Лес у скарб калектыўны залічаны.

Я па садзе іду — шмат пладоў залатых
Цешаць вока сузор'ямі вабнымі.
Наліліся антонаўкі сокам густым,
Абцяжарылі нізкія яблыні.

Я па вуліцы крочу. Калгаснік-сусед
Воз вязе, поўна збожжам нагружаны:
Расчыняйце вароты, гатуйце засек,
Сустракайце вясёлымі ружамі!

*1937*

* *

Каля хлопец трымаў на тугім паваду,
Чуўся кнігавак плач над ракой.
Сарамліва рабіна глядзела ў ваду,
Упрыгожыўшы завадзь сабой.

Сінім смуткам задымлены вочы яго.
Конь напоен, а ён — як заснуў.
Можа ўспомніў далёкага сябра свайго?
Можа ўспомніў юнак пра вясну?

Як злятае павольна з рабіны лісток,
У задуменні глыбокім сачыў.
Гэтым часам дзяўчына мінала масток,
Лёгка стан маладзы несучы.

Усміхалася сонцу, лістве залатой,
Што да долу прасілася з ліп;
Белым гусям, ляцеўшым удаль чарадой,
І аблокам, што ў рэчцы плылі.

Каля хлопца прайшла — хлопец нібы ажыў,
Бліснуў промень у сініх вачах.
Ён, здалося, ніколі зусім не тужыў —
Услед за ёй на кані паімчаў.

*1937*

## ЛІРЫЧНАЕ

Закацілася сонца за гай,
　　Небасхіл па-над гаем гарыць.
Я люблю гэты песенны час —
　　Ціхі час вечаровай зары.
Прамінаю узгорак. У твар
　　Хлебны вецер тугім б'е крылом.
Урачыста ўсплывае, плыве
　　Поўны месяц за дальнім сялом.
І злятаюцца зорак раі
　　Ўсё ніжэй з невядомых вышынь.
Нехта ў бубен ударыў. Гармонь
　　Заспявала у соннай цішы...
А мне сумна сягоння крыху,
　　І на сэрцы такі неспакой;
І гарачыя скроні крануў
　　Я міжвольна халоднай рукой.
Недасяжнай здаешся мне ты —
　　І абняць толькі ў марах магу.
Прыйдзе ноч, каля хаты тваёй
　　Я хаджу і гадую тугу.
Кажуць хлопцы, што быццам і ты
　　Устрывожана нечым цяпер,
Нават польку ліхую скакаць
　　Аніяк не прымусяць цябе.
Ой ты, ночка, юнацкая ноч,
　　Агарні цеплынёю мяне,
Раскажы пра каханку маю,—
　　Лёгкі сум мой, як дым, праміне.
Ды нашто сумаваць, калі б'е
　　Ў сто гарачых струменяў жыццё!
Разгараецца ў сэрцы агонь—
　　Невыказнае пачуццё...
Хутка, хутка прызнанне маё,
　　Як даспелы арэх, ападзе.
Мы з табой тады, змоўніца-ноч,
　　Прычакаем выдатных падзей.
Грукне бубен гарачы, як гром,
　　Разальюцца званочкі цымбал,

Будзе свята ў нас, і гасцей
    На вясельны запросім мы баль.
Ноч гусцее. Пагасла зара.
    Зорка срэбная ўпала ў ваду.
Я іду у сяло. За сабой
    Асцярожна каханне вяду.

*1937*

## ВІШНЯ

З табой мы тут часта хадзілі
І шмат перадумалі дум.
Цяпер мяне кліча Радзіма.
І я па граніцу іду.

Пра нашу далёкую ростань
Стрывожаны вецер пяе...
Я вішню у гонар сяброўства
Саджу каля хаты твае.

Вясной яна з кветак прыгожых
Накіне вясёлы убор.
Ты ўспомніш пра слаўныя ночы,
Калі мы сядзелі да зор.

Вятры дарагія павеюць —
Паклон прынясуць з-за гары.
А ў ліпені вішні даспеюць,
Акропяцца ў колер зары.

Будзь гордая! — Я у дазоры
З сябрамі і ноччу, і днём.
На шлемах гарэць нашы зоры
Той вішні чырвоным агнём.

*1937*

## Я УСМЕШКУ ТВАЮ ПАЗНАЮ...

Я усмешку тваю пазнаю
Па маленькіх знаёмых прыкметах,
Я усмешку тваю пазнаю
На старонцы маскоўскай газеты.

Твой партрэт мне прыпомніў той дзень...
Май. Вішнёвы пажар. Сіні ранак.
Па ваду да крыніцы ты йдзеш
Цераз луг, што у кветкі прыбраны.

А з-за бору ляціць самалёт.
Праляцеў над табой, над крыніцай.
Цябе, пэўна, заўважыў пілот,
Што табе з гэтых пор будзе сніцца.

Доўга-доўга глядзела ты ўслед
І махала хусцінкаю белай.
І зрабіўся заманлівым свет,
Ты пра лётчыка песню запела.

Ты крынічнай набрала вады
І ў вёдрах блакітных панесла
Два іскрыстыя сонцы... Тады
Нарадзілася мара, як песня,

Каб ляцець у нязведаны шлях,
За далёкія горы, за моры,
Каб круцілася ўнізе зямля,
Каб уверсе іскрыліся зоры...

Я гляджу на партрэт. Ты пілот.
Я пагутарыць хочу з табою.
Дзе ты сёння вядзеш самалёт —
Над пустыняй? Над цёмнай тайгою?

*1937*

## ВЫЯЗДЖАЛІ ЛЕСАРУБЫ

Белы снежань мяккім пухам
Апрануў палі і луг.
Пагуляла завіруха —
Пазмятала ў гурбы пух.

Хвалі дужыя падпёрлі
Лёд цяжкі. На дне ракі
Тлустыя самы замёрлі,
Сняць пра лета шчупакі...

Выязджала сінім раннем
Лесарубаў грамада.
Заспявалі песню сані,
Паімчаліся удаль.

Поле легла снежнай пусткай.
Глянь — канца няма нідзе.
Лес сцяной бяжыць насустрач
Працавітай грамадзе.

Башлыкі адзелі ёлкі
З снегу і стаяць сплючы.
Ў жоўтых кажушках вавёркі
Спрытна скачуць, як мячы.

Супакой лясны парушыў
Звон сякер. На чысты дол
Пілы гнуткія цярушаць
Пілавіння жоўты дождж.

Граюць пілы гучна-звонка,
І куды ні пазірні —
Каля зваленых сасонак
Свецяць лысінамі пні.

*1937*

## МАЦЕРЫ

Ад звонкіх песень, светлых дум,
Ад цішыні палеткаў мірных
Я зноў, засмучаны, прайду
Па сцежцы цяжкіх успамінаў.

Пра радасць хочацца спяваць,
І ўсё ж забыць не маю сілы,
Як ты чужое жыта жаць
Са мной малым калісь хадзіла.

І ад відна, і да відна
Гібела ты у полі, маці,
Каб цяжкай працаю для нас
Нішчымны полудзень прыдбаці...

Ты помніш вечар?
Небасхіл
Да рэшты спален быў зарою.
На ўзмежку села ты без сіл,
Слязу ўціраючы рукою.

Ды неслухмяная сляза
Расінкай капнула на шчаўе.
Шумела сумная лаза,
Самотна кнігаўка крычала.

Каб разагнаць сваю тугу,
Ты песню ціха заспявала.
Я гэту песню берагу —
Яна у сэрца мне запала.

Ты ў ёй жадала, каб я быў
Харобрым, статным і вучоным,
Красную дзеўчыну любіў,
Валодаў скарбам незлічоным.

Хацела, каб такім я стаў,
Ад сэрца зычыла мне шчасця,

Ды толькі ведала —
Чакаў
Мяне бізун, каб статак пасвіць...

Я вырас.
І сягоння рад
Уславіць песняю агністай
Наш ясны лёс, наш мудры лад
І светлы розум камуністаў.

Я ўсім багат! Я — гаспадар
Палёў, лясоў, лугоў і рэчак.
Я уладар высокіх мар
І добрай долі чалавечай.

*1938*

## ВЯСНОЮ

Жылы дрэў напоўніліся сокам,
Ручаі імкнуцца да ракі.
Неба стала чыстым і высокім,
І пяюць вясёлыя шпакі.

Ўсё вясна старанна падлічыла,
Сонцам абагрэла кожны кут,
Паляўнічым прынясла дзічыны,
Рыбакам расчысціла раку.

Рыбы абудзіліся з застою,
А ваўкі халодныя насы
Узнялі па воблака густое
І спрабуюць ціха галасы.

На паляне ў светлым пералеску
Расцвілі налітыя расой
Сінія падснежныя пралескі
Пад ахoвай урачыстых хвой.

Я пакінуў хату, кінуў вершы,
Блукаю па лесе, як дзівак.
Мяне кліча ў госці друг мой лепшы —
Шэры дрозд, цудоўнейшы спявак.

Пах смалісты п'ю і не нап'юся,
І пад гром птушыных галасоў
Да бярозы белай прыхінуся,—
Буду прагна піць салодкі сок.

І тады нальецца цела сілай,
Гэтай сілы радасць зберагу,
Каб яна мяне перанасіла
Праз бяду, і ворагаў касіла,
І знішчала чорную тугу.

*1938*

* *

Я пралесак блакітных сягоння парву
І вянкамі цябе прыбяру...
Узнімі з дамавіны сваю галаву,
Ты заснула зусім не ў пару.

Паглядзі — ужо сонца на ўсходзе ўстае...
Скуль прыйшоў ты, пранізлівы боль?
І ўявіць не магу я, што вочы твае
Не падораць усмешак мне больш.

Як у сне, вымаўляю тваё я імя.
Цішыня у адказ... ля акон
Дзве таполі на цыпках стаяць, не шумяць,
Бо парушыць баяцца твой сон.

У карункі прыбраўся калгасны наш сад,
Каб пацешыцца ты ім магла.
Ты ж яго даглядала, наводзіла лад,
Рада кожнаму дрэўцу была...

Як даспеюць плады на уцеху людзям,
Будзе радасці свята у нас.
Толькі я засумую і сябру аддам
Сваю поўную шклянку віна.

І у сад з патаемнай надзеяй пайду,
Буду доўга шукаць, а цябе не знайду...

*1938*

## МЕЛІЯРАТАРЫ

Усё роўна — ці Мазыр, ці Хойнікі,—
Балаты асушым тут і там,
Абы толькі вогнішча у хвойніку
Гатавала чай заўсёды нам.

Сонца будзе нашым спадарожнікам,
З сонцам працаваць і жыць лягчэй.
Астралябій тонкія трыножнікі
Не намуляць маладых плячэй.

На гнілую багну з ліхаманкаю
Пусцім стрэлы светлыя канаў,
Каб сплыла іржа балот з туманамі,
Каб палескі змрок навек сканаў.

Вечарамі, пасля працы спорнай,
Будзем торф змываць — даваць нырца
І на вогнішчы пад небам зорным
Будзем смажыць сала на дубцах.

Пра дзяўчат пагутарым і песняй
Патрывожым душны сон імшар.
Вылечым зямлю сваю ад плесні
І Радзіме прынясем у дар.

«Не дарэмна хлеб ядзім мы,— скажам ёй,—
Уладанні новыя прымай.
Яблынямі, вішнямі засаджвай,
Залатой пшаніцай засявай».

*1938*

## ТУГА

Я ступіў на дарогу вясны,
　　Прывітаўся з зялёнай вярбой.
Лугавыя вятры мае грудзі
　　Напоўнілі сілаю свежай.

За парогам зіма і нуда,
　　За парогам раздум'е і боль,
Неспакойныя сны уначы,
　　Пра каханне нясмелыя вершы.

Завіруха чарэмшын мяне
　　Захапіла у белы палон,
А у садзе ад бліскавіц
　　Разгарэлася полымя бэзу...

Гэта ты, дарагая, мяне
　　Ўчора клікала за сяло
Слухаць гутарку зорак і траў,
　　Слухаць шолах дрымотнага лесу?
Не, то, пэўна, не ты...

Ля гумна
　　Зажурылася вішня ў цішы
І чакае кагосьці,
　　Свой твар
Захінуўшы пуховай хусцінай.

Сумаваць я, сябры, не прывык,
　　А сягоння на сэрцы ляжыць
І ніяк не праходзіць туга
　　　Па маленькай чарнявай дзяўчыне.

Як жа здарыцца гэта магло?
　　　Як магла ты мяне не пазваць?
Не іначай, табе пра мяне
　　　У сяле наплялі маладзіцы.

Абыду ўсе палі і лясы —
　　　Я павінен цябе адшукаць.
У завеях пялёсткаў блакітных
　　　Няцяжка цяпер заблудзіцца.

*1938*

## МАЙСКІ РАНАК

Край неба наліўся зарою; і сонца устала,
Агнём прамяністым палі і лясы прывітала.

Нахлынуў на кветкі, на травы,
на яблыні макавы ранак.
Ніколі не бачыў зямлю я
прыгожай такой і прыбранай.

Прастор лашчыў вока красой
непаўторнай і свежай,
І кожная кветка малая мяне надзяляла усмешкай.

А людзі змянілі аблічча. Дзяды спамянулі
юнацтва.
Пачуліся жарты, і стала ў нас спорыцца праца.

Мы бёрны часалі, распраўіўшы дужыя плечы.
Спявалі сякеры аб сіле рукі чалавечай.

Брыгадаю дружнай мы новы амбар будавалі:
Для жыта, пшаніцы амбараў старых стала мала...

Пад ранішнім сонцам калгас жыў сям'ёю адзінай,
І радасны ранак быў ранкам шчаслівай Радзімы.

*1938*

## У НАВАЛЬНІЦУ

Перуны грукаталі ў прасторы пустым,
Прыгіналіся долу кусты,
І у цёмным прадонні набухшых крыніц
Гаслі водсвіты бліскавіц.

Мы стаялі ўдваіх, і тугая каса
Ненарокам кранула мой твар,
І тады я адважыўся і расказаў
Пра сардэчны, як кажуць, пажар.

Ты ж глядзела на клён, што на вуліцы мок,
Быццам бачыла першы раз.
Я адказу твайго дачакацца не мог,—
І агеньчык надзеі пагас.

Вось і схлынулі хмары, і дождж пераціх,
Чуцен кропель буйных перазвон.
Асцярожна трымаў на далонях тугіх
Серабрыстае зарыва клён.

Я з трывогай аб нечым цябе запытаў,
Ты хутчэй заспяшыла дамоў:
«Я нічога не чула, бо гром грукатаў,
Іншым разам раскажаш ізноў».

*1938*

## ПАДСОЧКА

Ствалы набраклі, вось, здаецца, пырснуць.
Плыве над верасам хваёвы душны пах.
Гаркавы смак жывіцы на губах,
І сонца спелае над галавой навісла.

Дыміцца жоўты мох, птушыны спеў замоўк,
І млеюць яшчаркі зялёныя ад смагі...
Я цэлы дзень блукаў, стаміўся і знямог,
Прысеў і прагна п'ю ваду з паходнай флягі.

У гэты час пачуў я сосен плач:
«Мы захлынаемся густой смалой, ратуйце!
Прарэжце скуру нам, няхай сцякае тук наш
На чэрствую зямлю, каб папараць расла».

І з бліжніх сёл падсочніцы прыйшлі,
Разцы сталёвыя у рукі ўзялі смела,
Навостраным лязом надрэзалі умела
Кару і луб і стрэлкі правялі.

І капнула празрыстая смала
Ў бляшаны коўш, і па зямлі, паволі,
Кавалачкам крыштальнай каніфолі
Да скрыпача у рукі прыплыла.

І можа заўтра малады скрыпач
Мелодыяй узрушыць сэрцаў сотні...
А мне прыпомніцца вясёлы смех падсочніц
І баравых сасонак ціхі плач.

*1938*

## АДКОПАНЫЯ ЗАРНІЦЫ

Тры тысячы гадоў зарніцы падалі
У возера, на мяккі чорны іл.
І лотаць адцвітала, і без сіл
Тапілася, каб стаць для рыб прынадаю.

Праходзіў час. Палеглі ў багну гразкую
Стагоддзяў парыжэлыя пласты.
На купінах туман асеў густы,
І возера дзяды зрабілі казкаю.

Пачула моладзь — і ўзяла рыдлёўкі,
Каб адшукаць зарніцы ў іле глёўкім
І ажывіць дыханне траў і рыб.
Тры месяцы капалі дол напорна —
І расцвілі агні над торфам чорным,
І паплылі па дроце да сяліб.

*1938*

## МОРА

Я рукой мімалётную хвалю крануў —
І ты, мора, мне стала
і родным, і блізкім.
У тваю глыбіню,
нібы ў пройдзены шлях,
зазірнуў —
І дзяцінства ўсплыло,
рассыпаючы звонкія пырскі.
На сустрэчу ка мне
ты зялёныя гоніш валы,
А на схіле прыбою —
да болю палюблены ветразь...
Прыгадаў я гады,
калі быў піянерам малым,
Калі з кнігай Жуль Верна
сядзеў я
над рэчкаю светлай.
Сабіраў дружбакоў.
Мы скрозь шторм
прабіваліся ў порт.
(Невялічкая рэчка,
за ёй — непраходны маліннік.)
Гром над намі расстрэльваў
хмары густыя ва ўпор
І чаўны-караблі
адбівалі вясновыя ліўні.
Нас гукала наперад
шчаслівая зорка прыгод.
Мы не зналіся з горам —
з нас кожны і весел, і
дуж быў.
Над агнём медуніц,
над спакоем нясоланых вод
Нарадзілася наша
юнацкая дружба.
Дні прайшлі...
прада мною
сапраўднае мора грыміць.

Ну, а я — ўсё такі ж
неспакойны дзівак-летуценнік.
Мора — радасць мая,
мора — песенны мой успамін,
Я іду да цябе,
каб нырнуць у салёпую пену.

*1938*

## РОСТАНЬ

Над намі высокая зорка
Блакітным агнём гарыць,
Спавіт цішынёю і змрокам
Вячэрняй зямлі прасцяг.
Не трэба, мая любімая,
Дакоры сябрам дарыць;
І ад сяброў не трэба
Патрабаваць прысяг.

З табою жылі мы дружна
На гэтых шырокіх палях.
Магчыма, рабіў я памылкі —
Ты сёння мне іх даруй.
Давай развітаемся цёпла —
Я еду ў далёкі шлях,
На нейкай пязнанай дарозе
Спаткаю заўтра зару.

З табою была мне праца
Лягчэйшай і весялейшай,
Мы шмат для калгаса зрабілі
Немалаважных спраў.
Няхай я парой дзівачыў...
Дык ведай — каханнем першым
І шчырым, і непаўторным
Цябе я, сяброўка, кахаў.

Я стану танкістам спраўным,
Ты будзеш заворваць гоні...
Б'е ростані сумнай хвіліна.
Адно я цябе прашу:

Убачыш вячэрнюю зорку —
Успомні, пра ўсё ўспомні
І думай, што я гэтым часам
Пісьмо да цябе пішу.

*1938*

## ПАГРАНІЧЧА

У бары густым настоен
Пах смалісты.
Падаслан падногі хвоям
Мох пушысты.
Цішынёй ад пагранічча
Павявае.
Каля лесу б'е крынічка,
Срэбрам ззяе
Ды каменьчыкам на ўцеху
Воды гоніць.
Тут мядзяныя арэхі
Ціха звоняць.
Цішыня. Каліна спее
Ды брусніцы
Даспяваюць, чырванеюць,
Як зарніцы...
Толькі вы, сябры, не верце
Супакою,
Бо заходні пахне вецер
Чадам боек.
Шмат паўзе шпіёнаў хцівых,
Дыверсантаў,
Каб забрудзіць нашы нівы,
Ўлезці ў сад наш,
Каб крывавымі рукамі
Шчасце знішчыць,
Каб дымілі пад вятрамі
Папялішчы...
Наш адказ панам рашучы:
Лепш не лезьце!
Не для вас гамоняць пушчы
На Палессі,
Не для вас пасуцца коні
Табунамі,
Не для вас красуюць гоні
Ячмянямі!
Мы не спім. Байцоў дазоры
Край вартуюць.
Ў пагранічча нават зоры

Злыдняў чуюць.
Не хваліся, пан разведчык,
Хітрым спрытам.
Будзе след чужы прыкмечан,
Будзеш біты.
Не прыкрыешся імглою,
Цемрай ночы.
Пагранічнікі-героі
Пільна сочаць.
Ты не знойдзеш, дзе падзецца,
Захавацца.
Шлях байцам пакажуць дзеці,
Бацька, маці.
Мы цябе акружым, зловім,
Нібы воўка.
І пад позіркам вінтовак
Ты замоўкнеш.
Шлях табе перагародзіць
Кожны кусцік.
Да палёў краіны роднай
Не прапусцім!

*1938*

## ЗВАРОТ БАЙЦА

Я зноў адчуў
Вясёлы пах палёў,
Спеў жаўранкаў
І шэлест тапалёў.

Не бачыў два гады
Цябе, мой край.
Дзень добры, рэчанька!
Прывет, шумлівы гай!

Мяне вітае ветла
Кожны ліст:
«Здароў, здароў,
Таварыш трактарыст!»

Журчыць між лоз
Крынічная вада:
«Даўно чамусь
Цябе тут не відаць.

Не поіш больш
Сталёвага каня,
З каханаю
Тут не сядзіш да дня.

Яна адна
Смуткуе над вадой,
Зязюлю слухае
І шэпча: «Любы мой!»

Адкуль і ці надоўга? —
Раскажы!»
Я, рэчанька,
У арміі служыў.

У чыстым полі
Грозны танк вадзіў,
Быў задаволен
Мною камандзір...

Пакуль спакойна
Зоры ў нас гарацць,
Палі ў калгасах
Зноў буду араць.

Тваёй вадой
Паіць буду каня,
З каханаю
Гулянць буду да дня.

*1938*

## ВОСЕНЬ

Сляды гарачыні
Яшчэ на тварах носім,
Ды паплылі ўжо дні
У залатую восень.

Самотны крык гусей
Даносіцца з-пад воблак.
Ў асмужанай красе
Твой бачу, восень, воблік.

Зямлі не адагрэць
Агнём ліствы апошняй,
І ветру песні пецъ
Над парыжэлай пожняй.

У хмарах далячынь,
Прасцяг дажджамі повен.
Не плавае ўначы
Маладзіковы човен.

Ды сціхне спеў вятроў,
Надвор'е праясніцца,—
Зямлі вільготнай зноў
Вясновы час прысніцца.

Блакіт нябёс тады
Празрысты, нібы ў маі.
Асеннія сады,
Як вогнішча, палаюць.

*1938*

* *

Плыў грукат па каналах вузкіх вуліц,
А сіверы паўночныя два дні
І дзве начы са злосцю дзікай дзьмулі
На яркія асеннія агні.

Лісты каціліся, як абручы, па бруку.
Распрануты каштан хістаў паркан,
Каб з саду выбегчы.
А вецер злосна грукаў,
Свістаў, нібы разбойны атаман.

Яшчэ апошні ліст да тратуара
Не дакрануўся, а чырвоны дах
Расправіў крылле, як вялізны птах,
І прагнуў узляцець насустрач хмарам.

А потым цішыня. За ёй — зіма і радасць.
Абрысы камяніц прапалі, як у сне...
А незвод на горад падаў, падаў,—
І твар гарачы мой крануў пушысты снег.

*1938*

## СУСЕДКІ

Калі бусел ляцеў
Палявацць да імшары купчастай,
Выганялі суседкі
Рупліва жывёлу на пасту.

А пасля каля студні
Размову вялі з паўгадзіны
Пра дачку дарагую
Ды пра слаўнага сына.

І выходзіла так,
Што дачка удалася у матку:
Працадзён адхапіла —
Аж мала у табелі месца;

Быццам сорак сватоў
Грукацяць у дзяўчыніну хатку,
Быццам сто жаніхоў
Сохнуць-вянуць па гэткай нявесце.

І выходзіла так,
Што хлапец залатыя меў рукі,
І разумны, і спрытны,—
Такіх пашукай і не знойдзеш.

Думкі добрых суседак
Плылі у вядомым кірунку,
І шапталі бярозы
Аб нейкай дасягнутай згодзе.

А як восень шляхі
Замасціла залочаным лістам
І пастух песню выпіў
З трубы берасцянай да рэшты,

Падышлі цягнікі,
Цягнікі загулі галасіста
І па розных шляхах
Павязлі жаніха і нявесту...

Вось і снежань.
Вятры
Табуны белагрывыя гоняць
Па бяскрайніх прасторах
Сцюдзёных палёў і аселіц,

На гасцінцы бярозы
Галінамі мёрзлымі звоняць,
А суседкам здаецца —
Чакапае едзе вяселле.

*1938*

## ЗАЎТРА

Мы любім жыць. Мы радасцю багаты.
Мы ў песнях славім кветкі і дзяўчат.
Але сягоння хаї у нашых хатах
Трывожным клічам песні загучаць.

Расце над светам цень вайны злачыннай,
Каб знішчыць дзень і зор святло зацьміць.
Вы чуеце — іспанскія жанчыны
Галосяць над забітымі дзяцьмі.

Крывавы зброд руйнуе брудным ботам
Хаціны мірныя, дзе люд вясёлы жыў.
Усходзяць замест сонечных гаёў там
Маўклівыя журботныя крыжы...

Я знаю — прыйдзе дзень, спавіты дымам;
Вайна даліны, горы скалане.
Штыкамі ашчацініцца Радзіма,
На фронт пакліча з сябрамі мяне.

На ростані заплача, пэўна, маці
Ды скажа ўсё ж: «Ідзі, ідзі, мой сын!»
З наказам матчыным пакрочу я змагацца
За родныя палеткі і лясы.

Як навальніцай, сілай шматмільённай
Змяцём забойцаў племя мы з зямлі.
І веру я — узніме сцяг чырвоны
На пераможным досвітку Берлін.

*1938*

## АПОШНІ ХУТАРАНІН

I

Вечар поле цемраю ахутае,
Цьмяны месяц прыплыве здалёк.
Загарыцца на маўклівым хутары
Ледзь прыкметнай зоркай аганёк.

Птушаняты спяць пад крыллем матчыным,
І вавёркі ў дуплах моцна спяць.
Голлямі хістаючы калматымі,
Хвоі старажытныя рыпяць.

Глуш начы разлеглася шматвёрстая,
Не чуваць гамонкі анідзе.
Што трымае на панурым востраве
Гэтых адасобленых людзей?

Тут няма з кім нават і пагутарыць,
Цішыня усюды, як дакор...
Адзінока жыў на дальнім хутары
З жонкай і дачкой Кажан Рыгор.

Чуў увосень ён выццё ваўчынае,
А вясной — паводак срэбны звон.
Ляжа спаць, укрыецца аўчынаю,—
Ад самотных дум знікае сон.

А на куце за гарбатай прасніцай
Маці круціць нудны калаўрот.
У сяле даўно ужо калгасніцы
Гэтакіх не ведаюць турбот.

І дачцы не спіцца летняй ночкаю,
У дачкі па сэрцы неспакой.
Выйдзе, паглядзіць у далеч змрочную,
Ногі золкай апячэ расой.

Стане пад асіну каля весніцаў,
Сумна думку думае сваю...
У сяле, за поплавам, равесніцы
Прыпеўкі вясёлыя пяюць.

А яна адна стаіць і тужыць.
І над соннай цішынёй двара
Асыпаецца ў шкляныя лужы
З неба зорак рубіновы град.

2

З сэрца крыўду выплеснуць і рад бы,
А каму паскардзішся, каму?
Досвіткам устаў, навосчыў дратвы,
Каб паправіць лаплены хамут.

Ды нішто не цешыць болей вока,
Неспакой цяжкі навіс над ім.
У юнацтве казачна-далёкім
Уяўляў ты шчасце не такім.

Ходзячы за быдлам па імшарах,
Гора запіваючы вадой,
Гадаваў пра будучыню мару,
Мару, незнаёмую з бядой.

...Сытыя стаеннікі імчацца,
Ад язды ўгінаецца зямля.
Кожны рад з табою павітацца,
У пашане, ў гонары сям'я.

Новая, са смолкіх бёрнаў хата,
Ў хаце пах пшанічных пірагоў...
І цякла малочная рака там
Між густых кісельных берагоў.

Дзе ж вы загубіліся, прапалі,
Душныя уласніцкія сны?
Дні прайшлі. На галаву апалі
Замаразкі першай сівізны.

Сківіцы сашчэплены да болю...
Як жа ў сэрцы крыўды не таіць?
Нават лава на нагах дубовых
Неяк неўпэўнена стаіць.

Людзі багацеюць, ездзяць ў госці,
Разам косяць, разам рубяць зруб...
Мо таму і ныюць глуха косці,
Мо таму і хутар стаў не люб.

3

Агорнуты прастор світаннем сінім,
Ў туманным моры плаваюць кусты.
Насустрач дню азяблыя асіны
Працягваюць вільготныя лісты.

І дрэў і хат акрэслены абрысы
Нябачнаю рукою разьбяра.
Вось першы промень над зямлёю
бліснуў —
І іскраў у расе не пазбіраць.

З палёў шырокіх вецярок прыносіць
Крыштальны звон даспелага калосся.
У гэты час палетак зажынаць
Прыйшла сям'я Рыгора Кажана.

І жыта расступілася ў бакі —
Сярпы плывуць, нібы маладзікі...
А з-за гары ў паход ідуць брыгады,
Пра колас наліўны пяюць дзяўчаты.

— Дзень добры вам!
— Хай спорыцца ў вас праца!
— Мо грамадой крыху дапамагчы?
Ад моладзі няма куды схавацца —
Звычайны жарт, а крыўдна нейк гучыць.

Прайшлі...
І разагнуў спіну Рыгор.
У гневе вочы цёмныя яго.
Узрушана шаптаў ён: «Не аддам!
Мая зямля — і я тут уладар.

Мая мяжа. Я — бог тут і закон».
І ногі, нібы клешні, у загон
Ўпіліся.
А з калгаснае зямлі
Цяжкія хвалі каласоў плылі.
Здавалася, палоску і Рыгора
Залье, затопіць аржаное мора.

4

Ён выедзе досвіткам сінім
Араць свой загон на зары.
«Давай узару за хвіліну!» —
Крычыць малады трактарыст.

Ён крочыць у горад. Мінае
З мядзянымі соснамі бор.
А шофер калгасны гукае:
«Сядай на машыну, Рыгор!»

Сябры да Рыгора на хутар
Прыходзілі, быццам сваты;
За чаркай спрачаліся люта
І звалі яго ў калектыў.

А ён наглядаў за калгасам
Праз краты сваіх азярод,
Чагосьці чакаў... А тым часам
Да шчасця прыходзіў народ.

Ён слухаў, як ранкам задумным
У полі камбайны гулі.
Бясконцым патокам у гумны
Снапы залатыя плылі...

Душа па сябрах сумавала —
Пайшоў бы да ўсіх і рабіў,
Ды зноўку раздум'е спыняла:
«А дзе ж ты,— спытаюцца,— быў,

Як мы асушалі балота
Па пахі ў сцюдзёнай вадзе,
Як прыгаршні ўмалоту
Вырошчвалі на бядзе?»

Ад думак цяжкіх, ад турботаў
Ішоў ён на поплаў ці ў бор.
Цяжкія Рыгоравы боты
Тапталі пажоўклы чабор.

5

У рацэ і над ракою
Дрэмлюць лозы ў супакоі.
Пад лазою дзед Анісім
Трапяткім цяньком прыкрыўся.

Загарэлы, сівабровы
Наш заслужаны пастух.
Побач з ім — яго каровы,
Навакол — ягоны луг.

Па раёну ходзіць слава,
Што Анісім — мудры дзед.
З-за паўсвета з важкай справай
Да яго кажыны йдзе.

І Рыгор наш незнарок
Заглянуў у гэты бок.
— Добры дзень!
— Здароў, Рыгорка!
— Усё ходзіш?
— Так. Хаджу.
— Зачастуй маёй махоркі,
Пэўна, ёю дагаджу...

— Дзед Анісім, дай параду,
Праўду шчырую скажы.
Не дайду ў жыцці да ладу...
Што рабіць мне?
Як мне жыць!

— Быў і я калісьці гэткім...
Меркаваў на сто ладоў,
Каб з нішчымнага палетка
Зерня выманіць для дзетак
Лішніх некалькі пудоў.
Працаваў, як чорны вол,—
Гол застаўся, як сакол.
Пасівеў ад дум тужлівых.
Думаў —
гора не міне...

Дзякуй людзям тым,
Хто вывеў
На прасторны шлях мяне.

Больш туга не смокча грудзі,
Дажываю ў шчасці век.
Чуюць людзі, бачаць людзі,
Што Анісім — чалавек.
Ты, брат, хмурны не хадзі,
Праўдзе ў вочы паглядзі...
У рацэ і над ракою
Шаснуў вецер неспакойны.
Ад сяброўскае махоркі
Горкім лозам стала горка.

6

Дзень пагас за сялом,
Паплавы ахінула змярканне.
Гусі шэрыя крык узнялі
Над ракой ля прыціхлай вярбы.
І вярталіся з пашы
Каровы з лагодным рыканнем
Пад вячэрнюю песню
Берасцянай трубы.

А на сходзе калгасным
Рыгора нібыта чакалі —
Колькі чулай спагады!
Ён знаёмых людзей не пазнаў.
Ён глядзеў на сяброў,
І настойліва вочы пыталі:
«Чалавек, адчаго ты
Упэўненым гэтакім стаў?»

І з'явіліся самі
На вуснах патрэбныя словы:
«Хачу радасць і гора
Я з вамі сумесна дзяліць...»
Так апошнім прыйшоў ён
Да праўды дарогай суровай,
Каб свой шлях дапісаць
На старонках калгаснай зямлі.

7

Ўзабраліся на калёсы
І кубел, і стол, і дзяжа...
З вачэй маці выцерла слёзы,
А што ў іх — ці радасць, ці жаль?

І рушыўся скарб небагаты
Ў сяло між зялёных прысад.
Там вырасце новая хата
Суседкаю добрай між хат.

Вазы адскрыпелі ў нізіне,
І стаў аглушальны спакой.
Хацела ўслед бегчы асіна,
Ды толькі махнула рукой.

Звініць наліўная пагода,
Цвітуць верасы у бары.
Рыгору былога не шкода,
Навекі парвана з старым.

Вавёрак спалохаўшы гудам,
Пад сцягам вясновай зары,
На гэты закрэслены хутар
Прыйдуць працаваць трактары.

Па пояс тут вырасце грэчка
І мёдам запахнуць палі.
Аб радасных днях чалавечых
Сыграюць на дудках чмялі.

*1938*

## СЭРЦА

Маё малое сэрца абмывае
Крывёй гарачай мужныя пачуцці
Нянавісці пякучай і любві.
Нянавісці, што думкі праясняе,
Стаіць на варце чыстай маладосці
І, ўбачыўшы пагляд вачэй хлуслівых,
Трывожным звонам голас падае.
І чым мацней расце мая нянавісць,
Тым гарачэйшай робіцца любоў.
Хаджу я з ёю па лугах і пушчах,
Гляджу на ўсё у радасным здзіўленні —
Як ластаўка гняздо старанна лепіць
І як шчупак ў затоне ломіць аер,
Як дзед-садоўнік беліць ногі вішням
І песню пра Купаліньку пяе;
Як вечарамі зоры паміраюць,
Каб нарадзіцца на світанні зноў.
Шматфарбны свет
ў мае ўваходзіць знічкі,
Каб акунуцца у крыніцу сэрца
І песняй непаўторнай празвінець.

*1939*

## ЮНАК

Ты — юнак. Навакол
Свет, як песня, прыгожы, прывабны.
Ападае на дол
Майскі пух зацвітаючых яблынь.

Добра ў садзе хадзіць,
Сустракаючы сонечны ранак,
Чулым сэрцам лавіць
Звонкі голас дзявочых вяснянак.

У маланкавы дзень
Хмара кідае медныя коп'і
І грымяць на вадзе
Гулкім выбухам першыя кроплі.

Ты вясёлы ідзеш
Пасля ліўня да шоўкавых руняў,
Што ні кветка — то верш,
А дзяўчаты усе — прыгажуні.

Травы гнуцца ад рос.
І ты бачыш, як макі на градах
Узнялі да нябёс
Каснікі каляровыя радуг.

Ты жадаеш хутчэй
Паляцець у блакіт і дастаць іх
І каханцы сваёй
Падарыць на вясельнае плацце.

*1939*

## АД'ЕЗД МАЛАДОЙ

Бубны! Бубны!
Грукачыце, бубны!
Расступайцеся, дзяўчаты,
Расступайцеся, дзяды!
У шаўровых чаравіках,
У адзенні шлюбным
Пад руку вядзе нявесту малады.
Запявайце, маладзіцы,
Дружна!
Рассыпайце, маладзіцы,
Ружы!
Расчыняйце ўсе вароты
Насцеж!
Пажадайце на дарогу
Шчасця!
Дугі ў красках,
Ў стужках коні.
Шоры бразгаюць
І звоняць.
«Ну, дачушка,— бацька кажа,—
У шчаслівы пуць!
Не саром сямейку нашу,
Добрай жонкай будзь».
Маці ж той не да гаворкі,—
На расстанні плача горка.
А падружкі раззлаваліся:
«Ты, Марылька, здрадніца.
Лепш бы ты не мілавалася
З Міхасём да раніцы».
«Мы ж,— клянуцца,— самі
Век не выйдзем замуж».
— Но, пайшлі, стаенпікі!
— Бывайце здаровы!
Ля варот — затор.
Хлопцы сталі ў рад суровы —
Непраходны бор.
«Гэй, жаніх, гані нам выкуп
І багаты і вялікі
За кужэльныя косы,

За блакітныя вочы,
За вішнёвыя вусны!»
І паехалі удалеч каля рэчкі, каля лоз.
Нашу слаўную дзяўчыну брыгадзір суседні звёз.
А на вуліцы, на вуліцы — ігрышча ў поўны ход.
Звоняць бубны, рэжа скрыпка,
Весяліцца наш народ.
Чутны жарты, піск і рогат. Нехта песеньку вядзе:
«Упілася ж я, ўпілася... Хто дадому давядзе?»

*1939*

## АСЕННІМ ДНЁМ

Пакуль па скверы выплачуцца вербы,
Мне не пазбегнуць адзіноты шэрай.
Не скрыпнуць перад госцем ветла дзверы,
У хаце —
Я і белы ліст паперы.

Не параднюся з восеньскім настроем.
Аловак мой знайшоў з самоты выйсце —
Папера прарасла густой травою,
Прысады выраслі,
Зашалясцела лісце.

І павяла мяне удаль дарога,
Да краю роднага,
Да гаю дарагога.
Вячэрняя задумная хвіліна...
Расплёскан на бярозах і хваінах

Барвовы лівень жнівеньскай зары,
І песня чутна —
«А ў бары, бары...»
Ідуць дзяўчаты з ягадамі з гаю.
І раптам чую —
Хтось мяне гукае.

Вось падышлі і весела жартуюць:
— Ты што? Палі ад вераб'ёў вартуеш?
— Чаго ты хмурышся у гэткі дзень харошы?
— А... здагадалася,
Згубіў, напэўна, грошы.

А я маўчу і думаю — якая ж
Мяне гукала?
Як тут адшукаеш?

Адна дзяўчына у ружовай хусце
Званчэй за ўсіх жартуе і смяецца.
Злавацца б трэба, толькі вось чамусьці
Так радасна, так моцна сэрца б'ецца...

Пайшлі дзяўчаты пожняю да вёскі,
Пагаслі ў росах
Песень адгалоскі.

І я паўшоў назад
У дзень дажджлівы
Паміж густых аўсоў, лясоў яловых...
Дзяўчынка тая
З фотакарткі кпліва
Глядзіць па мой паломаны аловак.

*1939*

## ВЫЗВАЛЕНАМУ БРАТУ

Не трубіў на зары гарніст,
Не грымела аркестраў медзь.
Праз асенняга ветру свіст
Наляцела на панства смерць.

Помняць Нёман, Дзвіна і Буг
Нашых танкаў пагрозны гуд.
Ты пазбыўся навекі, друг,
Белапанскіх іржавых пут.

Гнеўны шквал па зямлі прайшоў
І развеяў туман тугі.
Старажытныя замкі князёў
Асвяцілі нашы сцягі.

Не забыць мне, як неслі хлеб-соль
Нам на вышытых ручніках,
Як дзяўчаты з навакольных сёл
Кветкі сеялі па шляхах.

Расступаліся дрэвы з дарог,
Ліхаманкава біў кулямёт...
Слава тым, хто пад Вільняй лёг,
Слава тым, хто пад Гродняй лёг
За цябе, беларускі народ!

Вольны брат, засявай палі,
Насыпай буйным зернем засек!
Мы прагналі з тваёй зямлі
Каўтуновае гора навек.

*1939*

## ПАРАБАК

З маленства выпаў лёс пагаиы —
З бядою еў, з бядою спаў.
Служыў ён парабкам у пана,
Крывёй разоры паліваў.

У хаце дымная лучына
Свет закрывала ад вачэй.
І гора рэбры падлічыла
Ў яго замучаных дзяцей.

А з-за мяжы, з палёў калгасных,
Прыносіў вецер спеў дзяўчат.
І сказ аб братняй долі шчаснай
Цішком хадзіў ад хат да хат.

І парабак не сцерпеў:— Годзе
Для ўцехі панскай карак гнуць!
Няхай для нас палеткі родзяць,
Няхай для нас сады цвітуць!

Народ паўстаў. І на падмогу
Прыйшлі усходнія браты,
Каб радасную перамогу
Сустрэць пад сонцам залатым.

*1939*

## БЕЛАВЕЖА

Хвоі высяцца, нібы вежы,
Над пажоўклым імхом палян.
Старажытная Белавежа —
Усхвалёваны акіян.

Дуб вячысты ў галлі кашлатым
Успамін аб мінулым збярог...
Прыязджалі сюды магнаты,
Паляўнічы трубіў у рог.

На сухі, парыжэлы верас
Пырскаў пенай крывавай дзік.
І паны паміналі звера,
Узнімаючы рогат і крык.

Мы сказалі магнатам:— Хопіць
Сыта бавіцца! — І павёў
Нашу роту сялянскі хлопец
Па заблытанай сцежцы ласёў.

Нас чакаў тут за кожнай купінай
Куль варожых смяротны рой.
Ваша воля, браты мае, куплена
Дарагою цаной — крывёй...

Белавежа, ты век не састарышся:
Надышлі маладыя дні.
Пра геройства маіх таварышаў
Хвойнай песняю празвіні!

*1939*

## ЖАБРАКІ

Гэта страшная праўда, не сон —
Ля касцёла сядзяць жабракі.
Скупа сыпле журботны звон
На далоні калек медзякі.

Тут ідуць пешаходы шпарчэй,
Каб не бачыць гаротніцкіх слёз.
Пазірае з галодных вачэй
Майго дзеда пахованы лёс.

Вось пяе аднапогі жаўнер,
Пасінелы ад сцюжы, худы.
А калісьці пад шэлестам верб
Быў ён дужы і малады.

Дзе ж паны, што кляліся дарамі
Пагасіць твой боль, чалавек?
За якімі марамі, гарамі
Насягнуць іх праклёны калек?

Мне не будзе спакойна спацца,
Я не выпушчу стрэльбы з рукі,
Пакуль ёсць паны у палацах,
Пакуль ёсць па зямлі жабракі.

*1939*

## ЖУРАВЫ

Ты чуеш, дружа мой, як плачуць журавы
Над зарывам асенніх журавін?

Зіма сцюдзёная іх гоніць з цёплых хатак,
Ад родных ніў, ад ціхае ракі.
Праз вір вятроў,
Праз лютасць хваль касматых
Ляжыць іх шлях, далёкі і цяжкі.

Шкада мне іх — не вернуцца яны:
На поўдні лютуе крывавы бог вайны.
Там гнёзды спалены,
Там птушаняты знішчаны,
Смяротны дым плыве над папялішчамі.

Пад залатымі сонечнымі промнямі
Не хочацца і птушкам паміраць,
І будуць доўга галасамі сумнымі
Радзіму жураўліную гукаць.

*1939*

## КАЧУЛКІ

Пасярэдзіне зялёнай вулкі
Мы ганялі пекалі качулкі.

З ціхіх ліп зара на дол сцякае.
Чуцен воклiч: «Хлопцы, пераймай!»
І качулка, круглая, цяжкая,
З гулам пралятае з краю ў край.

Напярэймы забягаеш з дошкай,
Курыцца з-пад пятаў пыл і дым.
Маці ў жаху закрываюць вочы,
«Шыбенікі!» — лаюцца дзяды.

Хай яны, старыя, як паданні,
Ад маркоты крыху пагрымяць.
А у нас цяпер адно жаданне:
Толькі б не прамазаць, затрымаць.

Дні прайшлі. Забрукавана вулка.
І ад нас няведама куды
Тая закацілася качулка,
Захапіўшы росныя гады.

Мне прыпомніў даўнюю забаву
Воклiч: «Напярэймы забягай!»
Акружылі мы прымежны гай,
Пачалі на ворагаў аблаву.

Дрэвы сталі дужымі радамі,
Вецярок трывожна шалясціць.
І гарыць душа адным жаданнем:
Толькі б пераняць, не прапусціць.

*1940*

## У РОДНЫХ МЕСЦАХ

Бразгату трамвайнага не чую.
Адпачынак. Скончан доўгі шлях.
У гумне на сене заначую,
Цэлы месяц буду у гасцях.

Маці з шафы дастае настольнік
Самы лепшы, сэрцу дарагі.
Пад гарой аладак гнецца столік,
І смятаны — аж па берагі.

Я ніколі так не еў са смакам,
А матуля крыўдзіцца: «Зусім
Ты маіх аладак не ясі».
І гатова, любая, заплакаць.

Хлебны квас каштую з поўнай дзежкі
І у лес іду знаёмай сцежкай.
На мяне глядзіць хваёвы край
З хітраю усмешкай: «Пазнавай!»

Як жа не пазнаць!
Слядоў маленства
Дождж не змыў,
Вятры не замялі.
Мы не раз у гэтым самым лесе
Набіралі набіркі малін.

Як даўней, звініць на клёнах лісце
І дзятлы малоцяць, як калісьці.
Толькі ельнік, што намок ад рос,
Я за восем летаў перарос.

Сабяру сюды сягоння хлопцаў
Тых, з кім бульбу пёк асеннім днём.
Раскладзём агонь мы тут з ядлоўцу
І маленства песняй памянём.

*1940*

## ПА ЗАРЫ

Я устаў на зары.
Цьмяна росы блішчэлі на мяце,
Туманы адплывалі,
Радзелі
І падалі ніц...
Вось такою парой
Пачынаю заўжды хвалявацца,
Мне здаецца — прастор
Набракае агнём навальніц.

Я люблю гэты час!
У цішы нараджаюцца промні,
І ўспаміны былога
Прыходзяць са светлай зарой.
Пагляджу на усход
І маленства свайго дні успомню,—
І вайну,
І пажар,
І знясілены край родны мой.

...Мы не спалі ўсю ноч.
Адыходзілі белапалякі.
Глуха грукалі далі,
Рагатала у цемры сава...
Хтосьці бога маліў,
Хтось працяжна і роспачна плакаў,
Хтось прытулку шукаў,
Дзе б свой скарб пагарэльца схаваць.

Я тады быў малы,
Я не ведаў няпавісці сілу...
Людзі ў змрок пасылалі
Праклёны на банду звяруг.
Цемра помстай набракла
І гнеўныя крыкі насіла.
Мы не спалі ўсю ноч,
Мы з надзеяй чакалі зару.

І калі першы промень
Прабіў цёмнай ночы завесу,
Хлынуў свет малады
На астанкі абвугленых хат,—
К нам імчаўся галопам,
Пад сцягам чырвоным, з-за лесу,
Загартаваны ў бітвах
Будзёнаўцаў мужных атрад.

Мы глядзелі на ўсход —
Сонца яркае ззяла на піках.
Дзень шчаслівы радзіўся
Над спаленым нашым сялом.
І спявалі таполі
Аб радасці нашай вялікай.
Камандзір баявы
Ўзяў мяне да сябе у сядло.

Пад яго гімнасцёркай,
Апаленай сонцам і ветрам,
Гулка білася сэрца
Ў струменях гарачай крыві.
Ён сказаў мне на ростань
З усмешкаю ветлай:
— Вырастай, хлапчанё,
Вырастай і шчасліва жыві! —

І паехалі коннікі
Шляхам бярозавым простым
Біць уланаў за здзекі,
За кроў,
За маю Беларусь!
Доўга ўслед ім махалі
Хусцінкамі маткі і сёстры...
. . . . . . . . . . .

З той пары я люблю
Сустракаць маладую зару.

*1940*

## МАЦІ

Даіграў гарманіст,
Коні сена даелі...
«Прабачай, мой сынок,
Частавалі, чым мелі».

Пыл страсае з шынеля,
Засмучона глядзіць
І не ведае, родная,
Чым дагадзіць.

Змрок сцякае з акон,
Надыходзіць світанне.
Чым матулю суцешыць?
Што сказаць на расстанне?

Так заўсёды — гасціш,
А ў апошнюю хвілю
Раптам бачыш, што хата
Ўжо стала пахілай.

Ад пакрыўленых сцен
Павявае дакорам —
Мала маці мы любім,
Рэдка ласку ёй дорым.

А яна ж лічыць дні,
Каб хутчэй дачакацца,
Хлебны квас прыгатуе
У ліпавай кадцы.

Печ пабеліць. Падлогу
Зробіць чыстаю, чыстай...
За акном разгараецца
Дзень праменісты.

За акном вербалозы
Пад ветрамі гнуцца,
І шляхі нескончоныя
Стужкамі ўюцца.

Сэрца стала шчымець
Невыразнай трывогай.
«Ну, матуля, пара
Выпраўляцца ў дарогу.

Дык бывай, дарагая,
Аба мне не журыся,
Сні шчаслівыя сны
І чакай маіх пісем».

*1940*

## ФОТАЗДЫМАК

*Памяці В. Чкалава*

Вісіць ён на сцяне у простай рамцы.
Таварышы вясёлыя мае
На ім зазняты. Сонечнаю раніцай
Праменне першае сяброў абагрэе.

Як брат любімы, кожны з іх мне блізкі.
Не раз я моцна паціскаў руку
Паэтам ашхабадскім і тбіліскім,
Празаікам з Ташкента і Баку.

А ў цэнтры іх — герой, вялікі лётчык.
На цвёрдых вуснах — неастыўшы смех.
Высокі лоб. Брывей круты разбег
І смелыя дапытлівыя вочы...

Міпуць гады. І нашыя імёны
З папер пажоўклых час сатрэ. І змрок
Пакрые ўсё. І толькі светлым клёнам
Раскажа пра былое вецярок.

І, можа, некалі ў адзін прыгожы ранак
(Хацеў бы я пажыць у гэты міг!)
Дапытлівы юнак — мой невядомы праўнук —
Пачне перабіраць архіў і груды кніг.

Паўстане прад вачыма маладымі
Суровае эпохі прыгажосць.
У вочы юнака наш фотаздымак
Загляне, як далёкі, дзіўны госць.

І крыўдна мне, што не змагу нашчадку
Я расказаць пра стрэчы светлы час,
Як заклікаў Валерый Чкалаў нас
Смялей спяваць аб мужнасці і шчасці.

Як сокалу смерць крылле падламіла
(Паліў Маскву журботную мароз),

Як мы яго праводзілі ў магілу,
І песні захлыналіся ад слёз...

А можа, слова праз гады праб'ецца
І прашумяць легендаю бары
Аб тым, як ля палаючага сэрца
Сабраліся пагрэцца песняры.

*1940*

## БЯРОЗА

Не раз прыходзіў я з далёкае дарогі
Паслухаць звон тваіх блакітных хваль,
Вады напіць,
Натруджаныя ногі
Абмыць
І зноўку рушыцца удаль.

Стаю на беразе...
Вось так рака вякамі
То ў дзікай ярасці,
То ў ціхім сне плыве.
Тут кожны куст,
Тут кожны светлы камень
Паданнямі маўклівымі жыве.

Рака мая,
Ты сведка страшных дзён,
Шмат таямніц на дне ты пахавала.
Свой гонар патапіў Напалеон
Пад завірухі гул у тваіх хвалях.

Я паглядзеў углыб:
Там дзён мінулых жах.
На хвілю зачыніў павекі —
І з цемры выплыла нядоля на плытах
Пад енк журботны дзедавай жалейкі.

Па гэтым беразе
Хадзіў калісь рыбак,
Далёкі родзіч мой няшчасны,
І песня гнеўная гарэла на губах,
Шукала сонца і гукала шчасце.

Бяроза,
Помніш ты,
Як твой пакутны сон
Парушыў Ленін перуновым клічам!
Як армію Будзённы між лясоў
Вёў на уланаў хмарай навальнічнай!

І змоўк жалейкі плач,
І знік балотны сум,
Не стогнуць пушчы хмурыя ад жалю.
Як вынік слаўных спраў,
Як веліч мудрых дум,
Шумяць палі багатым ураджаем.

Бяру у прыгаршні празрыстае вады —
І сонца трапяткое у руках.
Я вечна быць хацеў бы маладым,
Такім, як ты, шчаслівая рака!

*1940*

# ДАСПЯВАННЕ

Закончан сход. Яшчэ трывожыць слых
Апошняга прамоўцы гучны выраз,
А перад намі сад вячэрні вырас,
Дзе зоркі сыплюцца з каштанаў маладых.

Узбуджаны гарачынёю спрэчак,
Я да лагоднай цішыні ледзь звык,
А ты сказала мне: «Глядзі, як маладзік
Нырнуў у лісце роснае парэчак».

Я глянуў і ўражаны замоўк,—
Нікчэмнасць дробязей мне зразумелай стала.
Зямля тамілася, а ноч над ёй спявала.
Я слухаў музыку — наслухацца не мог.

І ўпершыню адчуў я хваляванне,
Калі сустрэў дапытлівы твой погляд.
Ад смагі раптам вусны перасохлі...
А вішні трызнілі ў таемным даспяванні.

*1940*

## АБЫВАЦЕЛІ

Іхні дом змайстраваны лоўка
Каля мутных спакойных рэк.
Гэблем вылізаныя шалёўкі
Прыкаваны цвікамі навек.

Тут закон — у закут свой цягні ўсё.
Абмяльчэлае племя хапуг!
Душны свет іх даўно загніўся,
Атлусцеў, да брывей запух.

Дні напластваюцца, як копаць,
Без вялікіх трывог і падзей.
Спяць, ядуць і капейкі копяць,
І зайздросцяць шчасцю людзей.

О, яны цябе стрэнуць ветліва.
Ты для іх дарагі, ледзь не бог,
Ды з пагардаю непрыкметнай
З галавы агледзяць да ног.

Да касцюма твайго прыцэняцца:
Глупства! Танны зусім тавар.
Распытаюць, ці ёсць хто ў цэнтры,
І гарэбліва скрывяць твар.

І пакуль языкам стане мулка,
Яны сліняць твой выгляд і рост.
А пасля на крывых завулках
Абмінаюць за дзесяць вёрст.

Яны проста не глянуць у вочы,
Ўсе прыкметы у іх «не к дабру»...
Белізна вышываных сарочак
Прыкрывае стагодні бруд.

Дзе ім ведаць, як вішні ў цвеце
Шалясцяць пад агнём зарніц.
Як вячэрнія зоркі свецяць
У бяздоннай імгле крыніц.

Дзе ім ведаць пра дружбу ў паходзе,
Калі, стомлены доўгім днём,
Рад сябрам памагчы ў нягодзе,
Падзяліцца апошнім рублём.

Вось ён, свет блакітна-зялёны:
Скарбаў безліч — бяры, не хачу!
За чабор, за расу на клёнах
Я любоўю вялікай плачу.

Я хацеў бы раз'ятраным ліўнем
Змыць і сплавіць старую цвіль,
Каб у самай глухой даліне
Пышна сад пладаносны расцвіў.

Каб не кратала ўласнасці плесня
Чалавечых прыгожых душ,
Каб паэты складалі песні
Не з нянавісці — з сонца і руж.

*1940*

## ЗУБР

Мне сніўся зубр паміж высокіх хвоі,
Бывала, вейкі цяжкія заплюшчу —
І ён з вачмі, налітымі крывёй,
Прыходзіў да мяне з далёкай пушчы.

А у жыцці — складаней і грубей,
Дзіцячы сон знікае, як памылка...
Касіршы соннай кідаю рубель,
Без дрыжыкаў іду у стан асілка.

У пыльным закуце, схіліўшы галаву,
Стаіць вялізарны, чырвона-чорны,
Зубамі жоўтымі грызе-жуе траву,
Ляны і па-кароўему пакорны.

Што сталася з табой, магутны бык,
Дзе сілу, спрыт і ваяўнічасць страціў?
Чаму не ўсхопішся, як віхар, на дыбы?
За выгляд твой аж сорамна мне, браце.

А ведаеш што, зубр, давай-ка уначы...
Я памагу... Не бойся, нас не чуюць...
Гайда туды, дзе спеў драздоў гучыць,
На папараці мяккай заначуеш.

Ты ж нудзішся па соснах маладых,
І пушчам без цябе таксама сумна.
Прыпомні, друг, юнацкія гады,
Зуброўну — белавежскую красуню.

Маўчыш? Спалохаўся? Шкада пакінуць сад?
Ну, што ж, маўчы і стой у хлеве душным.
Плятуся раззлаваны я назад,
А зубр услед глядзіць мне раўнадушна.

*1940*

# ПРЫСУД

Над гарадскою вежай сіні змрок
Сцягі нябачныя ў сухіх вятрах палошча.
Праходжу моўчкі я пачную плошчу,
І ловяць сутарэнні гулкі крок.

Саплівым вокам хмурыцца ліхтар
На шыльду крамніка, на строй нязвыклых літар.
А ў прыцемку варот, густой імглой прыкрыты,
Як здань мінулага, стаіць стары гандляр.

Глядзіць прыветліва, нялёгка разгадаць
Клыкасты твар пад маскаю мядовай.
Ды ведаю: за грошы ты гатовы
Сумленне, гонар, праўду — ўсё прадаць.

Дзе пройдзеш ты, там разганяе ціш
Заплямленых чырвонцаў шалясценне.
Рукамі прагнымі падлічваеш барыш,
Слюнявым шэпатам вядзеш размову з ценьмі.

Твой кашалёк ад слёз чужых разбух.
Ты цела тлустае расціў над пенным куфлем.
Ты еў. Ты спаў, нырнуўшы ў душны пух,
А людзі побач з галадухі пухлі.

Ты пошасць лютую у край мой падсылаў,
І хрыплым голасам пагібель нам прарочыў...
Я да цябе нянавісць гадаваў
Ля піяперскага кастра ліпнёвай ноччу.

Ну вось, сустрэліся. Выслухвай жа прысуд.
Шляхоў няма. Ты над абрывам смерці.
Твой свет разбурыцца, старога ладу смецце
Вятры вясновыя па свеце разнясуць.

*1940, Беласток*

* *

Калі знаёмы тлум абрыдне
І верш аскоміну наб'е,
Калі дванаццаць раз на тыдні
З таварышамі піва п'еш,

Калі спатканні непакояць
І фарбы трацяць прыгажосць,
Калі ў сваім сядзіш пакоі,
Як быццам выпадковы госць,—

Тады адказам на трывогу
Вандроўны вецер б'е у твар,
Пад ногі просіцца дарога,
Скрыпіць іржавая жарства.

І ты, узяўшы кій, катомку,
У невядомы шлях плывеш,
А за табой, хлапцом бяздомным,
Ідзе па пятах верны верш.

І слых твой чулы прагна ловіць
І звон касы, і кветак пах,
Збірае песні, думкі, словы
У незнаёмых гарадах.

І, наблукаўшыся да стомы,
Праз тыдняў некалькі назад
Ізноў вяртаешся дадому,
Дзе па табе сумуе сад.

Каля парога вецер сціхне,
Ты паспяшыш сяброў спаткаць,
І ў сэрцы зноўку ярка ўспыхне
Любоў да роднага кутка.

*15.6.1940, Беласток*

## СТАЛАСЦЬ

Яна ішла з густых бароў,
З пякошаных лугоў,
Пакуль я ў садзе жартаваў
З юначкаю-вясной...
І дзіўна бачыць, што сябры —
У шэрагах байцоў,
Што косы мацеры маёй
Пакрыты сівізной.
Я усяго сябе аддаў
Агню вялікіх спраў.
Як быццам небасхіл цяжкі
На плечы мне налёг.
Так налягае летні дзень
На сцёблы тонкіх траў,
Так кветкі шчодра аддае
Сталёвым косам лог.
Я навучыўся разумець
Сяброўскі поціск рук,
Агнёў паходных цеплыню,
Смяротны гул баёў,
І сустракаць ля ціхіх рэк паходную зару,
І ў сэрцы беражна расціць
Цяжкія зерні слоў.
Глядзяць каштаны на мяне
І шэпчуць: «Падужэў.
Пасуравеў пагляд вачэй.
Стражэй абрысы губ».
Зямля,
Ты стала для мяне радней і даражэй.
І сад, знаёмы да драбніц,
Стаў сэрцу болей люб.
Я не сказаў табе «бывай!», сяброўка-маладосць.
Пральецца тапаліны дождж
На лёгкі пыл дарог —
І ты ізноў ідзі у гаі,
Ідзі і напявай,
Што шчасце ёсць, і песня ёсць,
Што радасць я збярог.

*1940*

## ПАРАНЕНЫ

Я адзін застаўся. Недалёка
Кулямётаў чуць буслішы клёкат.
За маўклівай чорнаю гарою
З ворагам змагаюцца героі.

Нада мной зязюля праляцела.
Не прысела. Не закукавала...
Рана маладое маё цела
Да зямелькі моцна прыкавала.

Твар гарачы травы ціха ліжуць
Шорсткімі сухімі языкамі.
Сосны месяц нада мной калышуць
Цёмнымі касматымі рукамі.

Горача. Балюча. Адчуваю,—
Плавяцца зямля і жвір пад сэрцам,
І трава, зялёная, жывая,
Ў сутаргах шапоча мне аб смерці.

Пакуль здужаю падняць руку я,—
Вораг маёй чэсці не спаганіць:
Злосную маленечкую кулю
Для сябе пакінуў у нагане.

Бой заціх. Снарады больш не выюць,
Едуць, едуць коннікі па полі.
Ведаў: камандзіры баявыя
Не пакінуць у бядзе ніколі.

І прыўзняў насустрач ім руку я.
Не шапчыце, травы, мне аб смерці.
Злосная маленечкая куля
Яшчэ трапіць ворагу у сэрца.

*1940*

## МАТЧЫНА ГОРА

Паглядзіць мне у вочы і крыкне ад болю,—
Пахінецца каліна чырвоная ў полі.

Узляціць над самотнай калінай сініца,
Панясе гора матчына да граніцы.

Там, пад Ломжай, далёка ў зямельцы пуховай
Яе сын, мой таварыш, навекі пахован.

Мы крывавыя раны расой абмывалі,
У маўклівай жальбе дол штыкамі капалі.

Жураўлі яму славу ў надхмар'і трубілі,
Дваццаць стрэльб над трупой, прысягаючы, білі...

Сэрца маці на доўгія годы затужыць...
Хай бы я лепш загінуў, чым любы мой дружа.

Маці, маці, не плач...

Паглядзі на шырокі раскованы Нёман,
Белавежы паслухай абуджаны гоман.

Палюбуйся ніколі нягаснучым сонцам —
Гэта сын твой прынёс шматпакутнай староцы.

Ты вясною на захад схадзі да магілы —
Прад табою ўсе маткі галовы пахіляць,

Ручнікамі і краскамі шлях твой усцелюць,
Непамернае гора пароўну раздзеляць.

Маці, маці, не плач...

*1940*

## ХВАЛА ВАМ!

Хвала вам, чырвонаармейскія боты,
Вы служыце службу сумленна і шчыра.
Не страшны мне з вамі пяскі і балоты,
Размытыя гаці і насыпы жвіру.

Заўсёды ішлі вы дарогаю простай,
І бор адгукаўся глухім адгалоскам.
Пачуўшы цяжкі ваш упэўнены поступ,
Адважна ўцякалі драпежныя войскі.

Хвала табе, стрэльба мая баявая,
Ніколі ты мне не намуляла плечы.
Ты ворагаў сэрцы наскрозь працінаеш,
Умела свінцовымі лекамі лечыш.

Ты пільна Радзіму сваю маладую
Вартуеш і ўвосень, і ўзімку, і ўлетку.
Я масла табе анічуць не шкадую —
Служы толькі верна, страляй толькі метка.

Хвала і шынелі, хоць сціплай, ды цёплай.
Суровая сцюжа мяне не згінала:
Ад дзікіх вятроў, ад асенніх патокаў
Мяне беражліва шынель захінала.

Хвала і табе, кацялок мой паходны,
Ніколі не кідаў мяне ты галодным.
Прыпомні, як мы ля ракі на прывале
За супам наварыстым піравалі.

А зорцы, што ззяе агнём рубіновым,—
Найлепшыя песні, найлепшыя словы.
З табою мне светла і ў цёмныя ночы.
Дзе кінеш прамень ты, туды я і крочу.

І людзі спяшаць на нямеркнучы свет твой,
І чуюць падзяку стагоддзя хвоі:
«Ты радасць прынёс к нам з краіны Саветаў
І зорку шчаслівую, друг наш і воін!»

*1940*

## ПРА СМЕРЦЬ

Не хачу паміраць я са стогнам і хрыпам
Ад нікчэмнай прастуды, ад таннага грыпа.
Уявіце малюнак:
імгліцца дожджык,
Зямля разбухла ад дожджавых дрожджаў,
І скрыпяць каламагі хаўтурнай калёсы
Праз нечыя енкі, размовы і слёзы.
І хтосьці, каго за бяздарнасць я лаяў,
Здымае капелюш з журботнасцю мілай,
Пра добрае сэрца маё завывае,
Слязою фальшывай паганіць магілу...
Прашу —
ганіце ад трун раўнадушных!
У іх жа нямала рублёвых турбот.
Ад іх крывадушнасці
мёртвым становіцца душна,
Ад нудных прамоў нават кідае помнікі ў пот.
А не — дык я сам разламаю труну
І з могілак іх турну.
Чаго разышоўся я ў пеннай ярасці?
Да смерці ж далёка, не блізка да старасці!
Не такім бы пабачыць мне дзень свой апошні.
Я жадаю, каб быў ён
за ўсе шчаслівейшым,
Каб на сход развітальны былі запрошаны
Мае справы, і мары, і вершы.
Каб усё, што любіў я, чым край мой багаты,
У той дзень да мяне заглянула у хату.
Каб вянкі прамяністыя з руж і язміну
Упрыгожылі сцены, падлогу і вокны,
І ад пахкага мёду, ад сонечных вінаў
Гладышы, і бутэлькі, і кубкі размоклі...
Я кліпну — і кліч разнясуць сады:
«Прыходзьце ка мне ўсе,
Каго я вучыў, каго я лячыў,
Каго ратаваў з бяды,
З кім я у час франтавы начаваў
У хмурым слонімскім лесе,
З кім я нямала нераспяваў

Вясёлых і сумных песень,
Хто мяне першым падтрымаў
На коўзкіх усходцах паэзіі».
Хай будзе праслаўлен той дзень і час,
Што шлях падвядзе маёй жыццёвы,
Калі я пачую, сябры, ад вас
Суровыя простыя словы:
«Ты рук на працы не шкадаваў,
Не ныў, не стагнаў ад зморы,
Ты шчасце з народам сваім будаваў —
І нам за цябе не сорам».

*1940*

## НОЧ

Такі прысуд: садам пустым рыдаць,
Вятрам спраўляць шалёнае ігрышча...
Ні зор, ні месяца. Адна глухая даль
На нечую пагібель дзіка свішча.

Цяпер сябры заснулі без трывог,
А я стаю самотны пад вярбою,
Да поўначы хаджу паміж дарог,
Гляджу на захад з болем і журбою.

І хоць заходніх дальніх гарадоў
Не бачыў я і, пэўна, не пабачу,
Мне проста цяжка знаць пра гора ўдоў
І чуць, як дзеці ў гарадах тых плачуць.

Мне проста страшна думаць, што зямля
З грудзей сваіх страсае камяніцы;
І нечая бяздомная сям'я
Не ведае, ад смерці чым прыкрыцца.

Вы чуеце, як чорныя палі
Разгневаная хмара глуха хлешча?
Агню вайны дажджамі не заліць,
Хоць свет аб тым маланкай апавешчан.

Вятрам — сляды зарніцаў замятаць,
А мне — блукаць па золкай непагодзе.
Мне трэба ўсё і чуць, і памятаць,
І ў ярасці сказаць забойцам: «Годзе!»

*1940*

## ПЕРШЫЯ КУЛІ

Нябачная першая куля
ля вуха злавесна свісне,
Зямля у нябёсы дзьмухне
крывавай віхурай гранат,
Барвовая душная хмара
над ціхім акопам навісне,
Таварыш паранены войкне —
і ты зразумееш: вайна.

Маланкай мільгнуць успаміны:
далёкая вёска, дзяўчына...
Ты слухаеш у трывозе,
як верба ад страху дрыжыць.
І хочаш зрасціся з зямлёю,
зрабіцца маленькай пясчынкай,
Зарыцца ў чабор духавіты,
замерці, дыханне стаіць...

Ты бачыш перад вачыма
агеньчык маленькі кветкі.
Мурашка з нікчэмнай здабычай
пабегла кудысьці наўцёк.
Усё, што ты ботамі трушчыў,
усё, што было непрыкметным,
Варушыцца, звоніць, спявае
і праслаўляе жыццё.

І з самых таемных глыбіняў,
з расплаўленых вогненных нетраў
Прыходзіць загад суровы:
«Устань, чалавек, паглядзі
На родны свой край,
на поле,
абмытае сонцам і ветрам,
За ўсё, што стварыў ты і створыш,
у бітву адважна ідзі».

І ты устаеш пад зямлёю,
    разгневаны і вялікі,
Пружыністую і тугую
    зямлю паглынуў агонь.
Бяжыш ты насустрач кулям
    з страшэнным бязгучным крыкам
І тупат пяхотных дывізій
    спяшыць за табой паўздагон.

*1940*

## ПІСЬМЫ

Грукне конь аб дол падковай —
Ты рукой закрыеш вочы.
Можа, словам выпадковым
Развітаюся з табою.
Ціхі сум вачэй дзявочых
Павязу ў сядле з сабою.

Покуль выеду я ў поле,
Вытры слёзы, усміхніся;
Накупляй паперы болей
І чарнілам запасіся,
Каб худзелі пісьманосцы,
Носячы мне torbki пісем.

Усхвалёваныя словы
Каля сэрца знойдуць схову.
Каб гарэлі — не згарэлі,
Маё сэрца ласкай грэлі,
І з табой глыбей раднілі,
І ад куляў баранілі.

А гарніст на бой пратрубіць —
Шаблі сонцу усміхнуцца.
Мо жыццё маё загубяць —
Хай хоць пісьмы застануцца.
Хай даведаюцца людзі,
Як байцоў чырвоных любяць.

*1941*

# БЕЛАСТОЦКІЯ ВІТРЫНЫ

Паэма

## I

Там, дзе гнеў клекатаў сэрцаў братніх,
разлучаных,
Дзе бізун прасвістаў і слязамі калючымі
Набрыняла зямля, трапяткая і гнеўная,
Пачынаешся ты, Беласток.
Непаўторнай сустрэчы імгненнем
Азарон мой радок.
Так, цяпер ты ў мяне на далонях. Цяпер ты
Абыдзённы і звыклы. А толькі ж учора
Нэнза вузкія вулкі палоніла нератам
І галёкала нема над горадам гора.
Пэўна, маткі збіралі шчаслівай часінаю
У паход нас. Ішлі мы у далечы сінія
Праз усмешкі і кветкі, праз помсту і кулі
Да цябе, Беласток.
Прывітаў скрыжаванні затоптаных вуліц
Пераможны наш крок.
Нібы першы пасланец краіны шчаслівай,
Я па бруку прайшоў.
І вітрыны крыклівыя
Разглядалі мяне з бессаромнай нахабнасцю,
Меркавалі — ці нельга садраць з мяне хабару.
Вывучалі ад шлема да ботаў, як азбуку,
Узнімалі барвовыя клёны, як светачы.
Гаварылі: «Мы гэткіх дагэтуль не бачылі»,
Прызнаваліся: «Гэткіх дагэтуль не ведалі».
«Ды нічога,—шапталі,—яго яшчэ мы вылавім.
Да сябе прыкуём. На свой лад абгаблюем».
Я ж у вочы ім глянуў — і гэтаю хвіляю
Яны з жахам адчулі, што я загублю іх.

## II

Сябры баявыя разгрукалі шляхту
Пад Аўгустовам і Гроднам.
Дзе армія наша праходзіла, шлях тої
Стаў назаўсёды родным.
Пёрлі паны без штаноў, без агляддкі...

Як жа не быць тут злосным?
Нават ніводную панскую пятку
Падстрэліць не давялося.
Ведаю: многа шчэ знойдзецца працы —
Пара за ачыстку горада брацца.
Ну, а пакуль што хоць пару гадзін
Пабуду з вітрынамі адзін на адзін...
Панскі лад я пачаў ненавідзець з калыскі,
Хоць ніколі яго і не бачыў блізка.
І цяпер прызнаюся і каюся:
Я асобай яго цікавіўся.
Паверце, вельмі дзіўна гучыць:
Танга, палац, прастытутка-графінечка,
Золата, перлы, якіх не злічыць,
Іскрысты лікёр у графінчыках.
А знізу на гэты сусвет разбэшчаны
Помстаю яраснай хлешча
Разгневаны вал рабочых.
Захад, ты побач. (Дзівіцеся вочы!)
Хоць і напсованы, хоць і падмочаны.
Гандляры — паляўнічыя хісткай удачы.
Як жа густа насеяна бараў і крамаў тут.
Першы раз я сваімі вачыма убачыў
Ілюстрацыі для палітграматы.
Шыльды сумленныя скрозь запаланілі
«Стэллы», «Афеліі», «Німфы», «Палопіі».
Цяжка без звычкі мне прымірыцца
З «Панам» пыхлівым і рыцарскім «Рыцам».
Безліч цырульняў. На ўсе варункі —
Розных масцей і парод.
Напэўна, у Беластоку цырульнікаў
Больш, чым вусоў і барод...
Вітае усмешкай мяне з-за акна
Мясцовы кароль гнілога сукна.
Сачу за светам глухім заваконным,
За каркам бычыным і рылам суконным.
Тавар беластоцкі, каторы пагорш,
Ён з ласкай анёльскай збывае за грош.
А з чорнага ходу ангельскія сукны
Сплаўляе за круглыя тысячы сука.
Крыўдна падумаць: такая брыда
За злоты гатова і сонца прадаць.
Побач — пародыя на магазін,
Вокны аслеплі ад тлустай гразі.

Хоць і грашовая фабрыка квасная,
Ўсё ж такі ўласная.
Пан фабрыкант, я шкадую вас —
Вып'ю з спагады квасу запас.
Далей іду. І вітрын павуцінне
Хоча мяне засмактаць, нібы ціна.
Глядзяць з-за шкла пракіслыя твары
Згвалтаваных матак боскіх.
Напэўна, святых найлепшым таварам
Лічылі ў дзяржаве польскай.
І дзе ні глянеш — стаяць дамавіны.
Аж страшна. Нібы збіраецца
Беластачан палавіна
Цяпер неадкладна ў рай ісці.
Красою зіхцяць дамавінныя горы —
Купляй за пяць, за дзесяць, за дваццаць.
Як ім не сорам фарсістым уборам
На свеце на тым задавацца!
К чорту ад гэтых ксяндзоўскіх брыдот!
І я уцякаю мігам.
Ад радасці расплываецца рот:
«Продаж цікавай кнігі».
Гэта люблю. Прыемней куды
Заходнюю бачыць культуру.
Я і ў Маскве закупляў пуды
Мастацкай літаратуры.
Кашалёк намацаў, серабром пабразкаў,
Заходжу — паважны купец.
Палохаюць з вокладак чорныя маскі —
Надзеям маім канец!
Глядзяць са старонак засаленых
Патомкі бязносыя Саніна...
Глохне ад нуднай бяссэнсіцы вуха,
Сэрца заходзіцца гнеўным стукам.
Глянуць — не згінуць. Паэту навука:
Капіталізм — нецікавая штука.

III

Надыдзе змрок, і ліхтары запаляцца,
З муроў змываючы суровае аблічча.
Таполя моўчкі на пажоўклых пальцах
Пачне у небе зоркі пералічваць.
Ноч паглядзіць уніз вачмі вільготнымі —
Мяне, маўклівага, узрушыць і расчуліць...

Як людна! Тратуары бясклапотныя
Плывуць, губляюцца ў імгле бясконцых вуліц.
Будзь, сэрца, компасам вандроўніку таемнаму.
Як карабель, плыву ў натоўпе вадкім.
А думкі нудзяцца. Чагосьці не стае мне.
Як разгадаць апошнюю загадку?
Маёй душы нікому не запэцкаць.
Адкінуўшы уедлівую грэблівасць,
У асабняк пралажу я купецкі
Праз шкло вітрын і сцен сухія рэбры.
Пакой затоплены святлом ружова-сінім,
Напханы крэслы пульхнымі гасцямі.
Стаю пад градам позіркаў пяўцямных,
І кажа гаспадар, глынуўшы сліну:
«Чаго прыйшоў ты, незнаёмы воін?
Ці нам узрадвацца,
ці хутка быць пад крыжам?»
«Не бойцеся,— кажу ім,— я спакойны.
Сягоння вас, здаецца, не пакрыўджу.
Я многа чуў пра вас. І вось цяпер прашу мне
Хоць кроплю паказаць былога шчасця!»
«Віват! Жаданы госць!» —і ў захапленні шумным
Гасціннасць расчыніла дзверы насцеж.
«Жылі, як людзі, мы... Ды справа наша трэснула.
З Парыжа не вазіць нам больш тавару.
Сягоння мы спраўляем гучна, весела
Апошні пір... Дык проша, пан таварыш!»
І я размяк. (Душа ў паэта чулая.)
Раз госць, дык госць. Не стану я сварыцца.
Гляджу на гандляроў, нібы на шулы, я,
Любуюся, як зубрамі ў звярынцы.
Звісаюць хамутамі падбародкі,
Спакусай дражняцца жанчын дзябёлых плечы.
Клякоча тук у звонкіх скавародках,
У кубках піва пеністае плешча.
На ногі хлынула салодкай хваляй танга.
З-пад шоўку чорнага — грудзей абрысы голых.
Іржуць мужчыны звонка, як мустангі,
І п'юць за лепшы час, за тлустасць фей, за
кволасць.
Ні кпін абразлівых, ні слоў, што вушы муляць,
Усё прылізана, прыемна, мякка, цёпла.
І сіні дым расце з узорных люлек,
Як казачных раслін сухія сцёблы.

Нястройны гул і смех, і млявы голас скрыпак
Мой чулы слых ахутываюць ватай.
І жарты з горла сыпяцца без рыпу,
Ўлагоджана, наіўна-грубавата.
Любуюся зарамленым пейзажам
(Між сочных траў струменіць ціха рэчка,
Над ёй павіслі спелыя парэчкі...)
І ўспомніў я аб светлым лузе нашым.
Як мы калісь брыгадаю касілі
І дружна копы да стагоў насілі,
Як з песнямі агні мы раскладалі,
Варылі юшку і на сене спалі.
І ўсё адразу стала нецікавым,
З самотаю задумаўся аб леце...
І раптаю чую — свежы пах атавы:
У вокны дзьмухнуў з родных пожняў вецер.
Абмыў мне зрок, шапнуў на вуха: «Здрада!»
І ўбачыў я, як хітра, таямніча
Расстаўлены мне пасткі і прынады,
Нацэлены мільёны дробных звычак.
Даволі сноў! Прысяга не забыта,
І сэрца не заліта тлустым маслам,
І рукі не стаміліся ад бітваў,
І у душы нянавісць не пагасла.
Падхоплены імклівым чыстым ветрам,
Хутчэй лячу на свежае паветра.
«Мы правядзём!» — крычаць мне у трывозе.
А я: «Не варта! Нам не па дарозе».

IV

У цэнтры, дзе вуліц каменныя стужкі
Плошча у вузел збірае,
Навек ахрышчоная імем Касцюшкі,
Вежа стаяла старая.
Яе «гадзіннікам» беластачане
Празвалі. А іншыя велічалі
Азызлую гэтую тушу
Ра́тушай ці рату́шай.
Пачвараю сытай яна драмала,
На шпілю завостраным сонца трымала,
Дугой выгіналася брама.
Унізе — як вывадак небывалы —
200 дробненькіх крамак.

На тоўстых паліцах прэлі тавары,
Гарлалі мядовыя гандляры:
«Для вас, даражэнькі, аддам задарам.
Хапай! Налятай! Бяры!»
Нават камар не падточыць носа
Пад моцны прылавак дубовы.
І несла капейкі армія босых
З Бельска і Заблудова.
У імя старога святога айца
Гусцей разліваўся смурод селядца.
У імя хітрэйшага меншага сына
Усюды раслі, як грыбы, магазіны.
Ад вежы гандлярскай штогод прыплод.
І падалі ніцма вятры
Ля абабітых жалезам варот,
Ля залачоных вітрын.
Навокал гібелі малыя дамы,
Ратунку прасілі: «Пакутуем мы.
Ў асеннія дні захліпаемся плачам,
На цыпкі ўстаём, але свету не бачым —
Бо гэта каменная вежа-навала
Паветра і сонца абрабавала».
Сачыла рупліва бяльмо цыферблата —
Ці добра спіцца суконным магнатам.
Павольна кружыліся чорныя стрэлкі
У зачараваным коле.
Здавалася,— пах селядца і гарэлкі
Адгэтуль не знікне ніколі...
А недзе на сходы збіраліся людзі:
«Дакуль замінаць гэта ратуша будзе?»
Заядла смакталі свае папяросы
І вежы старой пагражалі:
«Яна у нас заўтра аж ніць папросіць,
Не будзе ні спуску, ні жалю».
А я гэтым часам ля вежы блукаў.
Для вершаў новыя тэмы шукаў.
А тэмы налазілі самі
З забруджанымі рукамі:
«Што вам — японскага шоўку ці мыла?
Французскіх духоў? Калі ласка!»
Плошча кішэла, круціла-муціла,
Сляпіла брудам і бляскам.
Вось ідзе ў вышыванай кашулі
Янэк — самы вясёлы жулік,

Насвіствае арыі з «Галькі»,
Кажа: «Пра гора сягоння забудзьце.
Вы хочаце быць шчаслівым? Будзеце,
Толькі купіце ў мяне зажыгалкі».
Тут жа знаёмых нахабны рой
(я ўчора ў іх быў у гасцях).
Трымаюць высока над галавой
Рэйтузы з Ліёна — свой сцяг.
І мне па знаёмству суюць гадзіннік
(«такі гадзіннік на свеце адзіны!»),
А мне што?
Да вуха — ды слухай.
Чуецца джазавы бразгат і гул.
«Дзякую вельмі,— кажу,— за паслугі.
Я не хачу чырванець за прагул».
Баюся, што хутка за добрую плату
Яны і мяне прададуць па блату.
Агідна глядзець мне на іх. Ну і людцы!
Кінеш капейку — адразу паб'юцца...
Тым часам на фабрыках аднагалосна
Цвёрда рашылі ткачы:
Каб вечна на плошчы гасцілі вёсны —
Рынак ушчэнт растаўчы,
Крамы гандлярскія з гораду вымесці,
Плошчу ўсю сонечным каменем вымасціць.
Колькі сышлося ў той ранак іх!
Тысячы

Смелых, вясёлых, гордых.
Армія беластоцкіх тэкстыльшчыкаў
Загаспадарыла ў горадзе.
Поплеч стаяць беларусы з палякамі,
То кірка, то лом на плячы.
На пляц ашуканства, дзе жонкі іх плакалі,
У наступ пайшлі ткачы...
Пахіснулася вежа — і бразь! —
З цяжкім стогнам і крэктам у гразь.
Дзынкнулі вітрыны... Аскабалкі. Гром.
Прайдзісветы зычна заскуголілі:
«Надышоў канец, з голаду памром,
Будзем мы і босымі і голымі.
Засталася нам — аб днях мінулых скруха,
Дажываем мы апошнія гадкі...»
А над выццём, над пылам і разрухай
Пераможна загулі гудкі.

## V

У гэту ноч вясну ў нас гукалі
Задумнымі трывожнымі гудкамі.
Мне чулася: «Прыйдзі, хутчэй прыйдзі!
Сады шумлівыя з сабою прывядзі,
На брук распырскай золата расы
І кветкамі ўсе вуліцы засып».
У гэту ноч туманны парк наскрозь
Малочнымі заліт быў ліхтарамі.
На зыркі свет, бліскучая ад рос,
Ішла вясна з зялёнымі дарамі.
Яна ішла сцяжынкамі знаёмымі:
Па Нараву, па велічнаму Нёману
На крыгах серабрыстых прыплывала,
На крыллях жураўліных прылятала.
У гэту ноч грузавікі грымелі
Да самага світання.
З яркіх фар,
Як рогі светлыя,
Раслі снапы праменняў
І змрок густы падкідвалі да хмар.
Вясна у прадчуванні майскіх радуг
У горадзе наводзіла парадак,
Каб ён заззяў нябачанай красой
У час, калі за гаем сонца выспіцца
І з неба зоркі да астатку высыпяцца,
Як зерні спелыя з жытнёвых каласоў.
І ён настаў, вялікі ясны ранак,
Сцягамі першамайскімі прыбраны.
І сонца узнялося з-за гары,
І сотні сонцаў выбеглі насустрач,
Заліўшы бляскам новы строй вітрын —
Прасторных, асляпляючых, як люстры.
Дзень добры, горад мой! Вітаю з новым днём!
Тваіх вітрын нікому не парушыць.
І трубы медныя, налітыя агнём,
Ад радасці адна другую глушаць.
За чыстым шклом — спакуса павароў
І мара гаспадыняў клапатлівых —
Начышчаныя лысіны сыроў,
Наслоенае масла, яйкі, слівы.
Загорнутыя ў золата біклагі
З бутэлькамі у стройны сталі рад!

(«Ад моцы нашай многія палягуць.
Глыні крыху і вечна будзеш рад!»)
Як пена, беласнежныя карункі
Спускаюцца на пальцы веяроў.
І польты, расхінуўшы ветла рукі,
Адшукваюць сабе гаспадароў.
У шкле вітрын плыве натоўп. Праносяць
Серп з молатам на вогненным сцягу.
Гляджу, нібы у люстра, і адрозніць
Сябе ад іншых сёння не магу.
З усіх бакоў завеяла мяне
Вачэй, усмешак, вуснаў завіруха.
Аж насцярожыўся міліцыянер —
Ці не парушу вулічнага руху.
Не бойся, друг. Мне проста добра жыць,
Ісці, смяяцца, бавіцца гаворкай...
Я не зблуджу: ва ўсіх вачах гарыць
Шчаслівы свет маёй чырвонай зоркі.

*1940, Беласток*

# II

# ЗМАГАЙЦЕСЯ АДВАЖНА ЗА РАДЗІМУ!

Мой родны край, паслухай слова сына,
У горкі час зямлю сваю агледзь,
Шляхі, шляхі, разліў азёраў сініх,
Высокіх сосен вылітую медзь;

Да небакраю — наліўное жыта,
Імклівыя каналы між балот.
На кожным кроку — рук тваіх здабытак,
Твае сады,
Твой хлеб,
Твой горкі пот...

Над Беларуссю груганы навіслі,
Каб разарваць краіну на шматкі...
І поіць акрываўленая Свіслач
Нянавісцю паэтавы радкі.

Нягоднікі! Нахлынулі з разбоем,
Прымежны гай абвугліўся, счарнеў...
Смерць ворагам!
Склікае нас да бою
Народны гнеў, вялікі мужны гнеў.

Героі не звяліся ў Беларусі,
Не парадзелі нашыя лясы.
Браты мае, бярыце стрэльбы ў рукі,
А вострыя нажы — за паясы.

Каб не прайшлі ні сцежкаю, ні шляхам
Рабаўнікі; каб свіран быў пустым;
Каб гады азіраліся са страхам
На грымнуўшыя кулямі кусты.

Каб вораг задушыўся едкім дымам
І загаіць не змог смяротных ран,—
Змагайцеся адважна за Радзіму,
Атрады беларускіх партызан!

*11.7.1941*

## БЕЛАРУСІ

Ты ляці, маё слова, праз палі і лясы,
Прывітайся з краінай маёй дарагою.
Беларусь, я — твой воін аддапы і сын,
Мае думкі і сэрца заўсёды з табою.
Ты мяне гадавала, ты мяне калыхала,
Ты мне песні, як родная маці, спявала,
Клапатліва збірала у шлях.
Як люблю я задумлівы шэлест бяроз,
Хвалі жыта, святло перадранішніх рос
На тваіх аксамітных лугах!..

Цяжка думаць, што там папялішчы і кроў,
І усё, што да болю мне люба і дорага,
Сёння стогне пад дзікім прымусам звяроў;
Што бацькоўская хата зганьбована ворагам.

І калі у паходнай палатцы прысніцца мне
Светлы гай з залатымі суніцамі,
Плёскат сініх азёр на зары,
Спеў драздоў у смалістым бары,—
Тады гасне туга, адыходзіць самота,
Толькі ў сэрцы палае вялікасны гнеў:
Не, не стопчуць красы тваёй брудныя боты,
Не, народа майго аніхто не сагне!
Ён, магутны, у пушчы адвечныя рушыў,
І легенды лунаюць над роднай зямлёй,
Што адважны Гаркуша
Драпежнікаў глушыць,
Што Кастусь Каліноўскі выходзіць на бой;
Што усталі з магіл партызаны Дукоры,
Каб адвагу у сэрцах юнацкіх расціць;
Што бушуе і пеніцца Нарач, як мора;
Нёман гнеўна гамоніць і Прыпяць кіпіць.
Веру цвёрда: скапае бязлітасны вораг,
І штандар перамогі над краем запаліць зару.
Пакуль сонца не згасне,
Пакуль свецяцца зоры,
Беларусь не загіне, будзе жыць Беларусь!

*1941*

## ПРАЎНУК

Суровы час для нас цяпер настаў.
Я мімаволі даўні сказ прыпомніў...
Калісь мой прадзед кол у рукі браў,
З суседзямі ішоў да пушчы цёмнай.

Падсцерагаў з нянавісцю ў вачах
Ён ворагаў у зараслях зялёных
І біў смяротным боем з-за пляча
Праслаўленых салдат Напалеона...

Ў маіх руках не кол, а кулямёт,
А ў спадчыну ад прадзеда — адвага.
Яна са мною крочыць у паход,
Азораная пераможным сцягам.

Мне подзвігаў далёкіх не забыць,
Яны ў крыві, яны жывуць са мною.
І праўнук сёння ворагаў стаў біць,
Як прадзед: з-за пляча, смяротным боем.

*1941*

# ТАК ПАЧЫНАЕЦЦА НАРОДНЫ ГНЕЎ

Тут просты шлях да самае Масквы.
Абломкі шпал, варонкі ды ірвы...

Адбіта семафорава рука.
Вакзал пусты, як чэрап мерцвяка.

Дождж ападае стрэламі на дах,
Чуваць хаўтурны звон падраных блях.

У калідор, у залу нацякло,
Як светлы жвір, раструшчанае шкло.

На мыліцах стаіць маўклівы дзед,
Чакае на Маскву узяць білет.

Не ведае, не ведае стары,
Што адышоў цягнік апошні на зары.

А ўнук яго з вінтоўкаю залёг
За вадакачкаю, на ростані дарог.

Чакае дзед. І чуе ён здалёк
Цяжкі і незнаёмы нечы крок.

Прасунуўся у дзверы аўтамат,
За ім улазіць насцярожаны салдат.

Вакзал пусты. І раптам злосны крык
Ударыўся у вокны: «Бальшавік!»

На крык прыходзіць тлусты афіцэр,
Бярэ сівога дзеда на прыцэл.

З усмешкаю націснуў ён курок —
І адляцелі мыліцы убок.

Ідзе да вадакачкі афіцэр.
Бярэ унук забойцу на прыцэл.

Кароткі стрэл — і рыжы кат асеў.
Так пачынаецца народны гнеў.

*1941*

# АДПОМСЦІМ!

Гляджу і гляджу я на захад,
Туды, дзе пасохлі бярозы,
На роднае поле, дзе слухаў
Я песні вясёлыя жней,—
І сэрца цямнее ад жаху,
І зрок затуманьваюць слёзы,
А рукі, набраклыя гневам,
Сціскаюць вінтоўку мацней.

Усюды магілы, руіны,
На ветры дымяць галавешкі,
Шукай — і не знойдзеш усмешкі
На тварах змарнелых людзей.
У гэту журботную восень,
Здаецца, зямля ўся галосіць,
І вецер праклёны разносіць,
І пушча трывожна гудзе.

Адна, ля вярбы надламанай,
Сядзіць пасівелая маці,
Глядзіць і маўчыць, і чагосьці
Не можа ніяк зразумець.
І некага ёй выпраўляці,
І некага ёй сустракаці,
Адно — галасіць засталося
І ў горы няўгойным гарэць.

Ёй сосны усё расказалі:
Як білі, як мучылі сына...
Ляжыць ён, прыкрыты імхамі,
Адзін у маўклівым бары.
А лютасць фашыстаў без краю:
Дачку, маладую дзяўчыну,
Забралі у поўнач глухую,
На ганьбу павезлі звяры.

Не плач, шматпакутная маці!
Мы прыйдзем і ласкай сагрэем
Тваё набалелае сэрца,

І знікне самота з вачэй.
Ты бачыш? — Сягоння на ўсходзе
Без ліку сцягі барвавеюць.
Ты бачыш? — Як сонца на зброі
Сягоння палае ярчэй.

Матуля, збаўленне ўжо блізка!
За ўсіх і за ўсё мы адпомсцім —
За край зруйнаваны, за здзекі,
За нашых сясцёр і братоў.
Магутныя нашыя танкі
Раструшчаць варожыя косці,
І хлыне ў балота патокам
Паганая чорная кроў.

*1941*

## РАЗВЕДЧЫК

Над ракой у лозах рэдкіх
Плавае густы туман.
Прабіраецца ў разведку
Непрыкметна партызан.

Да драбніц знаёмы хлопцу
Таямніцы ўсіх дарог:
Вось ля гэтага ядлоўцу
Ён вяршыў з брыгадай стог.

І на міг яму здалося,
Што ідзе ён на пакос,
Што чуваць у сініх росах
Лёгкі звон сталёвых кос.

Уздыхнуў ён і паправіў
За плячыма карабін...
Асыпаюцца на травы
Зоркі светлыя з ялін.

З-за плячэй сасонак рослых
Загараецца прасвет.
Партызан на сцежцы роснай
Падазроны бачыць след.

Вось яшчэ... Сляды чужыя —
Блізка ворагаў папас:
Боты ў нас не гэтак шыюць
І не гэтак ходзяць ў нас.

Ён паўзе ускрайкам лесу
Між высокае травы.
На узгорку, пад навесам,
Ходзіць немец — вартавы.

Колькі тут іх? — І граната
Дужай кінута рукой.
Зараўлі спрасоння гады,
Пачалі з туманам бой.

Партызан стаіўся ў яме,
Лічыць водбліскі гармат.
«Ну, цяпер чарга за намі,
Твае сілы знаем, гад!»

За ракою каля гаю
Топчуць коні сыпкі жвір.
Там разведчыка чакае
Палкавы наш камандзір.

Будзе бітва — эскадроны
Навальніцай прашумяць.
Будуць чорныя вароны
Вочы ворагаў кляваць.

*1941*

## САША

Можна боль заглушыць і суцішыць вялікае гора,
Можна жыць у разлуцы,
далёка ад родных прастораў,
Аднаго не забыць, аднаго у душы не закрэсліць—
Гэта нашу нянавісць, якую праз бой мы прапеслі.

Тут спалучана ўсё:ярасць грому і гнеў бліскавіцы,
І найлепшыя мары, і сны, і празрыстасць крыніцы.
Ты, нянавісць,
трывожыш агнём незгасаючым сэрцы,
Ты Тышкевіча Сашу вядзеш на дарогу бяссмерця.

Саша... Жвавы хлапчук...
Чатырнаццаць гадоў адзвінела,
Чатырнаццаць садоў адцвіло,—
і тады зашугала вайна.
Цераз родны парог уваходзіць у хату ён смела,
Кліча маці, ды мёртвай ляжыць на падлозе яна.

Любы бацька, і брат,
і сястрычкі штыкамі заколаты,
Паламана калыска, на кнігах — забойцаў сляды.
У такую хвіліну сівеюць ад жаху сады,
У такую хвіліну нядужы становіцца волатам.

Не крычаў і не енчыў,
толькі вочы заплюшчыў ад жалю,
Дзве слязінкі, як іскры, на матчыны вусны упалі.
«Мама, мама, устань!»—І навекі матуля раскрыла
І на помсту страшэнную мёртвай рукой блаславіла.

І пайшоў ён у Жлобін, рашучы і узмужалы,
Па знаёмай дарозе, размолатай танкамі ў пыл.
А кругом у красе дарагая радзіма ляжала,
Зелянела атава, залацелі пад сонцам снапы.

Ён стаяў на рагу, непрыкметны, каля камяніцы,
І дзіцячыя чыстыя вочы глядзелі журботна наўкол.
І не ведаў ніхто, што ў вачах гэтых бура таіцца,
Што увесь ён напоен нянавісцю спаленых сёл.

Глуха скрыгалі танкі, грукаталі нямецкія боты.
Ён стаяў, ён чакаў, ён згараў у агні завірух.
Дзе ж яны? Дзе ж забойцы? —
і выехаў з-за павароту
Афіцэрскі аўтобус са зграяй кляймёных падлюг.

Надыходзь жа хутчэй, баявая святая расплата!
Дваццаць крокаў, пятнаццаць... і помста
зрываецца з рук.

Банду псоў ашалелых ушчэнт спапяляе гранатай
Мужны Саша Тышкевіч і падае мёртвы на брук.

І стаялі над трупам героя тупыя ад злосці
Немцы. Страх ледзяніў іх звярыную кроў:
«Калі дзеці савецкія гэтак бязлітасна помсцяць,
Колькі ж гневу тады і адвагі ў іхніх бацькоў!»

*1941*

## КАМСАМОЛЬЦЫ

Будуць казкі складаць і паданні,
Будуць песні звінець ля хат,
Як хадзіла Шубёнак Аня
Узрываць бензінавы склад.

Свідравалі паветра кулі,
Смерць выходзіла наперарэз.
У гарачае пекла вуліц
Люты вораг нахрапам лез.

Тых, хто любіць сваю радзіму,
Страх не здужае, не сагне.
Зыркім полымем, чорным дымам
Камсамольскі успыхнуў гнеў...

Многа іх — маладых партызанаў.
Чуеш свіст у кустах за ракой?
То на голас Шубёнак Ані
Адклікаецца Кулакоў.

Над зацішнаю пераправай
Гулка грымнуў гарматны гром,
Па густых аксамітных травах
Вораг рушыўся на паром.

Толькі рана святкуюць гады!
Пацямнела ад гневу рака.
Б'е без промаху іх з засады
Кулакова Андрэя рука.

Афіцэр пахіснуўся — і вобзем,
Немцы ходу — ва ўсе бакі...
Перамогу Андрэй перавозіў
На усходні бераг ракі.

Хай жа славяцца мужных двое!
Павядуць яны за сабой
Сотні тысяч новых герояў
На апошні смяротны бой.

*17.8.1941*

## ЗДРАДНІК

Толькі змоўк ад гулкіх стрэлаў пошчак,
Высыпаў па вуліцы народ.
Людзі сабіраліся на плошчы
На вялікі суд, на гнеўны сход.

Праяснелі змучаныя твары,
І малы смяецца, і стары.
Партызаны сёння гаспадараць —
Роднае зямлі гаспадары.

Хто там валачэцца, як пабіты?
А каго там сокалы вядуць?
Здрадніка, кулацкага бандыта,—
Ён разносіў па сялу бяду...

Ён стаіць ад страху пасінелы,
Затаіўшы воўчыя клыкі.
Кіне погляд з-пад ілба нясмелы —
Сціснутыя бачыць кулакі.

А народ сурова допыт чыніць:
Хоць цяпер душою не крыві,—
Ты за колькі прадаваў айчыну,
Колькі выпіў нашае крыві?

Ты вадзіў забойцаў па дарогах,
Боты фашыстоўскія лізаў.
Не расчуліць, не кране нікога
Брудная сабачая сляза.

Ты капаў магілу для народа,
Ды папаўся сам у пастку, гад.
Атрымай за ўсё узнагароду —
Кулю ды праклён ад родных хат.

*23.IX.1941*

## ПІСЬМО ДРУГУ

Пацішэла шалёная спрэчка гармат,
Я заходжу крыху адпачыць у бліндаж...
Мы вайною разлучаны, любы мой брат,
Толькі веру, што хутка шлях сыдзецца наш.

Помніш чэрвеньскі ранак? Прарэзлівы віск
Тройчы выклятых дзецьмі і маткамі бомб.
У агні і крыві захлынуўся наш Мінск,
Мы пакінулі з болем разбураны дом.

На развілцы дарог развітаўся з табой
І пайшоў я з байцамі на ворага ў бой.
Помняць Гомель і Ельня, Калуга і Бранск,
Як фашысты канալі ад жудасных ран.

А пра справы твае, пра налёты твае
Лес густы беларускі сягоння пяе.
Як віхор, па дарогах праносішся ты,
Спапяляеш агнём лютых ворагаў тыл.

Адшумеў лістапад, адзвінелі дажджы,
І зіма панагнала пякучых вятроў.
Табе цяжка, мой друг? Пацярпі, перажджы,
Куй расплату у нетрах дрымучых бароў.

Хутка, хутка настане рашаючы бой,
З тылу твой наляціць партызанскі атрад.
Здрыганецца зямля ад расплаты святой,
І ад смерці нідзе не схаваецца гад.

Да канца будзь жа смелым і мужным,
мой друг.
Знаю: зброі ніколі не выпусціш з рук.
Лепш загінуць са славай адважна ў баю,
Чым у рабстве пакінуць краіну сваю.

*1941*

## ФАШЫСТАМ ЛІТАСЦІ НЯМА!

З глухіх і цёмных сутарэнняў,
Прапахшых кроўю і вайной,
Арда раз'юшаных стварэнняў
На край накінулася мой.

Ім незнаёмы дружба, ласка,
Ні радасць працы, ні любоў.
Бунтуе пад жалезнай каскай
Распусная і злая кроў.

О, мы ніколі не даруем
І не забудзем гэта век,—
Як маці вешалі старую
І як сясцёр вялі на здзек.

Як мучылі байцоў у Брэсце,
Як руйнавалі родны Мінск,
Як на вачах дзяцей жанчын
Нямецкі вырадак бясчэсціў.

Мая зямля, мой край распяты,
Не радуй ворага слязой.
Абруш мацней у сэрца ката
Расплаты вострае лязо.

Не распластаемся мы ніцма
Пад фашыстоўскаю нагой,
Клянёмся: лютых чужаніцаў
Скасіць усіх да аднаго.

Таварыш, выкінь з сэрца літасць!
Калі ты хочаш волю мець,
Плаці нянавісцю бандытам:
За кулю — куля, смерць — за смерць!

Грамі навалу злыдняў прагных,
Калом, гранатаю глушы,
Тапі гадзюк у чорнай багне,
Пятлёй пяцьковаю душы.

Падсцеражы іх цёмнай поччу,
Перахітры у светлы дзень.
Чым больш фашыстаў ты прыкончыш,
Тым выратуеш больш людзей.

*28.XI1941*

## ДАРОГА ВАЙНЫ

1

Перад вачмі пажар вялізарны,
Густы, цяжкі ваенны дым.
На паясы дарог нанізаны
Палаючыя гарады.

Над беластоцкімі мурамі
Яшчэ не змоўкнуў бомбаў віск,
Агонь чырвонымі клыкамі
Грызе разбіты Ваўкавыск.

Дарога сталлю разварочана,
Абвален мост на дно ракі;
Ляжаць маўкліва на абочынах
Бязногія грузавікі.

Брыдуць натоўпы за натоўпамі,
На спінах — клункі, як гарбы.
Нібыта з веку дапатопнага
Сівую вывалаклі быль.

Тады мы першы раз заўважылі,
Як шмат у кожнага дабра.
У жыта кідалі паклажу мы —
Ўсяго з сабою не забраць.

Ішлі на ўсход шляхамі белымі,
Дзялілі напалам бяду.
З канаў рукамі агрубелымі
Рудую чэрпалі ваду.

Мы ведалі: вайне-грабежніцы
Не пакасіць нас, не пажаць.
Лепш будзем век бадзяцца ў бежанцах,
Але не скутымі ляжаць.

2

Я не ведаю, колькі ішоў —
Можа, дзень,
Можа, год,
Можа, нават стагоддзе.
Разгубіў самых верных таварышоў,
А другіх не знаходзіў.
І запомніцца на гады
Гэты шоргат калёс—заіржаўленых ціл,
Сум людскіх галасоў і папуры дым,
Гэта стома ў нагах і гарачы пыл,
Гэты, ўсімі забыты, палаючы лоўж,
Гэтых мёртвых вачэй сіняваты лёд...
Той дарогі бясконцай затуплены нож
Раніў сэрца маё навылёт.
Я аднойчы ішоў
На жаўцеючы ветразь страхі,
Каля чорных абвугленых хат.
І тады першы раз апаліў мяне выгук
сухі,
Нібы выбрах сабакі шалёнага: «Хальт!»
Што ж, усё зразумела.
Сашчэплена кола наўкол
Маіх лепшых надзей
Я ў сваіх уладаннях акружан.
Як злачынца, хавайся, туляйся тайком,
Раздзірай твар і рукі аб дзікія ружы.
Гэта цяжка, сябры,
прабірацца па нівах, якім
Спавядаўся з маленства
І ўсе выкладаў таямніцы,
І распытваць зямлю,
Дзе калісь плёў з рамонку вянкі:
«Ты не выдасі сына свайго чужаніцам?»
Гэта горка, сябры,
ноччу ў пыле ляжаць прыдарожным,
Прытварацца,
што ты ў гэту хвілю распяты і мёртвы,
Бо ўзнялі недзе побач
тупыя пасы пасцярожана
І вынюхваюць прагна цябе кулямёты.
Потым ранак пралазіў
Праз гушчар затуманеных хвой.

Зноў лавілі мяне нераты таямнічых
сцяжынак.

Я ішоў на ўсход,
і сляды засыпала за мной
Мутнаватае срэбра залётных дажджынак.
Фронт бліжэй і бліжэй,
Грозны грукат плыве па барах.
І ўжо сэрца маё
Налілося салдацкаю злосцю.
Я іду.
Я прыйду.
Падаб'юць — дапаўзу на руках,
Каб вінтоўку узяць
І за тое, што бачыў, адпомсціць.

*1942*

## КРАІНА МАЯ

Краіна мая, радасць мая,
Песня мая маладая!
Па нівах тваіх, па тваіх гаях
Сынава сэрца рыдае.

Ты часта прыходзіш ка мне, як сон.
Хмараю праплываеш,
Птушкай садзішся на ціхі клён,
Звонкім дажджом ападаеш.

Тады ўспамінаецца ўсё да драбніц,
Што звязана з родным краем,—
Як жыта шуміць, як агонь зарніц
На дне азёр дагарае.

Як летам спякотным за днямі дні
Ішлі па іржышчы калючым...
Мы ранілі ногі аб камяні,
І нам не было балюча.

І не было нічога ярчэй
За сонца на родным небе,
І не было нічога смачней
Матчынага хлеба.

Вада з прыдарожнага ручая
Была саладзей за мёд нам...
Краіна мая, маці мая,
Лёс твой цяжкі і гаротны!

Топча, катуе тваю зямлю
Вылюдак ашалелы.
Я кроў да апошняе кроплі пралью,
Каб толькі табе палягчэла.

Ні славы, ні скарбаў я не хачу,
Мне б толькі прыйсці непрыкметна,
Зямлю сваю пад нагамі адчуць,
Надыхацца родным паветрам.

*1942*

* *

Кожны з нас прыпасае Радзімы куток,
Каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны —
Дым над хатай, снапамі прыціснуты ток,
Матчын спеў і гароды, прапахлыя кмінам...

Гэта быў сорак першы палаючы год.
Прабіраліся мы з акружэння на ўсход.
У аршанскіх лясах на адной з дарог
Я пазнаў сярод верасу след маіх ног.

І паклікала родная хата мяне.
Я падпоўз да сяла, калі гаснулі зоркі,
Расхінуў асцярожна кусты і знямеў —
Каміны... каміны... Дух пажарышча горкі.

Развіднела. А певень людзей не будзіў.
Цішыня. Мёртвы попел. Ні стуку, ні груку.
Толькі клён, што мой бацька калісь пасадзіў,
Грэў на сонцы свае абгарэлыя рукі.

Я схаваў твар у травы. І зямля, як дзіцё,
Да мяне прытулілася целам магутным:
«Дзе ж ты быў, дзе ж хаваўся ты гэтулькі дзён,
Што дамоў не ішоў?» — запытала ледзь чутна.

Не прыпомню цяпер, што ў адказ я шаптаў —
Ці зямлю суцяшаў, ці пра маці пытаў.
Слоў вуголле злятала з патрэсканых губ,
І растоптаны кут быў да болю мне люб.

Наліваліся кветкі сцюдзёнай расой,
І прамыла раса мае сумныя вочы,
Каб убачыў я ўсё, каб запомніў усё,
Каб я думаў пра помсту і ўдзень, і ўночы.

*1942*

## ПАЧАСТУНАК

Афіцэр счарнеў ад лютай злосці:
Людзі зніклі, свірны ўсе пустуюць.
«Гэй, стары, патрушчым твае косці,
Калі добра нас не пачастуеш!»

Адчувае сэрца — будзе ліха:
Звоняць зброяй, пагражаюць каты.
І сказаў стары калгаснік ціха:
«Пачастую вас, заходзьце ў хату».

Прычыніў шчыльней у склепе дзверы.
Пацямнелі, нібы хмары, вочы.
Дзесяць немцаў, дзесяць афіцэраў
За сталом расселіся, рагочуць.

«Што ж марудна цягнеш ты прысмакі?
Падавай нам стравы беларускай!» —
«Ёсць для вас, фашысцкія сабакі,
У мяне гарачая закуска».

Размахнуўся з-за пляча гранатай —
Раз! — і грымнуў перуновы выбух.
Палыхнула гнеўнай помстай хата,
Азарыла ціхія сядзібы.

Ён памёр ля роднага парога,
Сэрца гераічнае заціхла.
А на бляск пажару па дарогах
Партызаны несліся, як віхры.

На гарачых конях паляцелі
Дабіваць раз'юшаную нечысць.
І клінкі навостраныя пелі
Аб адважным сэрцы чалавечым.

*1942*

## ВЯСНА ІДЗЕ НА БЕЛАРУСЬ

Бой яшчэ не скончан. Б'юць гарматы,
Аж гудуць ад водгулля лясы.
І плывуць на захад перакатам
Хрыплыя глухія галасы.
Змятай хваляй адкаціўся вораг,
Па-над полем кружаць крумкачы...
Узыходзіць воін на узгорак,
З-пад рукі глядзіць удалячынь.
Як акінуць вокам — сінім морам
Леглі беларускія бары.
Там сягоння слёзы, кроў і гора,
Там сягоння лютыя звяры.
Раптам дзьмухнуў сакавіцкі вецер,
І баец адчуў — ідзе вясна.
Заўтра сонца весялей засвеціць,
Скрышыць лёд магутная Дзвіна.
Заўтра там раскованыя рэкі
Змыюць з ніў пакуты і прымус.
Будзеш ты свабоднаю навекі,
Дарагая наша Беларусь.
І тады баец сябрам гукае:
«Блізка Віцебск. Трэба паспяшыць!»
І пайшоў наперадзе палка ён
З сонцам на штыку і у душы.
Веру: перамога вас чакае,
Слаўныя мае таварышы!

*1942*

## КОНЬ

Праз тысячы пастак з нямецкага тылу
У полк прабіраўся адважны разведчык...
На сінія травы, на сосны густыя
Павольна спускаўся жнівеньскі вечар.

Дабрацца б хутчэй, пра задумы д'яблаў
Усё расказаць бы свайму маёру,
Ды ногі не служаць і сэрца аслабла,
І рана няўгойная ные ад зморы.

Прылёг... А пушча прыглушана вые,
З гушчару вее трывогай нядобрай,
І травы навокал нібы жывыя —
Пралітая кроў пульсуе ў сцёблах.

А вуха да гонкай сасонкі прытуліш —
Яна адгукнецца затоеным стогнам;
Там чуецца горкая скарга матулі,
Што ў горы па дзецях замучаных сохне.

Ізноў ажывае усё, што бачыў
На нівах растоптанай Беларусі.
Баец устае, і з вуснаў гарачых
Злятае рашучае: «Дабяруся!»

І тут з-за хвоі, нібыта з казкі,
Каня стары селянін выводзіць.
Конь стукнуў падковай,
                              вуздэчкай забразкаў.
Байцу селянін перадаў паводдзе.

«Бяры, таварыш, майго варанога —
Уласнай рукою узгадаваны;
На полі шырокім, у доўгіх дарогах
Дзесяць гадоў ён служыў аддана.

Бяры, таварыш, ляці, таварыш,
Не збылытай таемныя сцежкі крывыя.

Імчыся пушчай, імчыся ярам,
Прыводзь хутчэй палкі баявыя».

«Чакай, мы прыйдзем! — крыкнуў
разведчык.—
Расплата страшная не за гарою».
І знік, як вецер, коннік. І вечар
Сляды старанна прыкрыў зарою.

*1942*

## ТРЫВОЖНЫЯ ЗВОДКІ

Ты ўсхопішся ранкам, нікім не разбуджаны,
І з сэрцам трывожным падыдзеш да радыё.
Чакаеш. Так, пэўна, чакае асуджаны,
Каб прыгавор апраўданнем парадаваў.

Сябе суцяшаеш зацяжкай махорачнай,
І выраз вачэй тваіх шчэ не акрэслены...
На поўдні ад сонца і выбухаў горача,
Над славай казацкай сякера занесена.

Крывёю заліта трава прыдарожная,
Пшаніца патоптана, дым над сялібамі.
З гранатай ля сэрца пад танкі варожыя
Кладуцца байцы непраходнымі глыбамі.

Суровыя весткі і думы суровыя.
Не зломіць нас вораг ніякімі бедамі!
І ўвесь ты падцягнуты і падрыхтаваны
Да працы, якая спачыну не ведае.

Выходзіш. Хвіліну глядзіш, як хістаюцца
Пад ветрам асіны над скошанай пожняю.
Праходзяць суседзі і ціха пытаюцца
Пра Дон і Растоў, пра навіны апошнія.

Іх рукі і вусны да мулкасці жорсткія,
І ў кожнага вочы — надзея у хворага.
«Спакойна, таварышы! Землі прыдонскія
Сягоння гараць пад нагамі у ворага».

Хто ў кузню, хто ў поле — усе разыходзяцца
Упарта каваць перамогу агністую.
І нечыя словы па сэрцах ўжо коцяцца:
«Нічога, таварышы, вынесем, выстаім!»

*1942*

## ПЕСНЯ

Над пушчаю вечар,
Над пушчаю вецер,
Над пушчаю месяц
Задумліва свеціць.
Агонь на паляне гарыць.
Пад крыллем сасновым
З аблiччам суровым
Сядзяць баявыя сябры.

Рассыпаны зоркі
На небе імглістым.
Злятае з-пад зор,
Як матыль залацісты,
І падае ў полымя ліст.
І просяць націху
Сябры гарманіста:
«Зайграй, заспявай, гарманіст!»

І ён пачынае:
«Над Прыпяццю сіняй
Сустрэўся я з ёю
Вясновай часінай
Пад клёнам высокім, густым...
Прыйшлі чужаніцы,
Забілі дзяўчыну,
Пасохлі на клёне лісты.

Мядовыя росы,
Лядовыя росы...
Не росы, а слёзы
Цямнеюць на лозах,
На папараці і дзеразе.
Сасонкі прыглушана
Ў лесе галосяць,
Туга маё сэрца грызе.

Падайце мне, хлопцы,
Вінтоўку, гранату,

Пайду я, знайду я
Праклятага ката.
Забойцу на свеце не жыць.
За здзекі з дзяўчыны,
За гора краіны
Адпомшчу — зямля задрыжыць!»

*1942*

## МІНСКУ

Ляжыш ты, мой горад, як волат, распяты
На пыльным крыжы беларускіх дарог.
Нянавісць і гора, і прагу расплаты
Сабраў ты па кроплі і ў сэрцы збярог.

Твой гонар і славу тваю абражае
Паганая лаянка п'яных салдат,
І смех прастытуткі, і мова чужая,
І свіст паліцэйскіх, і цені ад крат.

Знявечаны сталлю, закураны дымам,
Апалены чорным смяротным агнём,
Для нас ты застаўся красою Радзімы,
Надзеяй і заўтрашнім радасным днём.

На плошчах, на вуліцах попел гарачы
Не выпаліў след мой, не змыў яго дождж.
Я разам з табою над трупамі плачу,
Мой горад любімы — мая маладосць!

Хачу аднаго я: па бруку шурпатым
Прайсціся яшчэ раз, зірнуць на муры:
Хачу пакланіцца руінам той хаты,
Дзе Янка Купала паэмы тварыў;

Над Свіслаччу з сябрам памарыць пра шчасце
Ці, сціснуўшы зубы, ў бядзе памаўчаць
І гэтыя вершы маўкліва ускласці
Жалобным вянком на магілы мінчан.

Мой Мінск дарагі і далёкі, далёкі,
Гартуй сваю ярасць, змагайся, дужэй!
Я радасць цяпер вымяраю на крокі —
Штодня да мяне ты бліжэй і бліжэй.

Калі ж не дайду, а сажне мяне куля,—
Памерці усё ж такі будзе лягчэй,
Апошні раз кінуўшы ў бок тваіх вуліц
Пагляд прадсмяротны журботных вачэй.

*1942*

## СЯБРОЎСТВА

Для нас шумелі спелыя палі,
Для нас дразды спявалі звонка песні.
Мы плён зямлі бясклопатна пілі,
Як дар законны ў будучыню песлі.

Нас мала хваляваў далёкі бой,
Лагодны сон навекі часта плюшчыў.
І верш зіхцеў ружоваю лухтой,
І сэрца заплывала лёгкім тлушчам.

Ледзь пырсне дождж, ледзь грымне цёмны гром,
Мы цешымся цяплом свайго пакоя.
Была душа часамі пад замком,
Было нярэдка нават і такое,

Што думкі трупянелі ад драбніц,
Верш курчыўся пад раўнадушным зіркам,
І плёткі ў падарунак ад радні,
І дурнямі прывешаная бірка...

Пакуль на сходах спрэчак чэрствы ком
Жавалі, падпаўзала гэта дата.
Паэт, калгаснік, лекар і нарком
Прыйшлі ў бяду без рангаў і мандатаў.

На скрыжаванні бежанскіх шляхоў
Вайна нас пазбірала і здружыла.
І мы адчулі, што адна ў нас кроў,
Што нас усіх адна зямля ўскарміла.

Паміж сабою сталі мы бліжэй,
З суровых вуснаў не злятаюць скаргі.
І куст лазы палескай даражэй
Зрабіўся нам за казачныя скарбы.

І, смалячы салдацкую махру,
Ўсё думаем пра віцебскі гасцінец

І з заміраннем сэрца чуем хруст
У пушчы роднай тонкіх хварасцінак.

Нам прыйдзецца сяброў не раз лічыць
І ўсё запісваць ў сэрцы, як у кнізе...
Хвала і слава могуць разлучыць,
А гора і бяда заўсёды зблізяць.

*Ліпень, 1942*

* *

Будуць вечна сады расцвітаць,
Белагрудыя ластаўкі лётаць
І дзявочыяногі таптаць
Залатую лотаць.

Але гэткай вясны і спам
Не прыдумаць ніколі болей,—
Напаіла сягоння вясна
Успаміны болем.

Росы падаюць з ціхіх траў
На мае армейскія боты.
Растрывожыў, усхваляваў
Дрэў і кветак ласкавы дотык.

Думаў — толькі кроў і вайна,
Толькі жорсткія словы і думы.
Адгукнулася раптам яна,
Нібы рэха далёкае, сумам.

Вось, здаецца, поруч ішла б,
Гарадзіла б дзявочыя глупствы:
«Глянь — з бярозай цалуецца граб»
Ці «Дастань мне вясёлку на хусту».

Не, не прыйдзе яна у лясы:
Там, за фронтам, знаёмая хата...
І птушыныя галасы
Заглушае голас гарматы.

*1942*

## СІНІЯ КАСАЧЫ

А калісьці і я прачынаўся у бацькавай хаце.
Чэрвень. Раніца. Росы і цішыня.
На гародзе спявае націху маці
Пра маладога жаўнера, пра гнядога каня.

А пад вокнамі мята п'е сонца гарачае,
І глядзяць мне у вочы красой нерастрачанай
Сінія касачы.

Маладосць з краю ў край мяне весела кідала,
Колькі кветак дзівосных пабачыў і змяў!
Ля адных выраштаў, што бадзяцца абрыдла,
Каля іншых шаптаў я чыёсьці імя.

Любаваўся, глядзеў на краіны я розныя,
А пісьмо ад сястры напявала пра росныя
Сінія касачы.

Не паспелі у шчасці як след пакупацца мы,—
Бомбы свіснулі, пырснула першая кроў.
Хата вочы закрыла дашчанымі пальцамі,
Каб не бачыць гора гаспадароў.

Прашаптала матуля на ростані: «Лёс такі!..»
І прыніклі журботна да градак пялёсткамі
Сінія касачы.

Пяць франтоў мяне пылам гарачым абсыпалі,
За вайну перамераны тысячы вёрст.
З успамінамі крочыў пад ветрамі сіплымі
І з надзеяй на студзеньскім холадзе мёрз.

І заўсёды здалёк, праз прасторы вялікія
Усміхаліся мне і дамоў мяне клікалі
Сінія касачы.

Нехта бруднымі ботамі, пэўна, іх вытаптаў,
Выбіў градкі, спаліў невысокі паркан.
І не мае аздобы зямля працавітая,
І сумуе па кветках маўклівы туман.

Прыйдзе час — зноў збудуем мы хаты утульныя,
А цяпер — біць дык біць! І за слёзы матуліны,
І за сінія касачы.

*1942*

## ТЫ СКАЖЫ МНЕ, ЗЯЗЮЛЯ...

Напілася зязюля сцюдзёнай расы
І хацела ляцець да сябе у лясы,
Толькі я папрасіў: «Не ляці, пачакай,
Сумна мне, закувай».
«Што ж, не цяжка мне, хлопча, табе зваражыць,
Хочаш — праўду скажу, колькі будзеш ты жыць.
Загадай».
«Ну, пра гэта я ведаю сам:
Пакуль сэрца ад гневу святога гарыць,
Пакуль куля у дуле нагана ляжыць —
Буду жыць».
«Запытайся тады пра нявесту сваю —
Праз колькі гадоў ты сустрэнешся з ёй,
А ці хутка вясельную песню спяюць
Для тваёй маладой».
«І пра гэта не варта мне думаць-гадаць:
Да нявесты каханай рукою падаць.
Дай вось толькі прагнаць чужаніц
Ад шырокіх дарог, ад блакітных крыніц,
Каб пазваць на вяселле я мог землякоў,
Каб мы жыць распачалі ля родных дуброў...
Ты, зязюля, мне лепей сягоння скажы,
Колькі нашых сяброў у магілах ляжыць,
Колькі выбіта ніў, колькі спалена хат,
Колькі вытаптаў кветак раз'юшаны кат?»
«Многа прыйдзецца, хлопча, табе сумаваць,
Цяжка раны радзімай зямлі залячыць.
Ад зары да зары
Цэлы месяц куваць
І ўсяго не злічыць, не злічыць».
«Што ж, я сам падлічу
І за ўсё адплачу!»

*1942*

## ПАДБІТЫ ТАНК

Грозных танкаў сталёвыя жэрлы
Прапаролі шкляны небасхіл.
І вада яшчэ дробна дрыжэла,
І зямля ляжала без сіл.

Запяклася па ўскрайках варонак,
Як на вуснах, чорная кроў.
А на захадзе ў дыме чырвоным
Бой жалезным голасам роў.

Той часінаю з пушчы сіняй
Сцежкі родныя прывялі
Маладую жанчыну з сынам
На гарачы кавалак зямлі.

У знямозе на камень села,
Попел босыя ногі пёк,
На пажарышча доўга глядзела
І шаптала: «Сынок!.. сынок!..»

Ані хаты, ані павеці —
Голы комін ды цішыня...
А тым часам трывожны вецер
Хмары чорныя ў гурт зганяў.

І навісла цяжкая хмара,
Каб пад сінім агнём бліскавіц
Дружным залпам дажджу ударыць,
Мёртвы попел з руінаў змыць.

«Дзе знайсці прытулак для сына?
Дзе схаваць крывінку сваю?»
І убачыла раптам жанчына
Танк, паранены у баю.

Ён стаяў, велізарны, зялёны,
Каля чорнай абвугленай ліпы.
Шалупайкі жоўтых патронаў
Да падбітай лапы наліплі.

Але велічы ён не страціў,
Быў пагрозны ён і ў бядзе.
Узнялася сумная маці
І да танка з сынам ідзе.

Скрыпнуў танк ёй: «Залазь, я рады.
Гадам сцен маіх не прабіць...»
Дзе ляжалі радком снарады,—
Дзіцянё бесклапотна спіць.

Мог бы танк той жанчыне з пушчы
Расказаць, як чужынцаў біў,
Як фашысцкія косці трушчыў,
Як варожыя танкі давіў.

Ды не трэба... Яна заснула
Першым вольным, спакойным сном.
Сніла добрыя сны і не чула
Паядынку танка з дажджом.

Як, узняўшы сталёвыя біўні,
Ён, жартуючы, адбіваў
Залатыя атакі ліўняў
І маланак вогненны вал.

*1942*

## СЯБРУ ПА ЗБРОІ

Год гарачых баёў і суровых нягод,
Год рыдаючых рэк і патоптаных ніў.
Гэты сталлю і полымем хрышчаны год
Нас з нянавісцю кроўю братоў парадніў.

Смерць у дзверы к нам стукала тысячы раз,
Здрада хітрая моўчкі нам гібель віла.
Толькі мужнасць ніколі не кідала нас,
Па разбітых дарогах да помсты вяла.

І сягоння, у сонечны чэрвеньскі дзень,
Дакраніся, таварыш, да ўласных грудзей —
Сэрца б'е гнеўным звонам. Не сэрца, а гарт.
Ты не знойдзеш у ім ані слёз, ні спагад.

Чуеш, грымнулі першыя громы ў барах,
Чуеш, гнеў на зары у паход затрубіў?
Табе поплаў і поле гавораць: «Пара!»
Табе попел руінаў загадвае: «Бі!»

Сёння плечы, таварыш, шырэй разгарні
І варожае сэрца на мушку вазьмі.
Грукне стрэл — і ў яго бліскавічным агні
Перамогі абрысы ты ўбачыш на міг.

*1942*

## ГЭТА БУДЗЕ

Мы знаем: ісці яшчэ доўга да Мінска
па цяжкай дарозе,
Па снезе, па ручаінах, па травах,
вільготных і цёплых...
А горад наш родны убачым —
і сэрцы заб'юцца ў трывозе,
Маўкліва яго прывітаем і ступім паціху на попел.

Прагрукаюць танкі, і коні па бруку
працокаюць гулка,
Збягуцца мінчане насустрач
з лясоў і пахмурых зямлянак.
Мы знімем пілоткі і пройдзем
па спаленых вузкіх завулках,
Суровым дапытлівым вокам
у душы людскія заглянем.

І мы без памылкі пазнаем,
хто быў нам сястрою і братам,
Яны нам раскажуць, як ноччу
атрад партызанскі хавалі,
Як армію нашу чакалі,
як зброю на помсту кавалі —
І будзе ім хлеб, і спагада, і ласка, і новая хата.

Пазнаем і тых, што за грошы
сумленне сваё запрадалі.
Навостраны штык ім напомніць
прысягу на вернасць Радзіме,
Байцоў прадсмяротныя стогны
і матак глухія рыданні,
Хлуслівыя словы і сцежкі, якімі чужынцаў вадзілі.

Не будзе куды ім схавацца —
нянавісць узнімем сцяною.
Судзіць адшчапенцаў устануць
прабітыя кулямі дзеці,

Крывёю залітыя рэкі, падбітыя бомбамі хвоі,
Каменні забруджаных плошчаў
і чорны задымлены вецер.

І стрэлы па вырадках будуць
Пачаткам здабытага шчасця.

*1942*

## ПАРАВОЗ

Раз'юшаным вірам клубіўся агонь,
Лізаў гарачыя рэйкі,
І з болем глядзелі з далін на яго
Бездапаможныя рэкі.

Цяжкі паравоз ад самоты загуў
На ўвесь свой пракураны бас,
Як быццам хацеў пра сваю тугу
Сказаць у апошні раз.

Як быццам паскардзіцца ён хацеў
Сонцу, дрэвам і водам,
Што ростані час, як віхор, наляцеў,
Што адступаем на ўсход мы.

Маўкліва і горда вакзал дагараў,
І доўга за сінім возерам
У травах густых, у барах заміраў
Суровы плач паравоза.

Масква адбівала лавіны атак,
Краіна сілы збірала,
І ён калоны магутных танкаў
Вазіць стаў на фронт з Урала.

Байцоў на славу і подзвігі вёз,
Назад ледзь цягнуў трафеі.
Сек яго вецер, марозіў мароз,
Душыла зімовая вея.

Сцярвятнікі чорныя ноччу і днём
З-за хмар па яго палявалі.
Жалезнае цела палілі агнём,
Свінцовым дажджом палівалі.

А ён залечваў раны і — зноў
На захад, дарогаю простай;
Сухі перастук рассыпаў між палёў,
На колы наматваў вёрсты.

І з кожнай пуцёўкай бліжэй і бліжэй
Разбітая родная станцыя.
Там голас ягоны зямля беражэ,
Хавае, як скарб, ад паганцаў.

І хутка ўжо людзі яго сустракаць
Выйдуць з хацінаў знявечаных,
І дрогне жалезны голас гудка
Радасцю чалавечай.

*1942*

6 Зак. 839

## ДЗЕЦІ ВАЙНЫ

Ім не спявалі маткі калыханкі,
Яны не чулі казак ад дзядоў,
Палохаў іх ахрыплы голас танкаў,
Трывожыў іх журботны енк удоў.

Яны не плакалі бяссоннымі начамі,
Калі ад бомбаў неслі іх у склеп.
І словы першыя, якім іх навучалі,
Былі пра немцаў, пра вайну і хлеб.

Заціхнуць бітвы. Вораг будзе знішчан.
І дзеці прычакаюць таго дня,
Калі з-пад воблака ўпадзе на папялішчы,
Як цёплы дождж, густая цішыня.

Нясмела з хат яны у поле выйдуць,
Каб першы раз спакойна у жыцці
Палюбавацца родным краявідам,
Паслухаць звон рачулкі у трысці.

Пі пах лугоў, красой гаёў любуйся!
І ўсё ж іх сэрцы задрыжаць не раз:
Ім здасца самалётам першы бусел,
Пажарам здасца першая зара.

Лагодны гром за дальняю дубровай
Напомніць ім пра жах бамбардзіровак.
І часта, часта ў чыстыя іх сны
Ўрывацца будуць галасы вайны.

*1942*

## ІДУЦЬ СІБІРАКІ

Не па грукату мін і снарадаў,
Не па спаленых вёсках
Я цябе пазнаю,
Мой суровы Калінінскі фронт...
Па дванаццаці рэчышчах
Льецца адборнае войска —
Баявая лавіна
Сібірскіх праслаўленых рот.

На таежных вушанках
Рассыпаны зорак мільёны,
Тае іней на хвоях
Ад подыху моцных грудзей,
Угінаюцца нівы
Ад кроку бясконцых калонаў,—
Гэта армія мужных
Да лясоў беларускіх ідзе.

Абвявае сурова іх
Вецер сівога Валдая,
Б'е стары Селігер
Урачыста у хвалі-званы.
На раз'юшаны захад,
У чорную дымную далеч
Маладосць наша крочыць
Па разбітых дарогах вайны.

Рыбакі з Енісея
Ідуць ваяваць за Айчыну,
Паляўнічыя з Нерчынска,
Лесарубы з Іркуцкай тайгі.
І глядзіць Тарапец абгарэлы
Пустымі вачыма,
І сціскаюцца сэрцы байцоў
Ад вялікай тугі.

Так прыходзіць нянавісць...
Байцы аўтаматы здымаюць
І запалы ўстаўляюць

У вузкія горлы гранат.
Набліжаецца бітва,
І Волга браню апранае,
Каб навек не аглохнуць
Ад пошчаку злых кананад.

Яшчэ два пераходы —
Між снягоў, ад агню парыжэлых.
Навіна прашуміць,
Што Сібір на падмогу прыйшла.
Яшчэ два пераходы
Да спавітага полымем Ржэва —
Іх салдацкая слава
Там пачне пераможны свой шлях.

*1942*

## БАЙЦУ, ЯКІ ПЕРШЫ СТУПІЎ НА БЕЛАРУСКУЮ ЗЯМЛЮ

Не знаю, хто ты — баявы уралец
Ці дужы, каранасты сібірак.
Падправіўшы спраўней паходны ранец,
Прайшоў ты першым па маіх барах.

Ты першы кроплі горкіх слёз сірочых
Сваёй рукой з дзіцячых твараў сцёр.
Ты першы паглядзеў прыветна ў вочы
Бацькоў маіх любімых і сясцёр.

Ты ў бой ішоў з пагардаю да смерці,
Каб ратаваць мой край.
Ты парадніў
Сябе навекі з беларускім сэрцам,
З дубровамі, з красою нашых ніў.

Усё, чым нашая зямля багата,
Цяпер тваё — і вішні пад акном,
І песні звонкія, і стромкіх сосен шаты,
І беларуса дом — твой родны дом.

Ты зноў у бой...
Над Нёманам далёкім
З надзеяй хвоі шэпчуць: «Ён ідзе!»
Ідзі, баец,
Хай будзе шлях твой лёгкім,
Хай куля не кране тваіх грудзей.

Ты будзеш жыць, ты жыць цяпер павінен
За тых, каго замучылі яны.
Ты стаў цяпер для многіх матак сынам,
Народжаным у цяжкі час вайны.

Па ўсёй зямлі разносіцца, як казка,
Твой кожны стрэл, твой кожны новы крок.
Ідзі, баец, ідзі, наш сокал ясны,
Цябе чакаюць Мінск і Беласток.

*1942*

## ЗВАРОТ

Меднастволы, як выліты, высіцца бор,
Зацвітае на ўзлессі блакітны чабор,
Заглядзелася сонца у люстра азёр,—
Гэта ты, мая Беларусь!

Сіні ранак. Дзяўчына збіраецца жаць,
На плячы маладзік — серабрысты серп,
А наўкол наліўныя сады ляжаць,
Бурштыновыя яблыкі у расе,—
Гэта ты, мая Беларусь!

Я нямала прайшоў за вайну дарог,
А цябе такой непаўторнай збярог...
Бой мацнее!
Я хутка к табе прыйду,
Да грудзей набалелых тваіх прыпаду,
Пакланюся лясам і палеткам шырокім.
Толькі цяжка праходзіць апошнія крокі
Да цябе, мая Беларусь!

Толькі страшна мне думаць пра тую хвіліну,
Калі гляну у вочы я роднай краіне.
Буду хату шукаць,— а знайду руіны,
Буду маці гукаць,— адгукнецца магіла
На пагосце старым пад вярбою пахілай.

Што ж, якой ты ні будзеш — і ноччу, і раннем,
Я пазнаю цябе, я не здраджу табе.
Перанесла ты гора і катаванні
І зрабілася мне даражэй і радней.

Асушу твае слёзы,
Залячу твае раны,
Кожны ліст твой расправлю рукою старанна.
Узніму з папялішчаў твае гарады я,
Насаджу каля вёсак сады маладыя,
Каб ты вечна цвіла
І у шчасці расла,
Дарагая мая Беларусь!

*1942*

## НОЧ ПЕРАД СВЯТАМ

Заўтра мне дваццаць пяць
І Радзіме маёй дваццаць пяць.
Ды пра гэта падумаю я
Перад самым світаннем...
Ноч.
Шуміць лістапад.
Хвоі ў лесе панура рыпяць.
Вецер злосна шпурляецца
Ў твары сухімі лістамі.
Прыфрантовая вёска.
Даждҗом абглыданы лясок.
Звонка хлюпае гразь,
І за ногі хапае пясок.

Як ваўчынае вока,
Мігнуў аганёк папяросы —
Гэта наша друкарня
Стаіць на паходных калёсах.
Тут пад небам дажджлівым
Разбітай Калінінскай вобласці
Мы друкуем гарачыя словы
Аб славе і доблесці.
Тут суровую песню
Аб Сільніцкім, герої-нябожчыку,
Набіраюць рупліва
Дзяўчаты-наборшчыцы.
Іх сукенкі святочныя
Ад дажджоў парадзелі,
У дарогах знасіліся,
Палінялі ад сонца.
Ну, а новых такіх
Не знайсці, не купіць анідзе ім,
Бо так хораша шыюць
Толькі ў роднай старонцы.

Белым крыллем газеты
Машына махае старанна.
Нас трывожыць адно:
Толькі б скончыць у тэрмін тыраж.

Праміне гэта ноч,
І над небам імглістага рання
Панясе самалёт
Падарунак кастрычніцкі наш.
Там, за лініяй фронту,
Над беларускім прасторам
Прашуміць белы лівень
Святочных газет і лістовак.
Дзе яны ападуць —
Ці на луг, ці на чорныя гоні —
На хвіліну малую
Крывавыя раны загояць.
Іх падыме Мінай,
Іх падыме таварыш Заслонаў,
Скажуць хлопцам сваім:
«Па-святочнаму выдадзім бой!»
О, бяссонніца фронту —
Цяжэйшая з нашых бяссонніц.
Быць заўсёды і ўсюды
Табе неразлучнай са мной!..
Зноўку вецер і ноч.
Зноў дарога жуе мае ногі.
Зноў я чую надрыўныя
Грузавікоў галасы.
Гэта зброю вязуць,
Гэта стогнуць у цемры дарогі —
Ад Таржка і да Ржэва
Буксуюць цяжкія «зісы».

*

Не, не так меркаваў
Сустракаць я цябе, маё свята,
Дваццаць пяты Кастрычнік —
Мой светлы і радасны дзень!
Плашч-палаткамі вокны завешаны,
Нізкая, цёмная хата.
За сцяной непагода сівая
У сумныя трубы гудзе.
Адпачні, камандзір,
Ты зрабіў, што табе загадалі,
Захініся шынелем,
На лаву кляновую ляж.
Ды не спіцца, не дрэмлецца...

Лепей іпноў прыгадаю
Твары родных і блізкіх
І дом у сасонніку наш.
Прыгадаю, прыпомню,
Як бацька мне казкі там баяў
Пра ваяцкую славу
Далёкіх і велічных дзён,
Калі з саду праз вокны,
Здавалася мне, наплывае
Не пчаліная песня,
А шабляў разгневаны звон.
Самы раз бы яму,
Пасівеламу мужнаму воіну,
Сёння гушкаць унукаў
Ці, выпіўшы чарку віна,
На вяселлі маім
Са старымі сябрамі спакойна
Ўспамінаць, як раўла
Ў чатырнаццатым годзе вайна.
Ды спакою салдату
Няма аж да самае смерці —
У аршанскіх лясах
Партызан у засаду вядзе...
Хлешча дождж за сцяной,
За сцяной глуха скардзіцца вецер,
Непагода сівая
У сумныя трубы гудзе.

*

Мы па стопцы спірытусу
Хопім у чэсць гадавіны
І па першым лядку
Пойдзем рукі пажарамі грэць.
Чорны дым наплыве
Па узгорках, ярах і далінах —
Эшалоны чужыя
Ў гэты дзень будуць ярка гарэць.
Ў гэты дзень я убачу
Праз хмары высокага дыму,
Як далёкае сонца,
Сваю дарагую Радзіму...
Каб я ведаў, што буду
Так доўга у горкім выгнанні,

Можа, быў бы храбрэйшым
У першае чорнае ранне.
І каб лёг я касцьмі
Па той бок белавежскага бору,
Мо чужынец праклятЫ
Перайсці пабаяўся б мой труп,
Мо б зямля на мяне
Не паказвала з горкім дакорам
Абгарэлымі пальцамі
Мінскіх і гомельскіх труб.
Я не мёртвы. Жывы.
І за гэта жыццё я павінен
Перамогу і шчасце
Прынесці любімай краіне.
І адна у мяне — пра Радзіму —
Сягоння трывога,
І адна у мяне — на Радзіму —
Сягоння дарога.
Праклянуць мяне дрэвы,
І травы, і родная хата,
Калі я не асілю
У бітве нямецкага ката.
Гэта мой абавязак,
Гэта гонар і слава салдата.

*1942*

## АПОШНЯЯ КУЛЯ

Калі застанецца апошняя куля ў маім парабелуме
І ворагі крыкнуць:
«Здавайся, адрэзалі ўсе мы шляхі!» —
Я сцісну мацней рукаятку рукой агрубелаю
І ўспомню, як клёны дрыжаць ад рыданняў глухіх.
І буду я думаць у тую хвіліну смяротную
Не пра вузкія сцежкі, якімі ільга уцячы,
А пра тое, што недзе пад Брэстам
сястру маю родную

Клююць крумкачы.
Буду думаць, як друга на перакладзіне
З ціхім рыпам гайдалі вятры усю ноч напралёт,
І пра тое, што гадам разбіта,
І пра тое, што гадам украдзена,
І пра енкі дзіцяці, якога спускалі пад лёд.
І апошняю куляй,
што да ўласнага сэрца прымерана,

Я фашыста яшчэ аднаго у зямлю загоню
І, стрымаўшы салдацкую клятву па вернасць,
Сваё цела аддам і пятлі, і свінцу, і агню.

*1942*

* *

І гора міне, і радасць міне,
А цвёрда я знаю адно:
Тапельнікам не прычакае мяне
Утульнага побыту дно.

Той, хто столькі, як я, намёрз
На скрыжаваннях дарог і вёрст,
Не здолее ўседзець у цішыні
Пры цёплым хатнім агні.

Калі ты гэтулькі перамясіў,
Як я, гразі пад дажджом,—
Смачнейшыя стравы не даясі,
Пакінеш і стол і дом.

Аж весніцы з прыкрасці такой
Загрукацяць за табой,
Ды здзівяцца жоўтыя бельмы акон:
«Куды гэта напач ён?»

А я праз свіст кажаноў і зарніц
Пайду ля начных крыніц.
І зоркі скажуць: «На нас зірні»,
І кветка: «Мяне кран і».

А я, няўмольны, негаваркі,
Пайду на голас вятроў —
Туды, дзе нястомныя грузавікі
Развозяць па свеце сяброў.

Па звонкаму рэху начных гудкоў,
Па следу былых баёў
Шукацьму найлепшых сваіх радкоў,
Высокіх і дзіўных слоў.

*1942*

## АРТАБСТРЭЛ

Малацілі гарматы,
Малацілі цяжкімі цапамі.
І раўлі камяніцы,
І крышыліся косці мастоў.
Горад быў ці не быў?
Адкажы, не катуй мяне, памяць!
Ці снарад і цябе, нібы шкло на панелі, растоўк?
Вось і горкі ўмалот — гурбы бітае цэглы,
І ўсе людзі навекі пад душнаю цэглай палеглі.
І, здаецца, няма ўжо нікога, нікога на свеце.
То не я пазіраю —
Гэта трызніць атручаны вецер;
То не шкло на каменні,
А вочы мае раструшчаны;
То не дрот са слупоў,
А жылы мае пакручаны.
І не чорныя галавешкі
Датляваюць на бруку,
Гэта ногі мае гараць,
То смыляць мае рукі.
Раптам попел і цэгла варухнуліся, чхнулі, усталі.
Дзіўным голасам чалавечым у мяне запыталі:
«Дай, браток, закурыць.
Ёсць тытунь — будзем жыць...»

*1943*

* *

У мяне не забілі нікога — ні маці, ні жонкі,
ні брата.
Я не плакаў бяссонную ноччу ад горкае страты.
Ад чаго ж тады сэрца так хоча,
так прагне расплаты?
Мне на гэта адкажуць далёкі паднёманскі поплаў,
Плач дзяўчыны бабруйскай і мінскі
затоптаны попел.
Мне адкажуць сцяжынкі, якімі хадзіў па арэхі,
Адгукнецца мой голас у лесе сумуючым рэхам.
Я хацеў бы блукаць Белавежай на золаку росным,
Дзе з зубрамі сябруюць духмяныя гонкія сосны.
Я хацеў бы чытаць свае вершы Дзвіне і Бярозе
Ці з чачоткавым кіем у Слуцак ісці па дарозе.
Ды цяпер аднаму ні праехаць туды, ні прабіцца:
З аўтаматам стаіць на дарозе маёй чужаніца.
Ён абжорся нашым дабром,
Лой гніе на ваўчыных зубах.
Ён шчацінай зарос, як вяпрук,
Чорнай кроўю і тлушчам прапах.
Да талеркі маёй, дзе ляжаў
Ружаватага сала брус,
Прырастала яго губа,
Сліна капала на абрус.
І цяжкая каска яго на маім ляжала стале.
І бандыцкую кулю ён для мяне трымаў у ствале...
Не на тое мне дадзена сэрца,
Каб вораг яго прабіваў;
Не на тое мне дадзены вочы,
Каб злосна каршун іх кляваў;
Не на тое Радзіма мне ў рукі дала аўтамат,
Каб стаяў на дарозе маёй тройчы выкляты кат.
Не гадаю, з якое дарогі ўбачу я край любы мой —
Са Смаленскай, Чарнігаўскай
ці старажытнай Цвярской,—
Будзе дождж бушаваць ці аб каску звінець
будзе град —
Я ўвайду ў Беларусь, як байцы ўвайшлі
ў Сталінград.

*1943*

## НАЧНЫ МСЦІВЕЦ

Пражэктар белаю рукой
На захад паказаў,
І вінт раі гарачых зор
Размёў на ўсе бакі.
І змрок, як чорны вадаспад,
З высокіх крыл сцякаў,
Пакуль зусім не пагасіў
Унізе аганькі.
«У добры час, Адам Краўчук!
Удачы, капітан!» —
Крычаць яму таварышы
Праз зоры і туман.
А ён спакойна ўжо вядзе
На захад бамбавоз —
Штурвал слухмяны у руках
І бомбы пад крылом.
Ён горад свой ляціць бамбіць
І дом, дзе жыў і рос;
Ляціць паліць юнацкі клён,
Што шастаў пад акном.
Мінае фронт.
Тут на агні
Згарае ноч вайны.
Снарады ўнізе глуха б'юць
У рыжыя званы...
Убачыць толькі б родны Сож —
Не шкода ўсё аддаць.
У прорву чорную глядзіць —
Нічога не відаць.
«Мой любы край, зямля мая!
Ты чуеш? Гэта я,—
Твой родны сын, Адам Краўчук.
Я з-пад Масквы лячу.
Зямля мая, мой любы край,
Скажы, чаму маўчыш?»
Пакінь, мой дружа, не гукай:
Не адгукнецца ціш.
Распяў палескую зямлю
Бандыцкі п'яны зброд.

Каб голас свой не падала,—
Зямлёй забілі рот.
Ні стогн, ні крык не даляціць,—
На сотні вёрст туман.
Не, не такім ты ведаў, друг,
Палескі родны край...
Усё прыпомні, капітан,
Хай сэрца плача, капітан,
Начы такое, капітан,
Другі раз не чакай.
А штурман кажа Краўчуку:
«Ідзём на цэль. Пара!»
І сэрца стукнула ў грудзях:
Бязлітасна карай!
Тут прытаіўся сонны звер,
Ён горад прыдушыў.
Зеніткі кінулі уверх
Барвовыя нажы.
І, гасячы агнём агні,
Пайшлі ракеты ўніз.
Чырвапакрылы бамбавоз
Расплатаю навіс...
Гарыць адзін, за ім другі
І трэці эшалон...
І вось паўсталі, як з труны,
І горад, і вакзал,
І родны дом,
І пад акном
Ледзь-ледзь прыкметны клён.
І закіпела на вачах
Дзіцячая сляза.
Закамяней, Адам Краўчук!
Ты — мсцівец, не хлапчук.
І робіць новы разварот
Адамаў самалёт.
«Памры, мой клён,
Памры, мой дом,
Ад сынняе рукі,
Не кідай мне цяжкі праклён,
На лёс не наракай.
Памры, каб попелам тваім
Гардзіліся вякі.
А над руінамі набольш
Забойцаў нахавай!»

...Калі дванаццаты пажар
Устаў на поўны рост,
На ўсход праз полымя ляцеў
Барвовы бамбавоз.
І не заўважыў капітан,
Як маці ля руін
Шаптала, гледзячы услед:
«Мой сын, мой родны сын!»

*1943*

* *

Лес асенні глуха гудзе,
Дзяцел стукае у бліндаж.
Хвоі тоўстыя за акном
Цяжка тупаюць, як сланы.

Дзяцел стукае у бліндаж —
Неспакойны тэлеграфіст.
Як шкада, што я не магу
Зразумець яго тэлеграм.

Можа, гэта мой мінскі клён
Ці барысаўская вярба
Дзіва дзіўнае перадаюць,
Спавяшчаюць пра нечы лёс.

Можа, гомельскія лясы
Мне прыслалі рэха баёў —
Кулямётаў сухі перастук
Ці шалёную спрэчку гармат.

Дзяцел сціх. Пацямнела скрозь.
І апошні нягучны гром
Стаў у шосты накат забіваць
Залатыя цвікі дажджу.

*1943*

# ВОКА СНАЙПЕРА

У вока снайпера, нібы у дом прасторны,
Заходзяць дрэвы, хмары, вечар зорны,
І лёгкі цень птушынага крыла
З разлёту дзеліць вока напалам.

Хацеў бы снайпер у маленькай зніччы
Адразу пазбіраць усіх сяброў,
Муры высокія любімых гарадоў,
Сады, лугі, азёры і крыніцы.

Ды толькі белы яр
І снег навокал,
Ды чорны гад паўзе з кустоў у вока.

У момант вейкі, быццам абцугі,
Зацiснулі гадзюку.
Бліскавіца.
Сцюдзёныя блакітныя снягі
Засыпалі двухсотага арыйца...

І зноў адкрыта снайперскае вока
Для птушак, дрэў, сяброў і зор высокіх.

*1943*

* *

Учора тут жылі салдаты
З кляймом на шэрых рукавах.
Мы ўнеслі волю ў гэту хату
На акрываўленых штыках.

Чужыя ложкі апусцелі,
Гаспадаром жыве мароз.
Да саламяпае пасцелі
Забыты брудны плашч прырос.

На століку тузы і дамы,
Прабіты куляй патэфон,
Талерка костак абглыданых
І недажованы лімон.

На падаконніках бутэлькі
І пачкі кепскіх сігарэт.
Усё не наша. Нават бэлькі
У плямах.фрыцаўскіх газет.

Я печ распальваю таропка,
Кажу са злосцю ў цішыні:
«Палюдскаваліся, і — кропка,
Лепш паскачыце на агні».

Здзіраю, нібы скуру з гада,
Усё, што тут развесіў зброд...
Вяртаем родны воблік хатам
І далей крочым у паход.

*1943*

* *

Адплывае па захад гарматны гром,
Чорны снег і забітых белыя твары,
І пражэктар далёкі светлым багром
Б'е маўкліва ў чырвоную хмару пажару.
Мне б дабегчы і гэты пажар пагасіць,
Толькі рана баліць і замала сіл.
За плячыма — тысячы спаленых сёл
І дзесяткі разбураных гарадоў.
І я ведаю — гэта яшчэ не ўсё,
Гэта толькі пачатак трывожных гадоў.
Вы мне скажаце: будзе ізноўку бэз
І дзяўчаты у лёгкіх блакітных сукенках.
Для мяне ж яшчэ доўга расстрэлены лес
Захліпацца будзе дзіцячым енкам.
Ад чарэмхі — чад і ад бэзу — дым,
Попел скрыпне ізноў на маіх зубах.
Нашай будучыні гады
Будуць доўга глытаць папялішчаў пах.
І цагляная чырвань новых муроў
На мяне пральецца, як кроў.
І за белаю ваппаю свежых сцен
Я убачу хаціны чорны шкілет.
З чарапоў густая трава парасце,
Лівень змые варожага танка след,
А за мною заўсёды, да самай труны,
Будзе крочыць праклятая здань вайны.

*1943*

* *

Яшчэ рана, хлопцы, атрасаць
На паперу горкія ўспаміны...
Халадзее чорная раса
На нямецкіх мінах.

Слых ад кананады агрубеў,
Сонца задыхаецца ад дыму.
Калі возьмем гэты мы рубеж,—
Маткі нас абдымуць.

А калі надзеліць куляй лёс,—
Смерць сустрэнем чэсна, як мужчыны.
Вецер знойдзе нашы вочы паміж рос
І закрые шчыльна.

Змоўкне бой.
Нас знойдуць пад вярбой,
Асцярожна на руках падымуць,
Мёртвых данясуць да вёскі той,
Да якое не дайшлі мы.

Сабяруцца людзі, дрэвы, хаты,
Стануць у жалобе ля труны:
«Слава вам, адважныя салдаты
Самай страшнай і святой вайны!»

*1943*

## ЗУБРЫ

Помню, што гэта было ля Пружан:
Я задрамаў пад вярбою.
Чорнай маланкаю лётаў кажан,
Зоркі лавіў нада мною.
А потым была часіна зары,
І вецер павеяў свежы.
Я раптам пачуў, як равуць зубры,
Як равуць зубры ў Белавежы.
Меркавалі наіўна лясныя быкі:
«Нас мала, паслужым сумленна навуцы».
А тут разлятаюцца хвоі ў бакі,
І бомбы сталёвыя злосна ірвуцца.
Зубры паміраць ад бамбёжкі не хочуць,
Глядзяць на мяне іх журботныя вочы:
«Парай, што рабіць —
Мычэць ці маўчаць,
Ці рогі крутыя
У кроў мачаць?»
А што я, бяздомны, параіць вам мог?
Пры вашым здароўі
Варожаю кроўю
Можна зязюльчын угнойваць мох.
Сунецца гадзіна — стукніце рогам,
Другога падбіце тугім капытом.
У вас жа і сілы, і ярасці многа,
Смялей бараніце зялёны свой дом!
...Дзе тая пушча і дзе зубры?
Дзе вы, пружанскія хлопцы-сябры?
Стаю я на сопцы, па самай высокай,
На захад гляджу засмучаным вокам.
А хвою найбольшую ў Белавежы
Ніяк не угледжу,
Ніяк не угледжу.

*1943*

# ЗА ВАЛДАЙСКІМІ СОПКАМІ

За валдайскімі сопкамі
Сёлы рускія зноў гараць.
За лясамі высокімі
Плачуць Порхаў і Ноўгарад.

Прыкладу вуха к верасу —
Адгукнецца даль стогнамі.
Чую голас — не верыцца,—
Мяне кліча Эстонія.

Мне народам загадана
Тут шлях куляй пракладываць,
Ненавісную гадзіну
І штыком і прыкладам біць.

Лёс адзін у паходзе ў нас,—
І нідзе не прысталі мы.
Мо за Мінск недзе ў бой ідзе
Наўгародзец ці талінец.

Дарагая Прыбалтыка,
Землі родныя, брацкія!
Годы лепшыя бацькавы
Там палеглі за працаю.

Будзе бой, і праб'юся я
У Прыбалтыку сінюю,
І прыйду ў Беларусь сваю
Сцежкай даўняй, дзяцінаю.

*1943*

* *

Бачыў пра гэта у фільме я,
Чуў пра такое у песнях,—
А тут мы свой лёс прапеслі
Ад Селігера да Ільменя.

Ад Ільменя да Селігера
Я праўду вайны пякучую
Нагамі сваімі вымерваў,
Сэрцам сваім вывучваў.

Шынелі нашы намоклі
У багнах, што горай за пінскія.
Запомнім жа хвілі, дамоў калі
Пісалі пад хвоямі пісьмы мы.

Многа іх засталося
Неадпраўленых ля Лаваці.
Можа, і сёння галосіць
Па сыне нечая маці.

Байцы, гэты клімат лаючы,
Балоты штодня кляпучы,
Наказвалі нам, паміраючы,
Ад ворагаў іх берагчы.

Сумленне у нас не куплена,
Вадой не разбаўлена кроў —
Гатовы за кожную купіну
Памерці хоць сто разоў.

Мы хутка наперад рушым.
Хай славяцца блізкія дні,
Калі мы анучы прасушым
На зыркім эстонскім агні.

*1943*

## КОНІ

Дзіваліся мы, і дзіваліся фрыцы:
Такое у сне толькі можа прысніцца
На сене духмяным.

З-пад лесу на поўдзень, нібы у пагоні,
Імчаліся коні, без коннікаў коні,
Па лузе вячэрнім.

Ці травы прынадна сінелі ў балоце,
Ці вострыя кулі пасеклі аброці,
Што коні пабеглі?

Наперадзе белы. Здавалася, нібы
Ён цалкам са снегу. За ім вараны бег,
А трэці — буланы.

Імчаліся коні па травах, па кветках,
Пасланіся дымам іх грывы на ветры.
І стрэлы замоўклі.

Гулі капытамі, як бубнамі, глуха.
Дванаццаць падкоў замігцелі над лугам
Кавалкамі сонца.

Ды выраслі раптам, як чорныя дрэвы,
Смяротныя выбухі справа і злева —
Нямецкія жарты!

І коні пабеглі у пене і мыле
На мінпае поле, к уласнай магіле.
Мы сціснулі зброю.

Няма варанога, і белы канае,
Іх грывы густыя пясок засыпае
І попел гарачы.

Не, гэта не сон, не вячэрняя казка:
Мы біць пачалі з аўтаматаў па касках.
І ноч наступіла.

А трэці, буланы, з крываваю ранай,
Ўсё бегаў між куляў і сініх туманаў
З трывожным іржаннем.

*1943*

# БАЛАДА ПРА МІКОЛУ САСНОЎСКАГА

За вёскай Каменныя Горы
Сярод камарыных балот,
Зарыты па самыя вочы
Стаіць запусцелы дот.
Глядзяць амбразуры са страхам
Туды, дзе між ціхай травы
Гараць, нібы гнеўныя вочы,
Гарачыя кроплі крыві.
Скаціліся гэтыя кроплі
У самым пачатку вайны.
Іх лівень цяжкі не змывае,
На сонцы не сохнуць яны.
А сэрца, з якога крывінкі
Сцякалі,—
цяпер у магіле;
А ў сэрцы ляжаць тыя кулі,
Што грудзі героя прабілі.
Насіў гэта храбрае сэрца
Разведчык Сасноўскі Мікола.
У штурмах, смяротных атаках
Ён страху не ведаў ніколі.
Ды вырас на нашай дарозе
Сярод камарыных балот
Зарыты па самыя вочы
Зялёны ашчэраны дот.
Лупцуе пякучымі кулямі —
Нельга узняць галавы.
Залеглі вясёлыя хлопцы
Сярод невясёлай дрыгвы.
І злосць разабрала Міколу:
«Тут кіснуць не маю ахвоты.
Каб немцы глядзелі са смехам?» —
І шпарка папоўз ён да дота.
Як свіснулі злосныя кулі —
Вада усхадзілася варам.
Прыкрылі ўсе каскамі вочы —
Загінуў без славы таварыш!
А ён ужо стаў каля дота:
«Наперад, чацвёртая рота!»

І целам закрыў амбразуру,
І глотку заткнуў кулямёту.
Тры кулі заселі у сэрцы,
Крывінкі апалі на травы.
Байцы паздымалі пілоткі —
Навекі Сасноўскаму слава!
Мы справім па сябру памінкі,
Якія запомняць вякі.
З вінтовак зрываліся самі,
Наперад ляцелі штыкі.
Гранаты, і кулі, і міны
У гонар журботных памінак
Арыйскім ваўчыным мясам
Балотныя прорвы кармілі.
Штыкі ад крыві аж затлелі,
Пад ботам крышыліся косці.
Ты чуеш, Сасноўскі Мікола,
Як рота чацвёртая помсціць?
З магілы ні слова, ні гуку.
І рота ізноўку устала:
«Наперад, сябры, за Міколу!
Для помсты крыві гэтай мала».
Ад вёскі Каменныя Горы
Да Ільменя вёрст не палічыш.
Валяюцца мёртвыя фрыцы
На грозных сівых папялішчах.
З магілы ні слова, ні гуку.
Крывінкі не гаснуць ля дота.
Іх зыркае сонца не сушыць,
Вада не змывае ў балота.
І верыць чацвёртая рота,
Калі да Берліна аж дойдзе,
Тады адгукнецца Сасноўскі:
«Я чую, сябры мае, годзе!»

*1943*

## ГЕРОЙ

Злосна сказаў: «Уставай, пяхота!
Мы не на пляжы, а на вайне».
І лёг на змяіныя скруткі дроту.
І дзвесце салдацкіх запыленых ботаў
Прайшлі па яго спіне.

Не ён, а другія ішлі ў атаку,
Гранаты кідалі ў бліндажы,
Калолі фрыцаў, палілі танкі
І сцяг перамогі ўзнімалі ранкам
На заваёваным рубяжы.

А ён свае косці з іржавых калючак
Сваімі рукамі без стогну аддзёр,
Зваліўся на травы, і стала балюча
І травам, і росам, і ветрам гаючым,
Што прыляцелі з валдайскіх азёр.

*1943*

* *

Не, гэта не апошняя аповесць,
І летапіс яшчэ не скончан мой.
Над рыжым лугам, над ракою Полісць
Тры дні хрыпіць цяжкі і душны бой.

Мы чуем голас твой, Старая Руса.
Ідзём мы да цябе, Старая Руса.
Няма нам сну: ў нямецкіх ты руках.
Ў адной шарэнзе рускі з беларусам
І побач з украінцамі казах.

Тут кожны хоча уварвацца першым,
Нібы свой дом у гэтым гарадку,
Нібы там кат сабраўся зараз вешаць
Каханую, ці жонку, ці дачку.

На вогненнай зямлі ў сталёвым свісце
Тут кожны воін б'ецца за траіх...
Як мала сіл, каб стаць іх летапісцам,
Як мала слоў, каб расказаць пра іх.

*1943*

* *

Калі мне бывала весела,
Калі мне бывала радасна,
Я часта па цэламу месяцу
Твайго не знаходзіў адрасу.

Цяпер, адзінокі і стомлены,
Твой адрас так ясна успомніў я.
Пішу табе ліст і грахі свае,
Як горкую споведзь, апісваю.

А потым пытаю: навошта?
Не ходзіць туды цяпер пошта.

*18.8.1943*

## КУРГАНЫ

Мне здаецца, што гэта барвовае воблака
Нада мною вісіць з палавецкіх часоў.
Старажытнасць глядзіць затуманеным воблікам
З курганоў прыдняпроўскіх, з пахмурных лясоў.

І акоп гэты вырылі сталлю булатнаю
Нашы продкі сівыя ў шаломах цяжкіх.
Спяць яны ў курганах, меч да меча, па-братняму,
Топчуць ворагі славу пачэсную іх.

А зара, спапяліўшы драты ненавісныя,
Па-над імі ўзняла залатыя крыжы...
Сем гадзін да атакі.
Ізноўку гады свае
Пражыві, бо да восьмай не ўсім нам дажыць.

Заўтра раніцай сонца узыдзе крывавае,
Праплывуць над акопамі журавы.
Калі ляжам і мы ў курганы, дык са славаю,
Вось за гэты бяскрайні прастор баравы.

Да травінкі апошняй зямля наша выгара,
Попел мёртвыя вочы засыпле павек,
Яраслаўна заплача па новаму Ігару,
Сумны голас пакоіцца шалямі рэк.

Толькі не, мы не згінем, тэўтонаў адужаем!
Аніводнаму з іх больш на свеце не жыць.
Па-над мёртвай ардой, над крывавымі лужамі
Груганы будуць з радасным крыкам кружыць.

Свае раны абмыем дняпроўскай вадою мы
І на пір пераможцаў збяромся сюды.
Памянём добрым словам загінуўшых воінаў,
На магілы іх з чарак прыльём, як дзяды...

Можа, заўтра надзеі пахлынуць інакшыя.
А пакуль што праз дрот з той чужой стараны
На нашчадкаў сваіх, на пазіцыі нашыя
З-пад шаломаў зялёных глядзяць курганы.

*1943*



7 Зак. 839

## ДУМЫ САЛДАТА

Запомнілі ўсе мы дарогу старанна
Ад першае бомбы да першае раны,
Ад першае раны да першай атакі,
Калі мы палілі варожыя танкі.
Запомнілі ўсе мы зямлі той кавалак,
Дзе нам па расстанні зязюля кувала,
Дзе прагна і доўга чарпалі пад дубам
З крыніцы пілоткай зліnялай ваду мы,
А нам ужо стэпы вялікай Расіі
Суровыя слёзы вятрамі гасілі.
Зямлі той кавалак заўсёды прысніцца
То кужалем белым, то спелай суніцай,
То поясам слуцкім, то несвіжскім замкам,
Ці то маладой на ўпрыгожаных санках.
Калі б пазбіраць нам з бясконцай дарогі
Сляды, што пакінулі нашыя ногі,—
Яны ўсіх падлюг на зямлі затапталі б,
З-пад іх бы забойцы ніколі не ўсталі.
Калі б пазбіраць той агонь, што паліў нас,
І тыя няшчадныя золкія ліўні,—
Яны ўсіх гадзюк на зямлі спапялілі б
І попел сцюдзёнай вадой затапілі б.
А мы паміралі і зноў ажывалі,
Танулі, гарэлі і ўсё ж не згаралі.
Не жыў я б на свеце ніводнай гадзіны,
Прыкончыла б куля мяне на вайне,
Калі б я не думаў штодня, што Радзіма
Не спіць, з перамогай чакае мяне;
Што будуць званіць урачыста званы,
Што будзем мы некалі ехаць з вайны.
І што б нам ні зычылі добрыя людзі,
Жаданне маё тады простае будзе:
За ночы бяссонныя адаспацца,
З сябрамі за чаркаю развітацца.
А потым ісці скрозь агні лістапада
Дахаты па той абгарэлай зямлі,
Дзе некалі мы, маладыя салдаты,
Ваду, адступаючы, прагна пілі.

*1943*

* *

Старшына, налівай нам стопкі,
Норму поўную выдавай!
Вып'ем мы за валдайскія сопкі,
За балотны прыільменскі край.

Вып'ем мы за лясы густыя,
За прастрэленыя бліндажы,
За пасылкі тылавыя —
Златаусцінскія нажы.

Вып'ем мы за сваіх генералаў,
За ласкавых сясцёр франтавых,
За дзявочыя пісьмы з Урала,
За забітых сяброў і жывых.

Нам за многае піць бы і піць бы,
Ды АХО, памяпуўшы як след,
Запявай, што да свадзьбы-жаніцьбы
Мы дажыць бы хацелі, сусед!

*1943*

* *

Толькі лісцем рабін шалахні
І пакліч па імені —
Для мяне адназа агні
Загарацца над Ільменем.

Я на захад пачну пазіраць,
За сцюдзёныя воды Ільменя,
І вандруючая зара
Загарне ў сваю плынь мяне.

А куды занясе і шпурне —
Я зары даверуся.
Можа, знойдуць людзі мяне
На палескім верасе.

Упаду на дол нежывым,—
Усё роўна і мёртвы я
Буду слухаць гул баравы,
Скрып галля над вавёркамі.

А жывым даплыву, жывым,
Непараненым, непашкоджаным,—
Па шляхах пайду баравых,
Па лугах някошаных.

Да цябе, да знаёмых рабін,
Дабягу і скажу няголасна:
«Я пачуў, я прыйшоў, бо любіў.
Быць табе сярпом, а мне коласам».

*1943*

# РЭГУЛІРОЎШЧЫЦА

Можа, з Калініна, можа, з Саратава
Гэта дзяўчына з чырвоным сцяжком,
Толькі брывамі сурова нахмурыцца,—
Злезеш з машыны і пойдзеш пяшком.

Толькі ўскіне лагодліва вейкамі,—
Гравій пад шынамі запяе.
Чатыры дарогі сыпучымі рэкамі,
Як па загаду, плывуць да яе.

Рэгуліроўшчыца з кволымі рысамі,
На скрыжаванні дарог франтавых
Ты завалодала эмкамі, зісамі,
Сэрцам маім і сябраў маіх.

Ты ад пілоткі да ботаў знаёмая
Нам, што вандруюць з агню і ў агонь.
Кожны з нас хоча, каб трохі запомніла
Ты і аблічча і жарты яго.

Той, каго раптам усмешкай адорыш ты,
Пойдзе з усмешкай тваёю у бой,
Пойдзе туды, дзе ад выбухаў горача,
Каб не заплямiць усмешкі тваёй.

Залатакосая, прызнаюся я:
Хочацца мне, каб ты жоўтым сцяжком
Шлях паказала на Беларусь маю
Пасля апошняй бітвы цяжкой.

*1943*

## ПЕРАД СУСТРЭЧАЙ

Мінаючы бары і рэкі,
З вайны мы вернемся дамоў,
Як стомленыя дрывасекі,
Зваліўшыя пяцьсот дубоў.

Хто выйдзе цэлым, хто абрубак
Павалачэ ў далёкі шлях.
І ўсё ж усім нам будзе люба
І лёгка крочыць па палях.

Мы прынясём да родных гоняў
Увесь цяжар былых трывог,
Залатазорыя пагоны,
Медалі, раны, пыл дарог;

Усе адценні, гукі, фарбы —
Ад стуку сэрцаў у сяброў
Да водбліску далёкіх фараў,
І ўласны пот, і злыдняў кроў.

Як адбушуе навальніца
Сустрэч жаданых, горкіх драм,
Аб перажытым падзяліцца
З братамі трэба будзе нам.

І вось адно мяне трывожыць:
Ці трапна я чужынцаў біў,
Ці шмат праліў крыві варожай
За краі, які заўжды любіў?

Ці маю права пакланіцца
Я тым лясам, дзе жыў і рос?
Ці заслужыў я прычасціцца
Да радасці дзіцячых слёз?

*1943*

## ГОМЕЛЬ

Цёмнай студзеньскай ноччу
у сваім франтавым бліндажы
Думаў я — ці пашчасціць да гэткай часіны дажыць.

Каб пачуць жураўліныя трубы
Над сузор'ямі журавін,
Каб пакратаць далонямі грубымі
Травы палескіх нізін.

Вось і мары збыліся: вецер з Прыпяці вее і Сожа,
І ўрываюцца танкі у Гомель па трупах варожых.

Добры дзень, сенажаці, дубровы —
Залатое Палессе!
Добры дзень, беларуская мова,
Беларуская песня!

Хай не я, а таварыш мой
першым па Гомелі крочыць,
У яго — маё сэрца, пачуцці, і думкі, і вочы.

Ён рукамі маімі братоў
З шыбеніцы здымае,
Маім голасам ён з-за дратоў
Пала624нак гукае.

Маім голасам ён прысягае
адпомсціць за здзек і руіны.
Самы першы у попел кладзе па падмурак цагліну.

І гаворыць: «Пакуль чужаніцы
Дагніюць пад крылом груганов ым,
Зноў узнімуцца тут камяніцы,
Гомель вырасце новы».

*1943*

## ПАЛЕСКІ НАПРАМАК

Палескі напрамак!
Я ведаў цябе не па картах.
Я ведаў твой воблік і пах,
Твае пачастункі і жарты.
Тут кожная цаля зямлі мяне запрашала: «Любуйся,
Як плешча шчупак у аеры,
Як мерыць тарфянішча бусел».
Палескі напрамак!
Сюды па легенды і казкі
Калісьці хадзіў я па кладках між багнішчаў
гразкіх.
Сюды па шырокіх гасцінцах я ездзіў
па новыя песні.
Мяне сустракала гасцінна, як сына, Палессе
Ягаднымі лясамі,
Чырвонымі паясамі,
Дзявочымі галасамі...
Палескі напрамак!
Ляжыш ты ізноў прада мною,
Засыпаны лістам кляновым,
стаптаны вялікай вайною...
Прыйшоў і жахнуўся —
Мне вочы уласныя хлусяць!
Дзе людзі?
Дзе хаты?
Дзе гнуткія вербы у лузе?
Ці ж мёртвая гэта пустэля — маё залатое Палессе?
Ці ж каркание тлустых варон —
твая прывітальная песня?
Ці ж попел счарнелых руін — твая маладая аздоба?
Каму пакланіцца?
Каму мне сказаць свой «дзень добры»?
У першым сяле нас сустрэла
адна усяго маладзіца —
Змярцвелай рукой прывітала
з высокай сухой шыбяніцы.
У гнёздах няма птушанят,
І сонца няма у крыніцах.
Ні бору, ні зораў — раскралі усё чужаніцы,

Пагналі па захад дубровы, пагналі па захад лясы,
Павезлі у цёмных вагонах дзявочыя галасы.
Вось тут два дубы пабрылі,
тут крочыла маці з малымі.
Дымяцца слядоў ланцугі — і мы ўжо
прывязаны імі...
Была цішыня пасля бою.
І першая зімняя хмара
Маўкліва спусцілася з неба
на рыжую скуру імшары.
Снег белымі іскрамі ціха на мёртвыя косы злятае,
На вочы мае ападае і кроплямі горкімі тае.
Не сыпцеся, снежныя кветкі!
Убранства не просяць руіны.
Ідзі, маё гора, са мною па шчасце, па сонца краіны.
Ідзі, маё гора, па следу нявольніц-сясцёр
аж да Эльбы.
Страляй, маё гора, без стомы па катах
з гарматаў і стрэльбаў.
Каб кожнае рэха ад стрэлу балючыя раны гаіла,
Дубровы ўзнімала на пустках і сонцам руіны паіла.

*1943*

## ЛЁТЧЫКАМ «НАРМАНДЫІ»

Ні адной краінай так не трызніў,
Як табою, Францыя.
Парыж,
Весялосцю вуліц сваіх блісні!
Што маўчыш, агнямі не гарыш?

Пруцца танкі... Дзьме з Ла-Маншу вецер.
Вёскі у Нармандыі гараць.
Мне здаецца, і ў Ліёне дзецям,
Як і нашым, горка паміраць.

Мне здаецца, і ў Марселі ўдовы
Плачуць, як і нашы, над трунон,
Францыя, кулак свой шматпудовы
Узнімі над прускай галавой.

Грукні ў бубны дахаў Марсельезай!
Разбівай Бастылію! Трубі!
Іменем Рэспублікі — жалезам
Па пахабных мордах смела бі!

Здрадзілі. Прадалі. Падлажылі
Самую прыгожую пад танк.
Накруцілі трапяткія жылы
На штыкі раз'юшаных атак...

Думаў, што надоўга разлучылі,
Думаў: не пабачыўшы памру.
Прыляцела ў Беларусь на крыллях
Францыя у жорсткую пару.

Каб хутчэй Шампань з магілы ўстала,
Вёў над Оршай баявы атрад,
Благаславёны дымам і металам,
Незнаёмы мне французскі брат.

І калі над Мінскам чорных асаў
Ён збіваў — я помсціў за Парыж.
З гэтага праслаўленага часу,

З гэтае трывожнае пары,
Францыя, ты стала мне сястрою
І братамі — лётчыкі-героі.

Лётчыкі «Нармандыі»!
На хвілю
Станем каля Нёмна над вярбой.
За зямлю, якую мы любілі,
За зямлю, якую мы адбілі,
За Бізэ, Купалу і Рэмбо;

За аршанскіх нашых партызанак
І за нашу Жанну з Арлеана,
За Дняпро, Луару, Сену, Прыпяць —
Прапаную з фляг паходных выпіць.

Рады я: сяброў у нас не менеї,
Чым у сонца залатых праменняў —
Ёсць з кім і дружыць, і піраваць.
Сёння я гатоў ад захаплення
Трыста гарадоў расцалаваць.

Я прайду з вінтоўкай рэкі, горы,
Братнім землям чэсна наслужу
І, відаць, за незнаёмы горад
Галаву ад радасці злажу.

*1944*

* * *

Падвярнуўся мне на пазіцыі
Абшарпаны старэнькі том
Пра іспанскую інквізіцыю,
Пра мадрыдскі таемны дом;

Пра чуму, пра далёкія жахі
І пра нейкіх суровых святых —
Распіналі на белых крыжах іх,
На агні спапялялі іх.

Колькі бруду тут наварочана,
Колькі подласці і інтрыг.
І смяюцца у твар мне змрочна
Тры манахі — падлюгі тры:

«Паспрабуй — разгрызі наш каменьчык,
Паспрабуй — разгані наш туман».
Я ад прыкрасці пакамечыў
І шпурнуў у закутак раман.

Што за справа мне да манахаў
І да іх старажытных інтрыг!
Дзякуй богу, хапае жахаў
Мне на сённяшні дзень сваіх.

Выйшаў. Дыхаю свежым ветрам,
А на сэрцы чагось не стае.
Лёс закутага Саавεдры
Супакоіцца не дае.

Выплываюць чорныя літары
І загадваюць: паглядзі —
Вунь іспанскія інквізітары
Апранулі нямецкі мундзір.

Значыць, хітрыкі ўсе разгаданы.
На дарогах маіх перамог

Расправуляцца мне трэба з гадамі
Усіх колераў і эпох.

Біць падлюг, трушчыць іхнія косці
Прысягаю клятваї байца —
За сяброў і за хлопца з аповесці
Без пачатку і без канца.

*1944*

* *

Тры дні з упартасцю тупою
Ліў дождж на лес і сенажаць.
Ад нечаканага запою
Зямля не можа ачуняць.

Туман. Раса шукае выйсця —
Стрывожаная вецярком,
З пажоўклых жылкаватых лісцяў,
Нібы з далоняў, лье цурком.

Акопы нашыя размоклі
І адсырэлі сухары.
І птушкі на сяброўскі вокліч
Не адгукаюцца ў бары.

Што нас катуе дождж пракляты,
Яшчэ, як кажуць, паўбяды.
Але сумуюць аўтаматы —
Не бачаць фрыцаў з-за вады.

Мы ўжо клясці хацелі восень
І чорную навалу хмар,
Ды неба ў пяць гектараў просінь
Нам падарыла. Добры дар!

І вось грыміць ужо над гаем
Агонь і часты і густы.
Куды ні ступіш — пад нагамі
Дымяцца жоўтыя лісты.

*1944*

## КАЛУМБЫ

Давайце на шчырасці: кожны жадае
Убачыць сябе хоць маленькім Калумбам,
У кожнага мара свая залатая,
Якую мы песцім, гадуем і любім.

Вы скажаце можа: звяліся вандроўнікі.
Якія жылі паміж бур і трывог,
Каб толькі адкрыць нейкі дзікі і дробненькі
Пад зоркай палярнаю астравок.

Няпраўда. Я ведаю гэтакіх тысячы,
Імёны іх трэба на мармуры высекчы —
Яны паміраюць далёка ад дому
За мару, за цалі зямлі невядомай.

Плывуць яны морам і ноччу бяззорнаю.
«Зямля!» — усхвалёвана крыкнуць дазорныя.
Гарматы над хвалямі грозна грымяць —
І востраў сваё набывае імя.

Ідуць — і кірунак паказвае компас ім
Па чорных лясах сярод пастак і мін,
Каб Копысь ізноў быў ахрышчаны Копысем,
Каб Мінскам цудоўным ізноў стаў наш Мінск.

Хай гэтыя землі, азёры і рэкі
У даўнія годы адкрыты былі;
Байцы адкрываюць іх зноў, каб навекі
Мы тут пасяліліся і жылі.

Ідуць яны ўперад нязнанымі тропамі
На захад і чуюць праз дым яны крык —
Прыглушаным голасам просіць Еўропа іх:
«Ратуйце ад пошасці мой мацярык!»

*1944*

# МАЁ І ТВАЁ МАЛЕНСТВА

Мы рапіцой адбілі гэту вёску.
Па вуліцах струменіў сіні чад,
А ўжо звінелі галасы дзяўчат
У гушчары запыленага войска.
Я малака гладыш са смакам выпіў
І сеў на прызбе пад старою ліпай,
Трымаючы малога хлапчука
На дужых і ўпэўненых руках.
Назад таму, здаецца, чвэртка веку
І мне было таксама тры гады.
Маленькім сінявокім чалавекам
Каменьчыкі збіраў я ля вады.
І я вось гэткім быў белагаловым.
Такім?
О, не!
Такіх вачэй суровых,
Дзе сталая туга, дзе боль і гнеў,
У тры гады ніколі я не меў.
Маё маленства!
Душны пах чарэмхі,
Арэхаў залатых даспелы град...
Гукну: «я рад» — і стогалосым рэхам
Пацвердзіць гай, што сапраўды я рад.
Скажу: «хачу» — і кніга мне належыць.
Скажу: «магу» — і сам будую дом.
Маленства!
Ты гарыш агнём нязлежным,
Ты школьным заліваешся званком.
Ты заміраеш з вудай над ракою,
Пра вандраванні сніш вясною сны.
Гучыць пачаткам песні над табою
Світальны голас труб берасцяных...
Каб вырас я настойлівым, упартым,
Радзіма, нахіліўшыся над партай,
Цяжкому рамяству мяне вучыла —
Тварыць і жыць.
І кроў кіпела ў жылах,
Настоеная густа на праменні,
На водары гаёў, зарніц і траў.

Нядарма для сваіго я параджэння
Год дзевяцьсот семнаццаты абраў.
Той год адгарадзіў мяне сцяной
Ад слова «раб», ад свісту бізуноў,
Ад бацькаўскіх нішчымніц,
Ад апекі
Усемагутнай медзяной капейкі.
Плыла, плыла, як човен, праз сады
Мая калыска ў сталыя гады...
Ды годзе ўспамінаць!
Замрыце, вершы!
Я на руках
Трымаю земляка,
Народжанага ў годзе сорак першым.
Ён нарадзіўся ў рабстве.
Ён глядзеў
Галоднымі вачмі,
як вораг еў,
Як вораг піў,
як вораг рагатаў,
Як нашы кнігі вылюдак таптаў.
Не я яму,
а ён раскажа мне
Пра голад, пра бяссонніцу і гнеў.
Я пана бачыў толькі на малюнках,
Я бачыў у музеі ланцугі.
А гэтаму малому каты рукі
Для жарту заціскалі ў абцугі.
Спалоханы,
ён дзічыцца мяне,
Глядзіць з дапытлівасцю хваравітай.
А бацька дзе?
А бацька на вайне
Атручанаю куляю забіты.
Ён не прывычны да мужчынскай
ласкі —
Ледзь цепліцца удзячная сляза.
Мне сорамна яму чамусьці казку
Пра зайца і мядзведзя расказаць.
Не ён перада мной,
а перад ім
Сябе адчуў я хлапчуком малым...
Але святлом даверлівасці вочы
Яснеюць.

І, здаецца, хлопчык хоча
Сказаць:
«Ты бацька мой.
Прашу — вярні, вярні
Мой першы дзень, мой першы
крок нясмелы,
Зары вясновай ціхія агні,
Вярні калыску — каб матуля пела,
І першай птушкі свіст,
І першы бляск расы».
І я кажу:
«Усё вярну, мой сын!»

*1944*

* *

Я не піў на тваім вяселлі,
Не дарыў дары.
Я бадзяўся каля аселіц
Ля вячэрняй зары.

І здавалася мне:
З-за бору
Зноў ты выйдзеш з чорнаї касой.
Цішыня.
Загараюцца зоры
Над сцюдзёнай расой.

Сонца шар зарою іржаваї
На аселіцу выцек.
І зусім абарвалі жаўры
Залатыя ніці.

Ні цябе, ні песні на лузе...
Я іду ў тумане.
Пэўна, песні пра вернасць хлусяць,
Пэўна, казкі маняць.

Не! Я проста забыў,
Ля аселіц
Прабадзяўшыся да зары,
Што было ўжо тваё вяселле,
Што дарылі табе дары.

*1944*

* *

Я прысягаў не раз, не двойчы
Не абуджаць у сэрца зноў
Тваю паходку, стан дзявочы,
Загадкавых апошніх слоў.

Я уцякаў, нібы злачынца,
З пакутнай катаргі, хутчэй,
Каб адзінотаю лячыцца
Ад варажбы тваіх вачэй.

Я адракаўся, нібы здраднік,
Ад цёмных кос.
Я голас твой
Усё глыбей, усё старанней
Хаваў у памяці сваёй.

І марна ўсё!
За мной усюды,
Сама не знаючы таго,
Ідзеш па нейкаму прысуду
Ты і ў ваду і у агонь...

За днямі дні праходзяць цугам.
А я, знаць, вымушаны век
Блукаць бяздомным валацугам
Пад ценем ласкавых павек.

*1944*

## МАЯ ГЕАГРАФІЯ

Географы!
Кіньце старыя падручнікі
На сметнік ці ў печ.
Вы нямала наблыталі.
Усё пераіначапа і перакручана
У вашай навуцы вялікімі бітвамі.

Крытычна пара навуковую спадчыну
Усю пераглядзець.
Памылкі засведчу я.
Вайна панялася ў мяне за выкладчыцу,
І стаў на вайне я выдатным даследчыкам.

Не раз па-пластунску па нівах мы поўзалі,
Рукамі абмацвалі купіну кожную,
Размову з дубамі вялі і бярозамі,
Выпытвалі праўду у багнаў і пожняў мы.

Сцвярджаеце вы:
На Палессі, на Піншчыне,—
Тарфяныя залежы для прамысловасці.
А мы адшукалі пад папялішчамі
Нянавісці залежы ў гэтай мясцовасці.

Вы нудна пісалі пра нашы паселішчы:
«Стаяць каля рэк, па пагорках,
пад сонейкам...»
А думалі вы, што народ перасяліцца
У пушчы глухія, гаі і сасоннікі?

Знішчаў у агні ён багацце нажытае,
Быў сыты не хлебам, не салам, а помстаю.
Аблавай на гада хадзіў ён і літарам
Вучыў дзетвару на паперы бяроставай.

Паказвалі нам на Дзвіну і Днялро вы:
Напоўнены рэкі дубамі і вязамі.
А сёння плывуць не бярвенні, не дровы —
Плыты мёртвых катаў, жалезам павязаных.

А Прыпяць?
Па-вашаму — ціхая, прэсная,
Дзе рыба і ціна гадамі спрасаваны.
А ў Прыпяці вусны пясчаныя трэснулі
Ад смагі,
І просіць вады непрасоленай
Яна галасамі засмяглымі кнігавак.

Тут слёзы сцякалі.
Хто раз тут памыецца,
Таго галава белай соллю накрыецца.
І гэта занесці патрэбна у кнігу вам.

Хадзіла легенда, што краі наш не славіцца
Вулканамі грознымі,
Землетрасеннямі.
Спытайце ў фашыстаў — яны вам
прызнаюцца,
Як трэсла зямля іх начамі асеннімі.

Зямля іх усюды глытала праваламі,
Гарачай лавінай зямля залівала іх.
Яны ад адчаю не раз тут слязу лілі
І лепш бы згадзіліся жыць на Везувіі.

На картах рудых, недакладных ад старасці,
Абшар пад пясок ці траву заштрыхованы
Змяніце!
Цяпер тут бясконцыя зараслі
Крыжоў, пад якімі тэўтоны пахаваны.
Пакуль будуць новыя кнігі напісаны
І новыя карты даставяць па плану вам,—
Чытач, я знаёмлю з агульнымі рысамі
Маёй геаграфіі, створанай панава.

*1944*

# КАХАННЕ І ПОШТА

Ліст шалёны да любай напішаш тайком,
У канверт замуруеш, заляпаеш клеем,
Пад паштовай пячаткай, нібы пад замком,
Твае словы гарачыя тлеюць.
Доўга, доўга твой ліст
Будзе плыць у паштовых вагонах,
Задыхацца, камечыцца...
А табе ўжо ізноўку не спаць,
Мерацць крокамі сад
Аж да стомы ў нагах, аж да звону,
І на фота каханай
Штодня пазіраць разоў пяць.
Можа, хто задаволены
Гэтай паштовай валынкай —
Па паўслову у дзень
Размаўляць са сваёй дарагой.
Ты ж, каханне маё,
Стань пакутным агнём,
Стань вялікім
Акіянам пачуццяў
Без дна,
Без крутых берагоў.
Каб, як толькі на вуснах
Запаліцца слова «кахаю»,—
Зашумелі гаі,
Паўтараючы словы мае,
Каб маланкамі неба,
Каб віхурай пустыня глухая
Перакопвалі гордае сэрца твае.

*1944*

## ДАЛЁКІЯ СТАНЦЫІ

*Максіму Танку*

Па наіўнай і смешнай звычцы
Мы сябе юнакамі лічым.

Лічым мы сябе юнакамі,
А цяжкія лічбы гадоў
Нераспелымі жалудамі
Ападаюць са стукам на дол.

Колькі, дружа, табе — за трыццаць?
Мне прагрукала дваццаць сем.
Самы раз бы цяпер пахваліцца
Добрым пудам салідных паэм.

Ды паэм напісаў я нямнога.
Пэўна, лёс мне гэтак судзіў —
Не па рыфмах, а па дарогах
У паходных калонах хадзіць.

Не з адным я пагутарыў горадам,
Сёл, дарог і вятроў не злічыць,
Я свой лёс і надзеі гордыя
З лёсам арміі нашай злучыў.

Запытай паравоз, што з Асташкава
На Калінінскі фронт мяне вёз.
Пра бамбёжкі, пра страты цяжкія
Той раскажа табе паравоз.

Запытай у блакітнага Ільменя,
Як мы спалі на снезе пад мінамі.
Праўды горкае не заслоніць
Пра галодныя дні мае Слонім,

А пра кулі — гомельскі лес,
А пра дым і агонь — Смаленск.

Каля рэек сталёвых я стану
Ці паклічу праз мачты лясоў,—

Адгукнуцца далёкія станцыі
Мільёнамі галасоў.

Толькі гляну удалеч — і пырскамі
Дзьмухне вецер у твар маладэы
Чарнаморскай, і каспійскай,
І балтыйскай салёнай вады.

Толькі ў памяці крыху нарыюся,—
Зашумяць між маіх радкоў
Тэгеранскія кіпарысы
З завушніцамі маладзікоў.

Хоць няма ні часіны спакою нам —
Гул вайны на зямлі не сціх,—
Гэта шчасце:
Сумленным воінам
Па зялёнай планеце ісці.

А з паходу дадому вярнуся,—
Пра сваіх герачных сяброў,
Пра сузор'е зямных гарадоў
Раскажу дарагой Беларусі.

А далей — сівізна ляжа дымам,
Нас ад старасці будуць лячыць.
Што ж тады?
А сябе і тады мы
Юнакамі будзем лічыць.

*1944*

## НА РОДНАЙ ЗЯМЛІ

Мы на захад ішлі за рыкаючай душнай сцяной,
Нашы вусны засмяглі з гарачыні.
У вароты жалезныя грукаў бязлітасны бой:
— Беларусь, адчыні!

І тады расступіліся хвояў натоўпы ў бакі,
І мы ўбачылі — рыюць пясок на палянках,
Як смяротна паранеўныя быкі,
Агнявымі рагамі гармат
З чорнай свастыкай танкі.

А калючая елка ўдавіла двух немцаў галлём
У мурашнік,
Раз'юшаны, як навальніца.
І груган прыкрывае жалезным крылом
Вочы праўнука Ніцшэ.

Толькі я не пра гэта сягоння хачу напісаць.
Я даўно палічыў свае крокі да родных руінаў,
Я даўно прысягнуў залячыць кожны люты пісяг
На замучаным целе маёй беларускай краіны.
Я не ведаю, што адчуваюць буслы і шпакі,
Пралятаючы з выраю
Над знаёмай хацінай вясковай.
Я не ведаю, што адчуваюць расткі асакі,
Прарастаючы з цемры
На свет раніцою вясновай.
Я ж праслаўлю навекі часіну звароту
Сваім
Шчырым радасным словам
І двойчы, і тройчы!
Ці то цёплы плач, ці то горкі дым
Раз'ядае мне вочы.

Шчасце ёсць!
Паглядзіце на нашы сады —
Наліўныя плады сабіраюць садоўніка рукі,
Так і маці-Радзіма збірае свае гарады
Пасля бітваў цяжкіх,
Пасля доўгай і горкай разлукі.

Шчасце ёсць!
Паглядзіце на плошчы Масквы —
Залатыя сузор'і і пераможныя маршы:
Гэта — пот наш і кроў,
Гэта — наш ураджай баявы,
Гэта — слава народа,
Гэта — свята на вуліцы нашай!

*1941*

## ПЕРАМОГА

Гарэлыя лісты злятаюць з лоз,
На захадзе сціхае гул трывожны,
А у вачах байцоў яшчэ цямнее злосць,
І шаблі вострыя не ўкладзены у ножны.

Спацелы конь ірвецца на дарогу
Па новую святую перамогу.

Зямлю наўкол прысыпаў попел шэры,
На брустверах дыміцца горкі пыл.
А ворагі ляжаць па дне траншэі,
Як вымалачаныя снапы.

Нам справы не было да іх адчаю,
Не мелі часу выбіраць штыкі.
Аглохлыя жывыя мерцвякі
Не падымалі рук і не крычалі.

Куды крычаць!
Зямлёй забіты рот,
Якой так люта прагнулі яны.
Пасля пакут,
Пасля цяжкіх нягод
Сваці нам, справядлівы дзень вайны!

Ціпэй, мой конь!
І едзем мы у пене
Рамонку лугавога і праменняў.
Рака віецца па траве, як стужка
Ў дзявочых косах.
Пахне і палын!
З-пад капыта шугнула ў неба птушка.
А, жаўранак!
Звіні, грымі, малы!

А жаўранак званочак залаты
Згубіў ад радасці сярод асок густых,
І пакаціўся ён праз годы, долы

Званіць братам, што томяцца ў нядолі,
Пра наш прыход,
Пра нашу перамогу.
І шабля зноў успыхнула над полем,
І конь спацелы выбег на дарогу.

*1944*

## СОН ПРА АПОШНІ ЗАЛП

Ты часта мне снішся, апошні залп
З усёй незлічонае нашае зброі,
Калі апошняя матак сляза
Скоціцца ціха па труны герояў.
Увосень — на золаце лістапада,
Зімой — на блакітным, марозным полі,
Вясной — па зялёным духмяным лузе
Цябе мы сустрэнем, чаканы мір.
Адны ў Будапешце, другія ў Берліне,
А трэція ў брацкай магіле ў даліне
Пры ціхай каліне.
Не трэба пра гэта, не трэба, не трэба!
Зарніцы з вясёлак, зарніцы па небе!
Як бліснула першая з громам і дымам,
Загаманілі і пушчы, і рэкі:
«Жыві і красуйся, Савецкая Радзіма,
Навекі!»
Другая па небе ярчэй палыхнула
Суровым агнём,
Памінальным гулам.—
І ўсталі з магіл пераможцы-салдаты:
«Ці хопіць расплаты?
Мы прагнем расплаты!»
«Глядзіце, салдаты,— ніводнага ката!
Жывыя жывіце, а мёртвыя спіце
У славе і чэсці
Навекі!»
А потым зарніцы — без краю, без ліку,
За ўсё і за ўсіх, за малых і вялікіх.
Дажджы прамяністыя, з хмар ападайце!
Жыты прарастайце,
Сады зацвітайце!
Вяртайцеся, людзі, з няволі, з палону:
Жанкі — да мужчынаў,
Мужчыны — да жонак.
У сажалкі — рыбы,
Сярпы — на палетак,
Музыкі — да скрыпак,
А пчолы — да кветак!

І грымнуў апошні ўрачысты залп,
І стала святлей, чым у першы
дзень мая,
І ўсе павярнулі шчаслівыя твары
На ўсход, да бяссмертных
сузор'яў Крамля.

І стала ціха,
Цішэй вады:
Ні бітваў,
Ні стрэлаў,
Ні плачу,
Ні маршаў...
І толькі два маладых пехацінцы,
Дамоў ідучы з чужаземных краін,
Сышлі, затомленыя, з гасцінцу,
Прылеглі пад лісцем чырвоных калін.
А на галінах калін у расе
Тысяча мірных сонцаў вісела.
Ціха... Ціха...
Салдаты спяць.
Добрыя сны яны сёння сасняць,
Добрыя сны.

*1945*

## БУЛЬБА

Так ісці на захад, гэтак перці
За эпоху можна толькі раз.
Есці захацелася да смерці,
Ну, а повар з кухняю заграз.

Падцягнулі рамяні з тугою,
Леглі адпачыць пад сіняй хвояй,
На сухой абочыне шашы.
Рай — для ног, цыгарка — для душы...

Спрэчка пачалася нечакана:
Што смачней з усіх вядомых страў?
«Хаш і лобі! — першым крыкнуў Вано,—
Я б сем місак зараз уабраў».

«Плоў,— сказаў Ахмет.—
Калісьці дома...»
І пацмокаў смачна языком.
А Гурген ускочыў: «Вы знаёмы
З ерэванскім сочным шашлыком?»

Я тут узгарэўся не на жарты:
«Вашых страў я ганіць не хачу:
І яны што-кольвек, пэўна, варты,
Як хвалілі знаўцы іх — я чуў.

Сорам пра найлепшае не ведаць,—
Рынуўся я ў наступ на байцоў,—
Калі смачна хочаце паснедаць,
Закажыце бульбы з селядцом.

Печаная бульба — гэта казка,
Паскрабеш нажом — і калі ласка.
Жоўтая скарынка, як пірог,
Будзеш уплятаць яе за трох.

Трапіш да кабецінЫ рахманай —
Паспытаеш, друг мой дарагі,
Драпікі са свежаю смятанай,
Бабку, клёцкі, нават пірагі.

З нашай бульбы тысячу, не меней,
Смажаць і гатуюць розных страў...»
Я ўсхапіўся з месца і з натхненнем
Песню ім пра бульбу праспяваў.

Бачу: прапяла мая прамова,
Зараз крыкнуць: «Дзе яна? Гані!»
...Добра, што пад'ехаў ротны повар
На рудым запараным кані.

*1945*



8 Зак. 839

## ПЕСНЯ ПРА ЧАТЫРЫ МАГІЛЫ

Звініць лістапад залатымі дажджамі,
Лятуць журавы над палямі, лугамі,
Над Прыпяццю сіняй.

Дажджы залатыя — асеннія песні...
Чатыры браты на зялёным Палессі
Жылі, не тужылі.

Жылі на Палессі у вёсцы Замосце,
Сцяна да сцяны, і хадзілі у госці
Адзін да другога.

Алена ў Лявона, у Тодара Люба,
Мар'яна у Янкі, а Зося ў Якуба.
Ігрышчы, гулянкі.

Руплівая праца. Жыццё маладое.
Штогод па дзіцяці, а то і па двое —
Усё, як па песні...

Чатыры гармонікі гралі разлуку,
Чатыры салдаткі смуглявыя рукі
Ў тузе заламалі.

Алене і Любе, Мар'яне і Зосі
Чатыры лісты лістаносец прыносіў
З франтоў невядомых.

...На крыллях жалезных прынесліся каты,
Спалілі чатыры салдацкія хаты.
І самі палеглі.

Кароткая песня, а гора даўгое.
Пакрыліся косы жанчын сівізною.
І выраслі дзеці.

Зноў сонца зазззяла ў палескай старонцы,
І з попелу ўсталі ў Замосці пад сонцам
Чатыры хаціны.

Чатыры хаціны з тугою жапочай
Прагледзелі вочы, праплакалі вочы...
Ні вестак, ні слыху.

Звініць лістапад залатымі дажджамі,
Лятуць журавы над палямі, лугамі,
Над Прыпяццю сіняй.

З далёкага краю крылатыя госці
Прынеслі ў зялёную вёску Замосце
Чатыры магілы.

Варшаўскія землі, далёкая Вісла!
Над першаю хатай няшчасце павісла.
Галосіць Алена.

Славацкія землі, Карпацкія горы!
У хату другую пастукала гора
З далёкіх Карпатаў.

На брацкай магіле — балгарскія ружы.
Сірочыя вочы і плачуць, і тужаць
У трэцяй хаціне.

Чацвёртая хата: «Ой, тата наш, тата!
Забіў, загубіў яго вораг пракляты
На ціхім Дунаі».

Дажджы адзвінелі, гаі адшумелі.
З далёкага краю лісты прыляцелі
У вёску Замосце.

Здалося — палякі, балгары і чэхі
Сышліся у хаты са словам уцехі,
З глыбокім паклонам.

«Мы вашых герояў абмылі слязамі,
Іх светлыя вочы закрылі мы самі,
Навекі ім слава!

За нас яны смела галовы злажылі
І вольнае сонца для нас запалілі
Над нашай зямлёю.

Што ім не сказалі,— іх дзецям даскажам,
Што нашым было,— тое стала і вашым:
Нас кроў парадніла».

Збірай, выпраўляй у дарогу, Замосце,
Сваіх юнакоў і юначак у госці
У братнія землі —

На ціхі Дунай, у Сафію, Варшаву,
Да родных магіл, да бацькоўскае славы,
Бяссмертнае славы.

*1945*

* *

Сівая жанчына стаіць ля крыніцы,
Над ёю плывуць сакавіцкія хмары.
І глянуць жанчына ў крыніцу баіцца,
Баіцца пазнаць нечаканую старасць.

З вялікай вайны гаспадар яе прыйдзе
З тугою па хаце, па жончынай ласцы.
І зморшчыны могуць салдата пакрыўдзіць:
Кахаюць да старасці толькі у казцы.

І можа, яе не пазнае сівую,
Абкрадзеным некім сябе ён палічыць.
Ды стукнула сэрца салдаткі: «Жыву я,
Каб шчасце вярнулася на папялішчы...»

Жанчына сабрала апошнія грошы,
Сем яблынь купіла і сад пасадзіла:
«Расці, мой зялёны, цвіці, мой харошы!» —
І сад развінуўся вясною на дзіва.

І сад развінуўся, ліствою багаты,
На сажань углыб заплялося карэнне.
Вяртайся, мой родны, дадому, дахаты —
Не попел, а сад цябе дома сустрэне.

І здасца табе ў гэтым садзе вясною,
Што родны куток зноў утульны і светлы,
Што жончыны косы не сівізною
Пакрыты, а белым антонаўскім цветам.

*1945*

* *

Гарніст іграе збор. Да пляца
Ідуць калоны за аркестрам.
У клуб заходзіць развітацца
З сябрамі ён перад ад'ездам.

У клубе ціха. Ні гаворкі,
Ні пажаданняў на дарогу.
У пыльных брудных гімнасцёрках
Глядзяць сябры па сценкі строга.

Закантаваныя у рамы,
Глядзяць маўклівыя героі.
У воіна занылі раны
Перад суровым гэтым строем.

Не выйдзе з імі ён на працу,
Рукі на растань не пацісне.
Ляжаць яны ў магілах брацкіх —
Той на Дунаі, той на Вісле.

І калі будзе яму горка
Ці сэрца зойдзецца ад крыўды,—
Успомніць кроў на гімнасцёрках
І вочы, што зямлёй пакрыты.

Клянецца ён пад сонцам мірным
Быць гэткім, як яны ў атацы...
Палку даюць каманду «Смірна!»,
Пара з жывымі развітацца.

*1945*

## ФРАНТАВІК

На ўсе лады паэмы і быліны
Пяюць: хвала, хвала табе, баец!
А ён у нейкім дорфе за Берлінам
З палёгкай уздыхнуў — вайне канец.

І толькі той адчуе ў сэрцы слодыч
Ад гэтых слоў, ад гэтай цішыні,
Хто столькі год, як ён, ішоў паходам
Праз дзікія смяротныя агні.

Закончаны салдацкія турботы.
Нібы на штык, павесіць на кіёк
Заслужаную пару добрых ботаў
І франтавы апошні свой паёк.

Ён зойме месца сціплае ў вагоне,
Гудок раўне з палёгкаю: дамоў!
Сто колаў паравоз на ўсход пагоніць
Праз гушчары усіх замежных моў.

Рассыпле па мастах густое рэха
Цягнік — і стане светла на душы.
Нямецкія фарсіраваныя рэкі
Ўжо не фарсяць, плывуць сабе ў цішы.

Мінаючы славутыя сталіцы
У зарыве чужых садоў і траў,
Ён будзе пазіраць і сам дзівіцца:
Ў якую даль захопнікаў загнаў.

Не прынясе салдат з вайны крывавай
Багацця. Прынясе з сабой з дарог
Ён пяць падзяк — пяць звонкіх песень славы.
І водбліск найвялікшых перамог.

А вернецца дахаты — жонцы, дзецям
Найлепшым падарункам будзе сам.
Цяплейшым стане ў тое ранне вецер,
Утульней будзе нівам і лясам.

Ні ордэнам, ні таннай пахвальбою
Суседзям ён не будзе дакучаць.
Пасля даўгіх дарог і перуновых боек
Захочацца салдату памаўчаць.

Чытаючы крыклівыя трактаты
Пра подзвігі свае, пра гром атак,
Падумае з усмешкай вінаватай:
«Здаецца, што было у нас не так».

А досвіткам на сенажаць з касою
У новы наступ выйдзе.
Па траве
Яму насустрач з залатой расою
Сто тысяч мірных сонцаў прыплыве.

*1945*

* *

Дружа повар, кансервaў годзе!
Напячы пірагоў на мёдзе —
Адсвяткуем нашы дажынкі.
Першы раз на маім мінамёце
Мірна свецяцца тры дажджынкі.

Першы раз самалёт праплывае
Без тарпед над лясамі.
Першы раз салаўі спяваюць
Даваеннымі галасамі...

Кідай грошы апошнія, хлопцы,
У маю пілотку!
Купім сёння па добрай стопцы,
Каб абмыць пыл і копаць з глотак.

І калі ад чарчыны лішняй
Стане сонца скакаць на небе,
І калі пра чарэшню-вішню
Заспяваем гучней чым трэба,—

Аніхто крыўды мець не будзе:
Гэта нам абяцалі у песні.
Сёння зноў мы — мірныя людзі
І ідзём не ў Берлін — на Палессе.

Перш чым выправіцца дадому,
У апошні паход салдацкі,
Нам з вайною па-франтавому
Трэба горача развітацца.

*1945*

* *

Кожнае дробнае шкельца марыць іскрыцца сонцам,
Кожны мізэрны ручай верыць, што стане ракой...
Вера мая у шчасце, стань для мяне бясконцай.
Песня, любоў і пянавісць,
будзьце заўсёды са мной.

Сонца закоціцца —
шкельца не адшукаеш у змроку.
Прагны пясок засмокча светлы і звонкі ручай.
Ёсць і такія, што любяць, сыта пад'еўшы, галёкаць:
«Слава хвіліне шчасця! Потым няхай і адчай».

Не, не ручай і не шкельца будуць маёю мэтай.
Сытая хваля шчасця, сэрца майго не крані!
Калі ракой,— то такою, каб напаіць палеткі,
Калі гарэць,— дык, як сонца, горача, да труны.

*1945*

## СВАТ

Не са свету, дык поўпа з паўсвету —
І з Архангельска і з Чыты —
У армейскую нашу газету
Прысылалі дзяўчаты лісты.

Лізы, Галі, Ірыны, Валі
(Колькі позіркаў агнявых!)
Не прасілі — патрабавалі
Пазнаёміць з героямі іх.

Па рэдактарскаму загаду
Сто дзявочых лістоў забіраў
І пад гул шалёных снарадаў
Дастаўляў на пярэдні край.

Чорным снегам сляпіла вочы,
Калі поўз я праз дым і агонь,
Гулка стукалі сэрцы дзявочыя
У лістах каля сэрца майго.

А ў траншэі сцюдзёнай, задымленай
Сустракаў мяне кожны салдат —
Не па званню і не па імені:
«Добры дзень, рэдакцыйны сват!»

Злосным голасам каля дота
Я крычаў — ад гармат глухі:
«Выбірайце пявестаў фота,
Падмарожаныя жаніхі».

І яны, дарагія чэрці,
Залаты франтавы народ,
У трынаццаці кроках ад смерці
Ухмыляліся на ўвесь рот:

«Дай вось толькі суцішым гадзіп —
Пачытаем і паглядзім.
Будзем жывы — вяселле зладзім,
А памром — другім аддадзім».

Так між спраў, пад грукат гарматаў,
Выпадковы сват — паштальён,
За чатыры гады я сасватаў
Можа, роту, а мо батальён.

Адышлі дні былыя ў песню.
Дзе сябры мае? Дзе яны?
Ходзіць вецер па жоўтым лесе
І не бачыць нідзе вайны.

Цішыня... а восень такая,
Што расчуліць можа да слёз.
З ціхім звонам у рэкі сцякаюць
Ручаі залатыя з бяроз.

І ўсё робіцца, як намечана,—
Свайго шчасця не абмінеш...
Пяць сапёраў і сем разведчыкаў
На вяселлі клічуць мяне.

А чаго ж? Самы раз сабрацца,
Стукнуць-грукнуць і будзь здароў!
... Не паеду нікуды я, братцы,
У мяне ж не вада, а кроў.

Я і сам на падобны выпадак
Рыфмы добрыя падшукаў.
Я сяголетнім лістападам
Нешта-нейкае сам чакаў.

А пакуль я усю аб'езджу
Франтавую радню, як госць,—
Мне падпішуць прыгавар цешчы:
Прагуляў зусім маладосць...

Аб адным я шкадую зараз,
Што на фронце так шчодра вам
Адрасы ўсіх дзяўчат разбазарыў
І застаўся без адрасу сам.

*1945*

## ЛЯ ДЗЯВОЧАЙ КВАТЭРЫ № 5

Праз дажджу гушчары да цябе ён спяшыў,
Сто малапак яму пагражалі расправаю.
Тры гады ён табою адпою жыў,
Заслужыў на сустрэчу салдацкае права ён.

Ну, а я?
Я па праву яго дружбака
Спадарожнікам еду да гэтага горада.
Друг ідзе і хвалюецца, а напаказ —
Ён такі незалежны і гэтакі горды.

Ён дзяўчыну сваю сотні раз нам хваліў,
І мы зычылі шчасця яму і удачы.
Ён лісты ад яе у атакі насіў,
І яны прасаліліся потам гарачым...

Вось і весніцы колеру свежай травы.
Не хвалюйся. Спакойна. Атака наперадзе.
Эх, цяпер бы сюды наш аркестр палкавы,
Каб сустрэліся двое пад музыку Вердзі.

Стукнуў раз — цішыня.
Стукнуў двойчы — маўчаць...
У акне разляцеліся бровы, як ластаўкі,
І спалохана вылезла з-за пляча
Галава, прымацованая да гальштука.

Мой дружбак пабляднеў... Прадалася? Пляваць!
Жмут лістоў аб зямлю — і спаліў.
Так увечары
Ля дзявочай кватэры за нумарам пяць
Дагарэла каханне героя-разведчыка.

Нам адразу абрыдлі і восені медзь
І праменні, што стужкамі ў хмары заплецены.
Друг, мы сёння прымусім тэатр звар'яцець
За дванаццаць рублёў ад тугі Віалецінай.

Я абражаны, можа, не меней яго
І гатоў узарвацца прамоваю бурнаю:
На каго прамяняла ты сябра майго?
На каго? — а пасля ўжо ідзе нецэнзурнае.

І тады расчыніліся дзверы. Яна?
Не яна! Толькі гэта малая уцеха нам.
А дзяўчына так ветла: «Мар'яна ад нас
Пазаўчора ў суседні раён пераехала».

«Адрас, адрас!» — крычым і з надзеяй глядзім.
«Грыбаедава, 10».— І друг мой як кінецца...
Не, мы сёння на Вердзі не пойдзем.
Адзін
Я пайду паглядзець на «Вяселле ў Малінаўцы».

*1945*

## ЯНА НЕ ПРЫЙШЛА...

Абяцанка — цацанка, а дурню — радасць.
Па прыкметах усіх
Гэтым дурнем быць суджана мне.
На спатканне прыйсці ў першы дзень лістапада
Абяцала сама ты.
І вось пачынае цямнець,
А цябе ўсё няма...
Папяросы радзеюць у пачцы...
А на небе так хмарна — за год не праб'ешся да зор.
Сад глядзіць вінавата і просіць маўкліва:
Прабачце
За яе, і за дождж,
І за мой абшарпаны убор.
Раскладаюць вятры на дарожках асеннія ноты —
Будзе доўгі і нудны канцэрт, як увосень і след.
Дружа сад,
Я пакрыўджаны не за сваю адзіноту —
За цябе:
Ты не ўбачыш яе,
Ты не ўбачыш яе, мой сусед.
За такіх, як яна, на дуэлях калісь паміралі,
І калі б гэта дзіва прайшло па ўладаннях тваіх,
Графік рэйсаў нарушылі б і прыляцелі з Аўстраліі
Салаўі.
А яна не прыйшла...
Абяцала?
Дык хай пагражае
Сто вымоў, сто насмешак,
А ты на спатканне прыходзь.
Нават з ложка бальнічнага ўстань,
калі шчыра кахаеш,

Па дарозе памры,
А свайго дружбака не падводзь.
Бачу: ціха на цыпках у змрок адступае таполя.
Палічыла вар'ятам: не чула падобных прамоў.
Паспрабуй дакажы ёй, што гэта бывае —
Ніколі
Не паверыць адвазе дзявочай
І шчырасці слоў.

Вось што, дрэва!
Тут нечага лыпаць вачыма.
Калі з глузду я з'еду — не ваша бяда...
А сказаць вам папраўдзе:
Ні з якой сягоння дзяўчынай
Не ўмаўляўся сустрэцца я,
Проста заела нуда.
Непагодна на сэрцы.
І з гэтай сур'ёзнай прычыны
Я агітку пішу, а не слёзны ад роспачы верш,
Каб хадзілі дзяўчаты ў такія глухія часіны
На спатканне з каханымі.
Гэта надзейней і лепш.
Трэба быць з жаніхом у такое надвор'е нявесце,
Бо і вернасць размыць можа
д'ябальскі сум дажджавы.
Я ж з адзінаю мэтай заглянуў сюды —
Каб увесці
Гэты сад мой любімы
Ад мокрай пажоўклай ліствы.

*1945*

# ПАД'ЯЗДЖАЮЧЫ ДА МІНСКА...

Сягоння з апошнім вайсковым білетам
Дадому, дахаты са службы я еду.
І вецер дняпроўскі здзьмухае старанна
З маёй гімнасцёркі пылінкі Ірана.
На мяккай пасцелі ў купэ не ляжыцца:
«Ці шмат яшчэ вёрстаў да Мінска,
скажыце?» —
Пытаю наіўна у нейкага дзеда,
Хоць ведаю добра: не першы раз еду.
А дзед гаваркі і рахманы. Адразу
Ён шчодра сыпнуў мне станцыйныя назвы:
«Вось зараз пад'едзем да горада Оршы».
І Орша здаецца за Вену не горшай.
«Далей будзе ціхая станцыя Слаўнае...»
Вядома, тут кожная станцыя слаўная.
Якія знаёмыя назвы і словы,
Якая цудоўная родная мова!
І ўсё мілагучна для слыху майго:
І звонкае «дзе», і густое «чаго».

*

Стаю ля акна, у цішы калідора,
Са мной размаўляюць аршанскія зоры.
Цягнік атакуе начная дуброва,
Дубы мне гамоняць: «Здарова! Здарова!»
Мне ветла мігаюць агнямі будынкі,
А вецер асенні хапае ў абдымкі.
І раптам другія вятры наляцелі...
Ці зоры так доўга у вочы глядзелі,
Ці матчына сэрца ўжо стукнула недзе,
Што сын яе родны з вайны сёння едзе,
Ці попелам дзьмухнула з нейкай руіны,
Ці крыкнула птушка над нечай магілай,
Ці штосьці прашаптаць мне хацела краіна,—
Бо вельмі балюча душу зашчыміла.
Не трэба, Радзіма... Я ведаю, ведаю.
Цябе адбудоўваць з хлопцамі еду я.

*

Грукоча цягнік...
Праз якую гадзіну
Ты сыдзеш, мой верш, у журбе на руіны.
Ты горкага многа у Мінску пабачыш,
Без сведак, цішком, можа, нават паплачаш.
А зараз не гору, а добраму шчасцю
Расчынім уласныя сэрцы мы насцеж.
А зараз хай вецер дарожны засвішча,
Няхай захвалююцца зорныя рэкі...
Паўстань, мая будучыня, з папялішчаў!
Стань, Мінск мой, такім, як хачу я,
Навекі.

*

На плошчы Герояў у зарыве яблынь
Пад сонца ўзнялася Даватара шабля.
Купала у бронзавай велічы горда
Любуецца родным праменістым горадам.
Палацы патонулі ў ліпах і клёнах.
Мінск стольны.
Мінск светлы.
Мінск бела-зялёны.
Няма тут завулкаў пакрыўленых, вузкіх.
Тут горад навукі, паэзіі, музыкі.
Тут людзі — прыгожыя, смелыя, вольныя.
Тут кепскія вершы пісаць не дазволена.
А свята настала — у шэрагах стройных
Ідуць на парадзе савецкія воіны,
І наш генерал пад галошанне медзі
На слуцкім гарачым стаенніку едзе.
А там дыпламаты гамоняць тактычна
На мове выключна дыпламатычнай.
І з неба празрыстага сонца ласкава
Глядзіць на маю маладую дзяржаву.

*

Ты будзеш такім, а магчыма, і лепшым,
Магчыма такім, які дзецям прысніцца.
Хай лягуць у мур твой і гэтыя вершы,
Мой Мінск дарагі — беларусаў сталіца!

*1945*

## З «ПАРТЫЗАНСКАЙ ДУБІНКІ»

### «КУКУШКА»

Беларускія лясы
Любяць птушак галасы.
А цяпер з нядаўніх пор
Спахмурнеў вясёлы бор.

Завялася ў лесе птушка —
Фашыстоўская кукушка.
Той, каму яна кукуе,
Больш нічога не пачуе.

Раззлаваўся паляўнічы,
Наш ляснік, стары Тарас:
«Мала ты гадоў нам зычыш,
Рана ты хаваеш нас.

Нам пажыць яшчэ ахвота
Без нямецкіх абармотаў».
І узяў Тарас на мушку
Фашыстоўскую кукушку:

«Ты настрою нам не псуй,
На тым свеце пакукуй!»

*5.XII.1941*

### МАЛАДЗЕЦ СУПРОЦЬ АВЕЦ, СУПРОЦЬ МАЛАЙЦА — САМ АЎЦА

«Мне не страшны партызаны!» —
Закрычаў фашыст паганы.
«Я злаўлю іх і павешу!» —
Не міргнуўшы вокам, брэша.

Партызана ж як сустрэў —
Заскуголіў і умлеў.
Рукі ўгору, зад уніз
Да зямлі ад страху звіс.
Не хлусі і не хваліся,
Куляй лепей падавіся.

*1942*

## ПАРТЫЗАНСКІЯ ПРЫПЕЎКІ

Мы страляем трапна ў немцаў,
Толькі рэха коціцца.
Заняволенай зямельцы
Быць свабоднай хочацца.

Наляцелі немцы-каты,
Папалілі нашы хаты.
Мы жывём цяпер у пушчы,
Днём і ноччу гадаў трушчым.

Як у нашым у сяле
Стараста паганы.
Мы яго павесім хутка
Дагары нагамі.

Зорка бліснула на небе,
Хлопец падзівіўся.
Беларускім нашым хлебам
Гітлер падавіўся.

Думаў немец-чужаніца
З нашай дзеўкай ажаніцца.
А яна пасватала
Вырадка гранатаю.

Калі дома я жыла,
Слёзы горкія ліла,
Партызана палюбіла —
Афіцэраў двух забіла.

*1942*

## ЧАГО БАІЦЦА НЕМЕЦ?

Ці не бачылі вы Фрыца,
Што ўсяго цяпер баіцца?
Ён баіцца ў лазні мыцца:
Вельмі лёгка абварыцца,
І ў цырульніка галіцца —
Можа з горла кроў паліцца.
А падыдзе да крыніцы,
Не адважыцца напіцца,
Каб насмерць не атруціцца.
Хоча ў сена ён зарыцца.
Толькі страшна — загарыцца.
І у хаце кепска спіцца —
Партызан заўсёды сніцца.
Бруха ў гада разбаліцца,
Ён да ветру не імчыцца,
А падыме паўмасніцы
І паскудзіць чужаніца.
Ды за ўсё страшней для Фрыца
Нашых залпаў бліскавіцы...
Трэба хлопцы згаварыцца,
З акупантам разлічыцца
І зрабіць яму капут.

*1942*

## ШЧАСЛІЎЧЫК

Ходзіць Герман
Крокам мерным,
Горда куксамі трасе.
Два салдаты —
Супастаты
Кажуць: «Гэтаму вязе:
Яшчэ летась пад Масквою
Адмарозіў рукі, нос.
Што ж сяголетняй зімою
Адчыкрыжыць нам мароз?»

*1942*

## ПАЧАСТУНАК ГІТЛЕРУ

Гітлер прэцца, Гітлер лезе
Па свінец і па жалеза.

Ён глынуў бы ўсё на свеце —
Хлеб, і сталь, і кучу смецця.

Дзе такога нарадзілі
З апетытам кракадзіла?

Што ж, Адольфа мы накормім
І па форме, і па норме.

Коўш гарачага жалеза
Ўлезе ў горла гада?
Ўлезе!

*1942*

## ФАШЫСЦКІ «АНЁЛАК МІРУ»

Пра святых «анёлкаў міру»
Нам калісь манілі шчыра.
Малявалі на паперы
Галубкоў з галінкай шэрых.

Сёння тыя галубочкі
З казак вылецелі ўпрочкі,
І улез пахабна ў казку
«Галубок» з жалезнай каскай.

Вось анёлак фашыстоўскі
Перад вамі, з рылам тоўстым.
Ляпа тая метраў з дзвесце,
Ўсіх людзей гатова з'есці.

Кулямёт, вінтоўку, газы
Носіць гэтая зараза.
Толькі й марыць «галубок»,
Як пырнуць нажом у бок.

І калі жывых не стане,
Мір — па-іхняму — настане...
Мы ж пра мір інačай мыслім —
Б'ём фашыстаў ненавісных.

Як з гарматы ці з двухстволкі
Грукнем гэтага «анёлка»
Ды прысыплем гада жвірам,—
Вось тады і будзе мір нам.

*1942*

## ФРЫЦ АДСТУПАЕ

Фрыц сягоння не храбрыцца:
Нашы войскі гоняць Фрыца.
І уцёк сцюдзёным ранкам
Ён з Калініна на танку.
Не паспеў пажыць у танку —
Танк падбілі партызанкі.
І тады наш Фрыц падрапаў
На трохтонцы ў Андрыапаль.
Ды нямецкую машыну
Бомбы нашыя скрышылі.
Фрыц ледзь выбраўся з агня,
Раздабыў сабе каня.
Уцякае Фрыц ад смерці,
Толькі ж трэба нешта жэрці.
І пад самым Таропцом
Ён пакончыў з жарабцом.
Прыпякалі маразы,
Зжор каня за два разы.
Праз высокія сувеі
Пехатой папёр на Веліж.
Там на Віцебск ёсць дарога,
Ледзьве цягне немец ногі.
Партызаны, памажыце —
Рабаўнік зусім без сілы,
Пашкадуйце, пакажыце
Шлях кароткі да магілы!

*1942*

## ПРА САМАПОМАЧ

*Як уяўляе самапомач Кубэ*

Самі правім, самі давім,
Самі войскі нашы славім.
Беларускімі палямі,
Агародамі, лугамі,
Паясамі і лясамі
Карыстаемся мы самі.
А калі нам будзе мала
Цёплых рэчаў, масла, сала,
Мёду, кужалю ці шэрсці,
Садавіны, лёну, збожжа —
Беларускі люд патрэсці
Ермачэнка дапаможа.

*Як уяўляе самапомач Ермачэнка*

Самі хлусім днём і ноччу
Мы сялянам і рабочым.
Самі ліжам немцам пяткі,
Агітуем здаць падаткі —
Можа, з новымі панамі
Нажывём багацце самі.
А калі бяда навісне,
Каля вуха куля свісне,—
Уцячы ад кары, можа,
Нам фон Кубэ дапаможа.

*Як уяўляюць самапомач партызаны*

Самі сеем — самі жнём,
Самі гітлераўцаў б'ём,
І са здраднікамі-псамі
Распраўляемся мы самі.
А калі нам будзе трэба
Біць астатні раз па рэбрах,
Гнаць зладзюг
з краіны роднай,—
Дапаможа ўвесь народ нам.

*1942*

## КУРАШЧУПЫ-КУРАЕДЫ

На кабылах рыжай масці
Едуць немцы пеўняў красці.
Два зладзюгі-кураеды,
Фрыц і Ганс, у вёску едуць.
Лічаць Ганса ўсе паганцам.
Фрыц агідней і за Ганса.
Ну і морды! Ну і пара!
Самы б раз зямлю ім парыць.
Цэлы дзень шукаюць пеўня,
Рылы ў мыле, коні ў пене,
а пеўня няма.

Ад вялікае няўдачы
Курашчупы ледзь не плачуць.
Каб дарэмна час не траціць,
Сталі трэсці ў кожнай хаце.
Адшукалі небаракі
Два старыя андаракі,
Пук цыбулі, лусту воску,
Падпалілі з гора вёску —
пеўня не знайшлі.

Раптам голасна за хлевам
Закудахтаў здуру певень.
Аж жахнуліся ўсе куры:
— Ну і дурань! Вось дык дурань!
Так усіх нас гэта гніда
Кураедам можа выдаць,—
вопыту няма.

Немцы вушы навастрылі,
Аўтаматы зарадзілі.
Фрыц у фланг ударыў смела,
Шкло ў вокнах зазвінела.
Лупіць Ганс адважна з тылу.
Кроў у пеўніка застыла.
Калупнуў крылом ён смецце,
Кукарэкнуў перад смерцю:
— Гіну без віны!

Запалалі дровы ў печцы,
Закіпелі немцы ў спрэчцы.
— Ножкі буду есці я!
— Ножкі порцыя мая!
Фрыц на Ганса, Ганс на Фрыца —

Пачалі зладзюгі біцца.
Цягне Фрыц за чуб валос,
Ганс кусае Фрыцу нос —
стогнуць і смярдзяць.
Раптам грымнуў печы бас:
— Што за бойка? Вас іст дас?
Спрэчку вырашу я вашу —
З'ем і пеўня, з'ем і кашу.
Вам жа закусь даць якую?
Можна дулю, можна кулю.
На падлогу немцы хлоп:
— Партызан!
Вочы вылезлі на лоб:
— Партызан!
І падумалі тут немцы,
Што і певень на талерцы —
Партызан.

*1942*

## ГАРБАТАГА МАГІЛА ВЫПРАВІЦЬ

Шмат гадоў гарбун Савіцкі
Жор стаpанна хлеб савецкі,
Нос даўгі ў гарэлку тыцкаў —
не жыццё, а рай.
Жыў маўкліва, быццам рыба,
Як ягнё, вачыма лыпаў,
На баяне спрытна рыпаў —
што з яго узяць?
Наляцелі акупанты,
Загукалі: музыканта!
Ён падбег да чорнай банды,
варухнуў гарбом.
І праз дзень для гэтай зграі
Маршы прускія іграе
І ад шчасця памірае.
Вось дык сукін сын!
Неяк раз уночы, позна,
Як слімак, з канцэрта поўз ён,

Раптам цені тры пагрозна
                сталі перад ім.
— Як жывеш? Здароў, гарбаты!
Сёння ты іграў заўзята.
Атрымай за песні плату —
                ну, бяры, бяры...
Па гарбу і піжаи білі,
Новай музыцы вучылі,
Білі, білі, гаварылі:
                — Годзе ці яшчэ?
Сорак дзён ён цяжка дыхаў,
Галасіў, смярдзеў і чмыхаў,
Ачуняў крыху ад ліха —
                зноў пачаў іграць.
Скачуць фрыцы, скачуць дамы
З велізарнымі задамі,
Ходзіць пошчак над садамі:
                — Гер Савіцкі, біс!
Толькі мы не з той пароды,
Каб агідную уроду
На зямлі савецкай роднай
                слухаць і цярпець.
Партызаны з Камароўкі,
З Ляхаўкі і Старажоўкі,
Зараджайце ўсе вінтоўкі,
                выдайце канцэрт.
Каб пад вашыя «факстроты»
Паскакалі абармоты,
Каб гарбун шыракароты
                больш не ачуняў.

*1942*

### СЯМЁРА ДАЧОК

Было у Сымоніхі
        сямёра дачок:
Аўгіння, Аксіння,
Прузына, Хрысціна,
Зося і Прося.
Сёмая — Агата.

Прыйшло да Сымоніхі
семера салдат,
Семера салдат —
бандыцкі атрад:
Фрыц вашывы,
Ганс пляшывы,
Курт галодны,
Руд халодны,
Віль зялёны,
Карл шалёны
І Герман сіпаты.

Сталі сем бандытаў
дачок выбіраць,
Дачок выбіраць,
дабро адбіраць:
Фрыц пальто садраў з Аўгінні,
Ганс валёнкі — у Аксінні,
Курт хусціну — у Прузыны,
Руд гадзіннік — у Хрысціны,
Чаравікі Віль — у Зосі,
Карл грабеньчыкі — у Просі,
А Герман сіпаты —
Хвартух у Агаты.

Стала Сымоніха
гасцей частаваць.
Сталі дачушкі
матцы памагаць:
Аўгіння Фрыца — палкаю,
Аксіння Ганса — качалкаю,
Прузына Курта — мешалкай,
Хрысціна Руда — вешалкай,
Зося Віля — секачом,
Прося Карла — гладышом,
А Германа Агата —
Бруднаю лапатай.

Стала Сымоніха
дачок выпраўляць,
Пасаг сабіраць,
дабром надзяляць:
Аўгінні і Аксінні
Па чачоткавай дубіне,

А Прузына і Хрысціна
Атрымалі карабіны,
Зосі і Просі
Маўзеры падносіць,
Сёмая Агата
Узяла гранату.

Крыкнула Сымоніха:
«Стройся, дочкі, ў рад!
Пойдзем партызаніць
                усе у атрад».

*1942*

## ПАРТЫЗАНСКІЯ ДАДАТКІ Ў НЯМЕЦКІЯ ПАРАДКІ

Бургамістр — прахвост сабачы
Атрымаў такі загад:
«Назвы вуліц перайначыць
На фашысцкі новы лад».

Паслугач крутнуўся вёртка,
Падцягнуў павышай порткі,
Хутка склікаў маляроў,
Па-начальніцку зароў:

«З гэтых пор цэнтральных пляц
Імем Гітлера назваць
І завулак невялікі
Гебельсаўскім будзем клікаць.

Хай красуецца над скверам
З гэтай даты імя — Герынг.
А галоўную алею
Называць алеяй Лея».

І старанна быў пад вечар
Горад шыльдамі расквечан.
Раніцою людзі ўсталі
І са смехам прачыталі:

«Плошча Гітлера-бандыта.
Гітлер будзе тут забіты».
«Людзі Гебельса-гарылу
Б'юць каменнем тут па рылу».

«Герынг-сквер. На гэтым скверы
Мы павесім немца-звера».
«Не хадзі лепш, Лей, алеяй,
Бо ад страху ашалееш».

Так у «новыя парадкі»
Партызан упёс дадаткі.

*1942*

# НЯНАВІСЦЬ

## Паэма

### I

Сонца лілося на брук васпаваты,
Пыл залаціўся на лысым камепні.
Ад невыноснае спёкі гарматы
Ляпы разявілі і анямелі.
Тут, на ускрайку прыціхлага лесу,
Злосцю набраклі сталь і жалеза.
Грозна на захад глядзяць кулямёты.
Сэрцы на захад і вочы на захад.
Раптам у твары вецер залётны
Дзьмухнуў смалістым настоеным пахам.
Вецер залётны, вецер мядовы,
Не растрывожвай сэрцы салдатаў.
Можа, ім жыць засталося нядоўга,
Можа, яны не вярнуцца дахаты.
Жарты і гутаркі змоўклі ў траншэі.
Курыць баец у раздум'і махорку.
Пісьмы пакратае у кішэні
Сонцам прасмаленай гімнасцёркі
Ды уздыхне...
А пра што ён успомніў —
Не адгадаеце, ды і не трэба.
На аўтаматы гарачыя промні
Іскрамі ярасці сыплюцца з неба.
А капітан наш скінуў пілотку,
Сціснуў бінокль, нібы ворага глотку.
За капітанам салдацкія вочы.
З нейкай падзеяй дапытліва сочаць.
Ён уздыхне — уздыхнуць і армейцы,
Ён азірнецца — народзіцца страх.
Ён пажартуе і засмяецца —
Смех заіскрыцца у нашых вачах.
Раптам шаша загула глухавата,
Недзе завылі чужыя маторы.
Чуеце голас уладны камбата:
«Зброю рыхтуй! Набліжаецца вораг!»
Вунь яны, вунь яны, тройчы праклятыя!
Сціснуў бінокль да болю у пальцах.

Грузавікі іх з насамі куртатымі
Весела едуць, нібыта на шпацыр.
Вытрызніў дым іх ці попел уздыблены?
Ці гэта ранак стаў жартаў аматарам?
З потнымі тварамі, з бельмамі рыб'імі,
З чорнымі крадзенымі аўтаматамі
Гэтак упэўнена едуць, падлюгі,
Паміж палеткаў бярозавым трактам,
Быццам яны тут хадзілі за плугам,
Быццам яны сустракалі тут трактар.
Быццам пляваць ім на смерць і на кулі —
Нават галоў не хаваюць пад каскі,
З гарачыні каўняры расшпілілі,
І рукавы заліхвацкі закасаны.
Едуць з такой абражальнай пагардаю,
З тупатам, грукатам, свістам і рогатам,
Быццам байцы анічога нявартыя,
Зараз са страху пакоцяцца покатам...
Метры наперадзе тройчы палічаны.
Вось засталося пяцьсот усяго,
Вось яны цьмянымі грозяць абліччамі.
І капітан загадаў нам:
«Агонь!»

II

Зямля беларуская, кім ты прызначана
Арэнаю быць нечуваных баёў?
Дзяржавы прыходзяць
свой лёс перайначваць
Да рэчак тваіх, паплавоў і гаёў.
Агнём і касцямі, крывёй і жалезам
Угнойваюць войны твае балаты.
З усёй планеты салдаты лезуць
Памерці на нашых пясках залатых.
А колькі снарадамі глебы заворана,
Засыпана прахам салдацкіх імён.
Скажы мне, радзіма, няўжо ты створана
Зрабіцца пагостам для прагных плямён?
Крывёю набухлі дубровы і травы,
Блакіт спапяляюць крывавыя зоры.
Ты маеш, ты маеш, зямля мая, права
На большае шчасце, на меншае гора.
Я ж ведаю добра, чаго ты хочаш.
Ад першай песні над ціхай калыскай,

Ад першага промня, што глянуў у вочы,
Я выўчыў цябе да апошняй рыскі.
Табе б насенне кідаць у глебу,
Каб пеніўся з краю у край ураджай.
Табе б муры узводзіць пад неба,
Паэмы тварыць, дзяцей нараджаць...
Ды зноўку хрумсціць калоссе пад ботамі
Заходняй арды.
І пачатак вайны
Сустрэлі адважна, у першых ротах мы —
Твае, Беларусь, маладыя сыны.
Мы чэсна і мужна захопнікаў стрэцілі.
Пакуль адыходзяць палкі на усход,—
Мы глушым гадзіну, другую і трэцюю
Нахрапісты прышлы узброены зброд...
Задымлены пожні. Жалеза рыкае.
На вочы сцякае салёны пот.
Нянавісць радзімы маёй сустракае
Цябе, мой равеснік і мой антыпод.
Не стогнуць, не енчаць, не клічуць сясцёр тут
Байцы, што канаюць ад жудасных ран.
Крывёю залітую гімнасцёрку
Скідае паранены наш капітан.
І б'ецца ён зноўку з адвагай падвоенай,
Мой друг і начальнік — камбат баявы,
Ды мала набояў.
І падаюць воіны.
На дзесяць забітых — адзін жывы.
А немцы заходзяць у тыл і флангі...
Цясней станавіцеся, хлопцы-браткі!
Апошнія кроплі з паходнае флягі
Дап'ём і прывінцім да стрэльбаў штыкі.
А немцы ўжо чуюць, што сіла бярэ іх.
Са сцягам.
У рост.
У атаку.
На нас.
Заціхлі грымець за ракой батарэі.
Прыйшоў наш смяротны, таварышы, час.
І вось наш камбат у сарочцы крывавай
На бруствер узлез і гукнуў нам: «За мной!»
Вядзі, капітан, нас на смерць і на славу
У гэты святы і апошні бой!

*

Дыміцца пад сонцам салдацкая кроў
На растаптаным пяску.
Трыста байцоў, трыста сяброў,
Зямлю абняўшы, ляжыць.
Курыцца попел ля мёртвых гармат,
Каскі прысыпаў пыл.
Забітыя немцы зубамі грызуць
Крывавую дзеразу.
З акопа паранены ўстаў баец,
Павязку сарваў з вачэй.
Далёка, далёка яго сяброў
Немцы ў палон павялі.
«Бывайце, сябры, бывай, капітан!» —
Сказаў малады баец.
Заплакаў апошнімі ён слязьмі,
Лёг на пясок і памёр.

III

У глыбокім яры, між высокіх узгоркаў,
Апавітыя новым калючым дротам,
На пяску,
На крыві
І на поце горкім
У знямозе ляжалі разбітыя роты.
А за дротам — бярозы і сосны крывыя.
А за дротам — каменныя вартавыя.
Вось і скончана ўсё...
Паліць сонца сухое.
Нехта ранены трызніць.
Ні вады, ні махры.
Пераможцы не так пасля цяжкага бою
Спачываюць у ранішніх промнях зары.
Прыкіпела сарочка да плеч капітана.
Толькі болю не чуе, не ведае ён.
Запытаюць цябе, капітан, не пра раны,
Запытаюць, як вёў ты на боі батальён.
Мы ж табе, капітан, загадалі памерці.
Што ж ты збег у палон ад нячэснае смерці?
Думкі горкія сэрца камбата трывожаць,
Стогн глухі замірае ў ягоных грудзях.

Нават дрэвы, здаецца, праз агарожу
Нібы дзеці ў звярынцы на воўка глядзяць...
Я падпоўз да камбата і лёг на гарачай зямлі.
«Не сумуй, капітан.
Мы зрабілі ўсё, што маглі».
Капітан паглядзеў на высокія хмары,
Ні то мне адказаў,
Ні то выказаў мару:
«Мне б толькі убачыць,
Ну хоць бы на хвілю, на момант,
Як гнаць
Пераможцаў маіх
Будуць зноўку за Нёман».
І так захацелася глянуць,
Ну хоць бы праз шчыліну,
Ў заўтрашні дзень...
Толькі дзе там!
Ляжы і пра лёс не пытай.
Мы у пастцы.
І дзверы у заўтрашні ранак зачынены.
Нават родная вёска цяпер —
Як далёкі Кітай...
Пазіраюць з-за дроту бярозы і сосны крывыя
І каменныя вартавыя.

IV

Трэці ранак па хвоях на неба ўзыходзіў,
Мы ляжалі ў абдымках без слоў і размоў,
І здавалася нам — прамінула стагоддзе
З залатых гадоў,
З даваенных сноў.
Хоць бы грымнулі гром ці выбухнуў лівень!
Цішыня...
Ды туман апавіў мурагі.
Быў ён белы такі і да жаху маўклівы,
Быццам выплыў ён сёння з глыбокіх магіл.
А як сонца пасеяла промні у росах
І па травах прайшліся вятры, як смыкі,—
На узгоркі, што воддаль, з ваколічных вёсак
Маткі нечыя, сёстры прыйшлі і жонкі.
І стаялі, як сумныя цені, жанчыны
На ўзгорках.
Над намі.

Ля белых бяроз.
Пазіралі на лагер маўкліва жанчыны
І глыталі пякучыя кропелькі слёз.
Каб ляжалі на полі забітыя ў бітве мы,
Нашым маткам і жонкам было б мо лягчэй.
Можа, нас бы у труны паклалі, абмытымі
Цёплым горам жаночых любімых вачэй.
А цяпер нашы вочы трывожылі матак:
«Ой ты, горачка-гора! Майго ці няма там?»
А цяпер нашы твары палохалі жонак:
«Ці не мой, не дай божа, сядзіць у палоне?»
Крык ім рот раздзіраў, а яны не крычалі.
Сэрцы ў лагер ляцелі, а ногі стаялі.
А адна не стрывала — старая, сівая,
З вузялком у руцэ, з аржаным караваем.
Немец бразнуў насустрач сухім аўтаматам:
«Хальт!»
Ды крочыць і крочыць яна:
«Бог з табою, сынок, вы ж таксама салдаты».
І хусцінку са стравай працягвае нам.
Толькі грукнулі стрэлы...
Па травах зялёных
Каравай пакаціўся крывавы, чырвоны.
Прасвісталі тупыя нямецкія кулі,
Нас па сэрцах, як вострым нажом, разанулі.
Ці ж на тое нас маткі на свет нарадзілі,
Каб на нашых вачах іх маглі забіваць?
Каб пад немцам па роднай зямлі мы хадзілі
І стыдаліся ў вочы людзей пазіраць?
Гнеў і сорам пякучы спаліў нашы сэрцы.
Нас з'яднала нянавісць пачуццем адным:
Чым гібець у палоне —
лепш ад куляў памерці,
Гнеўна плюнуўшы ў твары забойцам сваім.

V

Быў пяты ранак выклятай няволі.
Мы пастарэлі ўсе у тры разы.
Пачуцці прытупіліся ад болю,
І вочы ачарсцвелі без слязы.
Сланяліся па лагеры маўкліва
Між мёртвых і жывых таварышоў.

І вось тады паходкаю лянівай
Пан камендант з аховай к нам прыйшоў.
Куртатае адкормленае шула —
Яму быць свінабоем ці барцом.
Гарэбліва бялюткая кашуля
Глядзела з-пад мундзіра на байцоў.
Са скаргай на яго да пракурора
Не пойдзеш і не крыкнеш: «Адчапіся!»
Свіныя вочы.
Рот — не рот, а прорва.
І тлушчам апалосканая пыса.
Дык вось які ты, фрыц — мой адпагодак!
Ухмылкай пераможнай крывіш рот?
За кроў маю чакаеш нагароды?
Святкуеш, што загнаў мяне за дрот?
А ён стаіць і сыта вока жмурыць,
Прыцэньваецца, гáдзіна, да нас.
І вось ужо шпурляе словы хмура
У твары нам яго прапіты бас:
«Палонныя расійскія салдаты,
Вы можаце ў свае вярнуцца хаты,
Вы можаце абняць нявест і жонак
І з дзецьмі дарагімі мірна жыць.
Больш не існуе Арміі Чырвонай.
Вам шлях адзіны — фюрэру служыць.
Аддайце ў нашы рукі камуністаў.
Ім — смерць!
А вам — жыццё, зямля і хлеб...»
Ці гэта дзень навокал стаў імглісты?
Ці я ад гневу зыркага аслеп?
Я слухаю.
Стукоча ў скроні кроў.
Уласны хлеб купляць за смерць сяброў?
Маю зямлю ён хоча мне прадаць?
Маё жыццё ён хоча мне аддаць?
Мы ў шэрагах сваіх такіх не мелі,
Каб гандляваў радзімаю зямлёй!
Але знайшоўся...
Хто ён, гэта нелюдзь
З панылым тварам, з рыжай галавой,
Што моўчкі з нашых шэрагаў выходзіць
І прадаваць ідзе сваю душу?
Пяць крокаў ты прайшоў, іуда,
Годзе!

Зрываюся.
Бягу.
Дагнаў.
Душу...
Мне рук сваіх не сорамна.
Я рад
З пагардай наступіць на твар іудзін.
Пан камендант здымае аўтамат,
Трынаццаць куль грукочуць мне у грудзі.
А я стаю.
Няма на целе ран.
Ты здзіўлены, равеснік мой пракляты?
Ад смерці падарылі талісман
Мне родныя палі, лясы і хаты.
Ад жаху ты узмахваеш рукой —
І вісельня з намыленай пятлёю
Ўжо вырасла, як прывід, нада мной.
І я ў пятлі павіснуў над зямлёю...
Ты не гаворыш,
Ты хрыпіш са свістам:
«Ну? Выдасце вы зараз камуністаў?»
І капітан — адважны наш камбат —
Выходзіць і плюе з пагардай ў немца:
«Я камуніст. Страляй, нямецкі кат!
Я не баюся куль тваіх і смерці».
За ім аж захісталася зямля —
Усе байцы ля капітана сталі:
«Мы камуністы ўсе. Цяпер страляй!»
І песня грозным выбухам: «Паўстань...»
Ірву пятлю і станаўлюся ў рад:
«Аддай загад страляць, нямецкі кат!»

VI

Скажаце: хлусня, паэт, хімеры!
Ты насмерць ў акопах не стаяў.
Хіба што у паэмах на паперы
Ворага ў магілу загапяў.
Не ў цябе праклятыя стралялі,
Выразалі зоркі на грудзях,
Не цябе на вісельню ўздымалі,
Распіналі злосна на крыжах.
Ведаю.

І ўсё ж я маю права
Болем жыць сваіх таварышоў,
Ганарыцца іх бяссмертнай славай,
Помсціцца за чыстую іх кроў.
Перажыў удар я з імі першы —
След навек застаўся у душы.
І калі не куляю, дык вершам
Ярасна захопнікаў глушыў.
З імі бараніў свае я гоні,
Галадаў, калеў і паміраў.
З імі я пакутваў у палоне,
З імі я ў пянавісць вандраваў.
Мужная пякучая нянавісць!
Сорамна прызнацца, а між тым
Называў пачуццяў дробных навісь
Некалі я іменем тваім.
А нянавісць —
Гэта трупы ў снезе
Дарагіх і блізкіх пад вярбой.
Гэта кроў герояў на жалезе
Закіпае і заве на бой.
А нянавісць —
Сівізна на скронях,
Горкая бяссонніца ад дум,
Што ў палон тваю нявесту гоняць,
Што тваіх бацькоў на здзек вядуць.
А нянавісць —
Храбрасць у атацы,
Дзе пра смерць не думаеш сваю;
Думаеш, каб толькі пакеітацца
З вылюдкам нямецкім у баю.
Аддасі ўсяго сябе без здачы
Ярасці караючай штыка,
Каб уратаванага убачыць
Хлопчыка малога на руках.
На фашыста кідаешся люта
І, не загаіўшы свежых ран,
Зноў у бой...
Грыміць Масква салютамі,
Уставай з магілы, капітан!
Разбудзі байцоў сваіх адважных.
Бачыш пераможную зару?
Мы ўжо блізка
Ля магілак вашых —

На Бярозе глушым немчуру.
І далей — за Нёман!
Гнеў руінаў
Пранясём да перамогі мы
І на плошчах чорнага Берліна
Прадыктуем справядлівы мір.
І тады у сонечнае ранне,
Змыўшы са штыкоў чужынцаў кроў,
Мы пачнём другое вандраванне —
Вандраванне ў радасць і любоў.

*Верасень 1943 — май 1944*

# III

## *Іранскі дзённік*

* *

Мы першы раз за межамі Радзімы.
Бывай, зямля савецкая мая!
Насустрач горы выплываюць з дыму,
Якія апяваў калісь Хаям.

Тужэй падцягваем франтавыя дзягі,
Глянцуем боты, чысцім шынялі.
Не так, як паэтычныя бадзягі,
Прайду па тэгеранскай я зямлі.

Я — пасланец Рэспублікі Саветаў,
Не заваёўнік, а жаданы друг.
Сустрэў Іран байцоў савецкіх ветла
Узмахам загарэлых дужых рук.

Якія горы! А сады якія!
Тут шмат зямнога цёплага дабра,
А назвы дрэў мудроныя такія,
Што цяжка нават рыфму падабраць.

Рака па скалах хвалямі грукоча,
Узмыленая, ярасна сапе.
І так ляціць, і так імчыцца —
Хоча
Нібыта абагнаць сама сябе.

Ідуць бясконцым мураўіным гужам
Памераў парадыйных ішакі.
Ні то ў Кабул, ні то да Гіндукуша
Вязуць яны славутыя шаўкі.

А ім насустрач па хрыбтах рудых —
З тысячагоднім стажам вярблюды,
З паклажай фантастычнай па гарбах,
З пагардаю сухою на губах.

Мы едзем і паселішчы гартаем,
Нібы старонкі незнаёмых кніг.
І металічны гул размоў гартанных
З налёту у палон бярэ мой слых.

Усюды крамы, крамачкі і крамкі —
Не меней дзесяці па жыхара.
Калі б уставіць гэты кут у рамку,—
Цудоўнае пано: «Гандлярскі рай».

Нас атакуюць гандляры малыя:
«Хурма! Лаваш! Купіце кішміша!» —
І так глядзяць, і так згінаюць шыі,
Нібыта я савецкі нейкі шах.

Ды ўбачыўшы, што пакупнік я дрэнны,
Зноў лямантуюць дружна: «Зорку дай!»
Цяжкая ты, замежная арэна,
Мой першы неразгаданы Кітай!

А тут яшчэ нязвыклыя кантрасты:
Палац раскошны, у мільёнаў пяць —
І дзед-жабрак. Ён мае грошы? Трасцу!
Панэль пад бок — і, калі ласка, спаць!

Не радуюць яго арлы і горы.
Кладзіся пад айву і памірай...
Прапахшы часнаком і сонцам горад,
Багаты і жабрачы горны край.

Не так, не так у нас...
Але якая справа
Мне да цябе, загадкавы Іран!
Сігнал рэгуліроўшчыка — «направа»,
І еду я направа, ў Тэгеран.

*1944*

# У ТЭГЕРАНЕ

Гулам незнаёмым аналошча,
З-пад гары — агні, агні, агні.
І ляціць ад прывакзальнаї плошчы
Чорны шах на бронзавым кані.

Дзіўна тут усё і незнаёма:
Песня-крык і востры пах пладоў,
Казачныя постаці харомаў,
Сцены глінабітныя платоў.

На асфальце трапяткія цені,
Пад ліствою звоняць арыкі,
І пераліваецца адзеннем
Буйны вір натоўпаў гаваркіх.

І калі гарачымі вачыма
З-пад чадры іранка шугане,
Мімаволі ты прашэпчаш імя,
Чутае калісьці,— Шаганэ...

Заламаўшы сінюю пілотку,
Паліцэйскі ішака вядзе.
На рагу з алахам на ўсю глотку
Брудны дэрвіш гутарку вядзе.

Дзівімся крыху на шоўк і шалі
Згодна абавязку ўсіх гасцей.
Ды раскоша нас не спакушае,—
Мы непараўнана багацей.

Нейкія замежныя салдаты,
Зорку запрыкмеціўшы маю,
Па панэлі грукаюць заўзята
І з павагаї чэсць нам аддаюць.

*1944, Тэгеран*

* *

Ты чуеш курлыканне — рад ці не рад?
Між хваляў густой сінявы
Лятуць журавы за гару Арарат,
На поўнач лятуць журавы.

Прывык сустракаць ты іх гэтай парой
Пад першай вясновай зарой.
А тут журавель, узмахнуўшы крылом,
У вырай праз сэрца ляціць напралом.

Забыў, што ад дому за тысячы міль,—
Злуешся і крыкнуць карціць:
«Гэй, хто там знаёмы да болю фільм
З канца пачынае круціць?»

Лятуць журавы за Казбек і Эльбрус,
І сэрца сціскае туга.
Сустрэне іх хутка мая Беларусь
На цёплых зялёных лугах.

Я зайздрасці к птушкам ніколі не меў —
Без крылляў мне нават ямчэй,
А зараз ад крыўды глухой анямеў
І з неба не зводжу вачэй.

*1944, Казвін*

* *

Я ўсё пераблытаў — дзе мора, дзе неба,
Дзе хмары, дзе горы...
Іран.
Красавік.
Даўно я не еў беларускага хлеба,
Ад паху смалістага бору адвык.

Зямля выхваляецца дзіўнай раскошай:
Гранатамі, рысам, салодкай айвой.
І нават мясцовыя танныя грошы —
З малюнкамі гор, вадаспадаў, ільвоў.

З гаёў апельсінавых сонечны лівень
Цябе залівае.
А пах — на ўвесь свет.
Пытае іранец мяне: «Ты шчаслівы
Пад небам паўднёвым?
Праслаў нас, паэт».

Дзівак!
Я абразай не буду няславіць
Твой край: тут цікава, прыгожа, і ўсё ж
Не мне апяваць тваё сонца і славіць
Шыразскія ружы і горы Загрош.

Я толькі заездам сюды, падарожнік,
Каб горы твае асвятліць на хвіліну
Агнём маёй зоркі пякуча-трывожным,
А потым вярнуцца да роднай краіны.

Далёка, ў зялёнай хваёвай старонцы
Ёсць хата свая ў мяне, пушча і поле,
Сваё найсвятлейшае добрае сонца.
Я іх праменяць не згаджуся ніколі.

Таму гэтак лёгка хадзіць мне па свеце,
Еўропу і Азію крокамі мераць,
Што родныя людзі, і сонца, і вецер
Чакаюць мяне і ў любоў маю вераць.

*1944*

## СЛУХАЮЧЫ «ПЕРАПЁЛКУ»

Адціснуты зоркі пад самую столь,
І неба ў арэнду гарою забрана.
Узровень над морам — 3 100.
Тут наша застава.
Тут землі Ірана.
Тут скалы чырвоныя,
Снег, як віно.
Не бачыў ніколі такіх краявідаў я.
На цыпкі прыўстанеш — і добра відно
Галодную і шматпакутную Індыю.
Зірнеш у цясніну —
Не ўбачыш і дна.
Пад вокнамі хмары блакітныя тоўпяцца.
А ўвечары зоркі заходзяць да нас,
Вядома, суседкі —
Цікавяцца хлопцамі...
Быў вечар.
У хаце глінянай са мной
Сядзеў каля радыё
Друг мой мінчанін,
Хрыпеў рэпрадуктар і трызніў вайной.
Змяркалася.
Сонныя горы маўчалі.
Мы прагна лавілі Маскву,
А затым
Цымбалы далёкія хтосьці пакратаў.
І раптам дыхнула жнівом залатым,
І матчынай ласкай,
І нейкаю стратай.
А голас чароўны з тугою звінеў
Пра птушку маленькую з хворымі грудкамі.
Сціскаў нашы сэрцы журботны напеў,
І вочы хавалі за дым самакруткі мы.
І скалы знікалі, шумелі бары,
І мы ўжо ляцелі з чужыны дадому:
«А помніш тэатр на Траецкай гары?
А гэту актрысу?» —
«Ну як жа, вядома!» —
«А нашы дзяўчаты!

А парк у нядзелю!
А фільмы, якія мы ў «Зорцы» глядзелі!»
Кажу, нахіліўшыся, ціха дружку:
«А піва, якое было на ражку!»
Мы помнілі ўсё, чым сталіца жыла —
То песня зрабіла далёкае блізкім...
Маленькая птушка сыпнула з крыла
На сэрцы нястынучым попелам мінскім.

*1944*

* *

І скрыпяць, і скрыпяць чужаземныя дрэвы сухія.
За дуваламі цёмнымі вые галодны шакал.
Я ніколі не сніў пра такія мясціны глухія,
Я экзотыкі гэткай ніколі нідзе не шукаў.

Так заўсёды бывае: не можаш ніяк пагадзіцца
З аднастайнасцю рэчаў, і звычак, і фарбаў, і слоў,
І зямля невядомая ноччу вясноваю сніцца,
І ты марыш пра лёгкія крыллі залётных буслоў.

Ты ўстаеш, атакованы снамі, і верыш, і верыш
У далёкія рэкі, у голас марскіх караблёў.
У нязнаныя землі, якія наўсцяж перамерыш.
У харчэўні бадзяг, дзе пакінеш ты рэштку рублёў...

Вось і землі жаданыя. Поўдзень.
Нязвыклыя рэчы і гукі.
Ты закінуты ветрам прыгод за трыдзевяць зямель.
Над табой заламіла ноч светлыя зорныя рукі,
Для цябе выплывае з-за мысу марскі карабель.

Для цябе ён надвесіў на мачту высокую месяц,
Ты у самым раю паэтычнай адвечнай хлусні.
Дзе ж тваё захапленне? Чаму галаву ты павесіў?
Пра якую зямлю, пра якія прыгоды ты сніш?

Адкажы, толькі шчыра... Мне сніцца сасновая хата
З пахам свежага хлеба і парнага малака,
З жоўтай чыстай падлогай,
насыпанай пахкаю мятай,
З фотаздымкамі родных пад белым вянком ручніка.

Зараз хочацца мець беларускага неба багата,
Па тых сцежках хадзіць, дзе хадзілі і нашы дзяды,
Каб старая зязюля, прысеўшы на хвою ля хаты,
Кожны вечар лічыла пражытыя дома гады.

*1944*

## РАМАНТЫКА

Дымяцца зялёныя горы —
Хоць лусту на снеданне рэж.
Спускаемся з гор мы у горад
З кароткаю назваю Рэшт.

Тут вецер вільготны і пруткі,
І ружы ў духмянай расе.
Тут землетрасенне за грудкі
Нізіну бярэ і трасе.

А воддаль Каспійскаму мору
Расчэсвае грыву буран...
Па гэтай нізіне, гавораць,
Калісьці хадзіў атаман.

Яго лебядзіныя чоўны
Пілі недалёка ваду.
Пад небам, трывожным і чорным,
Крычалі сычы пра бяду.

Снавалі кудлатыя цені,
Пажар агнякрылы шугаў.
Адгэтуль пад ветразем Сценька
У песню з княжной адплываў...

Чырвоным засыпаны пылам
Рамантыкі даўняй сляды.
Маскітаў раі абляпілі
Айвы залатыя плады.

Аглушаны спёкаю горад
Без руху.
І сотні гадоў
Глядзяць абалдзелыя горы
На нудпае мора садоў.

І дзе яны, князевы дочкі,
Што ззялі заморскай красой?
Вось гэта, што чэрпае з бочкі
Руды селядцовы расол?

Ці тая гандлярка худая,
Што варыць з баранінай плоў?
Іду я, і злосць разбірае:
Ну хто гэта казак наплёў?

Няма тут ні княжнаў, ні бітваў.
Сцвярджаю.
Я ўсё абышоў...
Іран, ты слязьмі ўвесь заліты,
Агорнут ў рыззё, а не ў шоўк.

*1944*

* *

На Ардабільскім перавале,
Пад дзікім позіркам арлоў,
Мяне, як скрыпку, пілавалі
Смыкі дванаццаці вятроў.

І я з вар'яцкай гэтай высі,
Бездапаможны і малы,
На мусульманскі край дзівіўся,
Прыклеіўшыся да скалы.

Па рыжай скроні перавала
З-пад залатога ледніка
Раўла, свяціла, піравала
Высакагорная рака.

Каля ракі маліўся богу
З крывой турэцкай шабляй курд.
І раптам з воблака сівога
Джайранаў выбег шэры гурт.

Курд, развітаўшыся з алахам,—
За стрэльбу, на каня і ўслед.
А я з тугой пакратаў флягу —
Ото б джайрана на абед!

Такім нязвыклым тут было ўсё,
Такім паўдзённым, трапяткім,
Нібыта казкай стаць клялося,
Нібы прасілася ў радкі.

Я не стрымаўся ад спакусы,
Стаў верш пісаць ля гулкіх вод,
На плечы нейкага Эльбруса
Паклаўшы верны свой блакнот.

*1944, Таўрыз*

* *

Гарлае ноч хрыпатай глоткай пеўня.
І кіпарысаў шум усё напеўней,
Світальны шум. Пара заснуць, пара...
Да чорнай шыбы прыкіпела зорка,
А мне не спіцца, і на сэрцы горка,
І скаргі нудныя выходзяць з-пад пяра.
Я на паперы, бледнай і пакорнай,
Раз'юшана складаю спісак чорны
Сваіх сяброў, якія тыдняў пяць
Ляпуюцца лісты мне напісаць.
А для мяне яны патрэбней хлеба,
Каб глянула з радкоў радзімы неба,
Каб ластаўкамі белымі канверты
Ляцелі да мяне з палескім ветрам.
За вокнамі шакал прачула вые,
А прада мной — лісты сяброў старыя...
Таму салдату, можа, і не спіцца
У далёкім чужаземным гарадку,
Што думаеш пра родныя крыніцы
І радуешся кожнаму радку.

*1944*

## БУТЭЛЬКА ЦЫНАНДАЛІ

Вецер, можа, з Інда, можа, з Ганга,
Апаліў спякотаю мой твар.
Разлажыў купец на нізкім ганку
Свой пярэсты дробязны тавар.

З усяе планеты грэшнай заваль
Зборышчам музейным тут ляжыць:
Шапка мараканскага зуава,
Чоткі, залінгенскія нажы,

Шофераў ангельскіх рукавіцы,
Сіняе з Манчэстэра сукно,
Даўнія марозаўскія сітцы,
Статуэтка «Закаханы гном»;

Кнігі, друкаваныя ў Бамбеі,
Гума — заплаці і тыдзень жуй,
Здымкі Нью-Йоркскага сабвея,
Дугласа Фербенкса і Менжу;

Дываны персідскія, пярсцёнкі,
Копія з Гагена, ром і бром,
Абразы армянскія і тонкі
Звонкага Саадзі вершаў том;

Пацеркі, вясёлкавыя шалі,
Дарагіх гадзіннікаў гара...
Купчык далікатна запрашае:
«Пане афіцэру, выбірай».

Ведае купец, што грошы маю,
Ёсць чым размачыць салдацкі хлеб.
Абыяка вокам прабягаю
Па замежным розным барахле.

Кніг індускіх я чытаць не ўмею,
Шоўк не для салдата. Дываны?
Гэта — рэч. Усходняй казкай вее.
Вось калі б іх бачыў да вайны!

Будзе яшчэ некалі багатым
Мой адбудаваны новы дом.
А цяпер няма ў мяне і хаты,
Попел не прыкрыеш дываном.

А цяпер гудзе ў далёкіх далях
На усіх шляхах вайна, вайна...
Я купіў бутэльку цынандалі —
Добрага грузінскага віна.

Не таму, што не было тут лепшых.
Мне ўспамін навеяла яно,
Як жылі мы, як пісалі вершы,
Як пілі вось гэтае віно.

Мы сягоння на чужой чужыне
Сядзем па-сяброўску за сталом,
Пасумуем па сваёй краіне,
Песню «А ў бары, бары» спяём.

А пасля па чары цынандалі
Вып'ем за здароўе тых сяброў,
Што сягоння у далёкіх далях
Б'юцца за Бабруйск і Магілёў.

*1944*

## СУСТРЭЧА З БЯРОЗАЙ

Дарога бегла у Бендэр-Шах,
Сцякала з гор да нізін.
Матор клекатаў у маіх вушах
Запар шэсцьсот хвілін.
Ад цішыні я раптам аглух
І выйшаў, як п'яны, на луг.
Насустрач выбеглі кіпарысы:
«Ад нашага сонца, таварыш, прыкрыйся».
І раптам, расштурхваючы натоўп
Крыклівых паўдзённых дрэў,
Бяроза рынулася:
«Браток,
Як слаўна, што ўрэшце мяне ты сустрэў!»
Схапіў у абдымкі ад радасці я
Бярозу:
«Адкуль жа ты ў гэтых краях?» —
«Я йшла за табой з магілёўскага бору,
Бо ведала: будзеш тужыць на чужыне
Па мне ты.
Я йшла цераз пушчы і горы,
Мясіла дрыгву ў Кахецінскай нізіне,
Глыбокія рэкі пераплывала,
Калела ад сцюжы на перавалах.
Паэт мой, чаго ты на поўдні не бачыў —
Айвы кіславатай, шакалаў ці кобраў,
Багатых пярсцёнкаў ці слёзаў жабрачых?
Тут горача, пыльна, тут вельмі нядобра.
Хадзем на радзіму!
Там зараз вясна.
Чужынцаў прагналі, баі адгудзелі.
Як травы шумліва ўзыходзяць у нас!
Як радасна пушчы гамоняць у нас!
Адгэтуль да нас і буслы паляцелі».
Мы доўга з бярозай стаялі ўдваіх
На нейкай нізіне, ў далёкім Іране,
На поўнач з бярозай глядзелі ўдваіх.
І так размаўлялі, што горы і луг
Ад рэўнасці дзікай ў тузе заміралі.

*1944, Бендэр-Шах*

## РАЗМОВА З ІШАКОМ

Гартанная песня завязла ў вушах,
Ад пылу зрабіўся я мельнікам.
Раве, нібы дрэнны акцёр, мой ішак,
Здзекуецца з пісьменніка.

Маўляў, раз прыехаў па поўдзень — цярпі.
І горы, і спёку пякельную.
Даволі пісаў пра жніво і сярпы,
Пра смачны дымок над патэльняю.

Падумаеш — хітрасць у рыфмы цаляць
У садзе, ружовым ад сораму.
А вось паспрабуй напісаць пра цялят,
Што пасвіць іранец пад зорамі.

А вось паспрабуй з вярблюдам у нагу
Прайсці праз пустэлі і горы ты...
Цярпеў я, цярпеў і зароў: «Не магу!
Ідзі ты, ішак мой, к чорту!»

І хто, вы скажыце мне, гэта хлусіў,
Што ішакі дурнаватыя?
Пасля той размовы я тыдзень насіў
Вушы, забітыя ватаю.

*1944*

## ПЯЧОРЫН У ПЕРСІІ

Зоры ззялі спачатку ў расе,
Каб агнём залатым адагрэць яе.
Ён пастукаў, прыйшоў і сеў
На пакрыўленым табурэце.

Зоры рынуліся да шыб
Падзівіцца на незнаёмца.
«Не прыпомню я вас, дадушы»,—
Я прамовіў з усмешкай няёмкай.

Вусны тонкія ён скрывіў,
Табурэціна заскрыпела.
«Смутак мой — і ў вашай крыві».—
І адкінуў цёмны капелюш.

«Мой загадкавы сум і нуду
Вывучаюць сотні вучоных.
Дзе праеду я, дзе прайду —
Там прыхільнікаў незлічона.

Хто са мной пагаворыць хоць раз,
Той вандруючай стане каметай.
Адзінокіх і гордых нас
Паважае уся планета».

Нібы вучань, пачуўшы падказ,
Уздыхнуў я з палёгкай. Цікава...
«Вы Пячорын? Я ведаю вас,
Ў сямігодцы праходзілі нават.
Вы, здаецца, мелі намеры
Ажаніцца на нейкай Мэры?»

Ён з пагардай зірнуў на мяне:
«І чаму вас вучаць у школе?
Каб Пячорын жанатым быў? Не!
Не зраблю я глупства ніколі».

«Прабачайце, зусім забыў,
Што жанчын вы любілі памучыць.

Казбіч Бэлу праз вас забіў?»
«І чаму вас у школе вучаць!»

Як змяніла яго пара...
Валасы парадзелі, залізаны.
Шэрай плямаю з-пад каўняра —
Зацыраваная бялізна.

Бледны твар. Чужаземны акцэнт.
Выраз вуснаў сухі і тонкі.
Цьмяна бліскаюць на руцэ
Тройчы выліпялыя пярсцёнкі.

Я сядзеў, пазяхаў... Не сцярпеў —
Запытаў у яго тактычна:
«На якой вы пасадзе цяпер,
На плебейскай ці арыстакратычнай?

З тых часоў, як з Расіі знік,
Ходзяць розныя цёмныя версіі.
Між вучонымі шмат грызні —
Чым займаліся вы у Персіі».

Ён адразу абмяк і зблажэў,
За хвіліну зліняла аблічча.
Табурэт пераставіў бліжэй
І пачаў шаптаць таямніча:

«Я даўно тут жыву. Прадаю
Віскі, піва, гарбату, закускі.
Людзі рускія не прызнаюць,
Ты, гавораць, не наш, не рускі.

І адводзяць вочы убок,
Знаю: думаюць — белагвардзеец.
Пераблытаўся дзён клубок,
І канца не знайду анідзе я...»

Я прыглядваюся пільней:
Ты, як кажуць, амаль адмершы.
Завагаўся — ці варта мне
На такога растрачваць вершы?

Бо даўно ўжо няма у нас
Гэткіх дэманаў гультаяватых.
Маладзік за акном пагас.
Як жа выжыць яго мне з хаты?

«Вам,— кажу,— пара ў рэстаран,
Зарабляйце на старасць грошы».
Уздыхнуў ён: «Іран мой, Іран».
І палез у старыя галошы.

І пайшоў ён пад новай зарой,
Адзінокі, ў капелюшы чорным,
Пеаражытага часу герой,
Так сказаць, бессмяротны Пячорын.

*1944*

## ШТО Я ДУМАЎ, ГЛЕДЗЯЧЫ НА КАСПІЙСКАЕ МОРА

Каспійскае мора!
Раздольным і сінім
Прыйшло на спатканне ка мне ты.
Паверыш —
Калі б ты шумела у нашай краіне,
Табе я штодня прысвячаў бы па вершу.

І хто гэта часам наіўна гаворыць,
Што ёсць справядлівасць?
Ад крыўды — аж горача.
Адным вось такое раскошнае мора,
Другія ж не маюць мізэрнага морачка.

Сягоння, як зоры на небе засвецяцца
І месяц з-за хмары нахмуранай выбліскне,—
Каўшом серабрыстым Вялікай Мядзведзіцы
Паўмора зачэрпну і ў Піншчыну выплесну.

Я прагны.
Свой грэх разумею і каюся,
І зноўку грашу яшчэ болей, вядома.
Калі мне цудоўнае што сустракаецца —
Жадаю загрэбці і везці дадому.

Для прыкладу — горы.
Хацеў я аднойчы
У Грузіі сперці славуты Казбек.
Ён сам прызнаваўся не раз мне, што хоча
Бліжэй перабрацца да нашых рэк.

А даць узамен я збіраўся грузінам
Палову мазырскай ці пінскай нізіны.
Грузіны — у лямант:
«Без гор мы загінем!
Няўжо табе мала азёр і бароў?»
І я злітаваўся — Казбек ім накінуў:
Не крыўдзіць жа добрых грузінскіх сяброў.

Я прагны.
І ўсё ж, хто са мною знаёмы,
Той шчыра прызнае, што хлопец я свой.
Дазволіў ахвотна я нашаму Нёману
Літоўскія землі ўпрыгожыць сабой.

Днянро на Украіну пусціў я з Палесся —
Вада у Дняпры з беларускай крыніцы.
Няхай. Мне не шкода.
Бо гэтулькі песень!
Куды без Дняпра іх надзець украінцам!

...Стаю ля Каспійскага мора на беразе
І марай уласнае сэрца трывожу —
Мая Беларусь, у рамонку і верасе,
Цябе не на жарты зрабіць я намерыўся
Багатай, шчаслівай,
Як песня, прыгожай.

*1944*

* *

Як шаблямі, на часткі
Ля горнае ракі
Сякуць крыламі ластаўкі
Распалены блакіт.

Чайхапшчык сонным вокам
Глядзіць, як наш баец
Па мосце рэдкім крокам
Ідзе з канца ў канец.

Ідзе, чапляе сонца
Навостраным штыком.
Паветра пахне со́чным
Казлінам шашлыком.

І гэты пах тубыльны
Злуе байца.
Нясе
Яго ўспамін над Вільню,
Дзе травы у расе,

Дзе хвоі над крыніцай
Лагодна так гудуць,
Дзе з малаком чарніцы
Увечары ядуць.

*1945*

* *

Апяваў Адам Міцкевіч стэпаў даль пад Акерманам,
Геній Пушкіна праславіў горы сінія ў тумане.

Да вялікіх мне далёка, я за імі не цягнуся.
Толькі хочацца мне вершы напісаць для Беларусі:

Пра заморскія прасторы, пра чужыя гарады,
Пра зямлю, дзе мы служылі ў неспакойныя гады.

Я адважыўся, нікчэмны, сетку рыфмаў ціха плесці
Пра Іран, краіну гораў, каб у сетцы той завезці

Хоць кавалак сонца поўдня у палескую краіну,
Спёку жоўтую пустыні, пах айвы і апельсінаў.

Раскажу, як караваны сумным звонам будзяць горы,
Як вязуць яны у Мекку на гарбах людское гора;

Як на вуліцах жабрачаць дзеці бедныя Ірана,
Як па горах дзікіх скачуць крутарогія джайраны.

Я тут жыў, здаецца, вечнасць, еў лаваш і вінаград,
Палюбіў арыкаў плёскат, пахкі персікавы сад,

Дзе удоды балбаталі на замежнай нейкай мове,
Дзе іранцы частавалі нас віном і тлустым пловам.

Дзесяць воблакаў над намі
млелі ў небе перагрэтым.
Іх блакітнымі слупамі падпіралі мінарэты.

На блакітных мінарэтах галасілі муэдзіны...
Я падумаў: тут пачатак
старажытных казак дзіўных.

Напісаць праўдзівы дзённік я адважыўся тады
Пра зямлю, дзе мы служылі ў неспакойныя гады.

*1945*

* *

Збіраліся чорныя, гарбаносыя,
Цягнулі з сабою сірот і ўдоў усіх,
Гора і слёзы свае выносілі
На старажытную плошчу Фірдоусі.

І гул нарастаць стаў, нібы пры абвале,
І чырвань сцягоў пачала разгарацца.
Рысу і працы патрабавалі
Дзесяць тысяч галодных іранцаў.

Коні жандараў хрыпелі у пене.
Завулкі чакалі ад выбухаў пошчаку,
І самі прасіліся ў рукі каменні
З раздаўленай гневам і ярасцю плошчы.

*1945*

## КАРАВАН

Хвала табе, моцны салдацкі сон
Без недарэчных сноў!
Мяне разбудзіў невыразны звон
Глухіх і сумных званоў.
У вузкіх цяснінах — блакітны дым,
На горах — ружовы дым.
За першым, галоўным, сівым і рудым,
Цягнуліся вярблюды.
І гэтак журботна глядзелі іх вочы,
І гэтак стаміліся іх гарбы.
Здалося: яны без спачыну крочаць
З эпохі Кіра ў нябыт.
Вядзе караваншчык — стары чалавек —
Чужы караван у Мекку
Па жоўтай пустыні
Без дрэў і без рэк,—
Шкада чалавека.
Да Меккі ён дойдзе,
А шчасця не знойдзе...
Няўжо гэта хлусяць, што створаны радыё
І самалёты?
І сумна кажу я:
«Ранак мой мінскі, прыйдзі і узрадавай
Хоць на гадзіну зямлю чужую.
Над Сожам і Прыпяццю сёння збяры
Пах мяты і хвоі
І пух зары.
Прынясі у чырвоных сюды прасцірадлах
Птушак паднёманскіх галасы,
А пустыню засей чыстым зернем расы,—
Мо палягчэе беднай старонцы,
Можа сасніць караваншчык сівы,
Што недзе над Мінскам,
Пад самым сонцам,
Пра шчасце курлыкаюць журавы».

*1945*

# ДЭМАВЕНД,
# ГАЛОЎНАЯ ГАРА ІРАНЦАЎ

Так засыпле снегам, так пасвенціць,
Што да ніткі вымакнеш, і ўсё ж
Успамін аб гэтым Дэмавендзе
Павяжэш на Прыпяць і на Сож.
На зямлі Афіны ёсць і Вены.
Ні Афін не бачыў я, ні Вен,
Гэтыя радкі мае навеяны
Цёплаю гарою Дэмавенд.
Цэлы дзень тугой мяне гняло,
А прыйшоў сюды — рукой зняло.
Можа, не рукою, а ракою,
Можа, старажытным супакоем,
Тут, ля верхавіны Дэмавенда,
Прызнаюся: гэтага не ведаў.
Пазірнеш уніз, у прорву зверху —
Хвалямі рудымі горны вэрхал.
Дзякуй, божа! Слаўна замясіў
Гэты неафармлены масіў.
Спецыяльна вылепіў для нас
Новую кватэру пад Парнас.
Тут прастор для галасістых бардаў —
Слухаюць ласі і леапарды.
Пра каханне вершы дужым басам
Можна для арлоў чытаць і барсаў.
Тут, калі дыскусія, то з громам,
А калі схалтурыў — прэч з гары.
І пісацьмем вершы не пяром мы,—
Кіпарысам на лістах зары.
Скончыўшы высокія адведзіны,
Я паклаў Вялікую Мядзведзіцу
Спаць на верхавіну Дэмавендзіну.
Спі, засні, Мядзведзіца, ледзь-ледзь
Я таксама не малы мядзведзь.
Нам бы згаварыцца, падружыць,
Ды спяшу ў нізіну: позні час.
Ну, а ты, шматвокая, ляжы,
Беражы персідскі мой Парнас.

*1945*

## ДОЖДЖ

Патонулі птушкі у дрэвах,
Як тонуць рыбы у водах.
І вецер справа налева
Шпурнуў па сад непагоду.

Расхрыстаныя ігрушы
Збіраліся запярэчыць,
А вецер хмару абрушыў
На іх зялёныя плечы.

Праў дождж: спачатку па нітцы,
А потым так горача жарнуў —
Здалося, ссыпаюць пшаніцу
На ток з мяхоў велізарных.

Ад ярасці гром разрываўся,
Нібыта на нейкай вайне быў.
Цярпеў я,
 цярпеў — раззлаваўся:
«Заткніце дзіравае неба!»

І змоўкла. Запахла навокал
Зялёным, салодкім і едкім.
Раскіданы ў небе глыбокім
Развараных хмараў аб'едкі.

Трасу дажджасховішча птушак:
Адбой у зялёнай сялібе!
Ляціце, крылатыя душы,
Спявайце, крылатыя душы!

І грымнуў вясёлы выбух
Птушак, пладоў і расы.

*1945*

## НА МОРЫ

Так загуста насыпана месяцаў
У бяздонную прорву вод,
Што не пройдзе ніяк, не памесціцца
Сярод гэтых вод параход.
Параход гарбузы залатыя
Падмінае, і давіць, і вые
У свой чорны трывожны гудок.
То не пенныя грывы сівыя
Валакуцца за параходам,
Гэта жоўтая сцежка на водах:
Маладзіковы сок.

*1945*

* *

Чорныя марскія ночы,
Маякі далёкіх зораў...
Ты згубіла сёння вочы
У праклятым гэтым моры.

І стаіш цяпер сляпая,
І зусім, зусім не бачыш,
Як на сэрцы закіпаюць
Ад пакуты хвалі плачу.

Я гатоў плячо падкласці
Пад руку тваю, нябога,
Для мяне было б за шчасце
Весці гэткага сляпога.

З бессардэчнасцю дзявочай
Ты маўчыш, і нешта тоіш,
І, напэўна, доўга хочаш
Жыць з такою слепатою.

*Ліпень, 1945*

## МАЛЯРЫЯ

І адзін я ў пустыні,
І адзін я ў пустыні...
Кроў пачне закіпаць,
Потым зноўку застыне.
Хоць шукаюць сябры —
ды мяне не знаходзяць
На паблытаных сцежках вайны.
Караваны мяне абыходзяць,
Заміраюць у далях званы.
Толькі жоўты пясок неабсяжнай пустыні
Нада мною галосіць
То працяжна, то сіпла.
Толькі жорсткі пясок агнявая пустыня
Праз вачніцы мае усё сыпле і сыпле.
А гарачае сэрца малатамі куюць,
А вятры адыходную песню пяюць.
Хоць бы трошачку цені,
Хоць бы кроплю вады,
Хоць бы сівы арол заслаціў крыллем сонца!
А пасля міражы,
А пасля гарады,
Што пакінуў калісьці я ў роднай старонцы.
Вось пяскі валасы ўжо мае замялі,
Сэрца зараз праб'е дванаццаць.
Не хачу паміраць на чужой я зямлі!
Трэба ўзняцца.
Я свінцовыя вейкі свае расчыніў,
Свет хіснуўся — такі нетрывалы і дзіўны.
Толькі я ўжо устаў,
Бо удалечыні
Я убачыў вялікае сонца Радзімы.
Дык свяці, не гасі гэты светлы маяк,
Дарагая Радзіма мая!
Хай вятры у вушах па-вар'яцку гудуць,
Хай пясок скрыпіць і рыпяць суставы,
Але я іду,
Але я дайду
Да першай савецкай заставы.

*1945—1947*

## ІСПАНСКАЯ НОЧ

**Паэма**

*Прысвячаю іспанскім рэспубліканцам,*
*якія адважна змагаліся*
*ў беларускіх партызанскіх атрадах*

«Барселонскі! Барселонскі!» —
Загадалі сто сеньёраў.
«Барселонскі слаўны танец»,—
Папрасілі далікатна
Чатырнаццаць сеньярыт.
Хварасцін сухіх бярэмя
Паляцела на вуголле,
І агонь, павесялеўшы,
Грызці стаў сухое голле
З лёгкім хрустам, нібы косці,
Аж пакуль не разгарэўся,
Як чырвоная дзяўчына.

«Покуль смажыцца дзічына,
Да агню сядайце, госці!» —
Да агню прыселі госці.
Прагрымела ў цёмным лесе
Сто пятнаццаць гулкіх рэхаў:
«Барселонскі слаўны танец —
Нам на радасць і уцеху!»

Грукнуў бубен з лёгкім звонам,
Флейта свіснула пяшчотна,
Дзве малыя гітарысткі
Тузанулі за гітары,
І з натоўпу кабальера
На шаўковую паляну,
На іспанскі сіні верас
Выйшаў стройны спрытны рыцар
Дон Дзіега дэль Альварэс.

Пра яго іспанцы чулі
За Сіераю Марэна,
За Таледскімі гарамі,
У Валенсіі, Мадрыдзе,
На шумлівай Гвадыяне,

На рацэ імклівай Тахо,
На рацэ Гвадалквівір.

Толькі стукнуў ён нагою
І замёр на хвілю горды —
Ад салодкага чакання
Затрымцела ўся зямля.
Толькі грукнуў ён другою,
Цені схлынулі з паляны,
І на полымя апалі
Дзве расінкі — дзве каралі
З цёмна-сіняга галля.

Дон Дзіега скача. Мірты
Б'юць у тонкія далоні.
Дон Дзіега скача. Лаўры
Для яго плятуць вянкі.
Нават звоняць кіпарысы,
Дружна звоняць кіпарысы
У зялёныя званкі.

Ўсё глыбей, усё бяздонней
Маладога дона вочы.
Усхваляваныя доны
Усхапіцца з месца хочуць.
Струн гітарных гул чмяліны,
Кастан'ет буслівы клёкат.
Дзве малыя гітарысткі
Абарвалі дзве струны.
І тады яна выходзіць —
Чараўнічая сеньёра,
На паляне, на выгодзе
Прыгажэйшая за ўсіх.
І панеслася пячутна
За імклівым кабальера,
Нібы хмарка за маланкай,
Нібы вецер за арлом.

«Запявайце танадзілью!
Сёння лепей, чым учора».—
«Запявайце танадзілью!
Хай загінуць сум і гора.
Весяліся, не журыся,
Благаслаўлёная зямля!»

*

А чаму у дон Дзіега
Франтавая гімнасцёрка?
А чаму у дон Дзіега
На пілотцы свеціць зорка?
А чаму ў яго сеньёры
Не іспанскае аблічча? —
Леглі промнямі на плечы
Залатыя дзве касы.
Можа, чорныя ад гора
На кужэльныя зліпялі?
А чаму яны не страцілі
Прывабнае красы?
Азірніся, падзівіся —
Мірты, лаўры, кіпарысы
Не падобны на сябе.

Што я бачу! Што за цуды!
Тут знаёмыя усюды:
Трапяткая арабіна
Ўся ў карунках і рубінах
Заглядзелася на дуб.
Ён, высокі і плячысты,
Варухнуў каб толькі лістам,
Трапяткая арабіна
Адказала б: «Я іду».

Дуб рагаты, дуб багаты
Жалудамі і ліствою,
Пазірае мудрым вокам
На цыбатыя дзве хвоі,
Пад хваёвым сінім крыллем
Басаногія бярозкі,—
Тры бярозкі-недароскі
Захаваліся ў цянёк.
А ля іх старая елка
На касматых цёмных лапах
Спрытна гушкае вавёрку,
Як малое дзіцянё.
Ценъ ляжыць ад гордай елкі,
Як піковы чорны туз.

Тут Іспаніяй не пахне,
Да Іспаніі далёка.

У Іспанію прабіцца
Праз франты цяпер нялёгка.
Пахне тут зямля смалою,
Апавіта дзеразою,
А пабелена бярозтай
Белай, белай, як туман.
То не дон Дзіега скача,
Скача наш Дзіега проста,
Наш Альварэс, храбры рыцар —
Беларускі партызан.

А сеньёра? А сеньёра,
Заранка Яўмена Гэля —
Трактарыстка і актрыса
З вёскі Новае Забэлле.
Пра яе паэт мясцовы
Напісаў у нейкім вершы:
«Вочы — сінія крыніцы,
Вусны — спелыя суніцы,
Косы — кужаль залаты».
Да яе — сцвярджаюць хлопцы —
Аніяк не падступіцца,
Аніхто не змог падбіцца:
А ні я, ні ён, ні ты.

А навокал на паляне
Ўсе знаёмыя старыя.
Б'е заўзята ў звонкі бубен
Партызанскі повар Тодар.
Ён камечыць гулкі бубен,
Нібы цеста пад вялікдзень.
А у флейту слаўна свішча
З Маладзечна музыкант.

Пад сасною на калодзе
Сам камбрыг сядзіць суровы,
Смокча люльку і кусае
Хітравата чорны вус.
Па-над ім узлазіць ціха
Па суках, як па драбіне,
На іспанскія нябёсы
Беларускі маладзік.

*

Танец скончан. Партызаны
Б'юць у ладкі: «Брава! Брава!»
У знямозе спачываюць
Пакамечаныя травы.
Гітарысткі — сувязісткі
Стогнуць ціха ў захапленні:
«Як шкада, што не былі мы
У Іспаніі ніколі».

Партызаны, партызанкі
Разышліся па зямлянках.
Атрасло ізноўку цені
Насцярожанае голле
На стаптаную паляну,

На гарачае вуголле.
Прымасціліся пад хвояй
На паляне толькі двое.
А пра што яны гавораць?
Пра паходы баявыя,
Пра налёты агнявыя,
Пра жыццё сярод бароў?
Пра сяброўства, пра сяброў.

«Не знайсці нічога ў свеце
Прыгажэй сапраўднай дружбы.
Ні адна не мае мова
Слова лепшага, чым «друг».
Забаліць у друга сэрца —
Зашчыміць і у мяне.
Скажуць: «здраднік»,— раззлуюся.
Скажуць: «ворагам забіты»,—
Не паверу: ён жывы!
За яго палезу ў бойку —
Вінаваты ён ці правы,
Мне ўсё роўна: ён мой друг!» —

Так казаў Дзіега Гэлі.
А яна хвілінай тою
Задуменна пазірала
На вуголле залатое.
А іспанец нечакана

Зажурыўся на хвіліну:
Наваліліся на сэрца
Дарагія успаміны.

Змрочны цень прабег па твары...
«Што з табою, мой таварыш?» —
«У мяне быў добры сябра,
Твой зямляк — Мікола Бечык.
Ён таксама гэты танец
Палюбіў у нас калісьці.
З гэтым хлопцам мы з баямі
Паў-Іспаніі прайшлі.
Гнеўна білі мы фашыстаў,
Білі чорных фалангістаў,
Я крычаў «ура» па-руску,
Ён крычаў: «Но пасаран!»
У лясах, цяснінах вузкіх
Мы збівалі асаў прускіх,
Не лічылі, не лячылі
Мы тады уласных ран.

Ды адной не залячылі...
Не забыць таго мне ранку,
Калі я капаў магілу
На ускраіне Мадрыда
Пад старым маўклівым лаўрам.
Жменька кожная зямлі той
Мне здавалася па пуду.
Сцерагуць магілу друга
На ускраіне Мадрыда
Сэрцы чэсныя іспанцаў
І журботныя легенды...

А пасля мы з Барселоны
Адплывалі на усход.
На усход мы адплывалі,
Вецер, горкі і салёны,
Варушыў цяжкія хвалі,

Хвалі бераг залівалі
Дарагой маёй радзімы.
Чорным дымам, чорным дымам
Зацягнула родны бераг.
Мне ж здалося: то не дым быў —
Думы чорныя мае.

І, не хвалі — наша гора
Край іспанскі затапіла,
І застаўся сярод мора
Я адзін, адзін, адзін...

Параход гайдалі хвалі,
Біў у твары горкі вецер,
Ну а я ўжо сніў і марыў
Пра зварот у Барселону,
Пра баі, пра тыя землі,
Па якіх дамоў вярнуся.
І вядзе мяне дарога
Да бацькоўскага парога
Па зялёнай Беларусі...» —
Абарваў расказ Дзіега,
Усхвалёваны устаў,
І яшчэ сказаць пра нешта
Ён хацеў, ды не сказаў.
Пажадаў спакойнай ночы,
Усміхнуўся і пакрочыў
У трывожны змрок начы.
Ён пайшоў пад дуб гарбаты
Гада-фрыца сцерагчы.

*

Ёй не спіцца, не ляжыцца
На духмяным свежым сене.
Ля зямлянкі ціха ходзяць
Сноў і зор і ліспяў цені.
І, здаецца, ёй на вуха
Нехта шэпча: «Гэля, Гэля,
А ці хутка, весялуха,
Зазвініць тваё вяселле?» —

«Ах, якое там вяселле!
Тры гады жывём у лесе».
Над гарачаю пасцеляй
Нахіліўся светлы месяц.
І, здаецца, шэпча месяц,
Нібы сваха падаедна:
«Лес не лай. У гэтым лесе
Закахаўся хлопец бедны»,—

«Не, няпраўда. За марамі
У яго жыве нявеста.
Ён яе кахае моцна,
Ад яе чакае вестак.
Ён паказываў мне здымак:
Чарнакосая, ў маністах.
Ён шаптаў з тугою імя:
«Мар'яніта, Мар'яніта».

А яшчэ казаў, нібыта
Я падобна да Мар'яны.
Толькі косы ў Мар'яніты,
Нібы дзве начы асенніх.
А ў мяне пад колер жыта,
Што асветлена праменнем».

Цені зноў зашалясцелі:
«Што ты, Гэля! Сорам, Гэля!
Мар'яніта — у магіле,
Яе немцы загубілі».—

«Не, мяне ён не кахае —
Па Іспаніі ўздыхае.
Для яго кабеты нашы
Часта дранікі пякуць,
Для яго дзяўчаты нашы
Песні звонкія пяюць.
Смачна — кажа — толькі наша
Страва крышачку смачней.
Песень шмат у вас прыгожых,
Толькі нашы прыгажэй».—
«Што ты, Гэля! Сорам, сорам

Плесці дробныя дакоры.
Вось як вернецца дадому,
Беларусь пачне хваліць,
А цяпер у хлопца сэрца
Па Іспаніі баліць.
Ён цябе адну кахае,
Пра цябе адну ён сніць...»

А навокал ноч глухая
Грозна ходзіць ля крыніц.
Туманы плывуць сівыя

Праз імхі і дурнап'ян.
А ў тумане — вартавыя
І засады партызан.

Я назваў цябе іспанскай,
Наша чэрвеньская ноч,
Каб зрабілася ты казкай,
Баявая наша ноч.
Можа, ты на Беларусі
Не паўторышся ніколі.
Можа, ты для Беларусі —
Ноч апошняя няволі...

А дзяўчыне ўсё не спіцца
На духмяным свежым сене,
Не даюць ёй супакою
Сноў і зор і лісцяў цені.
Сонна дыхаюць крыніцы,
Месяц дрэмле на вярбе...
«І навошта я, дурніца,
Закахалася ў цябе?..»

*

Ноч расу на дуб цярусіць,
А пад дубам на дзярузе —
Паланёны афіцэр.
Ён прыжмурыў злосна вочы,
Нібы воўк, драпежна сочыць,
Як Дзіега побач крочыць
З аўтаматам у руцэ.
Не ўцячы нікуды воўку:
Рукі звязаны вяроўкай.

«Не ў Кардове, не ў Гранадзе
Я убачыў ранкам ружу.
Над Бярозаю-ракою
Узыходзіла зара,
Піў ваду світальны голуб,
Мята клікала прамение.
Я сказаў залатакосай:
Забяры маю душу».

Спеў задумны, спеў іспанскі
Сее ў цёмным лесе казкі,

А у казку ў цёмным лесе
Голас фрыца раптам лезе:
— Вы іспанец?
— Так, іспанец.
— Гэта вы цудоўны танец
Танцавалі?
— Гэта я...
І спытаў тады палонны:
«Дзе ж Іспанія твая?
І няўжо сваёй ахвотай
Ты прыйшоў у край балотны,
Каб сумесна з гэтым збродам
Траціць лепшыя гады?
Тваё месца ў Барселоне
Між іспанак маладых.
Там гітары, песні, зоры,
Бой быкоў, тарэадоры,
Там лімонаў родных пах...
Можа, ты да фалангістаў
За былое маеш страх?
Абяцаю урачыста:
Дапаможаш уцячы —
Апынешся хутка дома,
І ніхто цябе, вядома,
З фалангістаў не кране.
Спадзявайся на мяне.
Будзеш ты, сеньёр, багатым.
Ну? Хутчэй бяры свой лёс».

Адказаў Дзіега:
«Гад ты!
Ты нямала выпіў слёз,
Нашых слёз, іспанскіх слёз.
Ты спаліў маю хаціну,
Ты забіў маю дзяўчыну,
Здратаваў маё ты поле...
Біў цябе я — не забіў».—

«Што вы, гер сеньёр, ніколі
Я ў Іспаніі не быў!»
«А чаму ты гэтак добра
Нашай моваю гаворыш?»

Супыніся, брат Дзіега,
Азірніся, брат Дзіега,

Ты не ведаеш, Дзіега,
Што палонны фрыц хіцёр,
Што аб востры шэры камень
Ён вяроўку перацёр;
Што ударыць гэты камень
У тваю з размаху скронь,
Сам ты звалішся, як камень,
На зязюльчын росны лён...
Ноч глухая. Мяккі мох.
Для уцёкаў шмат дарог.
Толькі гнеў і злосць на гада
Боль тупы перамаглі.
Не ўцякаюць ад расплаты
З партызанскае зямлі!
І за немцам-афіцэрам
Дваццаць куль паслаўшы ўслед,
Крыкнуў: «Цiртэ афуэра!» —
Выпраўляйся на той свет.

А зямля ужо яснела,
А зямля ужо грымела
Ад Палесся да Дзвіны.
Узняліся помсціць фрыцам
За крывавыя крыніцы
Гераічныя сыны.
Чарняхоўскі б'е з паўночы,
Ракасоўскі з поўдня б'е.
І святлеюць сонцам вочы —
Беларусі роднай вочы —
Франтавыя сны мае...

Свішча рацыя таропка.
На балонках рад у рад —
І працяжнікі і кропкі:
Баявы ідзе загад.
І, узрадваны загадам,
Кліча ўсіх на збор камбрыг.
І становяцца ў атрады
Партызанскія сябры.
А па лесе разлілося:
Наступленне пачалося!
Набівайце, хлопцы, зброю,
Расчышчайце шлях героям!
Вы ляціце сцежкай простай

Да забэлеўскага моста.
Не дамо ўзарваць праклятым
Гэты мост. Такі загад.
...У глыбінях дрэў касматых
Партызанскі знік атрад.
А за ім другі і трэці.
Бой ідзе па ўсёй зямлі.

Тол пад мост заклалі немцы,
Шнур бікфордаў правялі.
Змоўклі ўдалечы гарматы,
Наплывае грозны гул.
І здымаюць аўтаматы
Партызаны па бягу.
Наляцелі ранкам з бору
Сто разгневаных віхур.
Бі!

Нямецкія мінёры
Падпаліць паспелі шнур.
І напяліся ад крыку
Металічныя цяглі́цы,
Каб грымотна разарвацца
І раку зрабіць гарачай.

Аганёк паўзе па мосце,
А услед бяжыць Дзіега.
Ён не чуе, як навокал
Кулі дзюбаюць жалеза.
Ці то сэрца, ці то боты
Аддаюцца гулкім рэхам?
Рыкашэцяць кулі побач,
Смерць ужо ля вуха свішча...
Востры боль.
Агонь і змрок.

Стой, Дзіега, не валіся,
Перад смерцю не хіліся,
Вунь, да мэты — толькі крок.
Не, не зваліцца дачасна
Наш Дзіега. Хопіць сіл.
Ён дагнаў агонь і ўласнай
Чыстай кроўю пагасіў...

А калі раскрыў ён вочы,
Дзве рукі яго дзявочых
Асцярожна абнялі.
— Дарагі мой!
— Гэля, ты?

Вочы — сінія крыніцы,
Вусны — спелыя суніцы,
Косы — кужаль залаты...
Не ў Кардове,
не ў Гранадзе
Я убачыў ранкам ружу...
Над Бярозаю-ракою
Узыходзіла зара.
А над гэтаю зарою
Вецер пах ракой, жалезам,
Перагрэтым хвойным лесам,
Перапаленым бензінам
І няяснаю журбою.

«Дзе збірала ты рамонкі
І нашто вянок мне белы?» —
«Ціха, любы, гэта марля,
Я пазней збяру рамонкі».—
«Як не хочацца ў магіле
Мне ляжаць
між душных кветак.
Я табе яшчэ нічога
Не паспеў сказаць...» —
«Я знаю,
Ты, мой родны, будзеш жыць...»

Ад матораў мост дрыжыць.
А па мосце — танкі, танкі,—
Сотні ценяў на вадзе.
Так пасля ночы іспанскай
Пачынаўся гэтым ранкам
Беларускі светлы дзень.

А насустрач танкам з гаю
Арабіны выбягалі,
Выбягалі елкі з бору
На агонь чырвоных зораў.

Для Дзіега шалясцелі
Не рабіны, не яліны.
У святочны гэты момант
Чуў зямлі ён родны гоман:

Як спявалі урачыста,
Як сплялі для танкістаў
Лаўры светлыя вянкі,
Як званілі кіпарысы,
Залатыя кіпарысы
У зялёныя званкі.

*1945*

# МАЛАДОСЦЬ У ПАХОДЗЕ

**Паэма**

Калі мне давядзецца на чужыне
Загінуць, гэты верш за пасланца
Я выпраўлю ў далёкую дарогу,
У родную краіну да сяброў.
Ён пройдзе рэкі, горы і пустэлі
І некалі спакойным мірным ранкам
Пастукаецца ў мінскія вароты,
У сэрцы неспакойныя мінчан.
Запылены, ён прыйдзе, нібы споведзь,
Па сцежцы залатога лістапада
І пра мяне, пра сны мае раскажа,
Душой не пакрывіўшы, без хлусні.

*

Калі гэта здарылася? А ўрэшце,
Не гэта важна. Гай шумеў зялёны,
Пярэсты дзяцел па бярозе стукнуў —
Я рыфмай нечакана адказаў.
Цыбаты бусел дзюбай клюнуў сонца —
Прамень зламаўся і з вясёлым звонам
Асыпаўся на травы, на мяне.
Вячэрняя блакітная рачулка,
Падштурхваючы хвалямі малымі,
Каціла мільён маладзікоў.
Я многа іх набраў — паўнюткі кошык —
І раздарыў сяброўкам і сябрам.
Так першае сваё я вандраванне
У добрае, нязведанае шчасце,
У залатую песню распачаў.

*

Купальскія агні...
Была задачка!
Ісці ці не ісці? Мы піянеры.
Бязбожнікі. Арлы. Барацьбіты.
Мы ведаем дзядоўскія хітрошчы —

Цымбаламі завуць нас, спакушаюць
Купальскімі агнямі, жніўнай песняй,
Страшэннымі легендамі. Не пойдзем!
Нам вырашыць патрэбна неадкладна,
Як на бяду і гора ўсім буржуям
Раздзьмухаць рэвалюцыі пажар.
Мы цвёрдыя. А за сялом ля жыта
Агні гараць купальскія. Дзяўчаты,
Нібы русалкі, карагоды водзяць.
Звіняць цымбалы. Весяляцца скрыпкі.
Стары Базыль лады перабірае —
Гудзе, пяе ласкавая дуда.
Яе мы глушым з храбрасцю дзікунскай
Сваёй «картошкай» — піянерскім гімнам.
А ў небе зоры, а зямля так пахне!
А хлопцы ў неба узнімаюць кола —
Яно гарыць, як казачнае сонца.
Ну дзе тут утрымацца! Мы імчымся,
Забыўшы пра «загібы» і «ухілы»,
На звонкі голас дзедаўскай дуды.

*

Трыццаты год. Гудзе-гамоніць вёска.
Прамоўцы хрыпнуць. Ноччу глуха стогне
Трывожны звон — гарыць калгасны свіран.
Кульгавы Тодар — старшыня калгаса —
У аканіцы б'е... Няма адказу.
Сусед глядзіць у шчыліну спрасоння,
Рудую поўсць цярэбіць ён на грудзях
І хрысціць аржаную бараду.
Свярбіць душа... Дымяцца галавешкі...
А мы з начлегу на гарачых конях
Ляцім і свішчам: новая прыгода.
І за кульгавым старшынёй калгаса
Услед крычым, крычым у змрок клапіны:
Смерць кулакам — райкам і муражынскім!

*

Я ўзненавідзеў гэтых мукамолаў
І пасечнікаў (рыжыя бароды,
Святыя твары, сытая адрыжка),
Іх мёд вачэй хлуслівых, іх звярыны
Тупы агонь (не дай пакрыўдзіць, божа!).

Я ўзненавідзеў іх кублы і свірны,
Цяжкія габляваныя вароты,
Калі іх адчынялі з нудным рыпам
І парабкі стаеннікаў шалёных
Выводзілі ў дуброву на начлег.
А на начлезе я пытаў Ігната
(З тых парабкаў старэйшага): «Чаму вы
Не зробіце паўстанне?» Ён смяяўся
І закарэлым пальцам мне гразіў:
«Глядзі, паўстанец, раз яшчэ убачу,
Як будзеш лезці ў сад Райка па дулі,—
Здыму штаны і кіну ў крапіву».

*

Адвозілі іх на казённых санках
Пад вечар. Галасілі нема бабы.
Выжлятнікі накінутыя вылі
На маладзік. Узрадаваныя людзі
Яшчэ хавалі па праклятай звычцы
За шулы вочы. Мы ж, як іх паўпрэды,
Ішлі за кулакамі, на ўсю глотку
З вясёлай бессардэчнасцю крычалі:
«Ага, ага, ў Сібір вас высылаюць,
А мы ваш мёд і дулі будзем есці!»
Трывога людзям халадзіла сэрцы,
Нам справы не было да іх трывогі.
Мы бачылі вясёлыя хаўтуры,
Плявалі на кулацкую мы злосць!
Так з нашай вёскі жорсткая легенда
З пажарамі, забойствамі селькораў
І сытай самагоннаю адрыжкай
На санках ад'язджала у нябыт.

*

Калі ты бачыў, як зганялі людзі
Упершыню табун у трыста коней
І статак у чатырыста кароў;
Калі ты сустракаў, як цуда, трактар
І бачыў свята першай баразны;
Калі ты бачыў досвіткам, як прагна
Стагоддзямі закутыя палеткі
Зялёныя ірвалі ланцугі

І ўся зямля, упершыню адчуўшы
Сваю бяскрайнасць, сілу і багацце,
Ільснілася на сонцы чорным тлушчам
І жаўранкам спявала на зары;
Калі ты бачыў, як нырае ў травах
Сто сорак кос, як з радасным адчаем
Кладзецца жыта спелае пад песню
На сто крывых адвостраных сярпоў;
Калі табе, малому, распірала
Ад шчасця сэрца, грудзі, рукі, ногі,
Хацелася спяваць і кулдыкацца
(Чорт ведае чаму!) па мураве,—
Тады і ты, як я, навек адрокся
Ад прэснага зацішша хутарскога
І палюбіў размах вялікай працы;
Тады і ты, як я, паверыў цвёрда
У будучыню нашую, якую
Стварае міліён разумных рук.

*

Пра бітвы пад Чангарам і Каҳоўкай,
Пра конніцы славутыя атакі,
Пра тыф і голад, пра васьмушку хлеба
Апавядаць, падвыпіўшы на свята,
Яшчэ не надакучыла бацькам.
Іх змятыя салдацкія шынелі
Яшчэ віселі на пачэсных месцах,
І мы цішком іх шлемы прымяралі
З чырвонаю будзёнаўскай зоркай.
Але ўжо клікаў нас у новы ранак
Густы жалезны голас пяцігодак.
Старэйшыя браты ўжо ад'язджалі
На Днепрабуд, Магнітку і Кузбас.
Лісты іх пра паходы штурмавыя
Спакойна не давалі нам заснуць.
І прыкра нам было, што год замала,
Каб у тайгу пайсці шукаць руду;
І боязна было, што ўсе рэкорды
Адгрукаюць без нас, што стратасферу
Вучоныя падзеляць між сабой;
І крыўдна нам было, што на планеце —
Два полюсы і тыя ўжо адкрыты...
Так летуценні нас перарасталі,

Як мы свае перараcталі парты.
І мы цішком наводзілі даведкі
Пра Марс, Венеру, Месяц і Нептун.

*

І трэба ж мне было сустрэцца з ёю
На схіле лета. Залатое жыта
На хвілю расступілася. На сцежцы
Яна стаяла з чорнаю касой.
Было ёй год пятнаццаць ці шаснаццаць,
Я з ёй вучыўся, зваў дзяўчынку Веркай
І часта за касу яе цягаў.
І вось тады, у жнівеньскае ранне,
Я не пазнаў яе і сам здзівіўся.
З вачэй яе струменіліся хвалі
Глыбокай і празрыстай сінявы.
Мяне яны адразу затапілі,—
І сэрца захлынулася ад шчасця
І нейкай невыразнае тугі.
І страціў свет свой папярэдні колер,
І ўсё другім зрабілася адразу:
Чмялі гулі у казачныя дудкі,
Калоссе біла ў дробныя званочкі,
Старая ліпа па узмежку поля
Трымала сонца на руках зялёных,
У воблаках дзівосныя дзве птушкі
У хованкі гулялі... Годзе, годзе!
Пакуль я слухаў гул зямлі і сэрца,
Дзяўчына засмяялася і знікла.
Такога смеху я не чуў ніколі,
Ён для мяне, як новая загадка,
Паўстаў такі жахлівы і салодкі,
Што я, разгублены, зарыўся тварам
У цёплую зялёную траву.

*

З тых пор прайшло нямала год суровых.
Здавалася б, наіўнасць не да твару.
Але жыве той светлы смех у сэрцы,
І сэрца прагне жнівеньскай пакуты
І верыць у вялікае каханне
І ў тую, што на ўсіх маіх шляхах

Мільгала і знікала, нібы цень.
Я кідаўся за ёю і пярэдка
Ёй надаваў іпакшыя імёны —
Яна ізноў смяялася, шаптала:
«Не я, не я...» і я казаў: «Не ты».
Калі б не форма мужпая салдата,
Калі б не чын, не зоркі на пагонах,
Я б кінуўся ізноў у хвалі жыта
І ўсхваляваным голасам паклікаў
Яе, якой няма яшчэ імя.

*

Хвала табе, звычаїная папера!
Хвала агрызку школьнага алоўка!
Прывык я з імі з самага маленства
Дзяліць пачуцці, думкі і трывогі,
І першае нясмелае каханне,
І горкае раздум'е ў дні вайны.
Хвала табе, сто раз прапеты ямб!
Пазней, на фронце, мы цябе успомнім
І чаркаю салдацкай памянём.
Успомнім, як калісьці юнакамі
Над лермантаўскімі вершамі ўсю ноч
Сядзелі і пакутаю паэта,
Чужой пакутай налівалі сэрцы,
Чужыя думкі і сюжэты кралі
І выдавалі шчыра за свае.
І, кудлы ашчаперыўшы аберуч,
Над матчыным сталом згіналі хіб,
Паперы раўнадушнай давяралі
Свае грахі, якіх яшчэ не мелі,
Намуляўшы да скрыпу свае пёры,
Закасаваўшы сотні дзікіх строф,
Дзівіліся — паэзіі ні грама,
Ні катастроф, ні болю, ні тугі.
Ды к чорту сум! І так жылося добра
З далонямі, замазанымі фарбай,
З цагляным пылам на рабочых ботах
Курносай і задзірыстай братве.

*

Мой Мінск, я знаю, ты патонуў сёння
У попеле. Калі навее вецер
У гэтым моры, шэрым і журботным,
Будынак адзінокі выплывае,
Як бурай разгайданы карабель.
Другі будынак, як жабрак бязвокі,
Глядзіць маўкліва на усход. Па ім
Няма за што праменню зачапіцца,
Няма каму аддаць свайго агню,
Яно ў знямозе падае на попел
І гасне, гасне ціха ад тугі...
Пра гэта я чытаў, я гэта бачыў.
А верыць не хачу. Сабе не веру.
Мой родны Мінск жыве перад вачыма
Такім, як быў у слаўным трыццаць восьмым.
На плошчы — Ленін ва ўрачыстай бронзе.
Насупраць — неспакойныя студэнты
Прафесара рашуча атакуюць.
Чырвоныя трамваі, эмкі, зісы
У перагонкі бегаюць. На скверы
Лупцуе гулкі мячык дзетвара.
А я іду вясёлаю паходкай,
Мяне са здавальненнем паўтараюць
Натоўпы ўсіх люстэркавых вітрын.
І тысячы дзяўчат блакітнавокіх —
Па тварах бачу — зычаць шчасця мне.

*

А што мне шчасця зычыць? Я шчаслівы.
І гэтым шчасцем шчодра падзяліцца
Гатоў з людзьмі, што скардзяцца на лёс...
Мае жаданні, думкі адгадала
Радзіма і дала такі загад:
«Ты кажаш, што шчаслівы і багаты?
А там, на захадзе, тваіх братоў мільёны
Прадажнай шляхтай кінуты у пашчу
Вайны звярынай, гора і пакут.
Дык апранай шынель, бяры вінтоўку,
Ідзі на захад, вызвалі братоў».
Так стаў байцом я Арміі Чырвонай,
І павяла мяне на захад зорка,

Што ўзяла на маёй паходнай касцы,
Праз Ваўкавыскі лес, праз Белавежу,
Праз Пінскія балоты — у паход...
Запомніў я братэрскія абдымкі
Сялян каля стаўбцоўскага астрога,
І пацалунак трапяткі дзяўчыны
У Брэсце, і тэатр у Беластоку,
Дзе пасланцы народныя сказалі:
«Адной сям'ёю жыць народ наш будзе
Ад гэтых пор на вечныя вякі».
І ў два разы прыбавілася зораў
На нашым небе, і палеткі нашы
Шырэй і багацей удвойчы сталі,
І мова беларуская удвое
Зрабілася гучней і прыгажэй.
І мы ўкапалі на граніцы новай
З дзяржаўным гербам роднай Беларусі
Сасновы, моцны паласаты слуп.

*

Яна была цяпер са мною побач —
Краіна калатні і завірух,
Філосафаў, гармат і прастытутак,
Тупога самахвальства і інтрыг.
Рассунуўшы разгойданыя сосны,
Я пазіраў на чынныя палі.
Я слухаў, як у душным кабаку
Распараныя бюргеры у славу
Сваіх сыноў гарлалі «Гох!» і «Хайль!»
Над кабаком, як рыцарскаю шпагай,
Размахівала кірха вострым шпілем
І хмары рассякала напалам.
Я гэта бачыў. Толькі не заўважыў,
Як аднагодак мой — берлінскі фрыц
Штодня штыком калоў макет фанеры,
Дзе намалёван твар мой быў у касцы.
О, дорага я даў бы, каб тады
Мой верш і днём і ноччу без спачыну
Гудзеў над краем, як трывожны звон.

*

Праклён табе, разбойніцкая бомба!
Ты свіснула на досвітку ружовым
Над нашым сном, над нашай мірнай хатай
Іржаваю пілой праскрыгатала,
На два жыцці, на дзве балючых часткі
Распілавала нашу маладосць.
І ў тым жыцці, што толькі пражыта,—
Цвілі рамонкі, даспявалі вішні,
Зязюля кукавала, паравозы
Густымі галасамі запрашалі
Завезці нас у Крым ці на Каўказ.
А на стале маім ляжаў самотна
Пачаты ліст да той, да сінявокай...
І — новае жыццё! Яго абрысы
Я не паспеў тады яшчэ разгледзець,
Асляплены пажарамі вайны.

*

Прыпомні ўсё. Прыпомні ўсё да рэшты —
Як на вайну ішоў і што ты падарыў
Сваёй нявесце? Не было нявесты,
І маці не паспела благаславіць.
Гармоні не igралі на світанні,
Падковай конь не грукаў ля варот,—
У тое ранне на трывожным сэрцы
Аглушаны дыміўся Беласток.
Мы на ўсход пайшлі. І нам жанчыны,
Якіх мы ўчора цалавалі шчыра,
Крычалі, як праклён: «Куды? Куды?
Навошта пакідаеце?» — «Мы
прыйдзем...» —
Казалі мы, прыкрыўшы каскай вочы.
Мне сорамна было. Пякучы сорам
Паліў мне сэрца, аж скрыпелі зубы.
Я не баяўся смерці. Нават болей —
Хацеў памерці я, абы не бачыць
У пыле адступаючага войска.
У гэтым змроку, гуле і трывозе
Пачулі мы упэўненыя словы:
«За намі праўда! Пераможам мы!»
Я прагна слухаў. Не, не слухаў — піў

Упэўненасць вялікую і веру.
Так падарожнік, пэўна, ў Каракумах
Іртом засмяглым прагна п'е ваду.

*

Жалеза, кроў, руіны, пыл і слёзы
На сэрца наваліліся. І сэрца
Зрабілася цяжэйшае за камень.
І мы спыніліся. Далей няма шляхоў нам.
Далей Масква. Тут нам стаяць насмерць.
І пад Масквой тоў восенню глухою
Я сэрца падзяліў на тры часціны:
Адну пакінуў на руінах Мінска,
Другую недзе у заволжскіх стэпах,
Дзе рускі брат прытулак даў для маці,
А трэцюю з нянавісцю пякучай —
Сабе пакінуў, каб вяла у бой.
Так пачалася баявая сталасць —
Суровае салдацкае жыццё.
Салдацкае жыццё! Ваюй і мерзні,
Не спі адну, і дзве, і тры начы.
Цябе наскрозь дажджамі прапякае,
Марозам смаліць... На перадавой
Забудзеш ты, як зацвітае вішня,
Развучышся чытаць санет. Забудзеш,
Што ёсць на свеце у сукенках светлых
Ласкавыя дзяўчаты. І адна
Свідруе мозг пяўрымслівая думка —
Перахітрыць, падкрасціся, забіць.

*

Зімовай ноччу пад Старою Русай
Ішоў я на пярэдні край. У цемры
Гулі-раўлі касматыя снягі.
Было нявесела і горка мне. Але
Перад вачыма блізкай небяспекі,
Перад вачыма чэсных салдатаў
Я не хацеў пра стому сваю думаць
І пра цяжар акопнага жыцця.
А завіруха выла і свістала...
І мне здалося: з цемры пазіраюць
Суровыя дапытлівыя вочы
Падпольшчыкаў, герояў Перакопа,

І ў іх вачах гарыць адно пытанне:
«А за каго на вісельні ішлі мы?
Якому племю шлях мы расчышчалі?
На што ён здольны, сёняшні народ?»
Я мімаволі развінаю плечы,
Яшчэ тужэй пераціпаю дзягу
І ўжо іду без страху і трывогі
На край пярэдні, дзе агонь і смерць.
І сэрца б'е ўсхвалёвана і пругка
У партбілет, нібы у ліст брані.

*

Я на вайне не быў рахункаводам
І запісы дакладныя не вёў —
Дзе і ў якіх баях хадзіў у наступ,
І колькі куляў цэліла мне ў сэрца,
І колькі мін правыла нада мной.
Адным я ганаруся, што сумленна
Сваёй Радзіме песняю служыў;
Што разам з гераічнымі байцамі
Дзяліў паход, і хлеб, і небяспеку,
Дажджы, завеі і акопны бруд;
Што з імі ў наступленне перайшоў я,
І абдымала ў ранак вызвалення
Мяне таксама руская зямля.
Дзям'янскі наступ! Хоць і не грыміш
Ты славай сталінградскай, мне ты дораг,
Як травам дораг першы промень сонца,
Як птушкам дораг першы іх узлёт.
І тут байцы на штурм ішлі бясстрашна,
Захопнікі валяліся у снезе
Каля разбітых танкаў і гармат...
Стаяў я на дзям'янскай дымнай плошчы
У зблочаных валёнках, у пярэстым
Ад вільгаці і гліны кажушку;
Глядзеў, як працавітыя сапёры
Выцягвалі маўклівыя смерці джалы
З чыгунных мін. Я пазіраў і думаў,
Што хутка, хутка і у Мінск мы прыйдзем
(Калі не я — мае сябры па зброі),
Як вось і ў гэты рускі гарадок.

*

Я палічыў даўно дадому крокі
І ў сэрцы ўсе куткі размеркаваў
Для радасці і гора... А калі
Прагрукала гадзіна вызвалення
І мужныя героі Сталінграда
Пераступілі твой рубеж чакання,
Твой, Беларусь, пасечаны парог,—
Я ўпершыню за месяцы вайны
Сказаў услых святое слова «шчасце».
І, бурачы усе перагародкі,
Мне радасць затапіла ўсю душу.
І не хапіла слоў, каб апісаць,
Як біла артылерыя, як танкі
Ірваліся на захад праз агонь.
Так сонца узышло. Так пачалося
Другое нараджэнне гарадоў.
Так Беларусь з лясоў са зброяй выйшла,
З руінаў-папялішчаў узнялася
І наракла сваім бяссмертным імем
Тры баявыя грозныя франты.
Так Беларусь у шынялі салдацкім,
У ботах, парыжэлых ад паходаў,
Прыйшла ў Берлін адпомсціць за сябе.

*

І як шкада, што ў ранак вызвалення
Не давялося мне ісці ў атаку
З героямі праслаўленых франтоў.
Мяне закінуў у Іран спякотны
Загад Радзімы — мой салдацкі лёс.
(Суровы лёс вайны! Ты параскідаў
Па ўсёй зямлі байцоў-беларусаў.
Яны ішлі у бой за Брацілаву,
У Венскім лесе кашу гатавалі
І штурмавалі Дрэздэн і Берлін.
Па ўсёй зямлі раскіданы магілы
Мінчан, палешукоў і слуцакоў)
Але і тут, пад чужаземным небам,
Табе я верным сынам быў, Радзіма,
Служыў аддана, чэсць тваю бярог.
Я дзякую табе, зямля чужая,

За тое, што найлепшыя навіны
Пачуў я тут, пад гэтым душным сонцам,
Пачуў я тут Масквы ўрачысты голас,
Нібыта голас мацеры далёкай:
Канец вайны! Канец святой вайны!

*

Ты часта сніўся мне, апошні залп,
У франтавых зямлянках, на прывалах —
І вось доўгачаканы прагрымеў!
Я гэты дзень чакаў, нібыта свята.
Калі б малітвы ведаў,— памаліўся б
За хлопцаў, што ў Берліне зараз ходзяць,
За агнявыя водбліскі салютаў,
За родны і любімы свой народ.
Дзевятае! Дзевятае! — бясконца
Я паўтараю залатую лічбу
І слаўлю ад душы цябе, мой май!
Закончаны бясконцыя блуканні,
Закончана трывога нашых матак.
І слоў няма, а толькі вочы ў слёзах
Ды моцныя абдымкі дружбакоў.
А ўсюды сонца, сонца, сонца, сонца.
І бачу я:
Святлеюць гарады, што ў цемры слеплі
Чатыры леты. Бачу, як трава
Зацягвае іржавыя варонкі,
І пад вясёлы спеў на папялішча
Сама кладзецца цэгла ў гэты дзень.

*

Я ведаю: не ўсе яшчэ дарогі
Прайшла пад сонцам наша маладосць.
А зараз перадышка. Мы, што доўга
Ў руках трымалі баявую зброю,
Пачулі зноўку мірны пах зямлі.
І нашы вочы добра помняць колер
Духмяных паплавоў. І нашы вушы
Шчэ памятаюць, як звіняць сякеры
Па залатым бярне. Пара, пара
Збірацца ад'язджаць у родны край.
А што збіраць? Багацце ўсё са мною:

Апошні праязны білет казённы,
Апошні атэстат на харчаванне,
Шынель, бялізна, рэчавы мяшок.
(Яго мне старшына наладаваў
Даволі шчодра: цёплы бохан хлеба,
Кансервы, сала, цукар, спірту фляга
І моцны васпторгаўскі тытунь)
Вось зараз расцалуюся з сябрамі
(Ужо наліты шклянкі развітання),
Апошні раз падыхаю са смакам
Дымком паходнай кухні і скажу:
«Да пабачэння, франтавыя годы!
Да пабачэння, добрыя сябры!»

*

Ото дзівак! Я выпраўляць збіраўся
Вось гэты верш у Мінск за пасланца.
А вунь яна, мяжа! Мы едзем, едзем
Пад сінім дахам дарагой Радзімы,
Па сонечнай Арменіі вясёлай,
Па вінаграднай Грузіі — дамоў.
Вось сонца ўзнялося над Дэрбентам,
Вось сонца закацілася ў Растове,
Вось пеніцца мядовым пахам стэп.
Які прастор! Як дыхаецца лёгка!
Як смачна пахнуць тульскія лясы!
Зямля мая савецкая, нідзе я
Такой красы і велічы не бачыў.
Ты ў нас адна, адна такая ў свеце.
Вазьмі хоць сто рэспублік чужаземных
І да Радзімы нашае прымер —
Як пятакі на залатым чырвонцы,
Жахнуцца сваёй дробнасці яны.
А паравоз нястомна круціць колы,
А зоры загараюцца і гаснуць,
І нас здалёк агнямі ўжо вітае
Чаканая, жаданая Масква!

*

Масква, Масква! — як многа ў гэтым
гуку! —
Сказаў не я. Але і я скажу,
Што гэта слова — прыстань нашых думак,
Надзей, шуканняў, веры і любві.

Тут, у Маскве, знаходзілі заўсёды
Грузін — куточак Грузіі, літовец —
Літвы куток, кавалак Беларусі
Знаходзіў беларус... У горкі час
Бяздомныя збіраліся сюды мы
З усіх франтоў і бежанскіх дарог.
Для нас Масква была матуляй роднай,
Карміла, суцяшала, гартавала
І выпраўляла на смяротны бой.
Мы памятаем нумары гасцініц,
Дзе цёмнымі асеннімі начамі
Пісалі вершы пра цябе, Радзіма,
Ці, выпіўшы па-беларуску чарку,
«Купалінку» спявалі і «Вярбу»...
І вось ізноў шуміць вакзал маскоўскі,
Дзяўчаты абдымаюць і цалуюць
Вайскоўцаў, што вярнуліся дамоў.
І твары ўсе знаёмыя такія.
Дзе бачыў я вось гэтых двух сержантаў?
На Ільмені? Пад Бранскам? На Дняпры?
А можа, у часопісе на здымку?
«Адкуль?» — пытаю. «З Вены»,— першы кажа.
«З Берліна еду»,— кажа мне другі.
«А ты?» — «Я з поўдня,
З Персіі далёкай...» —
Мы паціскаем па-сяброўску рукі,
І перш чым у свае вярнуцца сем'і —
У Беларусь, на Волгу, на Урал,—
Ідзём мы, як у Мекку пілігрымы,
На плошчу да маскоўскага Крамля,
Каб благаславіла родная сталіца
На працу, на шчаслівае жыццё.

*

Ля маўзалея, ля крамлёўскіх елак,
Стаялі мы ў задуме. А на сэрцы
Было такое пачуццё, што словы
Здаваліся тут лішнімі. І кожны
У гэты момант думаў пра сваё.
А навакол Масква шумела морам,
Натоўпамі лілася, гаманіла.
А вецер пах асеннімі садамі,
Гасціннасцю сталічнай і данесіў

Да нас абрыўкі музыкі і смех.
І толькі Крэмль з высокімі агнямі
Быў урачысты, велічны і строгі.
А думкі самі горача у сэрцы
Складаліся ў маўклівую прысягу.
Я прысягаў Радзіме дарагой:
Я аддаю табе свой лёс і сілу,
І рукі працавітыя, і песню.
Загінуць загадаеш — я загіну,
Перамагчы — і я перамагу.
Нядарам пад тваім хадзіў я сцягам
На ворага.
Я сын твой і салдат!

*1945*

# ВЫБРАНЫЯ ПЕРАКЛАДЫ

## *Аляксандр Пракоф'еў*

* *

Салдацкая песня, ніяк не змані,
Ляці, нібы сокал, пад сонцам звіні,
Паведай аб тым, як мы злыдняў палілі
У гнеўным, смяротным агні.

Зарой пераможнай цвіці, наша доля,
Бо руская мужнасць не гасла ніколі,
У песню яны увайшлі баявую —
І руская стойкасць, і руская воля.

Мы мачты знайшлі у дрымучым бары,
Нам слаўна служылі ў бары тапары,
На вогненных ветразях неслі нас горда
Да сэрца радзімы вятры.

І голас грубеў, і цвярдзела далонь.
Віхор налятаў, як уздыблены конь.
І толькі мацней напінаў звонкі ветразь,
Шугаў яшчэ большы агонь.

Мы хвалі прайшлі, як эпохі ступенькі,
Бо сонца радзімы вяло.
І кожнае сэрца, як ветразь маленькі,
Як вогненны ветразь, цвіло.

Калі было гэта? Нядаўна? Даўно?
Нядаўна? А ўрэшце, нам усё адно,
Мы многа разоў ратавалі айчыну,
Спускаючы гадаў на дно.

Тады сонца змеркла ад подыху смерці,
Над кожнаю зоркай закрыліся дзверцы,
Ды доблесць расла у суровай праверцы,
Айчына, за справы твае.

Глядзі, як заўсёды нязломны наш лагер,
І мужнасці стане нам, хопіць адвагі...
А дзе гэта песня аб вогненных сцягах?
Хіба мы ўжо спелі яе?

## ВЕЧНА ЦВІЦІ, РАДЗІМА!

На рэках, па морах, далінах,
У горах, палях і барах
Цвіці, наша песня-айчына,
Застанься, як песня, ў вяках!

Усюды звіні і заўсёды,
Людскі акіян уздымай,
Над лёсам краін і народаў,
Як майскае сонца, палай!

У далях тваіх неабдымных
Сурова грымелі мячы,
Цвіці, дарагая Радзіма,
Як вечная песня, гучы!

Табе ўсё па сілах, магутнай,
Шчаслівы і светлы твой шлях!
Праменне зары пяцікутнай
Не згасне на гордых сцягах!

Ты змрок разагнала злачынны,
Ты здолела перамагчы.
Цвіці, дарагая Айчына,
Як вечная песня,
гучы!

І чуюць усюды народы
Аб велічным росце тваім.
Красуйся, не ведай нягодаў,
А мы цябе, вер, адстаім!

## ПЕСНЯ

На зямлі няма мілей радзімы,
Сіне-залаты нябёс прастор!
Не знайшлі, куды мы ні хадзілі,
Сонца гарачэй, іскрысцей зор.

Тут азёр і рэк імклівых воды
Блакітней усіх на свеце вод.
Тут у часе чорнай непагоды
Навальніцаю ўстае народ.

Даражэй не знойдзеш за радзіму,
Трэба ўсё рабіць нам для яе;
Так рабіць, каб дзень, што пражылі мы,
Подзвігамі радаваў яе.

Гэта ж наша — ўсе яе ўладанні,
Аддамо ўсе сілы, розум наш,
Мы акружым, родную, садамі
І гаямі светлымі наўсцяж.

Нашую радзіму не асіліш:
Волаты сыны і ўсе ў радні.
Вось яна — па імені Расія,
Прыгажэйшай не прысніш ані!

* *

У краі бярозавага шуму
Я пабачыў болей, чым прыдумаў.
Там сустрэў я цішыню-цішынку,
У рамонку й лотаці дзяўчынку!

Нібы ў васільковай ціхай вулцы,
І сустрэў яе я на прагулцы.
З беленькімі косамі, малая,
Мо яна была сястрычкай маю?

Ды, не зразумеўшы яе мовы,
«То ж нямая!» — хтось сказаў сурова.
А яна тоў вуліцай на радасць
І ішла і пела.
Гэта праўда.

## *Аляксей Суркоў*

### ПАРТЫЗАНСКІ МАРШ

Ніколі не згіне
ад лютых пажараў
Вялікі і слаўны наш край.
У бой за Радзіму
збірайся, таварыш,
Ідзі партызаніць у гаї.

«На прускага ката
За вёску і хату!» —
Кліч помсты народнай плыве.
Ідуць у атаку
Лясныя салдаты,
Грукочуць гранаты,
Крычаць аўтаматы:
— Жыве Беларусь!
— Жыве!

Змагайся без страху
з навалай варожай
За шчасце калгасных палёў.
У пушчах Палесся,
на Нёмане, Сожы
Грыміць навальніца баёў.

Пакуты Радзімы,
любімай і мілай,
Нянавісць у сэрца ўлілі.
Для немца-грабежніка
стануць магілай
Лясы беларускай зямлі.

Адважныя хлопцы
сядзяць у засадах,
Разгневана пушча гудзе,
Ад куль не схаваюцца
лютыя гады,
Расплаты не ўнікнуць нідзе.

Ніколі не згіне
        ад лютых пажараў
Вялікі і слаўны наш край.
У бой за Радзіму
        збірайся, таварыш,
Ідзі партызаніць у гаі.

        «На прускага ката
        За вёску і хату!» —
        Кліч помсты народнай плыве.
        Ідуць у атаку
        Ляспыя салдаты,
        Грукочуць гранаты,
        Крычаць аўтаматы:
        — Жыве Беларусь!
        — Жыве!

*Анатоль Сафронаў*

## НАГАСАКІ

Нагасакі... Так, так, Нагасакі!
Горад смутку
і атамных страшных руін.
Дзе стаялі дамы —
там цямнеюць баракі,
Не загоены шрам у людзей ні адзін.
Тут не выветрыў вецер
той жудасны
поўдзень,
Калі бомба
пайшла да зямлі ў цішыню;
Хто застаўся ў жывых,
той навекі, навекі
запомніў
Гэты грукат і гром,
гэты грыб над зямлёй,
гэты купал агню.

Не ў баю
і не ў часе суровай атакі,—
У страшэннай пакуце
тут тысячы леглі тады!
Нагасакі... Так, так, Нагасакі! —
Хрызантэмы, лілеі
аздобілі зноўку сады.
Тут усё яшчэ ў памяці ранняй,
але і такой ужо даўняй,
Не працёрлі падэшвы парог,
час руіны ўсе не заараў.
З чорных пліт,
нібы з чорных паданняў,
Тут да сонца ірвуцца
зялёныя парасткі траў.
Тут пяюць
галасы маладыя
Японіі.

Зноў жыццё на зямлі,
зноўку дрэвы наўкол шалясцяць.
Тыя, хто пабылі ў Нагасакі
хоць раз,—
зразумелі, запомнілі,
Што такое любоў
і вялікая прага жыцця.

## *Якаў Хелемскі*

* *

Добра нам блукаць па свеце
Пешым ходам і на «Ту»
І асвойваць на планеце
Ўсю зямную пекнату;

Пазнаваць аэрадромы,
Выгінастыя масты,
Мнагалюдныя паромы
І бязлюдныя плыты;

Хуткія аэрасані,
Грукатлівую арбу
І ў барханах калыханне
У вярблюда на гарбу.

Свежы вецер вандраванняў
Паміж гор і над ракой,
І прасторы адчуванне
Спераду і за спіной;

Водар луга, водар снега,
Смачны пах раллі вясной,
Нечаканасці начлегаў —
Іскраў рой і зорак рой.

Любы мне сады, будовы
Незнаёмых гарадоў,
Нібы вершы, вуліц новых
Назвы я чытаць гатоў.

Будзь у шлях заўжды сабраны,
Шчодры, лёгкі на пад'ём,
Будзь гатовы кожным ранкам
Свой пакінуць родны дом.

Без вялікага ваганця
Ў новы пошук наспяшы
Па пуцёўцы, па заданню
І па закліку душы.

Марачы аб землях розных,
Трэба, каб праїсці іх змог
Не зявакай і не посным
Сузіральнікам дарог;

Не курортаў маляўнічасць,
Не падсінены прыбой —
Праўду земляў навальнічных
Забірай заўжды з сабой.

Пішуць фарбай, пішуць мелам
На скале ці на кары...
Трэ каб справамі грымелі
Нашы прозвішчы, сябры.

След на сцежцы — ён не вечны...
Трэ за шчасце весці бой,
Каб у лёсе чалавечым
След навек пакінуць свой.

12 Зак. 839

*Мікола Пагнібеда*

## МАТУЛЯМ З РАСОН

Паэма

Бяссоннем,
Трывожным бяссоннем
Ахутала ноч Расоны.

Нідзе ні агню, ні іскры...
Не спалі, хоць поўнач блізка.

Дзяцей да грудзей прыхіналі,
Каб хоць малыя паспалі.

Маці ім з ціхаю ласкай
Шэптам баялі казкі.

Казкі не пра чарадзеяў,
Ткалася казка-падзея.

Усё пра салдата-асілка,
Што прыйдзе ў Расоны з Расіі.

І вынесуць сцяг палымяны
Насустрач з лясоў партызаны.

Абдымуць жонак сваіх любых,
Паставяць на попеле зрубы.

Насадзяць сады і дубровы,
А восень святочна-барвова

Раскіне усюды свой колер,
І дзеці зноў пойдуць у школу.

Гарэць будзе сонца ў блакіце...
Спіце, маленькія, спіце...

Трывожным,
Бясконцым,
Бяссонным
Падполлем
Ноч дыша ў Расонах.

Парою дажджоў і туманаў
Матулі ішлі партызанаў,

І снежнай парой непагоднай
Ішлі яны смела і горда

У лес да сыноў —
праз заставы —
Па матчынаму праву,

Па праву адвагі,
Праву любові,

Па матчынаму праву.

Па праву гаёў,
і бароў, і дуброў,
Куды пасылаюць іх
боль і любоў.

Па вечна святому
Народнаму праву —

Сваю бараніць
Дарагую дзяржаву;

Па праву бязлітаснай помсты-адплаты,
Дапамагчы трэба сыну і брату.

Па праву і хлеба,
і бульбы у торбе,
Што маткі прыносілі ў лес той
прасторны.

Па праву адзінаму,
Клятве адзінай
Падпольна на бітву
Расоны хадзілі.

Змагаліся
Дружна
І мужна Расоны,
І людзі, і рэчкі,
бярозы і сосны!

Усё вымагала для вылюдкаў кары,
За раны цяжкія,
рабункі, пажары!

І кожная наша малая хаціна
У лес правяла ўжо дачку альбо сына.

Туды, дзе з райцэнтра настаўнік сяброў
У мсціўцы паклікаў
да грозных бароў.

У Клясціцы клікаў
у першы атрад,
І кожнаму вучню ён шчыра быў рад.

І людзі,
з'яднаныя гневам і болем,
Ішлі з Сакалішчаў і Роўнага Поля.

Забор'е,
Шалашнікі
І Мілавіды —
Усе пасылалі людзей баявітых.

Сыноў выпраўлялі тайком у дарогу —
У лес да настаўніка
на дапамогу.

Адвагаї,
Яднаннем,
Ахвярным бяссоннем
Пазначана кожная ноч ля Расонаў —

Хадзіла,
грымела заўзята
Юных мсціўцаў адплата.

Граміла яна гарнізоны,
Паліла яна эшалоны,

Масты узрывала, крышыла
І злыдняў у багне тапіла.

Шляхі перакрыла да Ўсходу,
Сталела, смялела ў паходах.

І гром партызанскае міны
Да стэпаў ляцеў Украіны.

Хадзіла, страляла адплата
І не мінала ўжо ката —

У танку,
Акопе,
Ў дарозе —
У кожнай фашысцкай бярлозе.

На сховы з бетону, металу
Адплата часцей налятала

На чыстых, на вогненных крылах,
За смерць
яна смерцю плаціла.

На крылах народнага болю
І гневу —
і звала да бою.

Пра бітвы ў Расонскай акрузе
Ўжо зналі па ўсёй Беларусі.

Пра вучняў з дзевятых, дзесятых
Легенды хадзілі па хатах,

Ганцамі надзеі і сілы
Ляцелі праз фронт —
да Расіі.

Масква ў генеральскія планы
Упісвала гнеў партызанаў —

А маці з далёкіх Расонаў
Ім раілі ноччу бяссоннай...

О, маці усіх партызанаў,
Вы — беларуская гордасць,
Вы — наша любоў і адданасць,
Адзінства, адвага і цвёрдасць.

Душа ад пакут галасіла,
І сэрцы чарнелі ад болю.
І дзе вы начэрпалі сілы,
Каб страты і раны адолець?

Вы перакідалі горы
Чорнага гора свайго,
Вашу спаліць непакорнасць
Не здолеў шалёны агонь.

О, беларускія маці,
Маці з Расонаў сініх,
Петрыкі вашы і Каці,
Вашы Міколы, Аксінні,
Вашы Сцяпаны, Іваны —
Усе, каго вы калыхалі,
Вашы мадонны, тытаны,
У вашых вачах стаялі,
А вы каля іх на варце...

Шапталі словы ўстрывожана,
Адзінае ў долі прасілі,
Каб ваша дзіця, не дай божа,
Здраднікам не ахрысцілі.

Сумленне наша — матулі,
Адданыя дзецям дазвання,
Вас не палохалі кулі,
Допыты і катаванні.

У горы вялікім нязломныя,
Чысцей ад вясновай расы,
Вы чуткі баяліся цёмнай:
— Адступнік і здраднік твой сын.

Сыны ж ненавідзелі здраду,
Адважна хадзілі ў паходы,
Яны абнаўлялі радасць
У матчыных сэрцах заўсёды.

О, маці нашы сівенькія,
Бура вас не схіліла,
Вас мільёны, не жменькі,
Вы — наша глыбінная сіла.

О, добрыя маці з Расонаў,
Раскажуць легенды і казкі,
Як неслі вы людзям штодзённа
Вернасць, любоў і ласку.

Бяссоннем,
Чуйным бяссоннем
Тлелі ночы ў Расонах.

У дзверы хтось раптам пастукаў.
А бралася ўжо па світанне...
Няўжо падпаўзае гадзюка?
Няўжо з жыццём развітанне?

Прыслухалася...
Як у паролі
Стукаюць двойчы паціху...

— Дар'я Пятроўна, даволі
Вы паспыталі ліха.
Ад камандзіра атрада,
Ад вашага сына з наказам:
Мінаючы пасткі гадаў,
Пойдзем у лес мы разам.

— Ідзі без мяне.
Не магу я...
Пятру перадай паклоны.
Дзяўчатам дапамагу я
Вызваліцца з палону.

А заўтра, а заўтра ўжо з імі
Прыйду, як яму абяцала,
Сцяжынкамі баравымі,
Якія не раз таптала.

Мы варту падкупім — і прыйдзем.
Шчаслівa!
Не будзьце у крыўдзе.

Трывожна
У чорным бяссонні
Шэпчацца ноч у Расонах...

Не давялося Пятроўне
Хоць раз яшчэ сына ўбачыць...
У хату
Нахлынулі каты —
Гестапаўцы зграяй сабачай.

А паліцай рад старацца —
П'янчуга, злодзей і чмут...
— Агідная ў здрадніка праца,—
Як вырак, сказала яму.

А болей, а болей — ні слова,
На допыце ў каземаце
Скрываўленая і суровая
Стаяла прад катамі маці.

А тыя ад злосці змакрэлі
І мучылі без спачыну.
Палохалі цвёрдасць і веліч
Расонскай гордай жанчыны...

Расплюшчыла ў камеры вочы:
Дзяўчо на падлозе стагнала.
Да рук перабітых дзявочых
Пятроўна з жалем прыпала.

— Няўжо то Шалаева?.. Ніна!
Паслухай, я перад табою.
О божа, якая скаціна
Глумілася так над красою?

Устань жа, мая дачушка!..
О, колькі зазнала ты мукі!
Хай вецер цябе пагушкае,
Хай дожджык абмые рукі,

Хай луг набалелыя раны
Акропіць жывою расою,
Хай рэчка прыкрые туманам,
Як поійдзем у лес мы з табою...

Устань жа, мая ты каханая,
Бліжэй да мяне, мая ластаўка.
На помсту ідуць партызаны
За нас,
Аўтаматамі ляскаюць.

О так вось...
А слёзы салёныя...
Схіліся, а я пагаіўдаю.
Вярбінка мая ты зялёная,
Бярозка з Расонскага гаю.

Глядзі на мяне.
Ці пазнала?
Настаўніка вашага маці.
А што гэта —
след ад кінжала?
Успомняць яго пры расплаце...

Схіліся на матчыны грудзі,
Галінка маёй журбы.
З табою памром мы як людзі,
Не зламаныя, не рабы.

І наша радня ніколі
Не будзе за нас чырванець.
І будуць кветкі ля школы,
Як памяць пра нас, гарэць.

Восень ізноў заірдзеецца,
І пройдуць ля новых красак
Маці расонскія з дзецьмі,
Прысядуць на хвілю у класах.

І, можа, успомняць Пятроўну,
І, пэўна, згадаюць Ніну,
Яе прыгажосць чароўную,
Яе адвагу арліную.

Пра вернасць яе народу,
Нязгаснага сэрца гарэнне.
І будзе так год за годам,
Ва ўсіх, ва ўсіх пакаленнях.

О так во...
Ўсміхнулася доня:
— Хай страх будзе ў сэрцах варожых...
— І срэбра ў цябе ўжо на скронях!
О божа мой, божа...

Нянавісцю лютай,
Бяссоннем
Пранізаны
Ночы ў Расонах.

Кацюга прыйшоў на світанні,
Раве і ад злосці дрыжыць:
— Машэрава,
раз я астатні
Пытаюся, хочаш ты жыць?

Чакаю яшчэ паўгадзіны...—
І выйшаў,
хаваючы вочы.

Яна прыгарнула Ніну
І ціха на вуха прарочыць:

— Палі загамоняць жытам,
І лён разліецца блакітам,
Суцішацца раны ад болю,
Цябе ж не забудуць ніколі.

І помста натоліць прагу,
І кветкі ярчэй разгарацца.
Навучыць твая адвага,
Як жыць маладым і змагацца.

Свяціць будуць ціхія зоры,
І плыць будуць поўныя рэкі,
І гордасць суцішыць гора
Па тых, хто загінуў навекі...

За ўсіх нас у дзень вызвалення
Узнімуць чаркі, няйначай.
І ў кожнага будзе сумленнем
Памяць пра подзвігі нашы.

## СРЭБНАЯ КАСА

Быццам мяцеліца, б'юцца
Чайкі над вусцем Дунаю,
Быццам снягамі завеяны,
Хвалі бялеюць без краю.

Мо ў рыбакоў з тоіі прычыны
Срэбнай завецца касою
Тая, што выйшла з Дунаю
Ў прасторы марскога прыбою.

Тая, што выйшла за мора
З прасцёртымі ўдаль рукамі,
Што у варотах Дунаю
Вечна гарыць маякамі.

Гэтае месца апета
Ў думах народных даўніх —
З Волгі браты Пугачова
Прыйшлі ў дунайскія плаўні.

Прыйшлі ратавацца ад крыўды,
Ад лютае Кацярыны,
Прыйшлі ў курані запарожцаў
Ад мужных сыноў Украіны.

Пры вусці заклалі станіцу
Гуртом з казакамі-братамі,
На злых янычараў хадзілі,
Пенілі даль каюкамі.

Адпойчы ў баю пугачоўца
Цяжкія знясілелі раны,
Яго акружылі чужынцы,
Забралі ў палон басурманы,

На срэбнай касе да скалы тут
Паганцы яго прыкавалі.
Галеры, як чорныя здані,
На хвалях наўкол вартавалі.

Тры дні яго спёка паліла,
Спаліла і вейкі, і губы,

Тры ночы вятры яго секлі,
Аж іней бялеў на чубе.

На ранак чацвёрты — чайкі
Прымчаліся з мора, з Дунаю
Мяцеліцай белай, якая
Была без канца і краю.

Каса гэта срэбнаю стала
Ад светлай птушынае хмары;
Грымоты данесліся з мора,
Пачуліся буры удары;

Крутыя валы падхапілі
Галеры і кінулі ў мора...
Прабіўся блакіт паміж неба,
Нібыта прасека між бору.

Адхлынулі белыя чайкі
Удалеч, нібыта аблокі.
І знікла скала... А у вусці
Гулялі вясёлыя лодкі.

На першай лодцы гаілі
Зёлкамі хлопцы старанна
Брату свайму-пугачоўцу
Дунаем абмытыя раны.

А на другой — запарожцы
Чысцілі зброю, спявалі
Пра тое, як пабраціма
З няволі яны ўратавалі...

Быццам мяцеліца, б'юцца
Чайкі над вусцем Дунаю,
Быццам снягамі завеяны,
Хвалі бялеюць без краю.

Можа, таму і дагэтуль
Срэбнай завецца касою
Тая, што выйшла з Дунаю
Ў прасторы марскога прыбою.

## *Тарэнь Масэнка*

### «АДНАЛЮБ»

Хваліўся друг
Сваім адзіным шлюбам,
Што праведна
І сціпла век пражыў.
О так, ён быў
Вялікім адналюбам.
Апроч сябе...
Нікога не любіў.

### СКАРГА

*Н. Л.*

Мяне маці калісь пакідала
На іржышчы пад явара шум —
То каб ножкі да болю звыкалі...
Ты ж параніла мне і душу.

І не ўецца да шчасця дарога
Без цябе. І журботны прасцяг.
Ты забыла мяне, як малога,
На суровых дарогах жыцця.

## *Ян Райніс*

# ПАДАРОЖНІК

...Маленькі хлопчык
сваім нараджэннем
прыносіў радасць сваім бацькам,
а калі вырастаў — сваім сябрам...
...Удалечыні ты блізкі,
побліз — далёкі.

*(З прывітанняў сяброўкі і сябра)*

На шляху маім жыццёвым
Мне любоў часамі дарыць,
Я кладу яе у сэрца —
Ў гэту скарбніцу — глыбока;
Там ніколі ёй не знікнуць,
Нават сэрца каб рассеклі,
І тады б любоў знайшлі вы,
Знітаванай з тканкай сэрца.

Ласку кожную знайшлі б вы,
Што мае кранула скроні;
Кожны ветлы выраз твару,
Што глыток вады даваў мне,
Калі я канаў ад смагі;
Кожны поціск рук сардэчных,
І слязу, і ўсмешку друга,
Страх і крык перасцярогі,
Калі ў шлях я выпраўляўся.

Адшукалі б там глыбокі
Позірк, кінуты мне некім,—
Падарожніку з чужыны.
Ах, вы там знайшлі б таксама
Сарамлівае каханне,
Што мне вусны працягнулі,
Шчырую душу адбіўшы.

Многа ў скарбніцы багацця,
Ды яна мне не цяжкая,

Чым паўней яна, тым лепей.
Чым далей іду дарогай,
Тым знаходжу больш любові,
Нечаканай, даравапай
Незаслужана гасцінна.

Я не помню ўжо дарыўшых,
Адчуваю подых многіх:
Небаракі суцяшалі,
Сэрцы кволых неслі радасць,
Сплаканых вачэй прамені
Неслі мне святло жывое;
Стомленыя — вільгаць росаў,
Рукі ціспулі калекі,
Беднякі пасустрач неслі
Дыяментавыя сэрцы.

Колькі ні дарыў любові,—
Сотні раз яе вярнулі,
Нават тыя адаралі,
Хто далёк мне быў, якім я
Дапамогу даць не здолеў,
Не ўвабраўшыся у сілу,—
А любоў расла навокал,
Значна плённей за нянавісць.

Скарбы знойдзенай любові
Не вазьму з сабой: пакіну
Вам ізноў у сэрцы шчырым,
Як яно пакіне біцца.
Вось тады вы расчыніце
Сэрца, скарбы ўсе вымайце,
Што ўраслі у тканку сэрца.
І любоў і сэрца — вашы,
Давяраў я толькі сэрцу,
І яго ў дарозе толькі
Нёс не бачыўшым праменняў
І забыўшым аб любві.

Ну, а што, калі мне крочыць
Давядзецца гэтым шляхам
І пасля здранцвення сэрца,
За парогам развітальным?

Скіну ўсё я, нібы ў лазні,
Толькі дзеля вас пайду я,
І любоў тады ўся ваша
Будзе біць праменнем з цела,
Пераможа смерці сцюжу,
Перш чым я прыйду дадому
Даць ізноў сваё вам шчасце.

## НА СВЯТА ЗІМОВАГА СОНЦАВАРОТУ

Сонца, святкуй абуджэнне —
Свята адноўленай працы!
Работнік, і ты уставай:
Знойдзецца праца, святкуй!

Праца не толькі для хлеба,
Яна — барацьба за права.
Праца для хлеба — ярмо,
Праца змагання — узлёт.

Сонца з работнікам разам
Крочыць — сусвету апора:
Сонца зямлю саграе,
Работнік ёй шчасце дае.

*1927*

*Валдыс Лукс*

## ВЕРШЫ ПРА РАДЗІМУ

Двух дарагіх ў цэлым свеце яшчэ не бывала!
Ёсць толькі тая, адна, нібы сонца усход,
Тая, адна, нібы клён тваіх радасных год.
Тая, каторай душа твае песні складала,
Тая, якая жыцця твайго кужаль прадзе,
Тая, што разам з табою і ў буру ідзе.
Двух Даўгаў ў цэлым свеце яшчэ не бывала!
Ёсць толькі тая, што коціцца з рускай зямлі,
Што сустракаецца з морам, нясе караблі,
Тая, што ў грудзі свае ўсе крыніцы ўвабрала,
Што, апрануўшыся ў сінь верасоў,
Слухае тайны родных лясоў.
І дзвюх радзім у свеце яшчэ не бывала!
Ёсць толькі тая, дзе ўчора ў калысцы ты спаў,
Тая, дзе ранак праменісты ты сустракаў,
Частка яе — зорнай славай цябе абсыпала,
Думкі аб ёй, як бурштыны, гараць,
Былі яе, як галіны, шумяць.
Вось і таму ты адважна ў баю
Абараняеш Радзіму сваю.
Сэрца другога ніколі ў грудзях не бывала!

## *Петэр Сілс*

### ВАРТАВЫЯ МІРУ

Ніхто жыццё не любіць так, як мы,
Якія па крыві хадзілі ў наступ.
І мір ніхто не любіць так, як мы,
Якія спапялілі краты свастык.

Мы, гартаваныя ў пакутах і бядзе,
Калі вайны сканаў апошні дзень,
Плугі ўзялі у рукі і сякеры,
Жыццю і міру адчынілі дзверы.

Цяпер мы — вартавыя міру.
І ранамі сваімі, што ў грудзях носім,
Слязамі горкімі удоў і сірат
Клянёмся:

— Не ўдасца больш нікому
Нас напалохаць.
Грыміць народаў голас громам —
То голас твой, эпоха:

— Гэй, гангстэры шалёныя, пакіньце
Шлях пракладаць вайне!
Вы ўсе загінеце,
Калі абрушыцца на вас народаў гнеў.

## *Вацыс Рэймерыс*

### ВОЛЯ

Змёўшы змрок падняволыных часін,
Добра жыць і кахаць сэрцам чыстым...
Нарадзіўся ў таварыша сын —
Грамадзянін малы, галасісты.

Здасца казкаю сыну твой шлях,
Ён турмы, кайданоў не спазнае.
Ён у маці ляжыць на руках
Светлы, нібы расінка малая.

Хай гуляе ён... Не спавівай
Рук і ножак яго ты ніколі,
Сыну змалку адчуць не давай
Нават гэткай маленькай няволі.

## *Геворг Эмін*

* *

Я не магу.
З мяне даволі!
За што той боль мне сэрца рве?!
Няма кахання, а ўсё болей
Пакут, нібы яно жыве.

Каханне помсціць мне за страту!
Вось так праз многа-многа дзён
Баліць начамі у салдата
Рука, якую страціў ён.

*Адам Міцкевіч*

## РОЗДУМ У ДЗЕНЬ АД'ЕЗДУ

1925, 29 кастрычніка, Адэса.

Скуль ён, жаль мой заўчасны? — Гляджу у акно я,
А душой зноў блукаю па самотных пакоях,
Быццам нешта забыў тут мой зрок летуценны,
Развітацца ён хоча з вамі, мілыя сцены.
Вы між многіх світанняў і змярканняў тужлівых
Мае ўздыхі без мэты чулі ўсе цярпліва.
Праз акно цэлы вечар глядзеў я удалеч,
Выглядаў, сам не ведаў я, што выглядаю.
Аднастайнасць прыелася, ўстаў я, журботны;
Рэха будзячы лёскатам крокаў самотных,
Ад дзвярэй да дзвярэй паўтараю без мэты шлях
просты,
Такт за тактам лічу я жалезны гадзінніка поступ
Або шорах таго чарвячка, што да ранку
Ціха, ціха шкрабецца, нібы ў дзверы каханкі.
Блізка ранак. Чакаюць надаеды-вазніцы.
Скрутак кніг забярыце і рэчы-драбніцы.
Пойдзем! Не прывітаны, пераступаў я парогі,
Гэтак і ад'язджаю, не пачуўшы: «Шчаслівай
дарогі».
Што ж, хоць горад пакіну, абы з вачэй зніклі
Жыхары, што душой да мяне не прывыклі.
Мой ад'езд не ахопіць нікога жальбою,
Я ніводнай слязы не хачу пакідаць за сабою.
Як над лугам, расцвіўшым вясёлкай, здалёку
Кветка лёгкая, бы павуцінка, ляціць адзінока,
Яе здзьмухнулі недзе з завяўшай галінкі;
Хоць і ружу сустрэне і ў маёвых абдымках
Адпачыць будзе прагнуць і ўчэпіцца мёртвай
далоняю,
Зноў віхор адарве яе, далей пагоніць.
Гэтак імя сваё невядомае, твар чужаземны
Тут насіў я па плошчах шумлівых, завулках
таемных,

Тут пазнаць мяне прагнуў рой пявестаў
прыгожых,
А навошта? — прышэльца не варта трывожыць!
Матыля ловяць дзеці, покуль кружыць ён светлы,
Зловяць, глянуць і кінуць: хай ляціць сабе
з ветрам!

Паляцім! Шчасце ёсць, крыллі ёсць да звароту.
Паляцім і ніколі больш не знізім палёту!
Помню, як маладым я з бацькоўскай мясціны
Ад любімых сяброў, ад каханай дзяўчыны
Ад'язджаў і глядзеў на знаёмыя дрэвы,
Бачыў хустак узмахі, галасы чуў і спевы.
Плакаў.— Люба нам плакаць, покуль мы маладыя;
Плакаць зараз? Па чым? Старасць, годы не тыя.
Паміраць маладому лягчэй, не пабачыўшы свету,
Спадзяецца ён жыць ў сэрцы друга ці любай
кабеты.

А стары, што зрываў хлусні полаг ганебны,
Што не верыць у цуды на зямлі і на небе,
Знае, што назаўсёды ў труне ён замкнецца...
Вось таму па табе, горад, журыцца сэрца.
Дык сядайма! Труну у дарозе не спыняць,
Аніхто не праводзіць яе, нават вокам не кіне,
Ад'язджаю дадому, слёзы твар не аросяць,
Як ад'езд мой абвесціць паштовых званкоў
адгалоссе.

## *Фрыдрых Шылер*

### ПЕСНЯ РАЗБОЙНІКАЎ

(З драмы «Разбойнікі»)

Рэзаць, грабіць ў цёмным лесе
Нас не трэба навучаць!
Заўтра могуць нас павесіць,
Сёння будзем балявааць!

Жывём разгульна мы, сябры,
І кроў кіпіць ад хмелю.
Спім ноччу мы ў густым бары,
Плюём на буры і вятры;
Штоноч ў нас наваселле.
Меркурый, наш вясёлы бог,
Нас навучыў ўсяму, як мог.

Балюем сёння мы ў папоў,
А заўтра — ў шлях-дарогу.
Што не патрэбна для сяброў,
Мы ахвяруем богу.

І толькі сочны вінаград
Забродзіць у галовах,
Грымім мы на пякельны лад,
І нам тады сам чорт не брат,
У нас вэрхал адмысловы.

І стогн зарэзаных бацькоў,
Выццё дзяцей, і матак кроў,
І крык жанчын дарэмны
За музыку прыемней.

О, як яны страшна вішчаць пад нажом,
Як кроў у іх з горла ліецца руччом!..
А нас весяляць іх крыўлянні і мукі,
Чырвона ў вачах, і ў крыві нашы рукі.

Калі ж смяротны прыйдзе час,
Кат, скончы ўсё хутчэй!
Сябры! Пятля ўсіх сціснe нас...
Балюйце ж весялей!
Ура! Ай-люлі! Смерць не страшная нам!
Хутчэй на дарогу глыточак віна!

ЗМЕСТ

*Васіль Быкаў.* Паэзія дабрыні і мужнасці . . 5

I

Ураджайнае . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Моладзі . . . . . . . . . . . . . . . . 12
З песняю вясны . . . . . . . . . . . . 13
Сустрэча . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Вясновыя мары . . . . . . . . . . . . 16
Яблыня . . . . . . . . . . . . . . . . 18
На пашы . . . . . . . . . . . . . . . . 19
Верасень . . . . . . . . . . . . . . . . 20
Іспанскаму таварышу . . . . . . . . 21
Шызы галубок . . . . . . . . . . . . 22
Сувей . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
Радзіме . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Красавіцкая навальніца . . . . . . . 32
У дарозе . . . . . . . . . . . . . . . 33
Зажынкі . . . . . . . . . . . . . . . . 34
Нараджэнне дня . . . . . . . . . . . 35
Упэўненасць . . . . . . . . . . . . . 36
*** Я іду... . . . . . . . . . . . . . 37
*** Каня хлопец трымаў... . . . . . . 38
Лірычнае . . . . . . . . . . . . . . . 39
Вішня . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
Я ўсмешку тваю пазнаю . . . . . . . 42
Выязджалі лесарубы . . . . . . . . . 43
Мацеры . . . . . . . . . . . . . . . . 44
Вясною . . . . . . . . . . . . . . . . 46
*** Я пралесак блакітных... . . . . . 47
Меліяратары . . . . . . . . . . . . . 48
Туга . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Майскі ранак . . . . . . . . . . . . . 50
У навальніцу . . . . . . . . . . . . . 51
Падсочка . . . . . . . . . . . . . . . 52
Адкопаныя зарніцы . . . . . . . . . . 53
Мора . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Ростань . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Пагранічча . . . . . . . . . . . . . . 57
Зварот байца . . . . . . . . . . . . . 59

Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
*** Плыў грукат... . . . . . . . . . . . . . 62
Суседкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
Заўтра . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 65
Апошні хутаранін . . . . . . . . . . . . . . 66
Сэрца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
Юнак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
Ад'езд маладой . . . . . . . . . . . . . . 75
Асеннім днём . . . . . . . . . . . . . . . 77
Вызваленаму брату . . . . . . . . . . . . 79
Парабак . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
Белавежа . . . . . . . . . . . . . . . . 81
Жабракі . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
Журавы . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
Качулкі . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
У родных месцах . . . . . . . . . . . . 85
На зары . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Маці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
Фотаздымак . . . . . . . . . . . . . . . 90
Бяроза . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
Даспяванне . . . . . . . . . . . . . . . 94
Абывацелі . . . . . . . . . . . . . . . . 95
Зубр . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Прысуд . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
*** Калі знаёмы тлум абрыдне... . . . . . . . 99
Сталасць . . . . . . . . . . . . . . . . 100
Паранены . . . . . . . . . . . . . . . . 101
Матчына гара . . . . . . . . . . . . . . 102
Хвала вам! . . . . . . . . . . . . . . . 103
Пра смерць . . . . . . . . . . . . . . . 104
Ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Першыя кулі . . . . . . . . . . . . . . . 107
Пісьма . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Беластоцкія вітрыны (паэма) . . . . . . 110

II

Змагайцеся адважна за Радзіму! . . . . . 121
Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . 122
Праўнук . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
Так пачынаецца народны гнеў . . . . . . . 124
Адпомсцім! . . . . . . . . . . . . . . . 125
Разведчык . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Саша . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129

Камсамольцы . . . . . . . . . 131
Здраднік . . . . . . . . . . . . . . 132
Пісьмо другу . . . . . . . . . . . . . . 133
Фашыстам літасці няма! . . . . . . . . . 134
Дарога вайны . . . . . . . . . . . . . . 136
Краіна мая . . . . . . . . . . . . . . . 139
*** Кожны з нас прыпасае Радзімы куток... . . 140
Пачастунак . . . . . . . . . . . . . . 141
Вясна ідзе на Беларусь . . . . . . . . . . 142
Конь . . . . . . . . . . . . . . . . . 143
Трывожныя зводкі . . . . . . . . . . . . 145
Песня . . . . . . . . . . . . . . . . . 146
Мінску . . . . . . . . . . . . . . . . 148
Сяброўства . . . . . . . . . . . . . . . 149
*** Будуць вечна сады расцвітаць... . . . . . . 151
Сінія касачы . . . . . . . . . . . . . . 152
Ты скажы мне, зязюля... . . . . . . . . . . 154
Падбіты танк . . . . . . . . . . . . . . 155
Сябру па зброі . . . . . . . . . . . . . 157
Гэта будзе . . . . . . . . . . . . . . . 158
Паравоз . . . . . . . . . . . . . . . . 160
Дзеці вайны . . . . . . . . . . . . . . 162
Ідуць сібіракі . . . . . . . . . . . . . 163
Байцу, які першы ступіў на беларускую зямлю 165
Зварот . . . . . . . . . . . . . . . . 166
Ноч перад святам . . . . . . . . . . . . 167
Апошняя куля . . . . . . . . . . . . . . 171
*** І гора міне, і радасць міне... . . . . . . . 172
Артабстрэл . . . . . . . . . . . . . . . 173
*** У мяне не забілі нікога... . . . . . . . . 174
Начны мсцівец . . . . . . . . . . . . . 175
*** Лес асенні глуха гудзе... . . . . . . . . 178
Вока снайпера . . . . . . . . . . . . . 179
*** Учора тут жылі салдаты... . . . . . . . . 180
*** Адплывае на захад гарматны гром... . . . . 181
*** Яшчэ рана, хлопцы, атрасаць... . . . . . . 182
Зубры . . . . . . . . . . . . . . . . . 183
За валдайскімі сопкамі . . . . . . . . . . 184
*** Бачыў пра гэта у фільме я... . . . . . . . 185
Коні . . . . . . . . . . . . . . . . . 186
Балада пра Міколу Сасноўскага . . . . . . . 188
Герой . . . . . . . . . . . . . . . . . 190
*** Не, гэта не апошняя аповесць... . . . . . . 191
*** Калі мне бывала весела... . . . . . . . 192

Курганы . . . . . . . . . . . . . . . . . 193
Думы салдата . . . . . . . . . . . . . . 194
*** Старшына, налівай нам стопкі... . . . . . . 195
*** Толькі лісцем рабін шалахні... . . . . . . . 196
Рэгуліроўшчыца . . . . . . . . . . . . . 197
Перад сустрэчай . . . . . . . . . . . . . 198
Гомель . . . . . . . . . . . . . . . . . 199
Палескі напрамак . . . . . . . . . . . . 200
Лётчыкам «Нармандыі» . . . . . . . . . . 202
*** Падвярнууўся мне на пазіцыі... . . . . . . . 204
*** Тры дні з упартасцю тупою... . . . . . . . 206
Калумбы . . . . . . . . . . . . . . . . 207
Маё і тваё маленства . . . . . . . . . . . 208
*** Я не піў на тваім вяселлі... . . . . . . . . 211
*** Я прысягаў не раз, не двойчы... . . . . . . 212
Мая геаграфія . . . . . . . . . . . . . . 213
Каханне і пошта . . . . . . . . . . . . . 215
Далёкія станцыі . . . . . . . . . . . . . 216
На роднай зямлі . . . . . . . . . . . . . 218
Перамога . . . . . . . . . . . . . . . . 220
Сон пра апошні залп . . . . . . . . . . . 222
Бульба . . . . . . . . . . . . . . . . . 224
Песня пра чатыры магілы . . . . . . . . . 226
*** Сівая жанчына стаіць ля крыніцы... . . . . 229
*** Гарніст іграе збор... . . . . . . . . . . . 230
Франтавік . . . . . . . . . . . . . . . . 231
*** Дружа повар, кансерваў годзе!.. . . . . . . 233
*** Кожнае дробнае шкельца марыць іскрыцца сонцам... . . . . . . . . . . . . . . . . 234
Сват . . . . . . . . . . . . . . . . . . 235
Ля дзявочай кватэры № 5 . . . . . . . . . 237
Яна не прыйшла... . . . . . . . . . . . . 239
Пад'язджаючы да Мінска... . . . . . . . . . 241
З «Партызанскай дубінкі»
«Кукушка» . . . . . . . . . . . . . 243
Маладзец супроць авец... . . . . . . . . 243
Партызанскія прыпеўкі . . . . . . . . 244
Чаго баіцца немец? . . . . . . . . . . 245
Шчаслівчык . . . . . . . . . . . . . 245
Пачастунак Гітлеру . . . . . . . . . . 246
Фашысцкі «анёлак міру» . . . . . . . . 246
Фрыц адступае . . . . . . . . . . . . 247
Пра самапомач . . . . . . . . . . . . 248
Курашчупы-кураеды . . . . . . . . . . 249

Гарбатага магіла выправіць . . . . . . . 250
Сямёра дачок . . . . . . . . . . . . 251
Партызанскія дадаткі ў нямецкія парадкі 253
Ненавісць (паэма) . . . . . . . . . . . . . 255

## III

*Іранскі дзённік*
*** Мы першы раз за межамі Радзімы... 267
У Тэгеране . . . . . . . . . . . . . 269
*** Ты чуеш курлыканне... . . . . . . . 270
*** Я ўсё пераблытаў... . . . . . . . . 271
Слухаючы «Перапёлку» . . . . . . . . . 272
*** І скрыпяць, і скрыпяць... . . . . . . 274
Рамантыка . . . . . . . . . . . . . 275
*** На Ардабільскім перавале . . . . . 277
*** Гарлае ноч... . . . . . . . . . . . 278
Бутэлька цынандалі . . . . . . . . . . 279
Сустрэча з бярозай . . . . . . . . . . 281
Размова з ішаком . . . . . . . . . . . 282
Пячорын у Персіі . . . . . . . . . . . . 283
Што я думаў, гледзячы на Каспійскае мора 286
*** Як шаблямі, на часткі... . . . . . . . 288
*** Апяваў Адам Міцкевіч... . . . . . . . 289
*** Збіраліся чорныя, гарбаносыя... . . . . 290
Караван . . . . . . . . . . . . . . 291
Дэмавенд, галоўная гара іранцаў . . . . 292
Дождж . . . . . . . . . . . . . . . 293
На моры . . . . . . . . . . . . . . 294
*** Чорныя марскія ночы... . . . . . . . . 295
Малярыя . . . . . . . . . . . . . . 296
Іспанская ноч (паэма) . . . . . . . . . . 297
Маладосць у паходзе (паэма) . . . . . . . . 311

## ВЫБРАНЫЯ ПЕРАКЛАДЫ

*Аляксандр Пракоф'еў*
*** Салдацкая песня, ніяк не змані... . . . . . . 329
Вечна цвіці, Радзіма! . . . . . . . . . . . 330
Песня . . . . . . . . . . . . . . . . . 330
*** У краі бярозавага шуму... . . . . . . . . 331

*Аляксей Суркоў*
Партызанскі марш . . . 332

*Анатоль Сафронаў*
Нагасакі . . . . . . 334

*Якаў Хелемскі*
*** Добра нам блукаць па свеце.... . . 336

*Мікола Нагнібеда*
Матулям з Расон (паэма) . . . . 338
Срэбная каса . . . . . . . . 347

*Тарэнь Масэнка*
«Адналюб» . . . . . . . . . . . . . . . . . 349
Скарга . . . . . . . . . . . . . . . . . . 349

*Ян Райніс*
Падарожнік . . . . . . . . . . . 350
На свята зімовага сонцавароту . . . 352

*Валдыс Лукс*
Вершы пра Радзіму . . . 353

*Петэр Сілс*
Вартавыя міру . . . . . . 354

*Вацыс Рэймерыс*
Воля . . . . . . . . 355

*Геворг Эмін*
*** Я не магу... . . 356

*Адам Міцкевіч*
Роздум у дзень ад'езду . . . . . 357

*Фрыдрых Шылер*
Песня разбойнікаў . . . . . 359

**Панчанка П.**

П 16 Збор твораў. У 4-х т. Том 1. Вершы і паэмы (1934—1945 гг.). Выбраныя пераклады.— Мн.: Маст. літ., 1981.— 366 с. 1 л. партр.

У пер.: 1 р. 80 к.

У першы том Збору твораў народнага паэта Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы Пімена Панчанкі, увайшлі вершы і паэмы, напісаныя ў 1934—1945 гадах, а таксама выбраныя пераклады.

П $\frac{70403—030}{М 302(05)—81}$ падпіснае

ББК 84 Бел 7
Бел 2

ПИМЕН ЕМЕЛЬЯНОВИЧ ПАНЧЕНКО

**Собрание сочинений**
**в 4-х томах**

Том 1

Стихи и поэмы (1934—1945 гг.)
Избранные переводы

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар Р. І. Барадулін. Мастак Л. Я. Прагін. Мастацкія рэдактары А. І. Труханава, Л. Я. Прагін. Тэхнічныя рэдактары Л. М. Шлапо, Т. М. Сокал. Карэктары Т. В. Трубач, Л. С. Зіза.

ІБ № 943
Здадзена ў набор 18.07.80. Падп. да друку 14.01.81. АТ 07503. Фармат 84×100¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 17,94+0,10 укл. Ул.-выд. арк. 14,76. Тыраж 17 000 экз. Зак. 839. Цана 1 р. 80 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Паліграфкамбінат імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.